Кніжная паліца школьніка




# Чарадзейнае слова

Кніжная паліца школьніка

# Чарадзейнае слова

*Хрэстаматыя*
*для пазакласнага чытання*
*ў 3 класе*

Мінск
«Беларусь»
2022

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)
Ч-20

Серыя заснавана ў 2013 годзе

Складальнік *В. Г. Багуцкі*

**Чарадзейнае слова :** хрэстаматыя для пазакласнага чытання ў 3-м класе / склад. В. Г. Багуцкі. — Мінск : Беларусь, 2022. — 463 с. — (Кніжная паліца школьніка).
Ч-20

ISBN 978-985-01-1608-6.

У кнігу ўвайшлі народныя творы, а таксама вершы і апавяданні беларускіх пісьменнікаў.

Рэкамендуецца вучням пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання для пазакласнага чытання.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1608-6**

© Багуцкі В. Г., складанне, 2022
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2022

# Вытокі народнай мудрасці

## ЗАКЛІЧКІ І ПРЫГАВОРЫ

* * *

Бусел, бусел-калода,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода?
Калі сонейка — кружыся,
Калі дожджык, то садзіся.

* * *

Грыбочкі, грыбочкі,
Пакажыце лабочкі.
Я вас не пакіну —
Забяру ў карзіну.

* * *

Чужыя грыбы пад імхом,
А мае вярхом, вярхом.
Чужыя грыбы пад лісточкам,
А мае грыбочкі пад кусточкам.
Чужыя грыбы пад лазінку,
А мае ў карзінку.

* * *

Пацягунушкі, пацягунушкі,
Папярок талстунушкі,
А ў ножкі хадунушкі,

А ў ручкі хватунушкі,
А ў раток гаварок,
А ў галоўку разумок.

* * *

Каб нам ікалку прагнаць,
Трэба тры разы сказаць:
«Ехала ікалка
На рабой кабыле,
Кабыла ўпала —
Ікалка прапала».

## НАРОДНЫЯ ЗАБАЎЛЯНКІ І ЛІЧЫЛКІ

* * *

Пайшоў каток у лясок,
прынёс каток паясок.
Пайшоў каток на ганачак,
прынёс нам абараначак.
Пайшоў каток на рыначак,
прынёс каток разыначак.
Пайшоў каток на таржок,
прынёс каток піражок.
Пайшоў каток на вулку,
прынёс нам хлеба булку.

* * *

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Еду, еду, еду,
Ніяк не даеду.

Прыпрагу сароку,
Паеду далёка,
У новай кашулі,
Да свайго дзядулі.
Дзед дасць піражочак
І сыра кусочак.

* * *

Сарока-варона
кашу варыла,
дзетак карміла,
гэтаму дала,
гэтаму дала,
гэтаму дала,
гэтаму дала,
а гэтаму не дала.
Ты самы малы,
вады не насіў,
дроў не калоў,
круп не малоў.
Бяжы да крыніцы,
прынясі вадзіцы,
усім нам напіцца —
тады дам табе кашы.
Тут пень, тут калода,
тут мох, тут балота,
а тутака крыніца — сцюдзёна вадзіца
пацякла-пацякла-пацякла!

* * *

Ласка, ласка,
Дзе ты была?
У Бога жыла.

Што рабіла?
Кросны ткала.
Што зарабіла?
Кусочак сала.
Дзе тое сала?
Кошка ўкрала.
Дзе тая кошка?
Пад печку пайшла.
Дзе тая печка?
Краскамі зарасла.
Дзе тыя краскі?
Дзеўкі парвалі.
Дзе тыя дзеўкі?
Хлопцы пабралі.
Дзе тыя хлопцы?
На вайну пайшлі.
Дзе тая вайна?
Няма!

* * *

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшаў месяц пагуляць,
А за месяцам луна —
Аставайся ты адна.

## ЕХАЛІ З ГОРКІ СКАРАГАВОРКІ

❋ У арла пароль «арол», арол пароль запароў. Рапартаваў арол пра пароль, рапартаваў ды не дарапартаваў, стаў дарапартоўваць ды зарапартаваўся.

⁕ Белы бусел баіў байку беламу зайку.

⁕ Вадавоз вёз ваду ад вадаправода.

⁕ Гром грыміць, страляе, у дубы цаляе.

⁕ На двары стары баран грукаў зранку ў барабан, што Рабая курка клюе крупкі, боб ды боб — два бабы, а яшчэ боб — тры бабы.

⁕ Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.

⁕ У зайкі Бубы забалелі зубы.

⁕ І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу.

⁕ Каток нітак клубок закаціў у куток.

⁕ Лаўрэн лавіў рыбу, Лара варыла рыбу з лаўровым лістом.

⁕ Мама з Мілай мылі раму. Мама Мілу мыла мылам, Міла мыла не любіла, Міла мыла ўтапіла, мама мыла шукала, мама ў Мілы пытала, хто пабудзе ў вадзе і нямокры ідзе.

⁕ Ні налева, ні направа, ні направа, ні налева.

⁕ Пекар Пётр пёк пірог.

⁕ Рыбак Карней лавіў акуней.

⁕ Смешкі кошцы, слёзкі мышцы.

⁕ Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце.

⁕ Скача чапля па балоце, чачотачка ў чароце, а чубаты чачот топча, топча агарод. Я чачота падпільную, чапялою пачастую.

⁕ Шэсць мышанят у шалашы шамацяць: «Мама Мышка сушыла шышкі».

## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

* * *

⁕ Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш.

⁕ Бацькоўскае слова дарэмна не гаворыцца.

⁕ Матчыны рукі заўсёды мягкія.

⁕ Пры сонейку цёпла, пры мамцы добра.

⁕ Сэрца маці лягчэйшае за пух і цвярдзейшае за камень.

⁕ Усякая птушка сваё гняздо бароніць.

⁕ У гасцях добра, а дома лепш.

⁕ Ідзі ў родны край, там — і пад ёлкай рай.

* * *

⁕ Хто любіць працаваць, той не будзе доўга спаць.

⁕ Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

⁕ Хто працуе, той не сумуе.

⁕ За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца.

⁕ Няўмеку рукі не баляць.

⁕ Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота — там пуста.

⁕ Хочаш быць шчаслівы — не будзь лянівы.

⁕ Хто з працай дружыць, той жыве і не тужыць.

* * *

⁕ Слязамі гору не паможаш.

⁕ Спяшыць — людзей смяшыць.

* З кім пазнаешся, такім і станешся.
* Сябра за грошы не купіш.
* Адна ластаўка вясны не робіць.
* Як пражывеш, так і праслывеш.
* Не хвалі сябе — няхай людзі пахваляць.
* Выказанага слова да губы не вернеш.
* Як гукнеш, так і адгукнецца.
* Трэба ведаць, калі сказаць, а калі памаўчаць.
* Ласка горы разбівае.
* Рана загоіцца, а злое слова ніколі.
* З чужой бяды не смейся.
* Не рабі другому, што не люба самому.

* * *

* Дзе розумам не дайду, дык у кніжцы знайду.
* Людзей слухай, а свой розум май.
* У каго веды — у таго і сіла.
* Навука не мучыць, а жыць вучыць.

## ПРЫМАЎКІ ПРА МЕСЯЦЫ ГОДА

* Студзень — году пачатак, зіме палавіна.
* Прыйдзе люты — спытае, як абуты.
* Сакавік часам снегам сее, а часам сонцам грэе.
* Сакавік дрэвам сок пускае.
* Красавіцкі ручай зямлю будзіць.

* Мокра ў маі — будуць пышныя караваі.
* Чэрвень не гуляе — ураджай люляе.
* Ліпень пякучы, але даручы.
* Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.
* Што ў полі ўродзіць, жнівень знаходзіць.
* У верасні ліст на дрэве не трымаецца.
* Кастрычнік ходзіць па краю ды гоніць птушак з гаю.
* Кастрычнік зямлю беліць, а лес залоціць.
* У лістападзе гола ў садзе.
* Снежань зіму пачынае, а год сканчае.

## НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

* * *

* Кот ляжыць сярод пакоя — будзе цёпла.
* Зоркі моцна блішчаць — да марозу.
* Мала зорак на небе — на непагадзь.
* Вароны каркаюць чарадой — на мароз зімой, а летам — на непагадзь.
* Лес шуміць — чакай адлігі.
* Зіма ўцякае цёмнымі начамі.

* * *

* Сакавіцкая вада гаючая.
* Калі на дзень веснавога раўнадзенства, сустрэчы сонца і месяца, роўнасці дня і ночы (22 са-

кавіка), надвор'е добрае, роўнае, цёплае — астатнія дні вясны і ўсё лета таксама будуць роўныя, цёплыя, прыгожыя. А калі гэты дзень віхурны, дажджлівы, перападзісты — такія ж будуць астатнія дні вясны і летнія месяцы.

⁕ Туман з'ядае снег.

⁕ Гракі селі ў гнёзды — праз тры тыдні трэба пачынаць сяўбу.

⁕ У сакавіку вада не цячэ — у красавіку трава не расце.

⁕ Гром у сакавіку — прадвеснік урадлівасці.

⁕ Рана прыляцелі гракі, жаўрукі і жоравы — да ранняй і цёплай вясны.

⁕ Красавіцкі ручай зямлю будзіць.

⁕ З бярозы цячэ многа соку — да мокрага лета.

⁕ Май лясы прыбірае, лета ў госці чакае.

⁕ Як дуб ліст разгорне — чакай халадоў.

* * *

⁕ Летні дзень зіму корміць.

⁕ Спахмурнела неба, а кветкі дзьмухаўцоў раскрытыя — дажджу не будзе.

⁕ Вечарам і раніцаю туман сцелецца нізка па вадзе і зямлі — дзень будзе сонечны, ясны.

⁕ Калі ў Іванаву ноч (6 ліпеня) зорна, то будзе многа грыбоў, а калі вялікая раса — да ўраджаю агуркоў.

* Відаць многа павукоў — на добрае надвор'е.

* Чырвоныя воблакі перад усходам сонца — да ветру, а хмары — на дождж.

* Увечары моцна трашчаць конікі — да добрага надвор'я.

* У жніўні лета насустрач восені ўскач бяжыць.

* * *

* Гусі ляцяць нізка — зіма блізка, а высока — зіма далёка.

* Калі вароны садзяцца на верхавіны дрэў — будзе цёпла, калі рассаджваюцца па галінках — холадна; пры гэтым крычаць — на дождж.

* Кастрычнік зямлю балоціць, лес залоціць.

* У лістападзе — гола ў садзе.

* Пакуль ліст з вішань не апаў, колькі б снегу не выпала, ён усё роўна растане.

* * *

* Снежань год канчае, а зіму пачынае.

* Сонца ўлетку грэе, а зімой марозіць.

* Зіма не лета — у кажух адзета.

* Яснае неба зімою — перад моцнымі халадамі.

* Сухі снежань — сухая вясна і сухое лета.

* Сонца заходзіць у густыя воблакі — перад завірухай, сцюжаю.

* Доўгія ледзяшы вісяць на стрэхах — доўгая зіма, позняя вясна.

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

### Кукарэку, петушок...

Кукарэку, петушок,
Чырвоненькі грабяшок,
Па паветачку пайшоў,
Курку рабаю знайшоў.

Пачаў яе пытаці,
Ці ўмее чытаці.
— Не чытаю, не пішу,
Толькі яечкі нясу.

### Іграў я на дудцы...

Іграў я на дудцы, ту-лю-лю!
Седзячы ў будцы, ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю! *(Паўтараецца пасля кожнай страфы.)*
Грае мая дудка: ту-лю-лю!
Пяе весялушка; ту-лю-лю!

Як іграла дудка, ту-лю-лю!
Прыбег скакаць Юрка: ту-лю-лю!

А за Юркам Янка, ту-лю-лю!
А за Янкам — Танька, ту-лю-лю!

# Зімовыя песні

## Калядныя песні

* * *

Калядкі блізка,
Кілбаскі нізка.
Высока вісяць,
Няможна дастаць.

* * *

О-го-го каза,
О-го-го шэра,
Дзе рогі дзела?
— На соль праела.
Соль дарагая, мера скупая.
Ох ты, козанька,
Не будзь гордзенька,
Расхадзіся ты
Па ўсяму двару,
Пакланіся нізенька
Як гаспадару, як гаспадыні,
Дайце казе сена.
Каб каза прысела.
Дайце казе сала,
Каб каза ўстала.
На печы авёс —
Вялікі парос.
На палу жыта —
Нагамі збіта.
А ў том жыце перапёліца
Вывела дзяцей —
Люба глядзець.

Меншыя, большыя
паляцелі, а серадзельшыя засірацелі.
Казача, казача,
Вазьмі маю доч.
Дару табе пару сабак
І сала кумпяк,
І мех мякіны,
Тону пярыны,
І куль саломы —
Бывайце здаровы.

## Масленічная песня

Мы на горачцы пабывалі, пабывалі,
Масленку сустракалі, сустракалі,
Сырам гару набівалі, набівалі,
Маслам гару палівалі, палівалі.
Мы думалі Масленкі — сем нядзелек, сем нядзелек,
Ажно Масленкі сем дзянёчкаў, сем дзянёчкаў!
Нас Масленка абманіла, абманіла:
На сем нядзель паста пасадзіла, пасадзіла.

## Вясновыя песні

* * *

Жаваронačкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Нам хлебушак пераела.

* * *

Добры вечар, пане гаспадару!
Вясна красна на ўвесь свет!
Заспяваем песню вяльможнаму пану,
Як і для пана, таксама для пані.
У панскім дварочку, як у вяночку,
Садам абсаджоны, тынам гараджоны.
Панская ніва будзе ўрадліва.
Панскія дзеткі, як у садзе кветкі,
Да навукі кемны, у размове прыемны.
Палажыце кладку, пазавіце ў хатку,
Сыр на талерку пад'ясці маленька.

## Летнія песні

### Купальская песня

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыўшы вочкі пяром, пяром.
На Йвана Купала, на Йвана Купала! *(Паўтараецца пасля кожных двух радкоў.)*
  Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
  Вітала хлопцаў чалом, чалом.
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночкі агнём, агнём.
  Свяціла ночкі агнём, агнём,
  Пляла вяночкі шаўком, шаўком.
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,
Слыла Купалка цяплом, дабром.
  Слыла Купалка цяплом, дабром,
  Славу Купалу пяём, пяём.

## Жніўная песня

* * *

Радзі, сонца, жыта і пшаніцу,
Радзі ярыну капамі.
Радзі, сонца, жыта і пшаніцу
Поўны гумны стагамі...

## Восеньскія песні

* * *

Пасеялі дзеўкі лён,
Эй, люлі, дзеўкі лён.
Пасеяўшы, палолі,
Эй, люлі, палолі,
Белы ручкі калолі,
Эй, люлі, калолі.
Унадзіўся сівы конь,
Эй, люлі, сівы конь,
Патаптаў ён дзеўкам лён,
Эй, люлі, дзеўкам лён.
Ён макушкі паскусаў,
Эй, люлі, паскусаў
І ў рашточкі пакідаў,
Эй, люлі, пакідаў.
Дзеўкі лянок сабралі,
Эй, люлі, сабралі,
Белы кужаль паслалі,
Эй, люлі, паслалі,
А паслаўшы, памялі,
Эй, люлі, памялі.

Дзеўкі лянок папралі,
Эй, люлі, папралі,
Плаценка саткалі,
Эй, люлі, саткалі.

* * *

Талака, талака
Талачылася,
Увесь дзень па полі
Валачылася.
Мы ўвесь гнаёчак
Павыносілі,
На падводачках
Павывозілі.
Да ўвесь гнаёчак
Раскалацілі,
На ручках гнаёчак
Перадзяржалі,
Ножкамі зямельку
Перамералі.

## ПРЫПЕЎКІ

Дай, божа, усяго,
Чаго хочацца:
Паспаць, паляжаць,
Паварочацца!
   Рассыпся, гарох,
   А я пазбіраю,
   Раздайся, народ,
   А я — пагуляю!

Мяне татка гадаваў —
Уволю хлеба не даваў,
Каб я шыбка не расла —
Хутка замуж не пайшла!
  Расці, каравай,
  Вышэй тое печы,
  Каб было дзе ўчатырох
  Каравай сцярэгчы!
Ты, Марыйка, дзе бувала,
Можа ў лесе зімавала?
Гарод гарадзіла,
Красачкі садзіла!
  Мы пасеялі гарох —
  Вырасла люцэрня.
  Аграном развёў рукамі:
  — Пераблытаў зерне!
Ой, дай, божа, у добры час,
Як у людзей, так і ў нас.
Вясёла гадзіна —
Каб жыта радзіла!

## ГЭТЫЯ ЦІКАВЫЯ ЗАГАДКІ

* Стукае, грукае, а нідзе не відаць.
* І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць.
* Прыйшла чорна маці. Усіх паклала спаці.
* Сіняя пасцілка ўвесь свет накрыла.
* Глянеш — заплачаш, а ўсе яму рады.
* Ляцеў птах, на ваду — бах.
  Вады не скалыхнуў, на дно патануў.

* Без рук малюе, без зубоў кусае.

* На вадзе родзіцца, а вады баіцца.

* Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастане, паху не мае, зімой вырастае.

* Стаіць дуб у чыстым полі, а на ім дванаццаць голляў, а на голлях, як заўсёды, пяцьдзясят і два гнязды. Па сем яек там ляжыць. Што гэта за дуб стаіць?

* Не есць і не п'е, а ходзіць і б'е.

* Расцілі, збіралі,
Таптаді, ткалі
І на стол заслалі.

* З хаты ў хату водзіць, а сама не заходзіць.

* Было жоўтым, вырасла зялёным,
Сонца пацалавала — ізноў жоўтым стала.

* Пухнатае ягнятка,
Хто б падумаць мог:
Удзень яно з нагамі,
А ўначы — без ног!

* З грывай, а не конь,
з рагамі, а не бык,
з барадой, а не казёл.

* Гучна-гучна зароў
Цар пушчанскіх звяроў.
Гальчастыя рогі,
хуткія ногі,
колер поўсці — залаты.
Хто я, ці ведаеш ты?

* У ваду нырае смела,
хатку ён будуе ўмела,
Пад вадой і на вадзе
будаўніцтва ён вядзе.

* Ён прысмакаў з'еў нямала,
а калі харчоў не стала,
лапу смокчучы, заснуў,
ледзьве не праспаў вясну.

* У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла —
сляды замяла.

* З ялінкі на ялінку,
з галінкі на галінку
скача агеньчык жывы...
Хто гэта? Знаеце вы?

* Мышак ловіць, ды не коцік ён,
І лісты носіць, ды не паштальён.
Каб лісе не трапіць на зубок,
У калючы скруціцца клубок.

## Загадкі-жарты

* Што гарыць без агню?
* Што бяжыць без ветра?
* Што ляціць без крылаў?
* Што чорна, не чарнеючы?
* Што без вады плавае?
* Хто малюе без рук і алоўка?

* Што чалавеку самае мілае?
* Што хутчэй за ўсё на свеце?
* Хто гаворыць на ўсіх мовах?
* Які год цягнецца адзін дзень?
* Без чаго чалавек жыць не можа?
* Хто з барадой родзіцца?
* Што стаіць пасярод зямлі?
* Пад які куст заяц садзіцца, калі ідзе дождж?
* На што каню хамут кладуць?
* За чым ядуць?

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

### Адкуль пайшлі беларусы

Калісьці яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень. Адзін раз пярун разыграўся і давай пыляць стрэламі ў гэты камень. Ад яго стрэлаў выскачылі тры іскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя іскаркі на ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася, і свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё праяснілася, дык і адзначылася — дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося ўсякае жыццё ў вадзе і на зямлі. І лясы, і травы, і звяры, і рыбы, а пасля і чалавек завёўся: ці ён прыйшоў аднекуль, ці вырас хутка.

Гэты жыхар стаў заводзіць свае чалавечыя парадкі. Ці доўга ён так жыў, ці мала, але меў ён ужо сваю сялібу і шмат дзяцей. Было яму

прозвішча Бай. А як прыйшла яго гадзіна смерці, дык ён склікаў сваіх сыноў і падзяліў сваю маёмасць. Толькі аднаго сына забыў.

Той у гэты час быў на паляванні, і з ім былі любімыя бацькавы сабакі Стаўры і Гаўры. Прозвішча гэтаму сыну было Белаполь.

Неўзабаве пасля смерці бацькі вярнуўся Белаполь з палешні. А браты яму кажуць:

— Вось бацька падзяліў нам усю сваю маёмасць, а табе ён адказаў сваіх сабак, дык яшчэ наказаў, каб ты іх пусціў па волі: аднаго — у правы бок, а другога — у левы; колькі яны зямлі аббягуць у дзень, дык гэтая ўся зямля твая будзе.

Вось пайшоў Белаполь і злавіў дзвюх птушак, адна з якіх прыляцела з паўднёвага мора, другая — з заходняга. Пусціў адну птушку на поўдзень, ды і кажа першаму сабаку: «Бяры!»

Пусціў другую на захад і кажа другой: «Хапай!»

Як паляцелі тыя птушкі: адна ў адзін бок, другая ў другі... Як пабеглі сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася... Як пайшлі тыя сабакі, дык і да гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а ў другі бок — Дняпро.

Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца ды заводзіць свае лады...

У гэтага Белаполя ад розных жонак яго развяліся розныя плямёны пад прозвішчам БЕЛАРУСЫ.

## Возера Нарач

У гушчары старых бароў, як сляза, што ўпала з неба, блішчала вялікае возера. Вельмі прыгожае яно было. Расказы пра яго чароўнасць перадаваліся з паселішча ў паселішча і нават у далёкія краіны.

А яшчэ казалі людзі, што ў вёсцы, якая прыляпілася да аднаго з берагоў таго возера, жыла дзяўчына-сіраціна Найрыта, аднавяскоўцы звалі яе Нарай. Вочы яе блакітныя, колеру азёрнай хвалі, заўсёды весела ўсміхаліся. Залацістыя валасы тугой касой абкручвалі галаву. Голас у яе быў высокі і гучны. Бывала, сядзе на беразе пад разлапістым клёнам, дзе збіралася звычайна моладзь, на гусельках грае і спявае. Спачатку голас павольна плыве, а пасля ўзлятае высока і ляціць над узбярэжжам. У гэты час і птушкі змаўкалі. Людзі забываліся пра сваё гора.

Аднойчы, калі Нара спявала, праязджаў вёскаю пан, стары ўдавец. Пачуў ён дзівосную песню і загадаў спыніць каня. Слухаў, слухаў і сказаў Нары:

— Прыгожая кветка вырасла ў дзікім краі. Табе толькі спяваць у маіх пакоях.

— Кепская з мяне будзе служанка.

— Ты будзеш гаспадыняй, жонкай маёй.

Вакол Нары сядзелі на зялёнай мураве дзяўчаты і хлопцы. Адзін з іх, чарнявы юнак, падышоў да пана.

— Гэта мая нявеста,— сказаў ён,— а пан няхай сярод паноў жонку шукае.

— Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? — успомніў пан, чырванеючы ад злосці. І залямантаваў: — Узяць яго!

Прыслужнікі звязалі Андрэя і павезлі ў маёнтак. Больш яго ніхто не бачыў. Праз некаторы час пан зноў прыехаў да Нары даведацца, ці згодная яна прыняць з ім шлюб. Дзяўчына зрабіла выгляд, што згадзілася. Тут і дамовіліся пра вяселле.

Надышоў гэты дзень. Злосны вецер гнаў цёмныя хмары, а лес спяваў жалобныя песні. Нара ехала на фурманцы ў маёнтак, у руках трымала пакунак. Сустрэлі яе служанкі. Завялі ў панскія пакоі і апранулі ў шлюбнае адзенне. І Нара выйшла такой прыгажуняй, якія толькі ў казках і бываюць. Пакланілася яна пану ды папрасіла, каб перад шлюбам крышку адной пабыць у пакоях. Пан згадзіўся. Ходзіць ён па двары, на служанак пакрыквае і на дзверы паглядвае.

А Нара тым часам з пакунка дастала смалякі ды падпаліла пакоі адзін за адным. І калі шугануў чорны дым з вокнаў, а на даху заскакалі чырвоныя пеўні, выскачыла праз акно і на сваёй фурманцы, паганяючы каня, памчала ў вёску, на тое месца, дзе з Андрэем часта сустракала ўсход сонца, прыхілілася да клёна і горка заплакала.

Ды тут пачуўся конскі тупат. Панскія служкі людзей бізунамі білі, дапытваліся, дзе Нара.

— Вунь яна! — закрычаў нехта.

— Жывую не возьмеце,— крыкнула ворагам дзяўчына і кінулася да возера.

Цёмныя хвалі з белымі баранчыкамі ішлі адна за адной, а на беразе калыхаўся човен. Той човен, у якім Нара з Андрэем не раз каталіся. Спрытна і ўмела ўхапілася яна за карму і, адштурхнуўшыся ад берага, села ў човен.

— Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку, — прашаптала Нара.

Ад злосці панскія служкі кінулі гуслі ў возера. А човен адплываў усё далей і далей, потым зусім знік. Усю ноч бушавала возера. Стагналі хвалі...

З таго часу і назвалі людзі возера імем смелай дзяўчыны — Нарач.

## Месяц

Былі ў бацькі два сыны, два ўдалыя малойцы. Не захацелі яны жыць дома, рабіць чорную мужыцкую работу, а пайшлі ў свет шукаць лёгкага хлеба ды добрага жыцця. Выйшлі яны з дому разам дый пайшлі па адной дарозе, але хутка падышлі да раздарожжа. От большы і кажа:

— Чаго нам хадзіць разам? Разам мы знойдзем толькі адно дабро, а як пойдзем асобна, то можам трапіць на два.

— Хадзем асобна, — пагадзіўся малодшы брат, — але калі хто на што-небудзь натрапіць, што дабудзе, то тое будзе яго, тое зробіць яму славу.

Як сказалі яны, так і зрабілі. Большы пайшоў направа, а меншы — налева. Свет вялікі. Доўга яны хадзілі, доўга шукалі шчасця; кожны па-свойму шукаў тое, што яму падабалася. Большы брат прыйшоў у чужое царства, наняўся там на службу да аднаго багатага і знакамітага пана. А той пан ездзіў аж да самога цара дый браў з сабою свайго вернага ды лоўкага слугу. Пабачыў раз яго цар, упадабаў дый забраў да сябе. Жыве большы брат у цара пан панам, усяго яму даволі, хіба ж птушынага малака не хапае. Жыве, ніякай бяды не ведае.

Доўга хадзіў і малодшы брат па ўсім свеце, шмат бачыў і добрага, і ліхога, але ліхога больш, чым добрага. Яму не хацелася сядзець ды спажываць тое дабро, якое меў, але хацелася ўсё ўбачыць, усё паспрабаваць, ці то салодкае, ці то горкае. От так ён хадзіў як непрыкаяны, пакуль натрапіў і сам туды, дзе быў большы брат. І пачаў ён там вучыць людзей, як на свеце жыць, каб усім было добра, каб усе былі шчаслівыя. Пайшлі пра яго гаварыць вакол, пачалі да яго збірацца людзі ды слухаць разумныя рэчы. Дачуўся большы брат, пайшоў і ён паглядзець, які такі з'явіўся мудрэц, што вучыць ды бунтуе людзей. Прыйшоў, але не пазнаў брата, паслухаў дый данёс цару, што з'явіўся такі-сякі чалавек, які бунтуе народ. Узлаваўся цар дый загадаў схапіць бунтара. Захацеў большы брат яшчэ лепей выслужыцца перад царом, сабраў хеўру царскіх слуг, пайшоў ды забіў меншага брата.

Але яму стала так прыкра і страшна, што не ведаў, куды дзецца.

От бяжыць ён аб ноч паўз лес, зірне на Месяц, аж і той бяжыць, пераймае яго. Ён стане, дык і Месяц стане. Ён пабяжыць, дык і Месяц пабяжыць. Бег ён, бег, пакуль не выбіўся з сілы ды не ўпаў. Ляжыць ён ды пазірае на Месяц. Прыгледзеўся, аж там і бачыць, як брат забівае брата. Тады ён і здагадаўся, каго гэта забіў сваімі рукамі. Але тут і дух з яго далоў.

З тых часоў заўсёды відаць, што на Месяцы стаіць брат над забітым братам.

## Адкуль зязюля ўзялася

Калісьці праз вякі ў нашым краі жыў багаты зямянін — Властам яго звалі, і меў ён тры дачкі: Мляву, Здану і Зязюлю, як кветкі красныя, ладныя, як птушкі, але крашчая за ўсіх то Зязюля была. За гэта завідушча Млява проціў Зязюлі зло на вуме мела.

Раз, пад вечар, пасля спякоты, прыбягае Млява да сясцёр і кажа:

— Сястрычкі, кветачкі, пойдзема на возера купацца!

Тыя, вядома, як дзяўчаты,— рады падурэць, кінуліся навыперадкі. Зязюля апярэдзіла ўсіх, бо спраўнейшая была; за ёю і Здана пабегла.

Кінуўшы вопраткі на беразе, паскакалі ў ваду і давай пялёскацца, а Млява тым часам спраўна ўвіхнулася: вопратку Зязюльчыну скраўшы, пата-

піла ў возера і сама, як бы нічога не ведаючы, палезла купацца.

Купаюцца гэта яны, ажно загрымела — зірк! — бура, навальніца надыходзіць.

— Сястрыцы, уцякайма! — крычыць Млява і, не чакаючы другіх, схапіўшы вопратку, духам дамоў. За ёю і Здана паджгала. А Зязюля ходзіць па беразе, рукі ломіць, усё вопраткі шукае, шукае ды глядзіць. А вецер-то свішча, а на неба аж страх глянуць: хмары з рэхатам адна на другую пруцца, барукаюцца, варочаюцца,— няйначай як у гаршку. Ходзіць Зязюля, галосячы,— зірк! — з-за куста паніч выходзіць — красен, што крашчага ў свеце не знайсці, і вопратку Зязюльчыну ў руках трымае. Зязюлька хацела ўцякаці, але, глянуўшы яму ў вочы, стала як прыкована і глядзіць, вачэй адвесці не можа; штось да яго цягне, а сэрца як бы чым цёплым аблілося, а яшчэ як загаварыў, дык Зязюля не вытрымала — кінулася яму на шыю. І забраў той закляты княжыч Зязюлю да сябе ў крыштальныя палацы, у возера.

Жывуць яны ў шчасці, што лепшага і не згадаць, год, другі і трэці, а далей — згадала Зязюля бацькоў, і захацелася ёй пераведаць іх, і просіць мужа:

— Саколе мой ясны, пусці мяне дадому збегаць, бацьку ды маці пацешыць!

Той хоць нехаця, але дазволіў і кажа:

— Глядзі, Зязюля, не баўся, перад ноччу назад вяртайся, і як прыйдзеш на бераг, то клікні

тройчы: «Якуб!» — і выплыве вуж вялізны, а ты не лякайся яго, бо то я буду і забяру цябе!

Прыйшла гэта Зязюля да бацькоў, а тыя радыя — не знаюць, як яе прымаці: на кут пасадзіўшы, белым пірагом ды салодкім мёдам трактавалі. А Мляву, гледзячы на тое, яшчэ горш зло бярэ. Як толькі маці з Зязюляю засталіся самі ўдзвюх, стала маці пытаціся, дзе яна жыве, як і з кім, як яго зваці. Тая, бедная, вядома, як матцы, і выказала ўсё, а таго не ведала, што Млява пад дзвярыма ўсё чуе. Прагаварылі так да вечара і не агледзеліся, як стала цямнець.

Тады бачыць Млява, што Зязюля да мужа збіраецца, сама, узяўшы тапор, чым дужа — на бераг і кліча:

— Якуб! Якуб! Якуб!

Ён, небарака, не распазнаўшы голасу, выплыў, а яна як трэсне тапаром яго па галаве, так напалам і рассекла, а сама наўцёкі. Счакаўшы крыху, прыбягае і Зязюля, але, знаць, сэрцам чуе нядолю, бо і губы пабялелі, і ручкі чагосьці трасуцца, а сэрца аж здалёк чуваць, як калоціцца. Стала на беразе і кліча:

— Якуб! Якуб! Якуб!

І жаласць бярэ яе вялікая... З той вялікай жаласці зрабілася яна птушачкай, і ляціць Зязюля на вярбу, з вярбы ў лес, і так з дрэва на дрэва ляціць і кліча:

— Якуб! Якуб! Якуб!

## Адкуль узяўся мядзведзь

Ці ведаеце вы, адкуль узяўся мядзведзь?

Мядзведзь перш быў такі самы мужык, як і ўсе мы, гарапашнікі.

Даўно тое здарылася. Людзей тады было мала. Гэта цяпер так народу намножылася, што ледзь зямля іх падымае. А даўней людзі жылі сям-там па лесе, лавілі звера, птушак, а ў азёрах ды рэках — рыбу. Улетку збіралі ягады або капалі карэнне, рабілі запасы на зіму. Больш за ўсё запасалі арэхаў і мёду. Пчол тады было багата. Яны самі вадзіліся ў дуплах і ў земляных норах. Па лесе і цяпер яшчэ ёсць пчолы ў дуплах. Дык вось людзі і шукалі такіх пчол, і хто першы знаходзіў, таго і былі тыя пчолы. Ён абвязваў дрэва, на якім вяліся пчолы. Лічылася, што гэтыя пчолы ягоныя, а таму ніхто не мог іх чапаць.

Але жыў сярод людзей адзін гультаяваты мужык. Яму не хацелася самому шукаць пчол, дык ён прымудрыўся выдзіраць чужыя. Толькі цяжка яму было ўзлазіць на дрэва. І пачаў ён шукаць ведзьмара.

За сямю лясамі ды за сямю балотамі меўся такі вядзьмар. Вось і пайшоў гультаяваты мужык да яго. Ідзе ён ды ідзе лясамі, бачыць — ліпа абвязана; думае — пчолы. Падышоў бліжэй, зірнуў, аж дупло зусім нізка, а ў дупле — мёд. Выдраў гультай пчол і пайшоў далей. Бачыць — другое

дрэва абвязана. Выдраў ён і тут пчол. Сыты і задаволены, падыходзіць гультаяваты мужык да вядзьмаравае зямлянкі. Таго якраз не здарылася дома. Глядзіць мужык, аж тут пры самай зямлянцы ў дрэве пчолы. Давай гэта ён і тых пчол выдзіраць.

Але тут вядзьмар з'явіўся. Зірнуў на чужога чалавека і кажа:

— Раз пагаліўся на чужое, дык з гэтае пары і ты, і твае дзеці, і ўсё тваё кодла будзеце толькі пчол драць!

Абярнуў вядзьмар таго гультаяватага мужыка ў мядзведзя.

Дык вось адкуль узяўся мядзведзь.

## Паданне пра заснаванне Менска

Між Татарскім канцом і Пярэснінскім мастком, ля самага Віленскага паштовага шляху, некалі пасяліўся славуты асілак-знахар па празванні Менеск, ці Менскі, і пабудаваў на Свіслачы вялікі каменны млын на сем колаў. Ніхто самога Менеска не бачыў, тым не менш у навакольных мясцовасцях свіслацкай зямлі чуваць былі самыя фантастычныя расказы пра яго сілу. Кажуць, што ў яго млыне мука малолася не з жыта, а з камення, што ўначы чуліся нейкія дзіўныя крыкі, галёканне, песні, музыка і скокі, што апоўначы ездзіў ён на сваім млыне па селішчах і набіраў дружыну з харобрых, смелых, дужых людзей, з

якіх пазней утварыўся цэлы народ і пасяліўся побач з млыном.

Тут і быў заснаваны горад і названы імем волата — Менск.

## Адкуль Нясвіж

Нясвіж стаіць ужо больш за сем з паловай стагоддзяў. Заснаваў яго князь з роду Рурыкавічаў. А адкуль пайшла назва горада, людзі расказваюць так. Як вядома, любімымі заняткамі князёў у вольны час былі паляванне і розныя там забавы. Навокал княжага замка некалі далёка прасціраліся дрымучыя лясы ды непраходныя балоты. Аднойчы князь разам са сваёй чэляддзю паляваў на мядзведзяў. Адзін звер быў паранены, але ўцёк у гушчар лесу. Праз колькі дзён князь зноў быў на паляванні ў тым баку. Адзін з яго стральцоў знайшоў ужо мёртвага мядзведзя. Князь пад'ехаў да яго, агледзеў ды і кажа: «Ня свеж». Вось і пачалі тое месца называць Нясвіж.

## Як нарадзіліся Нёман і Лоша

Пра Нёман расказваюць так. Даўно гэта было. Недалёка ад вёскі Забалацце, што на нашай Уздзеншчыне, з-пад вялікага лазовага куста выбілася крынічка. Вада ў ёй была халодная, як лёд, а чыстая, як дзявочая сляза. Вада тая ўсё прыбывала, большала, аж пакуль не пабегла па двух ручайках. Так вось нарадзіліся рэкі Нёман і Лоша.

Нёман быў шчыры і крэпкі хлапец, а Лоша ціхая, лянівая і хітраватая дзеўка. Яшчэ больш падужэўшы, Нёман аднойчы сказаў Лошы:

— Раздолля трэба мне, волі захацелася. Буду як мага прабівацца да мора.

Нічога не сказала на гэта Лоша, толькі сама сабе надумалася навыперадкі бегчы з Нёманам і першай выскачыць да мора.

Назаўтра, калі яшчэ не развіднела, яна ціхенька ўстала і пайшла па нізінах ды па далінах да мора.

Прачнуўся Нёман, угледзеў, што Лошы няма, ну і кінуўся наўздагон, не разбіраючы дарогі, напрасткі.

З таго часу ён так і ляціць, пасяшае да мора, магутны і шырокі, а Лоша плыве сабе ціха, хаваючыся ды туляючыся па кустах і нізінах.

## Пра возера Свіцязь

Калісьці ўладаром возера быў мірскі князь. І вось ён задумаў даведацца, ці праўда, што на дне возера стаіць затоплены горад Свіцязь, як гэта гавораць у народзе.

Рыхтаваўся ён тры тыдні. Пабудаваў вялікі карабель, сплёў невад, паклікаў ксяндза. І вось, калі закінулі невад і пачалі выцягваць яго, то быў ён лёгкі. Рашылі, што нічога няма. Але, калі выцягнулі апошняе крыло, убачылі ў нераце цудоўную дзяўчыну з белым тварам, доўгімі распушчанымі валасамі. Адны ад здзіву аня-

мелі, другія кінуліся ўцякаць. Тады дзяўчына загаварыла голасам, падобным да голасу ручая, які бег у гэтае возера:

— Вы задумалі дзёрзкую справу, парушылі спакой возера. Але я раскажу вам пра яго. На тым месцы, дзе сёння возера, стаяў некалі горад. Князь, які валодаў горадам, быў у хаўрусе з навагрудскім князем Міндоўгам. Аднойчы напаў на Навагрудак з магутным войскам суседні цар. Князь разам са сваёй дружынаю паехаў на дапамогу Міндоўгу. У горадзе засталіся старыя, жанчыны, дзеці і сярод іх прыгожая князева дачка. Магутнае войска Міндоўга і княскае войска разбілі, і ворагі падышлі да горада Свіцязя. Тады перад князёўнай з'явіўся аднекуль стары і сказаў, што ператворыць горад у возера, а людзей у кветкі. Горад сапраўды адразу пачаў знікаць, а на месцы яго разлілося возера, па якім плавалі цудоўныя кветкі-цары.

Расказаўшы гэта, дзяўчына знікла. Больш яе ніхто ніколі не бачыў. Як успамін пра гэта, кожную вясну цвітуць на возеры кветкі-цары.

## Адкуль сяляне і паны

Бог зляпіў пана з пшанічнага цеста, а мужыка — з гліны ды, паклаўшы, каб сохлі, пайшоў абедаць. А пад той час — дзе ён узяўся! — прыбег сабака, просты мужыцкі падваротнік, панюхаў мужыка, шкрабануў усімі лапамі і, дабраўшыся да пана, чыста яго з'еў. Толькі

стаў аблізвацца, калі вось прыходзіць Бог. Як пабачыў ён, што зрабілася, то, ухапіўшы сабаку за хвост, давай трусіць. З сабакі і пасыпаліся паны, і пабеглі куды папала, а дзе які спыняўся, так Бог яго і называў. Спыніўся пад бярозаю — пан Беразоўскі, пад дубам — пан Дубінскі, пад сасною — Сасноўскі, пад елкаю — Ельскі, пад алешынаю — Альшынскі, пад гарою — пан Падгорскі, а як каторы ачуўся за балотам або за ракою, то пан Заблоцкі і пан Зарэцкі.

Дык вось адкуль сяляне і паны.

## Адкуль пайшлі буслы

Было гэта вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што не стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёле. І парашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, патапіць у якойсьці бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мяшок, завязаў, узваліў на плечы аднаму неразумнаму чалавеку і загадаў укінуць у паказанае прадонне. Як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, засіпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць, што ён такое прэ.

Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распаўзліся ізноў па зямлі.

Разгневаны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і зага-

даў збіраць гадаў-уцекачоў усё яго жыццё аж да самай смерці.

І ходзіць гэтыператвораны ў бусла чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтае пары ніяк сабраць не можа. З прычыны сваёй крэўнасці да чалавека гэты пярэварацень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.

## Дуб і сасна

Па дарозе ў Нясвіж растуць, абняўшыся, два дрэвы — дуб і сасна. Кажуць, было гэта яшчэ за князем Радзівілам. У князя была прыгожая дачка,і пакахала яна пастуха. І пастух яе таксама кахаў. Але пажаніцца яны не маглі, князь пра такое і слухаць не хацеў. І вось яны рашылі ўцячы з замка. Даведаўшыся пра гэта, князь разгневаўся, кіламетраў за шэсць дагнаў іх са сваёю світаю. Не пашкадаваў князь ні дачкі, ні пастуха: там і пакончыў іх жыццё. На тым месцы выраслі дуб і сасна, якія і цяпер растуць, навекі абняўшыся.

## Чаму воўк з сабакам ды з кошкай і мышкай варагуюць

У часы старадаўнія воўк, сабака, кошка і мыш жылі між сабою дружна, не варагавалі, адзін за аднаго стаялі і ні ў чым патрэбы не мелі.

Раз ваўку давялося некаторы час пагаладаць: не было харчоў. І расстараўся ён сабе грамат-

ку — прасіць хлеб па вёсках і па сёлах. З гэтаю граматаю воўк і пайшоў жабраваць.

Па дарозе мусіў ён перайсці па кладцы цераз нейкую рачулку ды зваліўся ў ваду і так замачыў сваю грамату, што яе немагчыма было разгарнуць, не прасушыўшы. Дабег воўк да бліжэйшай вёскі, ускочыў у першую хату, папрасіў там гаспадарскага сабаку дапамагчы яму і высушыць прамоклую грамату, а сам, таксама мокры, пайшоў сушыцца ў ёўню. Сабака адразу, як мага асцярожна, разаслаў грамату на градцы і, сам не маючы часу, даручыў кошцы перадаць гэтую паперу ваўку, калі ён па яе прыйдзе.

Між тым кошка заснула, прасохлая грамата ўпала з градкі на зямлю і трапіла ў зубы да мышкі, што тут якраз прабягала. Тая, не ведаючы, што гэта за папера, згрызла яе амаль усю, а шматкі, якія засталіся, зацягнула ў сваю норку.

Калі воўк вярнуўся ў хату і даведаўся пра ўсё, дык пачаў лаяць сваіх таварышаў. Ніхто з іх не хацеў прызнаць сваю правіну, і яны ўсе між сабою перасварыліся ўшчэнт. Воўк быў у роспачы, бо новай граматы яму не маглі даць. Завыў ён, бедны, немым голасам і злосна накінуўся на сабаку, які ледзьве вырваўся. Тады раззлаваўся сабака ды кінуўся на кошку і не выпусціў яе з лап, пакуль не пакусаў дашчэнту. Тут кошка накінулася на мыш, якая найбольш і правінілася.

З таго часу і варагуюць воўк з сабакам ды з кошкай і мышкай.

## Чаму заяц, ліса ды воўк разам не сыходзяцца

Калісьці ўсе пушчанскія звяры жылі ў вялікай згодзе. Часта збіраліся разам на якой-небудзь паляне на свае звярыныя сходы-зборы, таксама і ў госці хадзілі адзін да аднаго. Але здарылася вось што.

Аднойчы пагнаў хлопчык пасвіць козы. Гоніць іх, гоніць дарожкаю каля агародаў, а тыя козы — скок! — і ў агарод, і да капусты. Давай хлопчык іх выганяць. Гоніць-гоніць і выгнаць не можа. Сеў на мяжы і плача.

Бег узмеж агародаў зайчык, убачыў хлопчыка, як той горка плача, пытаецца ў яго:

— Чаго плачаш, хлопча?

— Як мне не плакаць! — праз слёзы той кажа. — Вунь улезлі козы ў капусту, і аніяк не магу іх выгнаць.

— Не плач, — яму зайчык на тое, — пайду я выганю.

Гнаў зайчык коз, гнаў і аніяк выгнаць не можа: ядуць козы капусту, ажно бароды ў іх трасуцца. Сеў зайчык каля хлопчыка і таксама заплакаў.

Бегла мяжою ліса, убачыла зайчыка ды пытаецца:

— Чаго плачаш, зайчык?

— Плачу я, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода выгнаць не можа.

— Не плачце, — суцяшае іх ліса. — Я іх зараз выганю.

Гнала-гнала ліса коз з агарода, а тыя і слухаць яе не хочуць: жумраць капусту, аж за вушамі трашчыць. Села ліса каля зайчыка ды заплакала.

Бег воўк, убачыў, як у лісы слёзы з вачэй коцяцца, ды пытаецца:

— Чаго плачаш, ліска?

— Плачу я, бо зайчык плача, зайчык плача, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода аніяк выгнаць не можа.

— Не плачце, — прамовіў воўк. — Я іх мігам выганю.

Кінуўся ён да коз, гнаў іх, гнаў, а тыя хоць бы што: цярэбяць капусту, дый годзе. Сеў воўк каля лісы ды зароў.

Па-над агародамі ляцела маленькая пчолка. Убачыла яна, як воўк слёзы пралівае, пытаецца:

— Чаго плачаш, воўча?

— Плачу я, бо ліса плача, ліса плача, бо зайчык плача, зайчык плача, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода аніяк выгнаць не можа.

— Не плачце, — празвінела пчолка, — я іх умомант выганю.

Падляцела пчала да першай казы і — бзом-бзом ёй у вуха, потым да другой — бзом-бзом, затым да трэцяй — бзом-бзом і так усім козам у вушы набзомкала. Застрыглі козы вушамі, затрэслі галовамі, задзерлі свае куртатыя хвасты ды далі драпака з агарода.

Звярам ніякавата зрабілася, што маленечкая пчолка мацнейшая за іх, вялікіх. Разбегліся яны хто куды ад сораму і дагэтуль не сыходзяцца разам.

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ

### Каток — залаты лабок

Жыў дзед з бабай. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць.

Вось баба і кажа дзеду:

— Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі гарчык мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок. Выскачыў з дуба каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзеду, дзеду, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак, паслала мяне баба ссекчы дубок, завезці на рынак, прадаць і купіць гарчык мукі на хлеб.

— Едзь, дзед, дахаты, будзе ў вас мука!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго мукі поўныя засекі.

Спякла баба хлеб, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і заціркі наварыць. Ды солі няма. Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у

лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго солі.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзеду, дзеду, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць — солі няма!

— Едзь, дзед, дахаты, будзе соль!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго солі цэлая дзежка стаіць.

Наварыла баба заціркі, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і капусты паспытаць. Вастры, дзеду, тапарок, едзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго капусты.

Навастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзеду, дзеду, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць, соль ёсць — капусты няма!

— Едзь, дзед, дахаты, будзе капуста!

Прыехаў дзед дахаты, а ў яго капусты поўная кадушка!

— Ай, як добра! Вось каб цяпер яшчэ сальца... Мы б з табою капусты наварылі, сальцам закрасілі б. Не палянуйся, дзеду: вазьмі тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго сальца.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзеду, дзеду, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: просіць баба яшчэ сальца да капусты.

— Добра, дзед, едзь дахаты, будзе сала.

Прыязджае дзед дахаты, а ў яго сала цэлы кубелец! Рады дзед, рада баба. Сталі яны жыць ды пажываць, дзецям казкі казаць. І цяпер жывуць, хлеб жуюць, капустаю з салам закусваюць.

Вось вам казка, а мне абаранкаў вязка.

## Ад крадзенага не пасыцееш

Былі ў аднаго чалавека два сыны. Як выраслі яны, бацька сказаў:

— Пара, сыны, за сталую работу брацца. Хто з вас чым хоча заняцца?

Маўчаць сыны — не ведаюць, якую сабе работу выбраць.

— Ну, дык пойдзем,— кажа бацька,— у свет, паходзім, паглядзім, што людзі робяць.

Сабраліся і пайшлі.

Ідуць так памаленьку, сыны да ўсяго прыглядаюцца, думаюць, якую работу ім выбраць.

Падышлі да адной вёскі. Бачаць — стаіць пры канцы вёскі кузня. Зайшлі яны ў кузню. Прывіталіся да каваля, пагаварылі. Старэйшы сын нават молат у рукі ўзяў — памог кавалю нарог выкаваць.

І зноў далей рушылі.

Падышлі да другой вёскі. Старэйшы сын паглядзеў туды-сюды: не відаць кузні ў гэтай вёсцы. Вось ён і кажа да бацькі:

— А чаму б і тут кузню не паставіць? Я мог бы за каваля застацца. Мне гэта работа падабаецца.

Бацька зарадаваўся: знайшоў, думае, большы сын сабе спосаб да жыцця!

— Добра,— кажа,— будзь кавалём у гэтай вёсцы.

Паставіў ён сыну кузню, той і пачаў кавальскаю справаю займацца. Людзі яго хваляць, і сам ён сваёю работаю задаволены.

А меншы сын, колькі ні ходзіць,— ніяк не можа работу па густу выбраць.

Ідзе ён аднаго разу з бацькам каля лугу. Бачыць — пасецца на лузе вол. А вёска далекавата, і пастуха не відаць.

— Ці не пачаць мне, бацька, валоў красці? — кажа сын.— Работа гэта лёгкая, і кожны дзень з мясам буду. Растаўсцею і сам, як вол.

— Крадзь,— кажа бацька.— На тое ж я цябе і ваджу, каб ты сабе які сталы занятак выбраў.

Заняў сын вала і пагнаў дахаты. А бацька кажа:

— Пачакай мяне пры лесе — мне трэба яшчэ ў гэтую вёску заглянуць: там адзін мой знаёмы жыве...

Гоніць сын вала ды ўсё азіраецца, як воўк, ці не бяжыць хто за ім. Пакуль да лесу дагнаў, дык добра такі перадрыжаў. Аж млосна ад страху зрабілася.

Пачакаў ён на ўзлеску, пакуль бацька вярнуўся, і пагналі разам вала дахаты.

Зарэзалі дома вала, знялі шкуру ды пачалі варыць свежаніну.

Наварылі, бацька кажа сыну:

— Вось што, сынку, давай знімем меркі і паглядзім, хто з нас ад гэтага вала пасыцее.

Узяў ён шнурок, змераў шыю сабе і сыну і завязаў вузельчыкі.

Селі за стол. Бацька есць спакойна, а сын усё на дзверы паглядае: ці не ідзе хто вала шукаць? Забрэша сабака, пройдзе ці праедзе хто — сын за мяса ды ў каморку хаваецца... А ў самога рукі і ногі дрыжаць.

І пайшло так дзень за днём.

З'елі нарэшце таго вала. Бацька кажа сыну:

— А цяпер давай шыі мераць: хто з нас пасыцеў?

Памералі, дык у бацькі шыя ўдвая патаўсцела, а ў сына ўдвая патанчэла. Дзівіцца сын:

— Чаму гэта так?

— Бо ты еў крадзенага вала,— кажа бацька.

— Дык жа і ты крадзенага еў!

— Не, я заплаціў за вала гаспадару і еў, як свайго. Таму я і пасыцеў. А ты як сядзеш за стол, дык страх адразу на шыю скок і душыць! Праз гэта яна і худзее. Ад крадзенага, брат, не пасыцееш!

## Стары бацька

Кажуць: што край, то звычай, што сяло, то нораў, а што галава, то розум. У адным месцы быў звычай — дабіваць старых людзей, каб яны дарма не елі хлеба, калі не могуць працаваць.

Часамі і самі старыя прасіліся, каб іх дабівалі, бо, ведама, ім цяжка было лыпаць вачыма, чакаць, пакуль ім дадуць есці або піць. От жыў адзін чалавек, у яго многа было дзяцей, ды ўсе ўдалыя, добрыя. Зусім састарыўся бацька, а яны яго слухаюць, шануюць. Але от давай суседзі прыставаць, каб яны дабілі свайго бацьку-дармаеда, бо ён ужо вельмі стары і ні да чаго не гож. Шкода дзецям старэнькага бацькі. І схавалі яны яго ў пограб дый носяць яму туды цішком есці і піць. Доўга жыў стары ў пограбе. Ляжыць сабе на саломе і Богу моліцца, а як суседзі разыдуцца на працу — ён высунецца з пограба, паглядзіць на яснае сонейка, пагрэецца й зноў схаваецца ў пограб. Малыя ўнукі і праўнукі прынясуць яму туды суніц або другіх ягад, а ён есць і кажа ім казкі. А то забягуць да яго маладзіцы або дзяўчаты, пяюць яму ў пограбе песні, чэшуць голаў. А сыны,

ужо барадатыя, часта прыходзяць да старэнькага бацькі пагаварыць пра гаспадарку ды пытаюць старога: калі і што дзе сеяць, як лепш абрабляць поле, як даглядаць жывёлу. Старэнькі ўсё ім кажа, усяму навучыць. Жыве сабе стары бацька, а дзеці дый унукі рады. Але вось настаў там вялікі голад. Прапаў блізу ўвесь статак. Пухнуць людзі з голаду, жыватамі качаюцца — няма за што рукі залажыць. Панеслі дзеці старэнькаму бацьку апошні хлеб, а ён дый кажа ім, каб яны садралі з будынкаў стрэхі дый вымалацілі тую салому.

Паслухалі дзеці старэнькага бацьку, садралі стрэхі дый давай малаціць старую салому. Глядзяць, аж на таку так многа зярнят, што хваціць хлеба да новага ўраджаю. Пытаюць суседзі, адкуль у іх хлеб, а тыя і расказалі ім, што гэта іх навучыў стары бацька, каторага яны хаваюць у пограбе. Пашлі ўсе суседзі, старыя і малыя, у пограб к старэнькаму дый вынеслі яго на руках. Доўга яшчэ пасля таго жыў старэнькі бацька. От з тае пары годзе дабіваць старых людзей, а пачалі ім служыць, даглядаць іх ды шанаваць.

## Іліпка-сынок

Жылі мужык і жонка. А дзяцей у іх не было. Жонка бядуе: няма каго ёй калыхаць, няма каго гадаваць...

Аднаго разу мужык пайшоў у лес, высек з алешыны палена, прынёс дахаты і кажа жонцы:

— На, калышы.

Палажыла жонка палена ў калыску ды давай калыхаць і спяваць:

— Люлі, люлі, сынок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі...

Калыхала дзень, калыхала другі, на трэці бачыць: замест алешынкі ляжыць у калысцы хлопчык!

Зарадаваліся мужык і жонка, назвалі сына Піліпкам і сталі яго гадаваць.

Падрос Піліпка і кажа бацьку:

— Зрабі мне, тата, залаты чоўнік, срэбранае вясельца — хачу рыбу лавіць.

Бацька зрабіў яму залаты чоўнік, срэбранае вясельца ды выправіў на возера лавіць рыбу.

Сынок як лавіць дык лавіць — дзень ловіць і ноч ловіць... Нават і есці дахаты не ідзе: вельмі ж добра рыба ловіцца! Маці яму сама абед насіла.

Прынясе да возера і кліча:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Піліпка падплыве да берага, высыпле з чоўна рыбу, а сам з'есць піражок ды зноў на возера.

Пачула старая Баба Яга-касцяная нага, як маці кліча Піліпку, і парашыла яго са свету звесці.

Узяла яна мяшок і качаргу, прыйшла да возера і пачала клікаць:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Піліпка падумаў, што гэта маці, і падплыў. А Баба Яга падчапіла качаргою чоўнік, выцягнула на бераг, схапіла Піліпку — ды ў мяшок.

— Ага, — кажа, — больш не будзеш тут рыбку лавіць.

Закінула мяшок на плечы і панесла да сябе, у лясную гушчэчу. Доўга несла, змарылася, села адпачыць ды і заснула. А Піліпка тым часам вылез з мяшка, паклаў туды цяжкага камення ды зноў вярнуўся да возера.

Прачнулася Баба Яга, схапіла мяшок з каменнем і, крэкчучы, панесла дадому. Прынесла і кажа да сваёй дачкі:

— Спячы ты мне на абед гэтага рыбака.

Вытрусіла Баба Яга мяшок на падлогу, аж там адно каменне... Як узлавалася Баба Яга, як закрычыць на ўсю хату:

— Я ж табе пакажу, як мяне падманваць!

Зноў пабегла на бераг возера ды давай клікаць Піліпку:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Пачуў гэта Піліпка.

— Не, — кажа, — ты не мая маці, а Баба Яга. Я цябе ведаю! У маёй мамы голас танчэйшы.

Як ні клікала Баба Яга, Піліпка не паслухаў яе.

— Добра ж, — падумала Баба Яга, — зраблю я сабе танчэйшы голас.

Пабегла яна да каваля і кажа:

— Каваль, каваль, натачы мне язык, каб танчэйшы быў.

— Добра, — кажа каваль, — натачу. Кладзі яго на кавадла.

Палажыла Баба Яга свой доўгі язык на кавадла. Каваль узяў молат і пачаў кляпаць язык. Адкляпаў так, што ён зусім тонкі зрабіўся. Пабегла Баба Яга на возера ды кліча тоненькім галаском:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Пачуў Піліпка і падумаў, што гэта маці яго кліча. Падплыў да берага, а Баба Яга — цап яго ды ў мяшок.

— Цяпер ты мяне не падманеш! — радуецца Баба Яга.

І, не адпачываючы, прынесла яго дадому. Выкінула з мяшка і кажа дачцэ:

— Вось ён, падманшчык! Палі ў печы яго. Каб да абеду гатовы быў.

Сказала так, а сама пайшла некуды. Дачка запаліла ў печы, прынесла лапату і кажа Піліпку:

— Лажыся на лапату, я цябе ў печ саджаць буду.

Лёг Піліпка і падняў ногі ўгару.

— Не так! — крычыць ведзьміна дачка. — Гэтак я цябе ў печ не ўсаджу. Піліпка звесіў ногі ўніз.

— Не так, — зноў крычыць ведзьміна дачка.

— А як жа? — пытаецца Піліпка. — Пакажы сама.

— Дурны ты! — вылаяла яго ведзьміна дачка. — Вось як трэба. Глядзі!

Лягла яна сама на лапату, выпрасталася. А Пілiпка за лапату ды ў печ. І заслонкаю яе засланіў, каб не выскачыла з гарачай печы.

Толькі ён выбег з хаты, бачыць: Баба Яга ідзе. Пілiпка скокнуў на высокі густы явар і схаваўся ў галлі.

Зайшла Баба Яга ў хату, панюхала — смажаным пахне. Дастала з печы смажаніну, наелася мяса, косці на двор выкінула ды пачала качацца па іх, прымаўляючы:

— Павалюся, пакачуся, Піліпкавага мяса наеўшыся, крыві напіўшыся.

А Піліпка адказвае ёй з дрэва:

— Паваліся, пакаціся, даччынага мяса наеўшыся, даччынай крыві напіўшыся.

Пачула гэта ведзьма і аж учарнела ад злосці. Падбегла да явара і давай яго зубамі грызці, падгрызаць.

Грызла, грызла, зубы паламала, а моцны явар стаіць як стаяў. Пабегла тады Баба Яга да каваля:

— Каваль, каваль, выкуй мне сталёвую сякеру, а то я тваіх дзяцей паем.

Спужаўся каваль, выкаваў ёй сякеру.

Прыбегла Баба Яга да явара, пачала яго секчы. А Піліпка кажа:

— Не ў явар, а ў камень!

А ведзьма сваё:

— Не ў камень, а ў явар!

А Піліпка сваё:

— Не ў явар, а ў камень!

Тут сякера як стукнецца ў камень — уся і вышчарбілася. Заенчыла ад злосці ведзьма, схапіла сякеру ды пабегла да каваля вастрыць.

Бачыць Пілiпка — хістацца пачаў явар: падсекла яго ведзьма! Трэба ратавацца, пакуль не позна.

Ляціць чарада гусей. Піліпка да іх:

— Гусі, гусі, скіньце мне па пяру! Я з вамі палячу да бацькі, да маткі, там вам адплачу...

Гусі скінулі яму па пяру. Зрабіў Піліпка з гэтых пёраў толькі паўкрыла.

Ляціць другая чарада гусей. Піліпка просіць:

— Гусі, гусі, скіньце мне па пяру! Я з вамі палячу да бацькі, да маткі, там вам адплачу...

І другая чарада скінула яму па пяру.

Потым прыляцела трэцяя і чацвёртая. І ўсе гусі скінулі Піліпку па пяру. Зрабіў сабе Піліпка крылы ды паляцеў услед за гусямі.

Прыбегла ведзьма ад каваля, сячэ явар, аж трэскі сыплюцца. Секла, секла, явар — трах! — упаў на ведзьму і задавіў яе.

А Піліпка прыляцеў з гусямі дахаты. Зарадаваліся бацькі, што Піліпка вярнуўся, пасадзілі яго за стол, пачалі частаваць.

А гусям далі аўса. Тут і казка ўся.

## Залаты птах

Былі ў аднаго чалавека тры сыны: два разумныя, а трэці — дурны.

Старэйшы сын, Сцяпан, умеў на скрыпцы іграць, сярэдні, Піліп, — на дудцы, а меншы,

Іван, ні да чаго спрыту не меў: сядзеў у запечку ды лучынкі стругаў.

Вырасла ў таго чалавека ў садзе яблынька, а на ёй — залатыя яблыкі. Цешыцца бацька з яблыкаў, і сыны цешацца. Кожную раніцу ў сад ходзяць глядзець, ці цэлыя.

Праверылі гэтак аднаго разу — не хапае яблыка! І на другую раніцу не далічыліся аднаго яблыка...

Засумаваў бацька. «Відаць,— думае,— нейкі злодзей панадзіўся ў сад цягацца». Кажа ён старэйшаму сыну, Сцяпану:

— Ідзі ты, сынку, пільнаваць яблыкі.

Прыставіў увечары Сцяпан да яблыні драбіны, залез на іх, сядзіць ды на скрыпцы іграе. Усю ноч іграў, а пад дзень дужа спаць захацелася,— ён і задрамаў. Раптам праз сон чуе: нешта над галавою моцна зашумела, залопала. Прахапіўся Сцяпан, працёр вочы,— нідзе нікога няма, толькі аднаго яблыка не хапае...

Вярнуўся ён да бацькі маркотны.

— Не ўпільнаваў,— кажа,— злодзея: зноў адзін яблык сарваў...

На другую ноч сярэдні сын, Пілір, кажа:

— Пайду я пільнаваць. Быць таго не можа, каб не ўпільнаваў!

Пайшоў ён, прымасціўся на драбінах ды выцінае сабе на дудцы розныя полечкі. Усю ноч іграў, а пад дзень дужа спаць захацелася,— ён і задрамаў. Раптам праз сон чуе: нешта над га-

лавою моцна зашумела, залопала. Пакуль прачнуўся — зноў аднаго яблыка няма!

Брыдка яму ў хату ісці, ды што зробіш: не дапільнаваў злодзея.

На трэці дзень меншы сын, Іван, кажа:

— Дрэнныя з вас, браты, вартаўнікі. Вось я пайду, то на чым ні стане, а прыпільную злодзея.

Усе толькі пасмяяліся з яго гаворкі: ат, вядома, — дурань!

Набраў Іван цэлы жмут лучынак і пайшоў на варту. Сядзіць на драбінах, стружа лучынкі ды песенькі пад нос сабе мармыча. Пачало на дзень займацца. Чуе Іван — нешта здалёку зашумела. Стаіўся ён, углядаецца. Аж бачыць — ляціць да яблыні вялікі залаты птах. Падляцеў блізка і хацеў яблык схапіць, а Іван злаўчыўся ды цап яго за доўгі хвост! Вырваўся птах і паляцеў без яблыка. Глядзіць Іван, аж у яго руцэ тры залатыя пяры засталіся.

Прыбег ён у хату, пабудзіў усіх.

— Глядзіце,— кажа,— я злодзея дапільнаваў і тры залатыя пяры ў яго з хваста вырваў...

Паглядзелі браты і пачырванелі ад сораму, што не яны, а дурань славы даказаў. Узяла іх зайздрасць.

— Добра ж, — кажа старэйшы брат, — паеду я ў свет залатога птаха шукаць.

Узяў ён адно пяро для прыметы, набраў харчоў, грошай на дарогу ды паехаў.

Мінула, можа, з паўгода, а ні Сцяпана, ні птаха няма. Тады сярэдні брат кажа да бацькі:

— Паеду хіба я шукаць залатога птаха. Можа, заадно і брата знайду.

Набраў і ён усялякіх прыпасаў на дарогу ды паехаў. Мінуў цэлы год, а ні братоў, ні птаха і слыхам не чуваць. Бядуе бацька, а Іван стружа лучынкі ў запечку ды мармыча сабе пад нос:

— Трэба, мусіць, мне самому ў дарогу выбірацца.

Падумаў бацька: «Што ж, прапалі разумныя сыны, няхай і гэты, дурань, прападае». І не стаў яму пярэчыць.

Нічога не ўзяў Іван з сабою: ні грошай, ні хлеба. Толькі ўзяў трэцяе пяро, кій у рукі і ножык-сцізорык, той, якім лучынкі стругаў. І пайшоў пехатою залатога птаха шукаць.

Ідзе ён, ідзе, а ўжо і вечарэць пачынае. Чуе ён воўчы голас недалёка.

Пайшоў на той голас. Бачыць — сядзіць у глыбокай яме старая ваўчыха.

— Ты чаго тут выеш? — пытаецца Іван у ваўчыхі.

— Ды вось бяда якая,— адказвае ваўчыха,— бегла на паляванне, а трапіла ў яму... Памажы мне, добры чалавек, выбрацца адсюль. Я табе, чым хочаш, адплачу. Іван кажа:

— Ты, старая ваўчыха, усюды гайсаеш, усюды бываеш: ці не скажаш мне, дзе жыве залаты птах? Калі скажаш, то вызвалю цябе з ямы.

— І скажу табе і нават завяду да яго,— просіцца ваўчыха.

— А не падманеш?

— Не.

— Ну, то глядзі.

Прынёс Іван дзве жардзіны сукаватыя, апусціў у яму. Выскачыла ваўчыха па жэрдках наверх і кажа Івану:

— Дзякую за ратунак. А цяпер сядай на мяне, я цябе хутчэй завязу туды, чым ты сам дойдзеш.

Сеў Іван на ваўчыху, тая і паджгала, не разбіраючы дарогі: па палях, па лясах, па балотных кустах. Іван толькі за вушы трымаецца, каб не скінуцца. Пераплылі мора. Бачыць Іван — стаіць на беразе мора залаты палац. Ваўчыха кажа:

— Ідзі ў гэты палац. Толькі паціхусеньку, памалюсеньку, каб нідзе і не шархнуў, бо гэта зачараваны палац: усё ў ім спіць. Але калі ты неасцярожна дакранешся да чаго, то ўсё абудзіцца, і тады жывым табе адтуль не выбрацца. Як увойдзеш у браму, убачыш там двух сабак. Яны на жалезных ланцугах да слупоў прыкуты. Глядзі ж, не пабудзі іх, бо як забрэшуць яны, то ўвесь палац на ногі ўзнімуць. Мінеш гэтак браму, увойдзеш у першы пакой. Там вісіць меч бразгучы. Ён залаты, дарагімі камянямі аздоблены. Але ты яго не чапай, бо ён пачне бразджаць і ўсіх пабудзіць. Увойдзеш у другі пакой, там вісіць гадзіннік пявучы, і яго не чапай, а ідзі проста ў трэці пакой: у ім убачыш залатую клетку, а ў той клетцы і сядзіць залаты птах. Вымі яго асцярожна з клеткі і сам варочайся да мяне.

Пайшоў Іван у зачараваны палац. Мінуў браму з сабакамі, увайшоў у першы пакой, у другі.

Бачыць — розных майстроў тут безліч: і сталяры, і слесары, і муляры. А каля іх варта з шаблямі ды стрэльбамі. І дзе хто што рабіў, там і заснуў. Падзівіўся Іван на іх ды пайшоў далей, у трэці пакой.

Вось перад ім і залатая клетка вісіць, а ў ёй залаты птах сядзіць. Як убачыў Іван птаха-злодзея, дык і на перасцярогу забыўся. Схапіў клетку, сарваў са сцяны. І тут такі звон пайшоў... Напалохаўся Іван ды назад. У другім пакоі зачапіўся знячэўку за залаты гадзіннік. Той давай спяваць, на ўсе лады выцінаць. Пабег Іван далей. Ускочыў у першы пакой, схапіў меч — вельмі ж ён прыгожы быў! А меч як забразджыць... Усё ў зачараваным палацы абудзілася. Усе кінуліся за Іванам. Ды Іван не драмаў — як страла праляцеў каля сабак і выскачыў з палаца.

Бачыць ваўчыха — бяда: Іван імчыцца на ўвесь дух, а за ім цэлая пагоня. Падскочыла да яго ваўчыха.

— Сядай, — кажа, — на мяне хутчэй!

Сеў Іван, а ваўчыха — у мора і паплыла. Пераплыў Іван мора і просіць ваўчыху:

— Скажы, дзе мае браты. Я не магу без іх дадому вярнуцца.

— Эх, — уздыхнула ваўчыха, — не шукай ты лепш братоў, бо яны цябе са свету звядуць.

— Не звядуць, — адказвае Іван.

— Ну, калі ты такі смелы, то ідзі на каралеўскі двор, — там твае браты ў астрозе сядзяць. Толь-

кі глядзі, сцеражыся іх... Яны табе дабра не жадаюць.

Развітаўся Іван з ваўчыхай, падзякаваў ёй і падаўся на каралеўскі двор. Прыйшоў да караля, прывітаўся.

— Што скажаш? — пытаецца кароль.

— Выпусці маіх братоў, — кажа Іван. — Навошта ты іх у астрозе трымаеш?

Кароль кажа:

— Не выпушчу. Твае браты хацелі лепшых маіх коней пакрасці.

Іван і так і сяк просіць — не згаджаецца кароль.

— Дык я выкуплю іх.

— Чым жа ты выкупіш?

Дастаў Іван з-пад світкі залаты меч:

— Вось табе выкуп.

Паглядзеў кароль на меч — спадабаўся: такога ў яго няма!

— Ну, добра, — згадзіўся кароль, — забірай сваіх братоў. Толькі больш не пускай іх у маё каралеўства.

Забраў Іван братоў, расказаў ім, як дастаў залатога птаха, і пайшлі ўсе разам дахаты. Прыйшлі яны ў цёмны лес, браты забілі Івана, а самі забралі залатога птаха ды пабеглі дамоў.

Шмат часу мінула ці не, здарылася трапіць у той лес ваўчысе. Чуе яна — дзесьці чалавек блізка. Пабегла ў той бок і ўбачыла забітага Івана.

— Вось, — бядуе ваўчыха, — як ты мяне паслухаў! А я ж табе казала, я ж цябе навучала: асцерагайся ліхіх братоў!

Пабегла ваўчыха на высокую гару, дастала пляшачку жывой вады. Вярнулася і ажывіла Івана. Устаў ён, пацягнуўся:

— Ох, як жа я доўга спаў!

— Спаць бы табе тут век-векам, каб не я,— кажа ваўчыха.

— А дзе ж мае браты? — пытаецца Іван.

— Дома. Спяшайся хутчэй і ты дадому. Там твой бацька з радасці, што браты вярнуліся і залатога птаха прынеслі, бяседу ладзіць. З'язджаюцца да яго нават паны і каралі на дзіва глядзець. Але бацька цяпер цябе не пазнае, бо ты змяніўся ад жывой вады. Дык ты, як прыйдзеш дахаты, папрасіся да кухара за памочніка. А як зварыцца страва, то ўпусці ў яе па кропельцы жывой вады.

Навучыла ваўчыха Івана, што яму рабіць, і пабегла.

Вярнуўся Іван дадому. А там і праўда госці збіраюцца. Кухар аж разрываецца адзін — шмат розных страў трэба наварыць ды напячы для гасцей. Падышоў Іван да кухара:

— Давай я табе памагаць буду.

— Добра, — згадзіўся кухар, — памагай, бо мне аднаму не ўправіцца.

Узяўся Іван памагаць. А потым і кажа кухару:

— Ты, дзядзька, стары, змарыўся, адпачні, а я ўжо сам усё скончу.

Бачыць кухар, што памочнік яго добра стараецца, і лёг адпачыць.

Згатаваў Іван абед, уліў у кожную страву па кроплі жывой вады і пабудзіў кухара. Той панёс абед да сталоў.

Бяседнікі ядуць і стравы хваляць — вельмі ж усё смачна згатавана! Пасля абеду кліча гаспадар кухара, дае яму гасцінца і дзякуе за смачныя стравы. Кухар кажа:

— Гэта ж тут адзін хлопец у мяне за памочніка быў, дык ён і наварыў такіх смачных страў. Сам я гатаваць гэтак не ўмею.

Гаспадар кажа:

— Дык пакліч яго да мяне, трэба і яму падзякаваць.

Паклікалі Івана. Гаспадар пытаецца:

— Дзе ты навучыўся такія смачныя стравы варыць?

— Бяда ўсяму навучыць,— адказвае Іван.

— Якая ж у цябе, хлопча, бяда?

Іван і расказаў пра тое, як ён залатога птаха дастаў, як братоў у караля выкупіў і як яны яго забілі, а добрая ваўчыха ажывіла...

Стаяць браты моўчкі, белыя як палатно, а бацька пытаецца:

— Дык гэта ж ты, мусіць, мой меншы сын Іван?

— Але, — кажа Іван.— Я птаха дастаў і слова стрымаў, а яны — браты мае разумныя — ліхадзеі!

Выгнаў бацька старэйшых сыноў з дому, а з Іванам і цяпер жыве.

## Сабака і воўк

Быў у аднаго гаспадара сабака. Шчыра служыў ён гаспадару, ды не агледзеўся, як пастарэў. Горш сталі бачыць яго вочы, і цяжэй яму стала вартаваць гаспадарава дабро. Тады скупая гаспадыня перастала карміць яго, а потым і зусім пачала з двара праганяць.

«Чым так жыць, — думае сабака, — лепш няхай мяне воўк з'есць».

Надумаўся ён і пайшоў у лес шукаць ваўка. Ідзе ён лесам, а тут насустрач і воўк бяжыць.

— Куды, сабака, ідзеш? — пытаецца воўк.

— Да цябе.

— Чаго?

— З'еш ты мяне, воўча...

І расказаў ён ваўку пра сваю бяду.

Бачыць воўк, што сабака надта худы — яшчэ зубы паломіць, і кажа:

— Не, цяпер я цябе есці не буду. Трэба, каб ты трохі патлусцеў.

— Як жа я патлусцею, — кажа сабака, — калі мяне гаспадыня зусім не корміць?

— Нічога. Мы зробім так, што яна цябе з ахвотаю будзе карміць.

— Дзе там! — пакруціў хвастом сабака. — Гаспадыня мая вельмі скупая.

— Слухай ты мяне, — кажа воўк. — Ідзі дадому і сядзі там на агародзе. Адвячоркам, як пачне цямнець, я прыбягу і ўхаплю лепшага гаспадаровага падсвінака. Ты наробіш брэху, пабяжыш

за мною, і я табе аддам падсвінака. Гаспадар убачыць гэта і загадае гаспадыні добра карміць цябе. А праз месяц, як патлусцееш, — прыходзь да мяне, тады я цябе з'ем.

Сабака падумаў і згадзіўся.

Адвячоркам прыбег воўк, ухапіў падсвінака і павалок цераз агароды.

Тут сабака як наробіць ляманту, як кінецца за ваўком...

Пачуў гэта гаспадар, выскачыў з хаты, бачыць: воўк падсвінака валачэ цераз агароды, а сабака яго даганяе, адбірае.

— Туйга! Туйга! — закрычаў гаспадар на ўсю сілу. — Кусі яго, Лыска!

Воўк тым часам кінуў падсвінака, а сам ходу ў лес.

— Малайчына, Лыска! — пахваліў гаспадар сабаку, прывёў на кухню і загадаў жонцы карміць яго.

Жыве Лыска прыпяваючы. А праз месяц зрабіўся такі тлусты, аж шэрсць блішчыць. І пра дагавор з ваўком забыўся.

Вось аднойчы сабраліся ў гаспадара госці. П'юць, гуляюць, песні спяваюць. Нямала тут і Лыску перапала — цэлую кучу касцей пад стол яму накідалі.

Наеўся Лыска ды выйшаў на двор — у сваю будку. Глядзіць — аж у будцы воўк чакае яго.

— Чаго ты тут? — здзівіўся сабака.

— Па цябе прыйшоў, — адказвае воўк. — Памятаеш наш дагавор з табою?

Спалохаўся сабака — не хочацца яму на воўчыя зубы трапляць. Вось ён і кажа:

— Не еш ты мяне, воўк. Я цябе за гэта добра пачастую самаю смачнаю ядою.

— Адкуль жа ты возьмеш?

— У майго гаспадара госці. Там пад сталом поўна касцей — нават з мясам. Хадзем!

— Баюся. Яшчэ заб'юць мяне там.

— Не бойся, не заб'юць, — угаворвае сабака. — Я цябе правяду так, што ніхто і не ўбачыць.

Згадзіўся воўк і пайшоў за сабакам.

Лыска пакінуў яго ў сенцах, сам убег у хату, махнуў хвастом і патушыў лучыну.

— Цяпер бяжы пад стол, — паклікаў ён ваўка. Воўк так і зрабіў.

Сабака накарміў ваўка, нават вінoм напаіў. Сядзяць яны сабе пад сталом ды зюкаюць пацiху.

А тым часам госці заспявалі вясёлыя песні. Воўк слухаў, слухаў, ды кажа сабаку:

— Мне таксама спяваць хочацца.

— Маўчы лепш, — адказвае сабака.

Воўк памаўчаў крыху ды зноў за сваё:

— Не вытрымаю, — кажа, — аж язык свярбіць, гэтак спяваць захацелася.

І зацягнуў на ўсю хату басам:

— Аў-аў!

А сабака таксама не вытрымаў ды давай падпяваць яму:

— Гаў, гаў! Цяў, цяў!..

Пачулі гэта госці, ухапілі хто качаргу, хто чапялу, пабілі ваўка і выкінулі яго з хаты разам з сабакам.

Ачухаўся воўк і кажа сабаку:

— Ну і накарміў жа ты мяне! Я табе не дарую гэтага.

— Сам вінаваты, — кажа сабака. — Трэба было маўчаць.

— Не, — не згаджаецца воўк, — гэта ты вінаваты. Навошта ты завёў мяне ў хату?

Спрачаліся яны, спрачаліся, нарэшце воўк кажа:

— Калі так, давай будзем ваяваць: хто каго зваюе, той таго і з'есць. Збірай сваё войска і прыходзь да мяне ў лес.

— Што ж, — кажа сабака, — няхай будзе так.

Назаўтра ўзяў ён барана, ката і пеўня сабе ў памочнікі ды пайшоў на вайну з ваўком.

А воўк запрасіў да сябе ў ваякі мядзведзя, дзіка і зайца. Сабраў ён сваё войска, выйшаў на ўскраек лесу і чакае.

— Палезь ты, Міхайла, — кажа ён да мядзведзя, — на елку ды паглядзі, ці не ідзе сабака са сваім войскам.

Мядзведзь узлез на елку, прыгледзеўся і кажа:

— Ідзе!

— Ну, дык злазь! — кліча воўк. — Будзем ваяваць.

— Не, не злезу, — адказвае мядзведзь.

— Чаму?

— Страшна.

— Што ж там за войска такое, што ты гэтак спужаўся? — пытаецца воўк.

— Такое войска, што я ніколі і не бачыў, — адказвае мядзведзь калоцячыся. — Адзін ваяка тоўсты і калматы, з віламі ідзе; другі — грозны, вусаты, ззаду піку нясе; трэці — у шапачцы чырвонай, са шпорамі на нагах, шабляю махае... Першы ідзе, галавою трасе ды ўсё крычыць: «Бэ! Я ўсіх пакалю, на вілы пасаджу!» Другі сярдзіта чмыша, па бакох азіраецца і ўсё мармыча: «Мне, мне іх давай!» А трэці, ганарысты такі, крычыць: «Куды, куды ісці! Я адзін усіх паб'ю!».

Дзік пачуў гэта ды хутчэй у мох па самыя вушы зашыўся. А воўк бачыць, што не паспее схавацца, — стаў на заднія лапы і стаіць. «Хавайся за мяне, — кажа ён перапалоханаму зайцу. — Яны падумаюць, што я — пень, і абмінуць нас».

Прыходзіць сабака са сваім войскам, бачыць — нідзе нікога няма.

Тут якраз барану рогі засвярбелі. Глядзіць ён — побач нейкі пень стаіць. Разагнаўся баран ды — трах! — рагамі ў пень. У ваўка ад гэтага і галава раскалолася. Паваліўся ён дагары ды ногі выцягнуў. Заяц выскачыў з-пад ваўка, але сабака згледзеў яго і адразу злавіў.

Дзіку ў гэты час, як на бяду, села муха на вуха. Паварушыў ён вухам, каб сагнаць яе, а кот падумаў, што там мыш. Кінуўся туды ды давай мох разграбаць. Так і дзярэ дзіка вострымі кіп-

3 Зак. 1790

цюрамі! Цярпеў, цярпеў дзік, а потым усхапіўся ды наўцёкі...

Певень напужаўся дзіка, залопаў крыламі, узляцеў на елку і нарабіў крыку:

— Куды, куды?

Мядзведзь падумаў, што гэты самы грозны ваяка да яго дабіраецца, і залез ад страху аж на верхні сук. Сук не вытрымаў, зламаўся, мядзведзь грукнуўся вобземлю і забіўся.

З таго часу больш і не сябруюць сабака з ваўком.

## Лісіца і Гусак

Неяк Лісіца злавіла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з'ем!» Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лісічка. Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць».

Ліса адказвае: «Танцуй сабе, а з'есці я цябе яшчэ паспею».

Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.

Глядзіць Ліса на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу пераступаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам.

## Курачка-рабка

Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць.

Ідзе воўк:

— Дзедка, бабка, чаго вы плачаце?

— Як жа нам не плакаць? Была ў нас курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

І воўк завыў.

Ідзе мядзведзь:

— Воўк, чаго выеш?

— Як жа мне не выць? Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся. Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць... А я брахаць не ўмею, дык і завыў.

Выслухаў мядзведзь казку і адарваў сабе хвост. 3 таго часу і жыве з куртатым хвастом.

## Жаба ў каляіне

Аблюбаваў дзед месцінку каля рэчкі. «Добры, — думае, — агарод будзе».

Пачаў ён зямлю капаць, грады рабіць.

Выпаўзла з нары жаба-рапуха. Убачыла дзеда, надзьмулася:

— Гэта мая зямля, мая вада! Ідзі прэч адсюль! Я тут гаспадыня!

— Бач ты, — дзівіцца дзед, — якая пані знайшлася!

Падхапіў ён жабу на рыдлёўку, занёс у балота ды шпурнуў у гразь.

— Такога суседства, — кажа, — мне не трэба! Там табе месца!

Парабіў дзед грады, насадзіў агародніны.

Прыйшла пара — зазелянеў дзедаў агарод. Тут і капуста, тут і бурачкі, і моркаўка, тут і мак зацвіў!

Даглядае дзед свой агарод, цешыцца. А жаба аж учарнела ад злосці, усё думае, як дзеда з агарода выжыць. Думала, думала і надумалася. «Ага, — кажа сама сабе, — зраблю я так: павязе дзед агародніну дахаты, а я на дарозе ў гразкай каляіне сяду ды воз яму перакулю. Агародніна ўся ў гразь і ўтопчацца. Дзед яе не спажыве. На другі год, нябось, не захоча тут агарод рабіць».

Прыйшла восень. Сабраў дзед агародніну, паклаў на воз і вязе дахаты.

А жаба запаўзла наперад, села ў гразкай каляіне ды надзьмулася, як бочка.

Конь спыніўся, храпе. Папудзіў дзед жабу пугаю.

— Гэй, суседка, саступі з дарогі!

А жаба яшчэ горш надзімаецца, грозіць:

— Не пушчу цябе па гэтых дарогах ездзіць, з майго поля агародніну вазіць!

«Вось бяда, — думае дзед, — што з жабаю рабіць? Прычапілася як смала!»

Махнуў дзед на каня пугаю, тарганyў лейцамі, конь і рушыў наперад.

Наехала кола на ганарыстую жабу — ну, з яе і дух вон.

## Хітры вол

Пайшоў вол сена касіць. Косіць, завіхаецца, на неба паглядае: ці не відаць адкуль хмары? «За пагоду, — думае, — сена насушу, стог скідаю, тады і зіма не страшна». Ідзе воўк. Загледзеўся на вала.

— Ты бык? — пытаецца.

— Не, я вол.

— Сена косіш?

— Кашу.

— Рагамі грабеш?

— Грабу.

— Хвастом падграбаеш?

— Падграбаю.

— А мяне ты не баішся?

Падумаў вол і кажа:

— Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!

Паверыў воўк і пайшоў шукаць сабе падмогі. Прыходзіць на другі дзень з двума братамі.

— Ты бык? — зноў пытаецца.

— Не, вол.

— Сена косіш?

— Кашу.

— Рагамі грабеш?

— Грабу.

— Хвастом падграбаеш?

— Падграбаю.

— І трох нас ты таксама не баішся?

Што валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.

— Не толькі трох, — кажа, — а і чатырох не баюся.

Паверылі ваўкі і падаліся шукаць новых сяброў.

Доўга шукалі. Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю чарадою. Глядзяць, а там ужо стог сена стаіць і вала не відаць.

Кінуліся ваўкі па следу і прыбеглі да двара, дзе вол жыў. Двор вала высокім частаколам абгароджаны.

Круціліся, круціліся ваўкі, скакалі, скакалі, ды так да вала і не дабраліся.

— Ага, — закрычалі яны са злосці, — ты, баязлівец, схітрыў!

— Схітрыў ці не схітрыў, — адказвае вол, — а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.

І павалакліся ваўкі прэч, хвасты падцяўшы.

## Пчала і муха

Жылі-былі пчала і муха. Пчала з ранку да вечара па лугах лятала, мёд збірала. А муха мёд толькі есці любіла. Дзе мёдам запахне, там і яна. А дзе мёду не чуваць, там муха не хоча нават пераначаваць.

Аднаго разу прысела муха адпачыць на зялёным лузе. Сонейка муху прыгравае, лёгкі ветрык абвявае. Кругом кветкі цвітуць, конікі скачуць. У небе птушкі песенькі спяваюць.

Задумалася муха: як добра на свеце жыць! Думала-думала, ды задрамала. А ў гэты час над лугам пчала пралятала. Ляціць, гудзе, мёд у вулей нясе. Цяжка ёй, аж стогне небарака.

Прахапілася муха ды як закрычыць на пчалу:

— Ах ты сякая-такая! Чаго тут над вухам стогнеш, мне спаць не даеш!

— Выбачай, — сказала пчала. — Я шмат мёду нясу, дык і стагну.

— Ха-ха, — засмяялася муха, — шмат мёду нясеш, а сама, нябось, галодная: вунь якая худая — адны косці...

— Праўда, — адказвае пчала, — мы, пчолы, збіраем пуды, а самі худы.

— А чаму ж вы худы? І мёд у вас, і вашчына ў вас...

— Дык жа мёд мы збіраем не толькі для сябе, а і сваім дзеткам, і гаспадару, які нам хату зрабіў, даглядае нас.

— Чакай, чакай, — кажа муха, — я нешта не зусім цябе разумею: як гэта можна збіраць мёд

для іншых? Мы, мухі, так не робім. Мы толькі гатовага мёду шукаем.

— Ат, — замахала крыльцамі пчала, — няма мне калі з табой гаманіць: трэба хутчэй дадому спяшацца, мядовую кашку дзеткам варыць.

— А дзе возьмеш ты мядовую кашку?

— На сябе вязу.

— У чым?

— У вазку, у палазку і за пазушкай.

Загула пчала ды паляцела ў свой вулей.

## Вол і асёл

Жылі на адным двары вол і асёл. Вол рабіў цяжкую работу — у ярме хадзіў, а асёл толькі калі-нікалі гаспадара ў павозцы вазіў.

Вось аднаго разу прыйшоў з работы вол, цяжка ўздыхнуў.

— Чаго ты, вол, уздыхаеш? — пытаецца асёл. — Мала сена гаспадар падкінуў, ці што?

— Не, брат асёл, — адказвае вол, — сена не мала. Ды ўспомніў, што і заўтра цаліну араць трэба. А гэта, браток, не песні табе спяваць — і-а, і-а...

— Э, — кажа асёл, — нас, аслоў, дурнямі лічаць, а ты яшчэ дурнейшы, дык і цягаеш сваё ярмо дзень пры дні.

— А што? Ты за мяне пацягнеш?

— Яшчэ чаго захацеў! — сказаў асёл. — Хопіць мне і калёс.

Вол махнуў хвастом.

— Ат, не можаш памагчы, дык лепш памаўчы.

Асёл памаўчаў, а потым зноў за сваё ўзяўся:

— Хочаш, навучу цябе, як ад ярма выкруціцца?

Вол натапырыў вушы, зацікавіўся:

— Ну, ну, навучы, брат асёл. Хоць бы дзень-другі ў хляве адстаяцца ды адляжацца.

— Заўтра, як выведзе цябе гаспадар з хлява, вазьмі ды закульгай: скачы на трох нагах. Вось ён і не паедзе араць на табе.

Ну, вол так і зрабіў, як асёл навучыў.

Паглядзеў назаўтра гаспадар на кульгавага вала, пачухаў патыліцу:

— Што ж рабіць? У нас вунь яшчэ ворыва колькі, а ты закульгаў! Ці не запрэгчы хіба асла? Ён, нябось, выгуляўся, у хляве стоячы.

І запрог гаспадар асла ў плуг.

Недарэмна ж кажуць: «Навучыў на сваю галаву!»

## Як курачка пеўніка ратавала

Жылі-былі курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

Вось аднойчы виграб пеўнік вялікую бобінку. «Ну, — думае, — гэтага зярняці курачцы не праглынуць, з'ем хіба сам».

Праглынуў — ды і падавіўся.

Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго курачка:

— Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

— Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся...

— Як жа цябе ратаваць, Пеця? — пытаецца курачка.

— Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць.

— А дзе яго дастаць?

— У каровы.

Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай масла!

— Нашто табе масла?

— Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

— Добра, — кажа карова, — дам табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.

Прыйшла курачка да касцоў:

— Касцы, касцы, дайце сена!

— Нашто табе сена?

— Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Касцы кажуць:

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з'ядзім, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара:

— Пекар, пекар, дай пірагоў!

— Навошта табе пірагі?

— Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў.

Пекар напёк пірагоў.

Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі і накасілі сена.

Прынесла курачка сена карове.

Карова з'ела сена і дала масла.

Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

Тут і казцы канец.

## Мена

Жыў дзед ды баба. Мелі яны хатку і загон зямлі. Але не было ў іх ні каня, ні вала. А гэта такое гора, што хоць ты сам у плуг упрагайся.

Сабралі яны сяк-так грошай. Пайшоў дзед на кірмаш, купіў буланага коніка і вядзе дахаты.

Сустракае па дарозе пастухоў, што пасвілі валоў.

— Добры дзень, дзед! Дзе быў? — пытаюцца пастухі.

— На кірмашы.

— Што купіў?

— Каня.

— Памяняй з намі, дзед, каня на вала: у нас валоў шмат, а каня няма.

Падумаў дзед: вол таксама ў гаспадарцы не лішні.

— Добра, — кажа, — давайце мяняцца.

Аддаў дзед пастухам каня, узяў сабе вала ды вядзе яго дахаты.

Сустракае па дарозе пастухоў, што пасвілі авечак і бараноў:

— Добры дзень, дзед! Дзе быў?

— На кірмашы.

— Што купіў?

— Каня.

— А дзе ж ён?

— Памяняў на вала.

— Памяняй з намі, дзед, вала на барана.

— Добра: баран у гаспадарцы не лішні.

Узяў дзед барана за рогі і вядзе дахаты. Сустракае па дарозе пастушкоў, што пасвілі індыкоў:

— Добры дзень, дзядуля! Дзе быў?

— На кірмашы.

— Што купіў?

— Каня.

— А дзе конь?

— Памяняў на вала.

— А дзе вол?

— Памяняў на барана.

— Памяняй з намі, дзядуля, барана на індыка.

— Добра: індык таксама ў гаспадарцы не лішні.

Аддаў дзед пастушкам барана, сам узяў індыка пад пахі і пайшоў далей.

Прыйшоў у вёску. Тут на вуліцы дзеці гуляюць: ездзяць на качэргах. Падбеглі да яго дзеці:

— Добры дзень, дзядуля! Дзе быў?

— На кірмашы.

— Што купіў?

— Каня.

— А дзе конь?

— Памяняў на вала.

— А дзе вол?

— Памяняў на барана.

— А дзе баран?

— Памяняў на індыка.

— Ой, дзядулька, памяняй з намі індыка на качаргу: мы з індыкам гуляць будзем!

— Добра, — кажа дзед, — давайце качаргу.

Узяў дзед качаргу і панёс дахаты. Даведалася аб усім баба, схапіла дзедаву качаргу ды давай яго біць. Біла, біла — качарга зламалася.

На гэтым і казка скончылася.

## Муха-пяюха

Жыла-была муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць камароў. Запрэгла муха-пяюха камароў у каляску ды паехала на пагулянку.

Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як паню зваць-велічаць?

— Я муха-пяюха. А ты хто?

— А я па паліцах скрабатуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — скача жабка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. А ты хто?

— А я па сажалках рагатуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — сядзіць на галінцы вавёрка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. А ты хто?

— А я па елках скакуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць заяц:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. А ты хто?

— А я праз дарогу скок.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — ідзе воўк:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. Праз дарогу скок. А ты хто?

— А я галодны воўк. Гам!..

І праглынуў усіх разам з каляскаю.

## Былінка і верабей

Сеў верабейка на былінку і хацеў, каб яна яго пакалыхала.

Але былінка не захацела калыхаць верабейку, узяла ды скінула яго.

Узлаваўся верабейка на былінку, зацырыкаў:

— Пачакай жа, гультайка, нашлю я на цябе коз!

Паляцеў верабейка да коз:

— Козы, козы, ідзіце былінку абгрызаць, бо былінка не хоча мяне калыхаць!

Козы не паслухалі верабейкі.

— Пачакайце ж, козы, нашлю я на вас ваўкоў!

Паляцеў верабейка да ваўкоў:

— Ваўкі, ваўкі, ідзіце коз душыць, бо козы не хочуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухалі і ваўкі.

— Пачакайце ж, ваўкі, нашлю я на вас стральцоў!

Паляцеў верабейка да стральцоў:

— Стральцы, стральцы, ідзіце ваўкоў біць, бо ваўкі не хочуць коз душыць, козы не хо-

чуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухалі і стральцы.

— Пачакайце ж, стральцы, нашлю я на вас вяроўкі!

Паляцеў верабейка да вяровак:

— Вяроўкі, вяроўкі, ідзіце стральцоў вязаць, бо стральцы не хочуць ваўкоў біць, ваўкі не хочуць коз душыць, козы не хочуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухалі і вяроўкі.

— Пачакайце ж, вяроўкі, нашлю я на вас агонь!

Паляцеў верабейка да агню:

— Агонь, агонь, ідзі вяроўкі паліць, бо вяроўкі не хочуць стральцоў вязаць, стральцы не хочуць ваўкоў біць, ваўкі не хочуць коз душыць, козы не хочуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухаў і агонь.

— Пачакай жа, агонь, нашлю я на цябе ваду!

Паляцеў верабейка да рэчкі:

— Вада, вада, ідзі агонь тушыць, бо агонь не хоча вяровак паліць, вяроўкі не хочуць стральцоў вязаць, стральцы не хочуць ваўкоў біць, ваўкі не хочуць коз душыць, козы не хочуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухала і вада.

— Пачакай жа, вада, нашлю я на цябе валоў!

Паляцеў верабейка да валоў:

— Валы, валы, ідзіце ваду піць, бо вада не хоча агонь тушыць, агонь не хоча вяровак паліць, вяроўкі не хочуць стральцоў вязаць, стральцы не хочуць ваўкоў біць, ваўкі не хочуць коз душыць, козы не хочуць былінку абгрызаць, а былінка не хоча мяне калыхаць!

Не паслухалі і валы.

— Пачакайце ж, валы, нашлю я на вас доўбню!

Не паслухала і доўбня.

— Пачакай жа, доўбня, нашлю я на цябе чарвей!

І чэрві не паслухалі.

— Пачакайце ж, чэрві, нашлю я на вас курэй!

Паляцеў верабейка да курэй, пачаў іх прасіць, каб бядзе дапамаглі.

— Добра, — адказалі куры, — дапаможам!

Пайшлі куры чарвей дзяўбці — і цяпер дзяўбуць.

Пайшлі чэрві доўбню тачыць — і цяпер точаць.

Пайшла доўбня валоў біць — і цяпер б'е.

Пайшлі валы ваду піць — і цяпер п'юць.

Пайшла вада агонь тушыць — і цяпер тушыць.

Пайшоў агонь вяроўкі паліць — і цяпер паліць.

Пайшлі вяроўкі стральцоў вязаць — і цяпер вяжуць.

Пайшлі стральцы ваўкоў біць — і цяпер б'юць.

Пайшлі ваўкі коз душыць — і цяпер душаць.

Пайшлі козы былінку абгрызаць — і цяпер грызуць.

Стала былінка верабейку калыхаць — і цяпер калыша.

## Сабачая грамата

Некалі панамі былі не толькі паны, а і панскія сабакі. І мелі яны пры сабе важныя паперы — дваранскія граматы. У тых граматах пісалася: ніхто таго ці гэтага пана або яго сабаку і пальцам крануць не смее, а самі яны маюць права біць і кусаць прыгонных людзей, колькі ім уздумаецца.

Паны і сабакі ганарыліся сваімі граматамі, трымалі іх пры сабе і шанавалі, як вока.

Вось аднаго разу пан і яго сабака сабраліся ехаць у Мінск на суд. Сабака і думае: «Дарога ў Мінск не малая, а тут яшчэ задажджылася, грамата можа размокнуць. Што я тады без дваранскай граматы варты! Не, пакіну лепш яе кату на схованку».

А трэба сказаць, было гэта тады, калі і сабакі, і каты, і мышы жылі ў згодзе, сябравалі, адно аднаго паважалі.

— Толькі глядзі, — кажа сабака кату, — з граматы вока не спускай. А то бяда будзе...

Узяў кот грамату і палез на печ. Ляжыць там ды дрэмле сабе, муркаючы. А сам адным вокам на грамату паглядае, каб хто не ўкраў. Ляжаў,

ляжаў і захацелася яму на двор выбегчы, на сонейку паграцца, за вераб'ямі паганяцца.

Паклікаў ён мыш з норкі і перадаў ёй сабакаву грамату на схованку.

— Толькі глядзі, — кажа, — добра схавай, каб не згубілася.

— Не турбуйся, сусед, — кажа мыш. — Я яе ў сваёй норцы схаваю. А туды, апроч мяне і маіх дзетак, ніхто не заглядвае.

Загуляўся кот на двары і пра сабакаву грамату забыўся. Ды і суседка-мыш не вельмі пра яе клапацілася — кінула ў норцы і пабегла па сваіх справах. Ведама, за чужое дабро не так дрыжыш, як за сваё.

Тым часам вярнуўся сабака з суда.

— Давай маю грамату, — кажа да ката.— Цяпер я сам буду яе сцерагчы.

Кот — да мышы:

— Дзе сабакава грамата?

Мыш сюды-туды — няма граматы!

— Дзе сабакава грамата? — пытаецца ў мышанят.

— Якая грамата?

— А тая папера, што я ў норцы схавала.

— А, — кажуць мышаняты. — Мы яе, дурэючы, на шматкі падралі.

Насварылася мыш на мышанят, ды што зробіш: страчанага не вернеш! Выбегла яна з норкі і сказала кату пра бяду.

Як пачуў гэта кот, як узлаваўся на мыш:

— Ах ты такая-сякая! Што ж я сабаку скажу? Я разарву цябе за гэта і з'ем!

І выпусціў на мыш свае вострыя кіпцюры. Мыш ледзьве паспела ў норцы схавацца.

Вярнуўся кот да сабакі з сумнаю навіною.

— Ай-яй-яй! — заенчыў сабака. — Што ты, гультай, нарабіў! Цяпер я ўсе свае дваранскія правы страціў. Я табе гэтага ніколі не дарую!

І кінуўся на ката. Кот — на плот, натапырыўся, зафыркаў: «Не падыходзь!»

З таго часу і разладзілася сяброўства ў сабак, катоў і мышэй. Сабакі не могуць катам дараваць, а каты сваю злосць на мышах спаганяюць.

Вось што тая сабачая грамата нарабіла.

## Пшанічны каласок

Жылі на адным двары курачка Сакатушка, гусак Шыпун ды індык Балбатун.

Курачка даглядала сваіх куранятак, грэблася на сметніку, шукала зярнятак. А гусак Шыпун і індык Балбатун толькі шпацыравалі ўзад і ўперад па двары, як важныя паны, ды заўсёды вялі між сабою спрэчкі аб тым, хто з іх важнейшы і разумнейшы.

— У мяне галава большая, — хваліўся гусак, — дык і розуму ў ёй больш!

Індык з гэтым не згаджаўся.

— Галава ў цябе вялікая, гэта праўда, ды дурная, як бот, — казаў ён.

— Ну, няхай сабе галава дурная, — адказваў гусак, — затое нос які ў мяне! Моцны, цвёрды,

прыгожы... А ў цябе што за нос — смех адзін! Чарвяк, а не нос!

І гусак, і індык былі страшэнныя гультаі. Яды шукаць сабе ленаваліся і таму часта галадалі. Каб не карміла іх сяды-тады гаспадыня, дык даўно б гультаёў і на свеце не было.

Аднаго разу знайшла курачка каля плота пшанічны каласок. Зарадавалася, засакатала на ўвесь двор:

— Ко-ко-ко! Глядзіце, які цудоўны каласок я знайшла!

Пачулі пра такую навіну Шыпун і Балбатун.

— А ну, пакажы!

Курачка паказала ім каласок. Індык панюхаў каласок сваім носам-чарвяком.

— Так, так, — сказаў ён, — каласок і праўда цудоўны. Трэба яго змалаціць.

— Ага, ага, — згадзіўся і гусак. — Трэба змалаціць. Тады будуць зярняткі. А яны смачныя... Ага, ага!

— Добра, — сказала курачка. — А хто яго змалоціць?

— Толькі не я! — адказаў гусак. — Я тоўсты, мне цяжка цэпам махаць.

— Дык што ж, ты хочаш, каб я малаціў? — горача забалбатаў індык. — Я табе не парабак!

— Ну добра, — сказала курачка, — я сама змалачу.

Пайшла яна на ток, узяла цэп і змалаціла пшанічны каласок. Прынесла зярняткі і цешыцца:

— Глядзіце, якія цудоўныя зярняткі! Чырванаваценькія, пузаценькія! Яны, напэўна, смачнейшыя за ячменныя.

Падышлі да зярнятак і гусак з індыком.

— Так, так, — сказаў індык. — Цудоўныя зярняткі.

— Ага, ага, — пацвердзіў гусак. — Аж шкада дзяўбці.

— І не трэба дзяўбці. Іх трэба змалоць ды напячы булак, — падаў разумную параду індык.

— Ага, ага, — згадзіўся гусак. — Пшанічныя булкі мяккія, як мой пух. А смачныя якія!

— Добра, — сказала курачка. — А хто змеле пшанічныя зярняткі?

— Толькі не я! — буркнуў гусак. — Мне цяжка ў млын хадзіць.

— І не я! — усклікнуў індык. — З такою простаю работаю і дурны гусак справіцца.

— Ну што ж, — сказала курачка, — калі так, то давядзецца мне самой ісці ў млын.

Усыпала яна зярняткі ў торбачку і панесла ў млын. Там змалола і прынесла муку дахаты.

— Ай, якая бялюткая мука! — засакатала курачка на ўвесь двор.

Індык панюхаў муку.

— Так, так, — сказаў ён, — добра пахне. Значыць, смачныя будуць булкі.

— Ага, ага, я ж казаў, што смачныя! — уставіў слова і гусак.

— Ну, а хто спячэ з гэтай мукі булкі? — запыталася курачка.

Гусак пакруціў галавою:

— Я не ўмею...

Індык адказаў:

— Я хоць і ўмею, ды не хачу. Няхай гусак пячэ.

— Ну, добра, — сказала курачка, — тады я сама спяку.

Знайшла яна пад паветкаю дзежачку і рашчыніла цеста. Потым накалола дроў і запаліла ў печы. Калі цеста падышло, курачка нарабіла круглых прыгожых булак і пасадзіла іх на лапаце ў печ.

Булкі пачалі пячыся. І такі прыемны пах пайшоў ад іх па ўсім двары, што ў гусака і індыка аж слінкі пацяклі.

А трэба сказаць, што яны даўно нічога не елі і так выгаладаліся, што нават спрачацца перасталі, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

— Хадзем у хату, — сказаў індык, — відаць, булкі ўжо гатовы.

— Ага, ага, — адказаў гусак. — Хадзем, брат, у хату.

Прыйшлі індык з гусаком у хату, а там курачка булкі з печы дастае. Мяккія, румяныя, пахучыя.

— Так, так, — весела загаварыў індык, — якраз у пару прыйшлі.

— Ага, ага, — заківаў галавою гусак і першы падаўся за стол. Індык — за ім.

Але курачка спыніла іх:

— Чакайце! Не спяшайцеся, панове! Перш чым садзіцца за стол, адкажыце мне на мае пытанні.

— Давай свае пытанні! — сярдзіта прашыпеў гусак. — Толькі хутчэй.

— Але, толькі хутчэй, — шпарка забалбатаў і індык. — А то дужа есці хочацца...

— Дык слухайце! Хто пшанічны каласок знайшоў?

— Ты, курачка, вядома, ты знайшла, — адказалі індык і гусак у адзін голас.

— Хто змалаціў каласок?

— Ты, курачка, змалаціла.

— Хто зярняткі ў млын насіў?

— Ты насіла...

— А хто дровы сек, у печы паліў, пшанічныя булкі пёк?

Пераглянуліся паміж сабою індык з гусаком і адказалі:

— Ты, вядома... За гэта табе і слава.

— Дык вось, — сказала курачка Сакатушка, — каму слава, таму і булкі. А вы, гультаі, ідзіце прэч адгэтуль! Ко-ко-ко! Дзеткі, бяжыце сюды хутчэй.

Пазбягаліся з двара кураняткі і пачалі з курачкай частавацца свежымі пшанічнымі булкамі.

А галодныя гультаі індык і гусак зноў заспрачаліся, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

## Каза-манюка

Жыў дзед ды баба з дачкою. І была ў іх каза. Пагнала дачка пасвіць казу. Цэлы дзень пасвіла па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары прыганяе дахаты. Дзед пытаецца ў казы:

— Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Насварыўся дзед на дачку, што дрэнна казу пасвіла, і назаўтра выправіў бабу.

Цэлы дзень пасвіла баба казу па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары прыганяе дахаты. Дзед зноў пытаецца ў казы:

— Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Дзед і на бабу насварыўся, што дрэнна казу пасвіла.

Надзеў тады дзед бабін каптан і хустку ды пагнаў сам пасвіць казу.

Цэлы дзень пасвіў па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы.

Увечары вярнуўся дахаты, пераадзеўся ў сваё адзенне, сеў на прызбе і чакае казу з пашы.

Прыйшла каза на двор.

Дзед пытаецца:

— Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла крапельку вадзічкі...

Узлаваўся дзед на казу-манюку, прывязаў яе за плот, а сам пайшоў касу вастрыць, казу-манюку рэзаць.

Дазналася аб гэтым каза, сарвалася з прывязі і пабегла ў лес. Знайшла ў лесе зайчыкаву хатку, залезла ў яе і жыве там, а зайчыка і на парог не пускае.

Сеў зайчык пад елачкай і плача.

Ідзе воўк:

— Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

— Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка — новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер рагаты ды барадаты, выгнаў мяне з хаткі і сам у ёй жыве, а мяне не пускае.

— Ну, добра, не плач: я таго звера выганю.

Падышоў воўк да зайчыкавай хаткі, пастукаў хвастом у дзверы ды кажа:

— Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А каза як затупае, як замэкае:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся воўк ды ад бяды ўцёк.

А зайчык зноў сеў і плача.

Ідзе мядзведзь:

— Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

— Як жа мне не плакаць, як не журыцца?

І расказаў мядзведзю пра сваю бяду.

— Ну, добра, — кажа мядзведзь, — не плач: я таго звера адразу выганю.

Падышоў ён да зайчыкавай хаткі, патупаў каля дзвярэй ды кажа:

— Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А каза як затупае, як замэкае:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся і мядзведзь ды ў гушчар — кульгець, кульгець...

Ідзе певень. Убачыў зайчыка і пытаецца:

— Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

— Як жа мне не плакаць, як не журыцца?

І расказаў зайчык пеўню пра сваю бяду.

— Э, — кажа певень, — такую бяду я адной лапай развяду. Я таго звера ведаю — гэта дзедава каза-манюка...

Падышоў певень да зайчыкавай хаткі, залопаў крыламі, закукарэкаў:

— Кукарэку! Кукарэку!
Заб'ю казу-недарэку.

Пачула каза ды як затупае, як замэкае:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Тады певень зноў яшчэ мацней залопаў крыламі, закрычаў:

> — Гэй, каза, збірай манаткі,
> Уцякай хутчэй ты з хаткі,
> Бо вунь дзед ідзе,
> Ён касу нясе...

Як пачула каза пра дзеда з касою, напужалася і кулём выскачыла з хаткі.

А зайчык з пеўнікам зайшлі ў хатку і сталі там жыць-пажываць ды дабра нажываць.

## Казёл і баран

Жылі дзед і баба. І былі ў іх казёл і баран.

Дажыліся дзед з бабаю — няма чаго есці. Адну саладуху вараць.

— Давай, баба, зарэжам барана, — кажа дзед. — Казёл няхай сабе яшчэ трошкі паскача.

— Добра, — згадзілася баба. — Рэж. Хоць запраўка якая будзе да капусты. А то мне ад саладухі ўжо духі падцягнула.

Пачуў гэтую гаворку казёл. Пабег да свайго прыяцеля барана і кажа:

— Цябе дзед з бабаю рэзаць збіраюцца. А калі зарэжуць цябе, то скора чарга дойдзе і да мяне. Уцякайма з двара.

Сабраліся казёл і баран ды пабеглі ў лес.

— Ну, тут ужо нас ніхто не знойдзе, — радуецца казёл. — Давай, баран, цяпельца раскладаць, абед гатаваць.

— А як раскладаць цяпельца будзем? — пытаецца баран. — Ні запалак, ні вуголля ў нас няма...

— Нічога, — адказвае казёл. — Разганіся ды ў пень рагамі: іскры і пасыплюцца. А я пайду тым часам сушняку назбіраю.

Толькі адышоўся казёл ад барана, як насустрач яму воўк бяжыць.

«Што ж рабіць? — думае казёл. — Ад дзеда з бабаю ўцяклі, а ад ваўка не ўцячэш».

Але казёл не з баязлівых быў.

— Гэй, баран! — крычыць ён. — Да нас сам воўк завітаў. Вось мы яго і зварым на абед. Лаві яго! А я памагу табе.

Як пачуў гэта воўк, як скочыць убок — толькі яго і бачылі. Воўк той яшчэ малады быў, казлоў і бараноў не бачыў. Думаў, на лясных разбойнікаў нарваўся.

Вярнуўся казёл да барана і кажа:

— Абед гатаваць нам тут няма калі: баюся, каб воўк зноў сюды не прывалокся.

Сабраліся яны і пайшлі далей. Ішлі, ішлі, чуюць — нешта трашчыць за імі.

— Ну, гэта, напэўна, той самы воўк нас даганяе, — кажа казёл. — Давай хіба, баран, палезем на елку.

Баран круціць рагамі.

— Табе што — ты вёрткі, можаш хоць на елку, хоць на страху ўскочыць. А я?

— Я падсаджу цябе.

— Хіба што.

Падсадзіў казёл барана на першы сук тоўстай старой елкі, а сам на верхавіну паскакаў.

А тут і праўда бяжыць воўк. І не адзін, а са старою лісіцаю. Воўк гэты паскардзіўся лісіцы, што яго хацелі зварыць на абед нейкія рагатыя лясныя разбойнікі. Лісіца ніколі яшчэ такіх разбойнікаў у вочы не бачыла. І яе разабрала цікаўнасць, што там за яны.

Прывёў яе воўк на тое месца, дзе баран з казлом спыніліся. А іх — няма. Тут лісіца нюхнюх — узяла след і бягом за разбойнікамі. Воўк за ёю.

Прыбягаюць да старой елкі. Лісіца нюх-нюх — няма следу. Бегала, бегала вакол, а след як вадою разліўся.

— Чакай, — кажа яна ваўку. — Я ў карты паваражу, дзе іх шукаць.

Селі яны пад галінаю, на якой баран ляжаў, і заняліся ваража́бою.

Тым часам баран ад страху не ўтрымаўся ды плясь з елкі. Проста на ваўка паваліўся. А храбры казёл не разгубіўся ды як закрычыць зверху:

— Трымай, баран, варажбітку! Ваўку я сам рады дам!

Вырваўся воўк з-пад барана ды ходу. А лісіца за ім. «З такімі разбойнікамі, — думае, — лепш не звязвацца».

## Ганарыстая варона

Раскаркалася неяк увосень адна варона на сметніку:

— Вы сабе як хочаце, — кажа сяброўкам, — а я не магу тут цэлую зіму мерзнуць. Я не такая дурная варона, як вы!

— А што ж ты думаеш рабіць, разумная? — пытаюцца сяброўкі.

— Палячу за мора: там, кажуць, зімы не бывае.

— Ну што ж, — паківалі галовамі сяброўкі, — шчаслівай табе дарогі. А мы ўжо як-небудзь і дома перазімуем.

Сабралася ганарыстая варона і паляцела за мора.

Доўга ляцела ці нядоўга, аж бачыць — пад ёю ўжо не вада, а зямля зялёная, зверху цёплае сонейка свеціць.

«Ну, — думае варона, — тут я спынюся». Апусцілася на высокае дрэва ды пачала выглядаць спажыву: выгаладалася ж, нябось, за дарогу.

Убачылі варону заморскія птушкі.

— Хто ты? — пытаюцца. — Ніколі мы ў сваіх краях такой птушкі не бачылі. Можа, ты паўночны салавей? Ён, кажуць, пяе, як званочак звініць.

— Але, але, — падхапіла варона. — Я — паўночны салавей!

А сама сабе думае: «Хіба я горш за салаўя спяваю? Чаму ж толькі яму гонар і павага?»

Зарадаваліся заморскія птушкі.

— Паспявай нам, паўночны салавейка! — просяць варону.— А мы паслухаем. Вельмі ж хочацца нам твой голас пачуць.

Задрала варона ўгору сваю дзюбу і заспявала на ўсё горла:

— Кар-кар-р! Кра-кра! Гэй, гэй! Я — паўночны салавей!

Пераглядваюцца птушкі паміж сабою, вушы лапкамі затыкаюць. «А няхай яго з такім салаўём! — шэпчуць. — Ён жа не лепш за звычайную жабу спявае...»

А потым не вытрымалі слухачы, гуртам наляцелі на варону і давай яе дзяўбці, давай таўчы. Траха не ўсё пер'е выскублі.

— Выбірайся, — крычаць, — прэч са сваімі песнямі! Не хочам мы цябе слухаць.

Вырвалася варона ад няўдзячных слухачоў і паляцела назад дадому.

А тут скора і вясна настала. Рэкі ад лёду ачысціліся. Не захацела варона на сметнік варочацца. Паляцела на рэчку. Села там на беразе і цікуе за рыбамі. Бачыць: паўзе рак. Ну, голад — не цётка: калі няма рыбы, то і рак — рыба. Схапіла яна рака і сабралася ўжо снедаць, як раптам чуе ліслівы ракаў галасок:

— Вось добра, што трапіў у дзюбу не якой-небудзь чорнай галцы або граку, а самой пані варонe. Як жа мне пашанцавала! Ты ж такая прыгажуня, такая красуня, што і сказаць няможна.

Шэрыя перайкі твае аж зіхацяць на сонейку. А галасок у цябе — як у таго салаўя, не раўнуючы: як пачнеш спяваць, дык на цэлы свет чуваць. Я не раз захапляўся тваімі цудоўнымі песнямі, у цёмнай нары седзячы. Хацеў бы я, пані варона, пачуць тваю песню яшчэ раз.

— Праўда, праўда! — каркнула ўзрадаваная ад пахвалы варона. — Гэта толькі дурныя заморскія птушкі зганілі мяне. Ну дык слухай!

І завяла варона на ўсю ваколіцу:

— Кар-кар-р! Кра-кра! Я не простая варона!

Скончыла спяваць, глядзіць — а рака і след прастыў.

Давялося ганарыстай і галоднай вароне зноў на сметнік да сябровак ляцець.

## Лісіца-хітрыца

Жыў дзед ды баба. Нічога ў іх з гаспадаркі не было, толькі адна курачка Чубатка.

Жылі яны, жылі, дажыліся — няма чаго варыць. Вось дзед і кажа бабе:

— Баба, а баба, звары хіба Чубатку, ці што?

Баба замахала рукамі:

— Што ты, дзед, надумаўся! Лепш мы галодныя будзем, а Чубаткі я не дам варыць.

Пачула гэта курачка, пабегла на двор, знайшла там бабовае зерне і прынесла бабе.

Дзед кажа:

— Вось і добра. Звары ты, баба, хоць гэтую бобінку.

Паглядзела старая на бобінку:

— Дзеду мой, дзеду, што за наедак з аднае бобінкі? Я для яе і гаршка не падбяру. Давай лепш пасадзім яе. Як вырасце, тады спячом цэлы бабовы пірог.

— Дзе ж мы яе пасадзім? — пытаецца дзед.

— На полі.

— На полі яе варона выдзеўбе...

— Дык на двары.

— На двары яе курыца выграбе...

— Тады давай пасадзім хіба ў хаце пад палацямі.

— Добра,— згадзіўся дзед і пасадзіў бобінку ў хаце пад палацямі.

Узышла бобінка ды давай расці. Расла, расла, уперлася ў палаці.

— Што, баба, рабіць будзем? — пытаецца дзед.

— Трэба палаці разбіраць.

Дзед разабраў палаці, а бобінка як пачала расці ды расці — дарасла да столі.

— Што, баба, рабіць будзем? — зноў пытаецца дзед.

— Трэба столь разбіраць.

Дзед і столь разабраў, а бобінка як пачала расці ды расці — дарасла да страхі.

Дзед і страху разабраў.

Выглянула бобінка на свет і давай расці яшчэ весялей. Дарасла аж да неба.

Узяў тады дзед торбу, палез па сцяблу на неба, абабраў спелыя струкі і вярнуўся назад.

Зарадавалася баба — цэлую торбу бабовых струкоў прынёс дзед!

— Ну, цяпер-то мы ўжо наядзімся пірага!

Палузала баба струкі, высушыла боб на печы, змалола і рашчыніла ў дзяжы цеста на пірог.

Цеста як пачало расці ды расці — з дзяжы вон лезе. Палажыла яго баба на лапату, загладзіла пірагом, размалявала рознымі ўзорамі, каб прыгожы быў, ды ў печ. А пірог як пачаў расці ды расці — з печы на прыпечак лезе. Адсланіла баба засланку, а ён — скок на хату, з хаты за парог — і ўцёк...

Кінуліся дзед з бабай даганяць пірог. Ды дзе там! Так і не дагналі.

Прыкаціўся пірог у лес. А тут насустрач яму рыжая лісіца-хітрыца. Схапіла яна пірог, выела мякіш, усярэдзіну шышак насыпала ды пабегла з пірагом да пастушкоў. Знайшла пастушкоў у полі і кажа:

— Пастушкі, пастушкі, дайце мне бычка-трацячка, а я вам дам за гэта пірог.

Бачаць пастушкі — добры пірог у лісіцы, жоўценькая скарынка аж блішчыць, так і хочацца яго паспытаць. Згадзіліся яны на мену і аддалі лісіцы бычка-трацячка.

— Толькі ж, глядзіце, не ешце пірага, пакуль я не заеду за горку, — кажа лісіца.

Села яна на бычка верхам і паехала. Як толькі схавалася за горкаю, пастушкі і кажуць: «Сядзем на пясочку, з'ядзім па кусочку!» Раз-

ламалі пірог, а там — адны шышкі яловыя... Падманула іх хітрая лісіца!

Едзе лісіца на бычку, бачыць — на дарозе пустая павозка стаіць, а недалёка чалавек арэ. Падкралася яна цішком да павозкі, запрэгла ў яе бычка-трацячка, села на мяккай саломе, і едзе сабе далей, пугай бычка паганяе.

Прыехала ў лес. Насустрач ёй воўк ідзе. Збегаўся, змарыўся, ледзьве ногі валачэ.

— Куды, кума, едзеш? — пытаецца.

— За трыдзевяць зямель, у трыдзясятае царства.

— Чаго?

— Там, кажуць, курэй і каршуны не дзяруць...

— А бараны ў тым царстве ёсцека? — аблізнуўся воўк.

— Ды імі там хоць гаць гаці!

— А лісічка, а сястрычка, вазьмі і мяне з сабою. Падвязі хоць мой хвост.

— Што адзін хвост везці, садзіся ўвесь ты.

Сеў воўк. Едуць далей. Сустракаюць мядзведзя.

— Куды, кумы, едзеце?

— За трыдзевяць зямель, у трыдзясятае царства...

— Чаго?

— Там, кажуць, курэй і каршуны не дзяруць, — адказвае лісіца.

— Там, кажуць, бараноў хоць гаць гаці, — падтаквае ёй воўк.

— А мёду там многа?

— Ды там, кажуць, мядовыя рэкі цякуць!

Мядзведзь зарадаваўся:

— То вазьміце і мяне. Хоць адну лапу падвязіце.

— Што адну лапу везці, садзіся ўвесь ты.

Уселіся ўтраіх, едуць далей. Аж раптам зламалася аглобля.

Лісіца кажа мядзведзю:

— Схадзі, кум, прынясі аглоблю.

Пайшоў мядзведзь у гушчар, знайшоў вывернутую елку і прывалок да воза. Убачыла лісіца, крыку нарабіла:

— Ах ты, мядзведзішча, ах ты, дурнішча, ці ж гэта лясіна для аглоблі!

І да ваўка:

— Схадзі, куме, прынясі тонкую аглоблю.

Пайшоў воўк і прынёс крывы яловы сук. Лісіца і на яго накрычала, плюнула ды пайшла сама па аглоблю.

Тым часам мядзведзь з ваўком з'елі бычка-трацячка, шкуру саломай напхалі, на ногі паставілі ды пайшлі сабе пасміхаючыся.

Вярнулася лісіца, бачыць — ні ваўка, ні мядзведзя, толькі бычок стаіць. Прыладзіла яна аглоблю, села ў павозку, махнула пугаю на бычка, а той — брык! — і паваліўся.

Паглядзела лісіца на бычка і аб усім здагадалася.

— Пачакайце ж вы ў мяне! Я вам гэтага не дарую! — пагразіла яна ваўку і мядзведзю ды пайшла сваёю дарогаю.

Шмат часу ішла ці мала, а ў дарозе ўжо і восень яе застала. Сустракае ваўка, таго, што з'еў бычка.

— Добры дзень, кум! Як маешся?

— Дрэнна, — кажа воўк. — Нешта азяб на дажджы, аж увесь калачуся. Зуб на зуб не трапляе.

— То трэба новы кажух пашыць, — раіць лісіца.

— Праўду, кумка, кажаш, — згадзіўся воўк.

Пабег ён на выган, схапіў авечку і прывалок у лес.

— Хопіць на кажух? — пытаецца ў лісіцы.

— Мала, — кажа лісіца.

Прынёс воўк яшчэ адну авечку:

— Цяпер хопіць?

— Не, яшчэ адну трэба.

Воўк і трэцюю прывалок.

— Ну, а цяпер, — кажа лісіца, — трэба краўца шукаць.

— Дзе ж мне яго шукаць, кумка?

— Я ведаю добрага краўца. Хадзем да яго.

Прывяла лісіца ваўка на луг. Там, у кустах, на прывязі жарабец пасвіўся.

— Вунь ён, кравец!

Воўк зарагатаў:

— Гэта не кравец, а жарабец! Не, кумка, як сабе хочаш, а розуму ў цябе мала.

Лісіца пакрыўдзілася:

— Ты пра мой розум не вельмі языком мялі. Я была разумная і буду, а ты быў дурань, дурнем і застанешся.

Тут ужо і воўк пакрыўдзіўся, аж узлаваўся:

— Паглядзім яшчэ, хто з нас разумнейшы!

— Не хваліся загадзя, — кажа лісіца, — лепш паглядзіш, як зараз з цябе шкуру знімуць.

— Хто зніме? — ляснуў зубамі воўк.

— Гаспадар гэтага каня.

— Не можа быць! — не верыць воўк.

— Пабачыш. На чым жарабец навязаны? — пытаецца лісіца.

— На вяроўцы.

Лісіца засмяялася:

— Вось і відаць, што дурань!

— Чаму? — падскочыў воўк.

— Жарабец на калу навязаны.

— Не можа быць! — залыпаў воўк вачыма.

— Хадзем пакажу.

Прывяла лісіца яго да калка, за які быў прывязаны канец вяроўкі, зняла вяроўку, зрабіла пятлю і закінула ваўку на шыю. Воўк і азірнуцца не паспеў, як у пятлі апынуўся. Тады лісіца падбегла да жарабца, замахала хвастом. Той спужаўся ды як драпануў да хаты, толькі падковы заблішчалі.

Так і прыцягнуў у пятлі ваўка да свайго гаспадара. Ну, а там з яго і шкуру знялі.

Вярнулася лісіца ў лес, закапала авечак у мох на запас, адны толькі мазгі на абед пакінула. Села пад елкаю і есць.

Ідзе мядзведзь — той, што бычка з'еў.

— Што гэта ты, кума, жуеш? — пытаецца.

— Мазгі. Сляпы ты, ці што?

— А дзе ж ты іх дастала?

— З галавы. І ты можаш дастаць, калі хочаш.

— Як?

— Вельмі проста: разганіся ды стукніся галавою аб дуб — мазгі і выскачаць.

— Дзякую ж табе, кума, за добрую параду. Так і зраблю. А то есці даўно хочацца.

Знайшоў ён самы тоўсты дуб, разагнаўся з усяе сілы ды і грымнуўся ў яго лбом.

Тут яму і канец.

## Верабей і мыш

Жылі па суседстве — верабей і мыш: верабей пад страхою, а мыш у норцы пад падрубаю. Жывіліся тым, што ад гаспадароў перападала. Улетку яшчэ сяк-так — можна на полі ці ў агародзе што-небудзь перахапіць. А зімою хоць плач: на вераб'я гаспадар сіло ставіць, а на мыш — пастку.

Надакучыла ім так жыць, задумалі яны ляда[1] капаць, збажыну сеяць.

Ускапалі ладную дзялянку.

— Ну, што будзем сеяць? — пытаецца верабей.

— А тое, што людзі сеюць, — адказвае мыш.

Назбіралі насення ды пасеялі пшаніцу.

— Што тваё будзе, — пытаецца мыш у вераб'я, — карэнне ці вяршкі?

[1] Ляда — поле на месцы высечанага лесу.

— Сам не ведаю.

— Бяры карэнне, — параіла мыш.

— Добра, няхай будзе карэнне.

Прыйшло лета. Паспела пшаніца. Мыш зжала каласы, а вераб'ю пакінула салому. Перанесла мыш каласы ў сваю нару, змалаціла, змалола, напякла пірагоў ды есць сабе зімою. Добра жыве, бяды не мае.

Верабей пакаштаваў салому — нясмачна!

Давялося яму на сметніку галоднаму зімаваць.

Прыйшла вясна. Мыш вылезла з нары, убачыла вераб'я і пытаецца:

— Ну, як, сусед, зімавалася?

— Дрэнна, — кажа верабей, — ледзьве выжыў: нясмачная наша пшаніца ўдалася.

— То давай будзем сёлета моркву садзіць: яна салодкая. Усе зайцы яе любяць.

— Давай, калі не хлусіш! — падскочыў верабей ад радасці.

Ускапалі свежае ляда і пасеялі моркву.

— Што тваё будзе, — пытаецца мыш у вераб'я, — карэнне ці вяршкі?

— Вяршкі! — кажа верабей. — Баюся браць карэнне: я ўжо на пшаніцы апёкся.

— Добра, бяры вяршкі.

Вырасла морква. Верабей узяў вяршкі, а мыш — карэнне. Занесла яна сваё карэнне ў нару і есць сабе памаленьку.

А верабей пакаштаваў вяршкі, аж яны не лепшыя за пшанічнае карэнне...

Надзьмуўся верабей, ледзь не плача.

Ляціць варона. Убачыла вераб'я.

— Чаго ты, верабей, надзьмуўся? — пытаецца.

Расказаў ёй верабей, як яны з мышшу сеялі пшаніцу і моркву.

Выслухала яго варона і зарагатала:

— Дурны ты, верабей! Мыш цябе падманула... У пшаніцы смачныя вяршкі, а ў морквы — карэнне.

Узлаваўся верабей, прыскакаў да мышы.

— Ах, нягодніца, ах, ашуканка! Я з табою біцца буду.

— Ну што ж, — кажа мыш, — давай біцца!

Запрасіў верабей сабе ў хаўруснікі драздоў і шпакоў, а мыш — кратоў і пацукоў.

Пачалі біцца. Доўга біліся, а ніхто нікога не пабіў.

Прыйшлося вераб'ю адступіць са сваім войскам на сметнік.

Убачыла гэта варона:

— Га, га, верабей, слабых ты хаўруснікаў сабраў. Калі б ты паклікаў марскога сокала, той адразу б усіх і мышэй, і кратоў, і пацукоў паглытаў.

Паляцеў верабей на мора, паклікаў марскога сокала.

Прыляцеў сокал і ўсё мышынае войска паглытаў. Адна толькі мыш, тая, што вераб'я падманула, засталася: у нару схавалася.

Настаў вечар. Сокал паляцеў на ржышча начаваць. Сеў на камені ды моцна заснуў. А верабей пашчабятаў ад радасці і палез пад страху.

Тым часам хітрая мыш пабегла ў поле да начлежнікаў, ухапіла галавешку і падпаліла ржышча, дзе спаў сокал. Узняўся агонь і асмаліў сокалу крылы.

Прачнуўся сокал, а ў яго крылаў няма... Пабедаваў ён ды падаўся пехатою да мора. Убачыў яго на дарозе паляўнічы, хацеў застрэліць, а сокал і кажа:

— Не страляй мяне, добры чалавек. Лепш вазьмі з сабою: як адрастуць у мяне крылы, я табе добра аддзякую.

Узяў паляўнічы сокала. Цэлы год карміў і даглядаў яго. Адраслі ў сокала крылы, ён і кажа паляўнічаму:

— А цяпер бяры мяне на паляванне. Я табе зайцоў і птушак буду лавіць.

З таго часу сокал і служыць памочнікам у паляўнічага.

## Жаронцы

Жылі дзед ды баба. Нічога ў іх з гаспадаркі не было — толькі пеўнік і жаронцы.

Дзіўныя гэта былі жаронцы: паложыць у іх дзед адно зярнятка, пакруціць раз-другі, і цэлая кадушка мукі намелецца!

Добра жылі дзед з бабай самі і пеўніка не крыўдзілі.

Дачуўся пра дзіўныя жаронцы пан. Парашыў ён украсці іх.

Прыехаў адвячоркам да дзеда і просіцца пераначаваць. «На паляванні, — кажа, — быў: далёка дадому ехаць, а тут ноч надыходзіць...»

— Начуй сабе, — кажа дзед, — месца хопіць.

Уночы, як дзед і баба заснулі, пан украў жаронцы ды паехаў.

Моцна затужылі дзед з бабай па жаронцах. Сядзяць яны галодныя ды плачуць.

Пеўнік слухаў, слухаў іх, а потым і кажа:

— Не плачце, я вярну вам жаронцы!

— Дзе табе вярнуць іх! — кажуць дзед і баба. — Пан цябе і на парог не пусціць.

— Нічога, — падхрабрыўся пеўнік, — вярну. Хоць сам загіну, а жаронцы вярну.

Развітаўся ён з дзедам і бабай ды паляцеў у панскі двор.

Ляціць ён дарогаю, ляціць ён шырокаю, а насустрач яму каршун.

— Куды, певень, ляціш? — пытаецца.

— У двор да пана.

— Чаго?

— Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Я лячу іх сысқваць.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Лезь у валляк!

Каршун улез пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей.

Ляціць ён дарогаю, ляціць ён шырокаю, а насустрач яму лісіца:

— Куды, певень, ляціш?

— У двор да пана.

— Чаго?

— Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу сысквацъ.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Лезь у валляк!

Лісіца ўлезла пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей.

Ляціць ён дарогаю, ляціць ён шырокаю, а насустрач яму барсук:

— Куды, певень, ляціш?

— У двор да пана.

— Чаго?

— Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу сысквацъ.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Лезь у валляк!

Барсук улез пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей.

Ляціць ён дарогаю, ляціць ён шырокаю, а насустрач яму воўк:

— Куды, певень, ляціш?

— У двор да пана.

— Чаго?

— Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу сысквацъ.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Лезь у валляк!

Ляцеў, ляцеў пеўнік і прыляцеў у двор да пана. А ў пана ў гэты час былі госці — пілі, гулялі. Вокны і дзверы насцеж парасчынялі.

Узляцеў пеўнік на падаконнік, залопаў крыламі ды заспяваў на ўвесь голас:

— Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку! Ён у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Я прыляцеў сысклваць. Аддавай, пан, жаронцы!

Пану стала брыдка перад гасцямі, што пеўнік яго злодзеем абзывае. Вось ён і кажа:

— Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, укіньце ў куратнік: няхай яго куры задзяўбуць!

Схапілі слугі пеўніка, укінулі ў куратнік, а самі пайшлі.

Тут пеўнік і кажа:

— Каршун, каршун, вылазь з валляка, падушы курэй!

Выскачыў каршун з валляка, перадушыў усіх курэй ды паляцеў у лес.

Пеўнік зноў прыляцеў на падаконнік:

— Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку! Ён у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў...

— Ах, — кажа пан, — дык яго куры не задзяўблі? Добра ж! Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, занясіце ў гусятнік: няхай яго гусі зашчыплюць!

Схапілі слугі пеўніка і ўкінулі ў гусятнік.

Пеўнік ачухаўся ды кажа:

— Лісічка, лісічка, вылазь з валляка, падушы гусей!

Лісіца так і зрабіла, а сама ў лес пабегла.

Паляцеў пеўнік на падаконнік ды зноў сваё спявае:

— Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку!..

— Ах, — кажа пан, — дык яго і гусі не зашчыпалі? Добра ж! Слугі, слугі, занясіце яго ў свінарнік: няхай яго свінні загрызуць!

Занеслі слугі пеўніка ў свінарнік. А там пеўнік кажа:

— Барсук, барсук, вылазь з валляка, пагрызі свіней.

Барсук так і зрабіў, а сам пабег у лес.

Прыляцеў пеўнік на падаконнік:

— Ку-ка-рэ-ку!..

— Ах, — кажа пан, пачуўшы пеўнікаў голас, — дык яго і свінні не загрызлі?.. Слугі, слугі, укіньце яго ў стайню: няхай яго коні затопчуць!

У стайні пеўнік кажа:

— Воўк, воўк, вылазь з валляка, парэж коней!

Воўк выскачыў, парэзаў усіх коней і ходу ў лес.

Прыляцеў пеўнік на падаконнік:

— Ку-ка-рэ-ку!..

Пан аж за галаву хапіўся: што ж рабіць? Потым кажа:

— Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, занясіце кухару, няхай ён яго засмажыць.

Слугі так і зрабілі.

Кухар засмажыў пеўніка і прынёс на талерцы пану. Пан схапіў яго ды і праглынуў са злосці ўсяго адразу. А пеўнік ажыў у панскім жываце, вытыркнуў дзюбу праз правае вуха ды заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку!..

Пан закрычаў:

— Слугі, слугі, хапайце сякеры, сячыце гэтага нягодніка!

Схапілі слугі сякеры, як секанулі, дык і адсеклі пану правае вуха... А пеўнік пералез у левае вуха ды зноў заспяваў.

— Слугі, слугі, — крычыць пан, — сячыце яго!

Секанулі слугі, ды не па пеўніку, і адсеклі пану левае вуха. Застаўся пан без вушэй.

Тады пеўнік высунуўся ў рот.

— Слугі, слугі, — крычыць пан, разявіўшы рот, — сячыце, сячыце яго!

Секанулі слугі, ды не па пеўніку, а па языку, — адсеклі пану язык.

А пеўнік выскачыў, паляцеў на падаконнік, сеў і спявае.

Бачыць пан — няма рады: усю яго жывёлу пеўнік перадушыў, ды і самога скалечыў. Вынес ён жаронцы з пакояў і аддаў іх пеўніку.

Пеўнік схапіў адзін камень пад адно крыло, другі — пад другое і паляцеў дахаты.

Зарадаваліся дзед з бабай жаронцам, пачалі ў іх муку малоць.

З мукі хлеб пякуць, самі ядуць і пеўніку даюць.

## Сынок з кулачок

Жылі дзед і баба. І быў у іх сынок. Ды такі малы, што з-пад шапкі не відаць. Не большы за кулак. Так дзед з бабай яго і звалі: сынок з кулачок.

Паехаў аднойчы дзед араць, а бабе сказаў, каб згатавала абед ды прынесла яму на поле.

Баба згатавала абед ды кажа да сына:

— Каб ты быў большы, дык занёс бы бацьку абед за мяне. А так мне самой трэба ісці.

А сынок падхрабрыўся і кажа:

— Давай, мама, занясу абед.

— Дзе табе данесці яго? — не верыць маці.

— Данясу!

Узяў сынок з кулачок абед, паставіў у дзедаў лапаць, сам ззаду сеў і паехаў.

Едзе сабе і песенькі спявае. Прыехаў на поле, гукае бацьку:

— Тата, я табе абед прывёз!

Убачыў яго бацька, зарадаваўся:

— Малайчына, сынок!

Сеў ён абедаць, а сын кажа:

— Тата, пасадзі мяне на саху, я араць буду.

— Як жа ты будзеш араць?

— А паглядзіш, — кажа сын.

Пасадзіў яго бацька на саху. Сынок з кулачок узяў лейцы ў рукі і крыкнуў на каня:

— Но, сівы-буры!

І пачаў араць.

Ехаў дарогаю пан у брычцы. Убачыў ён такое дзіва.

— Прадай, дзед, мне свайго аратага, — кажа пан.

— Не, пане, не прадам: гэта мой сынок.

А пан прычапіўся як смала: прадай ды прадай!

— Я табе, — кажа пан, — дам шмат грошай. Пачуў гэта сынок, падбег да бацькі і шэпча яму:

— Прадавай, тата, толькі вазьмі ў пана за мяне жменю золата. Не бойся, я ад яго ўцяку...

Згадзіўся дзед і прадаў пану сына за жменю золата.

Узяў пан хлопчыка, пасадзіў у кішэню і паехаў. «Вось, — думае, — добрага аратага нажыў. Гэтакага ні ў кога няма. Няхай зайздросцяць мне ўсе паны!»

Тым часам хлопчык прадраў панскую кішэню, цішком вылез з яе ды выскачыў з брычкі. Пан нават і не пачуў. Паехаў сабе дамоў хваліцца дзіўным аратым.

Агледзеўся хлопчык: кругом густы лес.

Пахадзіў ён, пахадзіў па лесе і заблудзіўся.

А тут і вечар настаў. Сеў хлопчык пад елкаю і плача.

Ні адсюль, ні адтуль — галодны воўк. Ухапіў ён хлопчыка і праглынуў яго.

Апамятаўся хлопчык, пачаў брыкацца ў воўчым жываце, пачаў крычаць:

— Гэй, воўк, нясі мяне дахаты!

— Не панясу, — кажа воўк.

— Нябось, панясеш, як надакучу табе.

— Паглядзім, — агрызнуўся воўк і пабег у поле шукаць авечак.

Прыбягае да чарады авечак, а хлопчык як крыкне з воўчага жывата:

— Гэй, пастухі, глядзіце, воўк па авечкі крадзецца!

Пачулі гэта пастухі, прагналі злодзея. Ды яшчэ і сабак нацкавалі на яго.

Прыбег воўк у лес і кажа хлопчыку:

— Вылазь вон!

— Не, не вылезу, — адгукаецца хлопчык. — Нясі мяне дадому.

— Не панясу! — злуецца воўк.

Выгаладаўся воўк ды зноў пайшоў шукаць спажывы. Але куды ні прыйдзе, усё няўдача: не дае яму хлопчык спакою.

Зусім схуднеў воўк, ледзьве ногі цягае. А хлопчык усё сваё права правіць:

— Нясі мяне дадому!

Бачыць воўк — няма рады: панёс хлопчыка дадому.

Прынёс да двара і кажа:

— Вылазь. Вунь твая хата.

— Не, — адказвае хлопчык, — нясі на двор.

Прынёс яго воўк на двор і зноў крычыць:

— Вылазь!

— Не, нясі ў сенцы.

Прынёс воўк яго ў сенцы.

Тут хлопчык выскачыў вон ды як закрычыць:

— Тата, хадзі ваўка біць!

Выбег бацька з качаргою і забіў ваўка. Шкуру злупіў і бабе футра пашыў. А баба сасмажыла за гэта дзеду і сынку гуся. Тут і казка ўся.

## Сабака-паляўнічы

Жыў дзед. І быў у яго сабака.

Надакучыла сабаку жыць у дзеда: і вартаваць няма чаго, і корму мала. Пайшоў ён у лес на паляванне. Напаткаў там ваўка. Разгаварыўся.

— Няма чаго, — кажа, — мне дома рабіць. Ды і з ядою туга. Хачу заняцца паляваннем.

— Добра, — кажа воўк, — жыві са мною. Навучу цябе паляўнічаму рамяству.

Застаўся сабака жыць у ваўка.

Жывуць яны дзень, другі — захацелі есці. Воўк кажа сабаку:

— Збегай, брат, на поле, глянь, можа, там хто ёсць.

Вярнуўся сабака з поля і кажа:

— Там гусі ходзяць.

Воўк пакруціў галавою:

— Э, беганіны шмат, а наедку мала.

І не пайшоў гусей лавіць.

Праз гадзіну воўк зноў пасылае сабаку:

— Збегай глянь, можа, там яшчэ хто ёсць?

Вярнуўся сабака і кажа:

— Свінні ў бульбе капаюцца.

— Э, — кажа воўк, — з імі таксама клопату шмат: пішчаць, хоць ты вушы затыкай. Пачакаем.

Пачакалі крыху, воўк і кажа:

— Збегай яшчэ паглядзі — ці няма там чаго цікавейшага?

Пабег сабака, паглядзеў — на полі конь пасецца. Вярнуўся ён назад і сказаў аб гэтым ваўку.

— Вось цяпер можна збірацца на паляванне.

Пабег воўк у азярцо, абмачыўся ў вадзе, выкачаўся ў пяску ды пытаецца ў сабакі:

— Ну як, падобны я цяпер на паляўнічага?

— Дзіва што! — кажа сабака.

Пайшлі на поле. Воўк забег каню наперад, сцерухнуўся, засыпаў яму вочы пяском, а потым схапіў за горла і задушыў.

Ад'еўся сабака, патлусцеў.

— Ну, цяпер, — кажа ён ваўку, — я ўжо і без цябе абыдуся. Буду жыць адзін.

Пакінуў сабака ваўка і пайшоў сабе далей. Сустракае па дарозе ката.

— Куды ідзеш, кот? — пытаецца.

— Мышэй лавіць.

— Э, — кажа сабака, — ці варта такою драбязою займацца? Хадзем лепш са мною: навучу цябе паляўнічаму рамяству.

Згадзіўся кот, і сталі яны жыць разам. Жывуць дзень, другі — захацелі есці. Сабака кажа:

— Збегай на поле, паглядзі, хто там ёсць.

Збегаў кот, паглядзеў.

— Гусі ходзяць, — дакладвае сабаку.

— Э, — паморшчыўся сабака, — беганіны шмат, а наедку мала.

Праз гадзіну сабака зноў пасылае ката на поле.

Вярнуўся кот і кажа:

— Свінні ў бульбе капаюцца.

— Э, — кажа сабака, — з імі таксама клопату шмат: пішчаць, хоць вушы затыкай. Пачакаем.

Паляжалі крыху, а есці і аднаму, і другому хочацца.

— Збегай яшчэ на поле паглядзі — ці няма там чаго цікавейшага? — зноў пасылае сабака ката ў разведы.

Вярнуўся кот з поля і кажа:

— Конь пасецца.

Сабака ўсхапіўся:

— Вось цяпер можна збірацца на паляванне!

Пабег ён у азярцо, абмачыўся ў вадзе, выкачаўся ў пяску і пытаецца ў ката:

— Ну як, падобны я на паляўнічага?

— Вельмі падобны, — кажа кот. — Як выліты. Воўк таксама, перш чым на каня нападаць, у вадзе купаецца і ў пяску качаецца.

— Ды я гэтую навуку ў ваўка і пераняў, — хваліцца сабака.

Пайшлі на поле.

Сабака забег каню наперад, сцерухнуўся, як воўк, ды хацеў яго за горла ўхапіць. А конь як дасць яму капытом, дык той і паляцеў кулём з паламанымі рэбрамі.

Паглядзеў кот на такое паляванне ды кажа:

— Не, лепш паляваць на мышэй: хоць работа і марудная, затое рэбры будуць цэлыя.

І пайшоў ён далей сваёй дарогаю.

# Лісіца і дрозд

Жылі дзед і баба. Дзед у лес хадзіў дровы секчы, а баба дома была, пірагі пякла.

Аднаго разу злавіў дзед у лесе дзікага парсюка і прынёс дахаты. Харошы быў парсючок — стракаценькі ды паласаценькі.

Пачала баба парсючка карміць — і цестам, і мукою, і свежаю травою.

Але, вядома, дзік — яму жалудоў давай! Цягне яго ў лес па жалуды.

Нічога не зробіш, пачала яго баба ў лес пускаць, жалуды збіраць.

Цэлы дзень ён у лесе гуляе, а нанач дахаты бяжыць. Такі добры парсючок быў!

Аднойчы бяжыць ён у лес, а насустрач яму галодны воўк.

— Парсюк-парсючок, дзік-дзічок, — кажа воўк, — я цябе з'ем.

Парсючок хітры быў, падумаў ён і адказвае:

— Не еш мяне, шэры воўк, лепш ідзі са мною на жалудовую палянку: там чарада гусей пасецца.

А воўк да гусей вельмі ахвочы. Паверыў ён дзічку-парсючку і пайшоў за ім на жалудовую палянку.

На дарозе была вялікая воўчая яма. Парсючок яе ведаў ды і абышоў, а воўк — бух у яму! І сядзіць там.

Назаўтра парсючок зноў пайшоў на жалудовую палянку.

Ідзе ды ідзе, сустракае яго лісіца:

— Куды ідзеш, парсючок?

— Па жалуды.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Хадзем.

Ідуць яны, ідуць, падышлі да ямы. Парсючок абышоў яму, а лісіца — бух ваўку на галаву!

На трэці дзень сустракае парсючка заяц:

— Куды ідзеш, парсючок?

— Па жалуды.

— Вазьмі і мяне з сабою.

— Хадзем.

Дайшлі да ямы — і заяц туды паляцеў. Стала іх цяпер у яме трое: воўк, лісіца і заяц.

Сядзяць яны ў яме, захацелі есці. Лісіца кажа:

— Давайце крычаць: хто слабей крыкне, таго з'ядзім.

Крыкнуў воўк — моцна.

Крыкнула лісіца — таксама не надта слаба.

Крыкнуў заяц — зусім слаба: толькі піскнуў.

Ну, яго і з'елі. Воўк усе косці паеў, а лісіца кішкі сабе ўзяла і ў пясок закапала.

Назаўтра зноў прагаладаліся. Лісіца дастала кішкі ды есць патроху.

— Што гэта ты, кума, ясі? — пытаецца воўк.

— Кішкі.

— Дзе ты іх узяла?

— Лапаю сабе жывот распарола і дастала.

Воўк паверыў, распароў сабе кіпцюрамі жывот ды і сканаў. Лісіца і яго з'ела.

Прыляцеў да ямы дрозд. Лісіца просіцца ў яго:

— Дроздзік-драздок, вызвалі мяне з ямы!

— Як жа я цябе вызвалю?

— Накідай у яму галля, я і вылезу.

Дрозд накідаў галля. Лісіца вылезла з ямы і кажа:

— Дроздзік-драздок, вызваліў ты мяне?

— Вызваліў.

— Накармі ж цяпер мяне.

— Як жа я цябе накармлю?

— Вунь баба на поле ідзе, міску бліноў нясе. Ты заляці ёй наперад ды сядзь на дарозе.

— І ўсё?

— Усё.

Паляцеў дрозд і сеў пасярод дарогі. Баба ўбачыла дразда, паставіла міску з блінамі і кінулася яго лавіць. А лісіца схапіла бліны ды за кусты!

Наелася лісіца бліноў, прыйшла да дразда:

— Дроздзік-драздок, вызваліў ты мяне?

— Вызваліў.

— Накарміў?

— Накарміў.

— Цяпер напаі.

— Як жа я цябе напаю?

— А вунь, бачыш, чалавек бочку з півам вязе. Ты ўзляці на бочку ды дзяўбі затычку.

— І ўсё?

Паляцеў дрозд, сеў на бочку ды давай дзяўбці затычку.

Убачыў гэта фурман, схапіў кол. Дрозд узляцеў угору, а фурман з усяе сілы трах па бочцы!

Бочка разбілася, піва вылілася. Цэлая лужына налілася.

Паехаў чалавек, бядуючы, далей, а лісіца напілася піва з лужыны, колькі ёй хацелася, ды зноў пабегла да дразда:

— Дроздзік-драздок, вызваліў ты мяне?

— Вызваліў.

— Накарміў?

— Накарміў.

— Напаіў?

— Напаіў.

— Цяпер пацеш ты мяне.

— Як жа я цябе пацешу?

— А вунь на таку дзед з бабаю гарох малоцяць. Ляці туды і садзіся на лоб то бабе, то дзеду.

— І ўсё?

— Усё.

Паляцеў дрозд на ток, сеў бабе на лоб. Убачыў дзед дразда ды — трах цэпам! Але не па дразду, а па бабіным ілбе. Дрозд фыркнуў і перасеў на дзедаў лоб. Тады баба з крыкам: «А кыш!» — бах цэпам дзеду ў лоб!..

Лісіца аж качаецца са смеху, пазіраючы, як дзед малоціць бабін лоб, а баба — дзедаў.

Набілі яны сабе гузакоў, кінулі малацьбу ды пайшлі дахаты прымочкі на лбы ставіць.

А дразду хоць бы што — паляцеў сабе ў лес, пасвістваючы.

## Казка пра быка і яго сяброў

Пасвіўся на лузе бык. Убачыў ён каля рэчкі туман і напужаўся: падумаў, што зямля і вада гарадь.

«Пабягу я лепш адгэтуль на край свету!» — парашыў бык.

Задраў хвост і пабег.

Сустрэўся яму па дарозе казёл:

— Бык, куды бяжыш?

— На край свету.

— Чаго?

— У нас зямля і вада гараць. Баюся, каб і мне не згарэць.

— Пабягу і я з табою.

— Бяжы.

Бягуць яны, а насустрач ім парсюк:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць! Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўтрох. Сустракае іх гусак:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць! Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўчатырох. Сустракае іх певень:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гарэць!

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Беглі, беглі, прыбеглі ў лес. А тут і зіма надыходзіць.

Бык кажа:

— Ну, хопіць бегчы: зімою зямля не загарыцца. Давайце будзем хату рабіць ды запасы на зіму рыхтаваць.

Парсюк кажа:

— Мне хаты не трэба: я выкапаю сабе яму, нанашу туды моху на падсцілку, жалудоў на харч ды буду зімаваць. Мне і так цёпла будзе!

Казёл кажа:

— А я карою пракармлюся, у дупле пагрэюся.

— А ты, гусак? — пытаецца бык.

— У мяне пер'е цёплае, я дзюбу ў яго схаваю ды так перазімую.

— А ты, певень?

— А мне што, я і пад ялінкаю перазімую.

Што рабіць? Узяўся бык адзін хату будаваць. Нанасіў бярвення, моху, збудаваў цёплую хату і жыве сабе ў ёй без бяды.

Насталі лютыя маразы. Парсюк круціўся, круціўся ў яме, не вытрымаў ды пайшоў да быка:

— Пусці, бык, у хату: сцюдзёна вельмі.

— Не, — кажа бык, — не пушчу: ты ў мох закапаешся, табе і так цёпла будзе!

— Калі не пусціш, — кажа парсюк, — дык я падкапаю лычам падрубу — твая хата абернецца, ды яшчэ і цябе самога задушыць.

Напужаўся бык: хочаш не хочаш, трэба пускаць парсюка ў хату.

— Ну, добра, — кажа, — ідзі: удвух весялей будзе.

На другі дзень прыходзіць казёл:

— Пусці, бык, у хату.

— Навошта табе хата: ты ў дупле перазімуеш!

— Ну, калі не пусціш, дык я разганюся, стукну рагамі ў сцяну і праб'ю дзірку: мароз залезе ў хату, табе холадна будзе.

Што рабіць быку — пусціў казла.

— Добра, — кажа, — хата ў мяне не малая: хопіць і траім месца.

На трэці дзень прыходзіць гусак:

— Бык, бык, пусці ў хату пагрэцца!

— Не пушчу!

— Чаму?

— У цябе пер'е цёплае, ты ў яго дзюбу схаваеш ды і так перазімуеш.

— Ну, калі не пусціш, дык я дзюбаю ўсю страху расцягаю, табе холадна будзе.

Спужаўся бык — пусціў і гусака.

На чацвёрты дзень прыходзіць певень:

— Пусці, бык, у хату!

— А хіба табе пад ялінкаю не цёпла? — засмяяўся бык. — Не пушчу! У мяне ўжо і так цесна.

— А калі не пусціш, дык я ўзлячу на гару і ўвесь пясок са столі зграбу: дух з хаты праз столь выйдзе, і ты замерзнеш.

Спужаўся бык — пусціў і пеўня.

Жывуць яны ў хаце ўпяцёх.

Ідзе мядзведзь. Убачыў хату.

— Хто тут жыве? — пытаецца.

— Бык, казёл, парсюк, гусак і певень, — адказваюць з хаты.

— Пусціце і мяне пагрэцца.

— Не, не пусцім! Ты нам не кампанія.

Мядзведзь стукнуў лапаю ў дзверы, праламаў іх і ўвайшоў у хату.

Тут бык выставіў рогі ды прыпёр мядзведзя да сцяны. А казёл давай яму рагамі ў бок лупіць, а парсюк зубамі за жывот ірваць, а гусак у нос дзяўбці... А певень узляцеў на лаву ды давай крычаць: «Кудах-кудах! Куды-куды!» Ледзьве жывым выскачыў з хаты няпрошаны госць — мядзведзь.

Ідзе ён, кульгаючы, па лесе, сустракае ваўка.

— Дзе быў, сусед? — пытаецца ў яго воўк. — Чаму ты такі хмуры?

— Ой, — кажа мядзведзь не сваім голасам, — трапіў я да страшэнных разбойнікаў. Адзін мяне віламі да сцяны прыціснуў — не павярнуцца. Другі ражнамі ў бок таўчэ. Трэці абцугамі кішкі выцягвае. Чацвёрты спіцаю ў нос коле. А пяты, у чырвонай шапачцы, ззаду шабля крывая, на нагах шпоры, бегае па лаве ды ўсё крычыць: «Падай, падай яго сюды!» Добра, што я ўцёк, бо не ведаю, што б гэты пяты разбойнік зрабіў са мною...

З таго часу больш ні мядзведзь, ні воўк у тую хату не заглядвалі.

## Селянін, мядзведзь і лісіца

Араў селянін поле. Не канём, а валом. А вол такі лянівы быў, што проста бяда. Ні голасу не слухае, ні пугі не баіцца.

Раззлаваўся селянін на вала ды як крыкне на яго:

— А ну, каб цябе мядзведзь задушыў!

Толькі ён так сказаў, аж тут і мядзведзь ідзе.

— Ну, давай, — кажа да аратага, — свайго вала. Я яго задушу.

Пачухаў селянін патыліцу. Шкада стала яму вала. Ды і араць не будзе на чым. Сам жа сахі не пацягнеш.

Вось ён і пачаў прасіцца ў мядзведзя:

— Дай, — кажа, — хоць загон дакончу. А ты схадзі тым часам за мяжу, у быльнёг, адпачні там.

— Добра, — згадзіўся мядзведзь. — Спяшацца мне няма куды.

Пайшоў ён за мяжу і лёг адпачываць.

Бяжыць з лесу лісіца, спынілася каля селяніна:

— Тру-ру-ру! Тру-ру-ру! Гэй, чалавеча, ці не бачыў ты тут ваўкоў-медзвядзёў? Стральцы едуць, пра іх пытаюцца.

Падумаў селянін: калі сказаць пра мядзведзя, ён, чаго добрага, замест вала яго самога задушыць... «Лепш прамаўчу», — парашыў селянін.

— Не, лісанька, не бачыў, — адказвае ён.

А хітрая лісіца пакруцілася, пакруцілася каля воза ды зноў пытаецца:

— А што гэта там, за мяжою, ляжыць?

— Калода на лучыну, — кажа селянін.

Лісіца памахала хвастом:

— Каб гэта была калода, дык яна б на возе ляжала...

Сказала так і пабегла ў лес.

Пачуў гэта мядзведзь і просіцца ў селяніна:

— Палажы мяне на воз.

Селянін палажыў яго на воз.

Зноў прыбягае лісіца:

— Тру-ру-ру! Тру-ру-ру! Гэй, чалавеча, ці не бачыў ты ваўкоў-медзвядзёў? Стральцы едуць, пра іх пытаюцца.

— Не, не бачыў...

— А што гэта ў цябе на возе ляжыць?

— Калода на лучыну.

— Каб гэта была калода, яна б вяроўкаю была прывязана.

Сказала так і пабегла ў лес.

Мядзведзь кажа селяніну:

— Прывяжы мяне вяроўкаю.

Узяў селянін вяроўку ды так увязаў мядзведзя, што той і не зварухнецца.

А лісіца тут як тут:

— Тру-ру-ру! Тру-ру-ру! Гэй, чалавеча, ці не бачыў ты ваўкоў-медзвядзёў? Стральцы едуць, пра іх пытаюцца.

— Не, не бачыў.

— А што гэта ў цябе на возе ляжыць?

— Калода на лучыну.

— Каб гэта была калода, у ёй бы сякера тарчала.

Сказала і пабегла ў лес.

Мядзведзь дужа напужаўся стральцоў, просіць селяніна:

— Зрабі, каб на мне сякера тарчала.

— Добра, — кажа селянін.

Узяў ён сякеру і ўсадзіў з размаху ў мядзведзя. Мядзведзь трохі паварушыўся — ды і дух з яго вон.

А лісіца зноў тут.

— Ну, цяпер дай мне гасцінца за вала, — кажа да селяніна.

— Якога?

— Мяшок курэй.

— Добра, — кажа селянін, — дам табе гасцінца. Пачакай трошкі.

Пайшоў селянін дахаты па курэй, а тут і сапраўды наехалі стральцы з сабакамі. Убачылі сабакі лісіцу ды за ёю.

Лісіца і ад курэй адраклася. Ледзь да сваёй нары дабегла.

Ускочыла ў нару, задыхалася.

А сабакі стаяць, лісіцу вартуюць, з нары не выпускаюць.

Надакучыла лісіцы ў нары сядзець, парашыла яна ад сабак адкупіцца.

5 Зак. 1790

— Вочы, вочы, — кажа лісіца, — што вы рабілі, як я ад сабак уцякала?

— Глядзелі, куды табе бегчы.

— А вы, вушы?

— Слухалі, ці блізка сабакі.

— А вы, ногі?

— Хутчэй беглі, цябе ратавалі.

— А ты, хвост, што рабіў?

— А я ўсё то за пень, то за калоду чапляўся.

— Ну, хвасцішча-дурнішча, аддам жа я цябе сабакам!

І выставіла хвост з нары:

— Наце вам, сабакі, хвост!

Сабакі ўхапіліся за хвост ды і лісіцу разам з ім выцягнулі.

## Як лісіца ваўка судзіла

Пайшоў адзін чалавек у лес па карчы. Накапаў смалякоў і пачаў іх у мяшок складваць. Аж бачыць — бяжыць воўк.

— Ратуй ты мяне, чалавеча! — просіцца воўк. — За мною стральцы гоняцца. Я табе за гэта добра аддзякую — лісіцу на каўнер прыцягну.

— Як жа я цябе выратую? — кажа чалавек.

— Схавай у мяшок і нясі замест карчоў.

Чалавек так і зрабіў. Узваліў на плечы ваўка ў мяшку і пайшоў дарогаю.

Пад'ехалі стральцы, пытаюцца:

— Што нясеш, дзядзька?

— Карчы...

— А ваўка тут не бачыў?

— Не, не бачыў...

Стральцы і памчаліся сваёю дарогаю.

Зняў тады чалавек мяшок з плячэй, развязаў.

— Ну, вылазь! — кажа ваўку.

— А стральцоў блізка няма?

— Няма.

Вылез воўк з мяшка і кажа да чалавека:

— А цяпер я цябе з'ем!

— Што ты, воўча! — здзівіўся чалавек. — Я цябе ад смерці выратаваў, а ты мяне з'есці хочаш... Не, гэта не па закону!

— Як не па закону? — злуецца воўк. — Гэта наш, воўчы, закон.

— Дык хіба ж няма праўды на свеце? — не згаджаецца чалавек.

— Няма! — кажа воўк.

— Не, — кажа чалавек, — праўда ёсць! Давай папытаемся ў каго хочаш.

— Давай! Толькі хутчэй!

Пайшлі яны разам дарогаю. Сустракаюць сабаку — старога, худога, скура ды косці.

— Сабака, — спыніў яго чалавек, — рассудзі ты нас.

— А які ў вас суд? — пытаецца сабака.

— Ды так і так, — пачаў расказваць чалавек.

Выслухаў сабака і кажа:

— Няма праўды на свеце! Пакуль я быў малады і шустры, гаспадар мяне карміў, даглядаў.

А як састарэў, дык зусім з двара прагнаў. Цяпер вось іду ў лес — можа, які галодны воўк з'есць, каб не мучыцца доўга.

— Не, не, — перабіў яго воўк, — спачатку я чалавека з'ем!

Ляснуў ён зубамі і кінуўся да чалавека.

— Чакай! — сказаў чалавек. — Сабака судзіць не папраўдзе — ён сам пакрыўджаны. А такі суддзя несправядлівы. Пойдзем далей, папытаемся яшчэ ў каго-небудзь.

— Добра, — згадзіўся воўк, — ну пойдзем. Толькі хутчэй! Мне няма калі з табою судзіцца.

Пайшлі далей. Сустракаюць лісіцу.

— Рассудзі нас, лісічка, — просіць чалавек.

— А што ў вас за суд?

— Ды вось справа якая. Капаў я карчы ў лесе. Бачу — бяжыць воўк. «Ратуй мяне ад стральцоў, — просіцца. — Я табе за гэта лісіцу на каўнер прыцягну». Я і выратаваў яго — у мяшок схаваў. А як мінула бяда, дык ён мяне з'есці хоча. Скажы сама: ці ж гэта па закону? Хіба ж няма праўды на свеце?

Падумала лісіца і кажа:

— Не магу я вас рассудзіць, не бачыўшы, як яно ўсё было. Трэба на месцы дазнанне зрабіць.

— Добра, рабі дазнанне, — згадзіўся воўк. — Толькі хутчэй! Мне няма калі доўга чакаць.

Прыйшлі на тое месца, дзе чалавек карчы капаў.

— Вось, — паказвае чалавек, — тут я ваўка спаткаў, тут яго і ў мяшок схаваў.

— Так, так, — кажа лісіца, — зараз будзем дазнанне рабіць.

Узяла мяшок, пакруціла-пакруціла яго перад сабою і кажа:

— Нешта ты, чалавеча, не тое гаворыш... Хіба ж пан воўк мог улезці ў гэты мяшок?

— Ад страху не толькі ў мяшок — у табакерку ўлезеш, — адказвае воўк.

— Як суддзя, я гэтаму не веру...

— Не верыш?! — агрызнуўся воўк. — Дык глядзі сама!

Расхінула лісіца мяшок, воўк — гэльц! — і ўскочыў у яго.

— Ну, цяпер верыш?!

— Але, — міргае лісіца чалавеку, — цяпер добра бачу, што мяшок якраз па ваўку. Застаецца толькі мацней завязаць.

Тут чалавек, доўга не марудзячы, узяў ды і завязаў мяшок.

— З пана ваўка, — смяецца лісіца, — таксама нядрэнны каўнер будзе!

Падзякаваў чалавек лісіцы за справядлівы суд і кажа да ваўка:

— Ну вось, а ты казаў — няма праўды на свеце. Ёсць праўда!

Ускінуў ён мяшок з ваўком на плечы і панёс дахаты — шкуру знімаць.

## Коцік, пеўнік і лісіца

Жылі-былі коцік і пеўнік. Добра жылі, дружна. Коцік на паляванне хадзіў, а пеўнік абед варыў, хатку падмятаў, песні спяваў.

Аднойчы пайшоў коцік на паляванне, а пеўнік зачыніў за ім дзверы ды пачаў абед варыць.

Бяжыць лісіца, убачыла хатку, падскочыла да акенца:

— Гэй, хто тут гаспадар?

— Я, — кажа пеўнік.

— Пусці ў хату.

— Чаго?

— Пасяджу трохі, адпачну з дарогі.

Пеўнік добры быў, пусціў лісіцу ў хатку.

А лісіца — цап! — ухапіла яго і панесла дадому. Апамятаўся пеўнік, закрычаў на ўвесь лес:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

Пачуў гэта коцік, прыбег, адабраў у лісіцы пеўніка і завёў яго назад у хатку.

— Ну, — кажа, — глядзі ж, другі раз не пускай лісіцу, бо цяпер я далей пайду і магу не пачуць цябе.

— Добра, — кажа пеўнік, — не пушчу.

Зноў пайшоў коцік на паляванне.

А лісіца тут як тут:

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, адчыні!

— Чаго табе трэба?

— Пазыч агню.

— Навошта?

— Буду ў печы паліць.

— Не адчыню, бо ты схопіш мяне.

— Ды не, больш не буду хапаць.

Паверыў пеўнік лісіцы і адчыніў дзверы. А тая — ухапіла яго і панесла.

Пеўнік зноў пачаў клікаць коціка:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

Добра, што коцік далёка не адышоўся ад дому: пачуў ён пеўніка, прыбег і адабраў яго ад лісіцы.

— Ну, — кажа ён пеўніку, — калі ты і трэці раз адчыніш лісіцы дзверы, то бяда табе будзе: цяпер я пайду на паляванне яшчэ далей.

— Не, — кажа пеўнік, — больш я гэтай зладзейцы дзвярэй не адчыню.

— Глядзі ж!

І коцік пайшоў у самыя далёкія лясы.

Прыбегла лісіца:

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, дай вугалёк!

— Не, цяпер я дзверы табе не адчыню!

— Дык ты праз акенца падай.

— Праз акенца можна, — згадзіўся пеўнік.

Адчыніў ён акенца, а лісіца ўхапіла яго і панесла.

Крычаў, крычаў пеўнік, ды коцік яго так і не пачуў: вельмі ж далёка ён зайшоў.

Прынесла лісіца пеўніка дахаты і загадала дочкам у печы паліць, з пеўніка крупнік варыць. А сама пайшла гасцей склікаць.

Вярнуўся з палявання коцік, бачыць — няма пеўніка. «Мусіць, яго зноў лісіца ўхапіла? — падумаў коцік. — Як жа яго цяпер з бяды выратаваць?»

Зрабіў ён скрыпачку галасістую ды пайшоў да лісіцы.

Прыйшоў, сеў ля варот і зайграў, прыпяваючы:

— Тылі-тылі, скрыпіца,
Тут сядзела лісіца.
А ў лісіцы новы двор,
Сем дачушак
На выбор.
Восьмы пеўнік,
Гэта мой!

Пачулі лісіцыны дочкі музыку і кажуць:

— Як хораша нехта іграе. Бяжым паслухаем, а пеўніка зварыць яшчэ паспеем.

Выбеглі яны на двор ды і заслухаліся.

Пеўнік жа тым часам не драмаў: выскачыў з лісіцынай хаткі ды пабег з коцікам дадому. Так і засталася лісіца ні з чым.

## Лёгкі хлеб

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

— Ты што ясі, чалавеча?

— Хлеб, — адказвае касец.

— А смачны ён?

— Дзіва што смачны!

— Дай мне пакаштаваць.

— Калі ласка!

Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку.

Спадабаўся ваўку хлеб. Ён і кажа:

— Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці, але дзе мне яго даставаць? Парай, чалавеча!

— Добра, — кажа касец, — навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць.

І пачаў ён вучыць ваўка:

— Перш-наперш трэба зямлю ўзараць...

— Тады і хлеб будзе?

— Не, брат, пачакай. Потым трэба зямлю забаранаваць...

— І можна хлеб есці? — замахаў воўк хвастом.

— Што ты, пачакай яшчэ. Раней трэба жыта пасеяць...

— Тады будзе хлеб? — аблізнуўся воўк.

— Не яшчэ. Дачакайся, пакуль жыта ўзыдзе, халодную зіму перазімуе, вясной вырасце, потым закрасуе, потым пачне наліваць зярняты, потым спець...

— Ох, — уздыхнуў воўк, — вельмі ж доўга чакаць. Але цяпер-то ўжо я наемся хлеба ўволю!

— Дзе там наясіся! — перапыняе касец. — Рана яшчэ. Спачатку спелае жыта трэба зжаць, потым у снапы звязаць, снапы ў бабкі паставіць. Вецер іх правее, сонейка прасушыць, тады вязі іх на ток...

— І есці хлеб буду?

— Які нецярплівы! Спачатку трэба снапы абмалаціць, зярняты ў мяшкі сабраць, мяшкі ў млын завезці ды мукі намалоць...

— І ўсё?

— Не, не ўсё. Муку трэба замясіць у дзяжы і чакаць, пакуль цеста падыдзе. Тады ў гарачую печ пасадзіць.

— І спячэцца хлеб?

— Але, спячэцца хлеб. Вось тады і наясіся яго, — скончыў касец навуку.

Задумаўся воўк, потым пачухаў лапай патыліцу і кажа:

— Не! Гэтая работа занадта марудная і цяжкая. Лепш парай мне, чалавеча, як лягчэй яду здабываць.

— Ну што ж, — кажа касец, — калі не хочаш цяжкі хлеб есці, параю табе лёгкі. Ідзі на выган, там конь пасецца...

Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня:

— Конь, конь! Я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа конь, — еш. Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.

— І то праўда, — згадзіўся воўк.

Нагнуўся ён падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы...

Перакуліўся воўк ды ходу.

Прыбег да рэчкі. Бачыць — на беразе гусі пасуцца. «Ці не з'есці мне іх?» — думае. Потым і кажа:

— Гусі, гусі! Я вас з'ем.

— Што ж, — адказваюць гусі, — еш. Але спачатку зрабі нам адну паслугу перад смерцю.

— Якую? — пытаецца воўк.

— Паспявай нам, а мы паслухаем.

— Гэта можна. Спяваць я — мастак.

Сеў воўк на купіну, задраў галаву і давай выць. А гусі крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.

Злез воўк з купіны, правёў гусей вачыма і пайшоў далей ні з чым.

Ідзе ды лае сябе апошнімі словамі: «Ці ж не дурань я, га? Навошта я згадзіўся спяваць гусям? Ну, цяпер каго ні сустрэну — з'ем!»

Толькі ён так падумаў, бачыць — ідзе па дарозе стары дзед. Воўк падбег да яго:

— Дзед, дзед! Я цябе з'ем.

— Чаго так спяшацца! — кажа дзед. — Давай спярша табакі панюхаем.

— А смачная яна?

— Паспытай, дык будзеш ведаць.

— Давай!

Выняў дзед з кішэні капшук з табакаю, сам панюхаў і ваўку даў.

Як нюхнуў воўк на ўсю сілу, дык цэлы капшук табакі ўдыхнуў у сябе. А потым як пачаў чхаць на ўвесь лес... Нічога ад слёз не бачыць, усё чхае. Так з гадзіну чхаў, пакуль усю табаку не вычхаў. Агледзеўся потым, а дзеда і след прастыў.

Пайшоў воўк далей.

Ідзе ён, ідзе, бачыць — на полі чарада авечак пасецца, а пастух спіць. Нагледзеў воўк у чарадзе самага большага барана, схапіў яго і кажа:

— Баран, баран! Я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа баран, — такая мая доля. Але каб не мучыцца мне доўга ды і табе каб не ламаць зубы аб мае старыя косці, стань лепш вунь у той лагчынцы і разяў рот, а я ўзбягу на ўзгорак, разганюся і сам ускочу табе ў рот.

— Дзякуй за параду, — сказаў воўк. — Так і зробім.

Стаў ён у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды — трах! — рагамі ваўка ў галаву. Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка, свету ён не ўбачыў.

Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае:

— Цікава: з'еў я яго ці не?

А тым часам касец скончыў работу ды ідзе дахаты.

Пачуў ён воўкавы словы і кажа:

— З'есці-то не з'еў, але паспытаў лёгкага хлеба...

## Як кот звяроў напалохаў

Жыў дзед ды баба. І быў у іх кот. Дзед кашалі плёў, баба кудзелю прала, а кот паляваць на мышэй хадзіў.

Вось пайшоў раз кот у лес на паляванне ды і заблудзіўся. Шукаў, шукаў дарогу дадому — не знайшоў. Сеў пад ялінай і плача.

Бяжыць лісіца. Убачыла ката, заглядзелася: ніколі яшчэ такога звера ў сваім лесе не сустракала!

— Ты хто такі будзеш? — пытаецца.

— Я — Кот Мурлыковіч.

— А чаго ж ты плачаш, Кот Мурлыковіч?

Расказаў ёй кот аб сваёй прыгодзе.

— Хе, — кажа лісіца, — каб толькі тае бяды! Ідзі да мяне жыць. Будзеш у мяне за гаспадара.

— Добра, — кажа кот.

Вось прыходзіць ён да лісіцы. А ў яе курэй — і смажаных, і вараных. Наеўся кот і спаць уклаўся.

Тым часам бяжыць па лесе воўк: топ-топ, шлёп-шлёп!

Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць:

— Хто гэта ў маім лесе стукоча-тупоча? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ж у цябе гаспадар? — пытаецца воўк.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е!

Узяла ваўка цікавасць. Ён і кажа!

— А ці нельга было б, кумка, хоць адным вокам паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець-то можна, — адказвае лісіца, — але без падарунка лепш не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, будзе падарунак, — сказаў воўк і пабег далей.

Вярнулася лісіца ў хату.

А тым часам ідзе па лесе мядзведзь: трэсь-лом, трэсь-лом, трэсь-лом!

Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць зноў:

— Хто гэта ў маім лесе трашчыць? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ў цябе гаспадар? — пытаецца мядзведзь.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е!

І мядзведзя ўзяла цікавасць: які такі гаспадар у лісіцы, што хвастом усіх забівае? Вось ён і кажа:

— А ці нельга было б, лісічка-сястрычка, хоць паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець можна, — кажа лісіца. — Толькі без падарунка не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, падарунак будзе, — сказаў мядзведзь і пайшоў далей.

Прабеглі яшчэ дзік-сякач і заяц-шарак. Лісіца і іх сваім гаспадаром напалохала.

Сабраліся звяры і моцна задумаліся: якія ж ім падарункі лісіцынаму гаспадару прынесці?

Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Вось што, браткі, трэба смачны абед згатаваць ды ў госці яго з гаспадыняй запрасіць. Тады ўсе разам і паглядзім.

— Добра, няхай будзе так, — згадзіліся звяры.

І тут зноў яны моцна задумаліся: які абед згатаваць?

Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Я прынясу мёду калоду.

— А я — барана, — кажа воўк.

— А я — жалудоў, — кажа дзік.

— А я — салодкай капусты, — кажа заяц.

Згатавалі абед і пачалі раіцца, каму запрашаць ісці.

Мядзведзь кажа:

— Я тоўсты, мне хадзіць цяжка.

Воўк кажа:

— Я і так набегаўся, мне ногі баляць.

Дзік кажа:

— А я складна гаварыць не ўмею.

А заяц нічога не сказаў. Вось і парашылі паслаць яго, як лягчэйшага на ногі.

Прыбег заяц да лісіцынай хаты, пастукаў лапкай у шыбіну, зажмурыўся ад страху ды прапішчаў спалоханым голасам:

— Дзень добры вам, шаноўныя гаспадары! Прасілі мядзведзь, воўк і дзік, каб вы ласкавы былі, да іх у госці прыйшлі.

Сказаў так адным духам ды ходу назад.

Падрыхтаваліся звяры гасцей сустракаць. Сядзяць ля багатага стала, чакаюць, аб лісіцыным гаспадару разважаюць.

Вось заяц і кажа:

— Не, сядзець так боязна. Хто яго ведае, які гаспадар у лісіцы? А што, калі ён абеду нашага не ўпадабае ды ўсіх нас хвастом пазабівае... Давайце схаваемся і на яго паглядзім.

Згадзіліся звяры з мудрай зайцавай парадай ды пачалі хавацца.

Мядзведзь на дуб узлез, дзік у мох зашыўся, воўк пад куст забраўся, а заяц у траве схаваўся.

Тым часам узяла лісіца пад руку свайго гаспадара і пайшлі яны ў госці.

Прыходзяць на палянку. Чуе кот — мясам запахла. Бачыць — цэлы баран ляжыць. Тут ён шэрсць наставіў, вусы натапырыў ды адразу на барана накінуўся.

Есць ды ўсё бурчыць: «Мяў-у, мяў-у!»

Звяроў аж страх узяў. Ім здалося, што ён крычыць: «Мала, мала!»

— Ну і звяруга! — кажа воўк. — Мне б і за дзень з такім рагалём не ўправіцца, а яму на раз мала...

Дзік ляжаў, ляжаў у моху ды ад страху пачаў хвастом варушыць. Кот падумаў, што мыш з норкі вылазіць. Скокнуў туды і ўчапіўся кіпцюрамі ў дзікаў хвост.

Як усхопіцца дзік, як кінецца наўцёкі! Толькі галлё трашчыць.

Кот напужаўся ды скок на дуб!

«Ну, — думае мядзведзь, — гэта ён мяне ўбачыў. Трэба ратавацца, пакуль не позна».

Грымнуўся мядзведзь з дуба проста на куст, пад якім воўк сядзеў. А таму здалося, што гэта сам лісіцын гаспадар на яго напаў. Усхапіўся воўк ды ходу далей ад бяды. А мядзведзь за ім: трэсь-лом! трэсь-лом!

Уцякалі яны так, што заяц іх ледзьве праз гадзіну дагнаў. Дагнаў і кажа:

— Каб не паслухалі мяне ды не схаваліся, ён бы нас усіх з'еў! Ну і страшэнны звер!

А кот з хітрай лісіцай нагасцяваліся ды пайшлі сабе дахаты.

## Сава і дзяцел

Не паспела яшчэ і развіднецца як след, а дзяцел Тук Туковіч ужо ўхапіўся за работу. Ён так забарабаніў па старой хвоі, ажно рэха пайшло па ўсім лесе.

У гэты час суседка яго, сава — Неразумная Галава, толькі пачынала ўкладвацца спаць.

— Тук-тук-тук! Стук-стук-стук! — раптам пачула яна вясёлую дзятлаву песню.

Высунула сава галаву з дупла.

— Ці маеш ты розум, шаноўны Тук Туковіч! Перастань грымець над самым вухам. Дай спакойна паспаць.

— Гм! — здзівіўся дзяцел. — Хто ж гэта спіць сярод белага дня!

— Як хто? — лыпнула сваімі круглымі вачыма сава — Неразумная Галава. — Усе мае сваякі, усе совы і пугачы спяць толькі ўдзень!

— А ўночы што вы робіце?

— Лятаем, здабычы шукаем. Гэта толькі ты і ўсе твае сваякі жывуць па-дурному: уночы спяць, а ўдзень яду здабываюць.

— Не, — кажа дзяцел, — як сабе хочаш, а я ўночы не магу лятаць.

— Чаму? — запыталася сава.

— Бо ўночы цёмна, нічога не відаць.

— Няпраўда! — адказала сава. — Гэта ўдзень цёмна, а ўночы светла.

— Не, гэта ўдзень светла, а ўночы цёмна, — не згадзіўся дзяцел. — Хіба ж ты не бачыш, што ўдзень сонейка свеціць, а ўночы — не.

— Якое там яшчэ сонейка ты выдумаў! Яго няма на свеце!

— Як гэта няма? Што ты пляцеш?

— Я яго не бачу, значыць, няма, кажу табе, — не здаецца сава.

— Ат, гаварыць з табою, што ваду ў ступе таўчы, — сказаў дзяцел і яшчэ мацней забарабаніў па дрэве. — Калі ты адна не бачыш сонца, дык думаеш, што і ўсе такія слепакі на свеце жывуць.

— Ну пачакай жа, — узлавалася сава — Неразумная Галава, — я табе адпомшчу!

Мінуў дзень, настала ноч. Усе дзятлавы сваякі моцна заснулі. Заснуў і дзяцел Тук Туковіч.

Навокал было так ціха, і сон да нашага дзятла пасля працоўнага дня прыйшоў такі салодкі, што яму нават жукі-караеды перасталі сніцца.

І раптам сярод начной цішыні нехта моцна загаласіў:

— Ку-га! Ку-га! Ку-га!

А потым зарагатаў:

— Ха-ха-ха! Гу-гу-гу!

Прахапіўся дзяцел Тук Туковіч, дрыжыць ад страху: хто гэта пужае яго? Працёр вочы, прыгледзеўся, аж бачыць: сава — Неразумная Галава сядзіць на суку і рагоча на ўвесь лес.

— Тфу, каб цябе! — плюнуў дзяцел. — Знайшла час рагатаць. Ідзі спаць!

— Не, — кажа сава, — спаць уночы я не магу. Буду спяваць, цябе і тваіх сваякоў пужаць.

— Ну і песня ж у цябе! — паморшчыўся дзяцел. — Ад такой песні здурнець можна.

— Ха-ха-ха! Гу-гу-гу! — яшчэ мацней зарагатала сава.

Ёй адказалі гэткаю ж песняю ўсе яе сваякі.

— Пачакай жа ты, лупавокая! — пагразіў дзяцел саве. — Заўтра я табе адплачу!

І праўда: назаўтра пачалося тое ж самае. Цэлы дзень дзяцел барабаніў па старой хвоі і не даваў спаць саве. Затое потым сава ўсю ноч галасіла і рагатала — дзятла пужала.

І так у іх пайшло дзень пры дні, ноч пры ночы: ні дзяцел, ні сава з таго часу не могуць спаць спакойна.

## Вучоны рак

Жылі дзед і баба. Ні бедна жылі, ні багата. Мелі хлеб, мелі сёе-тое і да хлеба. Адна бяда — не было ў іх дзяцей. А без дзяцей — якое жыццё! Сумна, нудна. Дзеду яшчэ сяк-так, ён то ў лес па дровы едзе, то ў полі працуе, то рыбу ловіць. А баба адна дома сядзіць. Сядзіць ды ўздыхае: «Былі б у мяне дзеці, хоць пагаварыла б з імі, пазабаўлялася».

Пайшоў дзед аднаго разу на рэчку. Рыбы не злавіў, а злавіў рака. Прынёс дахаты і кажа бабе жартам:

— На табе, старая, рака, будзеш з ім гаманіць.

Паглядзела баба на рака і адказвае:

— Ці не з глузду ты, стары, з'ехаў: хто ж з ракам гамоніць?

А рак паварушыў вусамі і кажа:

— Праўда, маці, я з табою буду гаманіць!

Дзед з бабаю аж за галовы схапіліся. Вось гэта дык дзіва!

Пачаў рак у іх жыць, з бабаю гаманіць.

Паехаў аднойчы дзед араць. Баба згатавала абед ды збіраецца ў поле дзеду несці. Рак ёй кажа:

— Ты, маці, старая, лепш дома пасядзі, давай я абед у поле занясу.

— Што ты! — замахала рукамі баба. — Ты ж маленькі!

— Нічога, — кажа рак, — я маленькі, ды ўдаленькі!

Падлез ён пад кошык з абедам, падняў і панёс.

Прыходзіць на поле.

— Гэй, бацька, — крычыць, — ідзі абедаць!

— Бач, які ты спрытны, — усміхаецца дзед, — сам абед прынёс!

Пачаў дзед есці, а рак запусціў саху ў разору, ускочыў валу на ярмо і арэ.

Едзе пан з палявання. Бачыць — дзед абедае, а валы самі аруць.

— Гэй, дзед, — крычыць пан, — хто ў цябе валамі кіруе?

— Рак, — адказвае дзед.

Прыгледзеўся пан лепш і ўбачыў рака.

«Вось дык араты!» — пазайздросціў пан дзеду.

— Прадай, дзед, мне свайгоаратага!

— Не, пане, рак гэты ў мяне за сынка роднага служыць. Ён не прадаецца.

— Прадай, дзед, я табе добрыя грошы за яго дам.

Пачуў гэта рак і шэпча дзеду:

— Прадай, бацька, мяне. Вазьмі з пана сто рублёў. І дагаварыся так: калі я за тры дні тры разы ўцяку ад пана — прапалі яго грошы.

Дзед згадзіўся і прадаў пану рака.

Пан пасадзіў рака ў паляўнічую сумку і павёз дахаты. Прыехаў, расшпіліў сумку, глядзіць, а рака няма. Адна дзірка ў сумцы свеціцца. Вось табе і маеш аратага!

Вярнуўся пан да дзеда. Бачыць — дзед з бабаю вячэраюць і рак каля іх сядзіць.

— Дык ты ўсё-такі ўцёк ад мяне! — дзівіцца пан.

А рак смяецца:

— І яшчэ два разы ўцяку!

— Паглядзім, — кажа пан.

Забраў ён рака, пасадзіў у бляшаную скрыначку і павёз дахаты.

Прыехаў, адчыніў скрыначку — рак сядзіць там.

— Ну, цяпер, — кажа пан, — ты ад мяне не ўцячэш!

Пахваліўся пан дома сваім вучоным ракам і аддаў яго дочкам гуляць. А каля дзвярэй лёкаяў паставіў, каб рак не выпаўз.

Пачаў рак панскім дочкам казкі казаць. Тыя слухалі, слухалі ды і паснулі. Уночы рак пазвязваў панскім дочкам косы і чакае, што будзе.

Прачнуліся раніцай дочкі, тузаюцца, крычаць:

— Ты чаго мяне трымаеш? — крычыць першая.

— Гэта ты мяне трымаеш! — адказвае другая. — Пусці, а то я табе ўсе валасы павырываю!

Пачулі сварку лёкаі, прыбеглі ў спальню, а рак тым часам шмыг праз адчыненыя дзверы — і няма...

Зноў паехаў пан да дзеда і бабы. Бачыць — рак на лаве сядзіць, бабе лапці пляце...

— Добра ж, — кажа пан, — цяпер ты ўжо ад мяне не ўцячэш! Я цябе нікуды ад сябе не пушчу!

— Нічога, — смяецца рак, — уцяку.

Палажыў пан рака ў тую ж бляшаную скрыначку і паехаў дахаты.

Дома выпусціў рака ў сваім пакоі, а сам сеў на варце каля дзвярэй.

Сядзеў, сядзеў пан ды і задрамаў. Рак доўга не думаючы ўзлез на стол, знайшоў запалкі і падпаліў панскія паперы. Дым так і шугануў пану ў нос. Прачнуўся пан, бачыць — поўны пакой дыму. Ён падумаў, што ўвесь маёнтак гарыць, нарабіў крыку.

Збегліся слугі і адчынілі пакой. А рак тым часам шмыг за дзверы, толькі яго і бачылі.

Прыпоўз дахаты і загадвае бабе:

— Кідай мяне, маці, у гарачы кіпень!

— Што ты, сынок, — спужалася баба. — Ты ж зварышся ў кіпені?!

— Кідай, кажу, а то пан скора тут будзе!

Кінула баба рака ў кіпень, глядзіць — аж выходзіць з гаршка прыгожы кучаравы хлопчык!

Зарадаваліся дзед і баба, пасадзілі хлопчыка за стол, частуюць. А тут і пан прыязджае са слугамі. Паглядзеў туды-сюды.

— Дзе рак? — пытаецца.

— Няма ў нас рака, — адказваюць дзед і баба.— Ты ж яго забраў.

— Шукайце рака, — крычыць пан да слуг, — шукайце!

Кінуліся слугі шукаць рака. Шукалі, шукалі ды перасталі. А пан здурнеў ад злосці і нават цяпер вучонага рака шукае.

## Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць

Некалі, кажуць, звяры і жывёлы не мелі хвастоў. Адзін толькі звярыны цар — леў — быў з хвастом.

Дрэнна жылося звярам без хвастоў. Зімою яшчэ сяк-так, а прыйдзе лета — ратунку няма ад мух ды мошак. Чым іх адганяць? Не аднаго за лета, бывала, насмерць заядалі авадні ды сляпні. Хоць гвалт крычы, як нападуць.

Дачуўся пра такую бяду цар і выдаў загад, каб усе звяры ішлі да яго хвасты сабе падбіраць.

Памчаліся царскія ганцы ва ўсе канцы звяроў склікаць. Ляцяць, у трубы трубяць, у барабаны

б'юць, нікому спаць не даюць. Убачылі ваўка — перадалі яму загад царскі. Убачылі быка, барсука — таксама паклікалі. Лісіцы, куніцы, зайку, ласю, дзіку — усім сказалі, што трэба. Застаўся адзін мядзведзь. Доўга ганцы шукалі яго, нарэшце знайшлі соннага ў бярлозе. Пабудзілі, раскатурхалі і загадалі, каб па хвост спяшаўся.

Ды калі гэта было, каб мядзведзь куды спяшаўся. Сунецца ён сабе памаленьку — кульгецьп, кульгецьп, усё вакол разглядае, нюхам мёду шукае. Бачыць — дупло пчалінае на ліпе. «Дарога да цара не малая, — думае, — трэба падсілкавацца».

Залез мядзведзь на дрэва, а там поўнае дупло мёду. Замармытаў ён ад радасці ды пачаў дупло выдзіраць, мёд выграбаць, за абедзве шчакі ўплятаць. Наеўся, паглядзеў на сябе, аж усё футра ў мёд ды ў парахню выпацкана!.. «Як жа, — думае, — у такой вопратцы на царскія вочы паказвацца?»

Пайшоў мядзведзь на рэчку, памыў футра і прылёг на ўзгорку сушыцца. А сонейка так цёпла прыпякло, што Мішка і не агледзеўся, як соладка захроп.

Тым часам пачалі збірацца да цара звяры. Першай прыбегла лісіца. Паглядзела туды-сюды, аж перад царскім палацам цэлая куча хвастоў. І доўгія, і кароткія, і голыя, і пушыстыя...

Пакланілася лісіца цару і кажа:

— Яснавяльможны цар! Я першая адгукнулася на твой загад. Дазволь мне за гэта выбраць хвост, які я пажадаю...

Ну, цару ўсё роўна, які хвост даць лісіцы.

— Добра, — кажа, — выбірай сабе хвост па густу.

Растрыбушыла хітрая лісіца кучу хвастоў, выбрала самы прыгожы — доўгі, пушысты ды памчалася назад, пакуль цар не перадумаў.

За лісіцаю прыскакала вавёрка, таксама выбрала сабе прыгожы хвост, хоць і меншы, як у лісіцы. За ёю — куніца. І яна з добрым хвастом назад пабегла. Лось выбраў сабе самы доўгі хвост, з густою мяцёлкаю на канцы, каб было чым ад аваднёў ды сляпнёў бараніцца. Барсук ухапіў хвост шырокі і тоўсты. Конь узяў хвост з аднае валасні. Прычапіў, махнуў па правым баку, па левым — добра сячэ. «Цяпер мухам смерць!» — заржаў ён ад радасці ды сігануў на свой луг.

Апошні прыбег зайка.

— Дзе ж ты быў? — кажа цар. — Бачыш, у мяне толькі адзін маленькі хвосцік застаўся.

— Хопіць мне і гэтага! — зарадаваўся зайчык. — Даўжэйшы хвост — цяжэйшы. А мне трэба быць лёгкаму, каб ад ваўка ды сабакі ўцячы.

Прычапіў зайка сабе, куды трэба, куртаты хвосцік, падскочыў раз-другі і весела пабег дахаты. А звярыны цар, раздаўшы ўсе хвасты, пайшоў спаць.

Толькі адвячоркам прачнуўся мядзведзь. Успомніў, што ён жа мусіў спяшацца да цара па хвост. Зірнуў, а тут і сонца за лес коціцца. Кінуўся ён з усіх ног наўгалоп. Бег, бег, аж змакрэў небарака. Прыбягае да царскага палаца, а там — ні хвастоў, ні звяроў. «Што ж цяпер рабіць? — думае мядзведзь. — Усе будуць з хвастамі, адзін я без хваста».

Завярнуўся Мішка і патэпаў злосны ў свой лес. Ідзе, аж бачыць — на пні барсук пакручваецца, удалым сваім хвастом любуецца.

— Паслухай, барсук, — кажа мядзведзь, — навошта табе хвост? Аддай яго мне.

— Што ты, дзядзька мядзведзь, выдумаў! — дзівіцца барсук. — Хіба ж можна такі прыгожы хвост аддаваць?

— А калі не дасі па-добраму, то я сілаю вазьму,— буркнуў мядзведзь і палажыў сваю цяжкую лапу на барсука.

— Не дам! — крыкнуў барсук і рвануўся з усяе сілы наўцёкі.

Глядзіць мядзведзь, а ў яго лапе палоса барсуковай шкуры засталася і канчур хваста. Адкінуў ён шкуру прэч, а канчур хваста прычапіў сабе ды пайшоў даядаць мёд у дупле.

Барсук жа як бегчы дык бегчы — ад страху месца сабе не знаходзіць. Дзе ні схаваецца, усё яму здаецца, што вось-вось мядзведзь прыйдзе, рэшту хваста адбярэ. Выкапаў ён тады

глыбокую нару ў зямлі і стаў там жыць. Рана на спіне зажыла, але затое засталася цёмная палоса.

Бяжыць аднойчы лісіца, бачыць — нара, а ў ёй нехта храпе як пшаніцу прадаўшы. Палезла ў нару, глядзіць, аж там барсук спіць.

— Што гэта табе, суседзе, наверсе цесна, што ты пад зямлю забраўся? — дзівіцца лісіца.

— Але, лісічка, цесна, — уздыхнуў барсук. — Каб не трэба было яды шукаць, дык і ўночы не выходзіў бы адгэтуль.

І расказаў барсук лісіцы, чаму яму на зямлі жыць цесна.

«Эге, — падумала лісіца, — калі мядзведзь на барсукоў хвост пакваліўся, то мой жа ў сто разоў лепшы...» І пабегла шукаць схованкі ад мядзведзя. Прабегала ўсю ноч, нідзе схавацца не можа. Нарэшце пад раніцу выкапала нару, такую, як у барсука, залезла ў яе, накрылася сваім пушыстым хвастом і спакойна заснула.

З таго часу барсук і лісіца жывуць у норах, а мядзведзь так і застаўся без добрага хваста.

## Чалавек і козы

Жыў некалі ў адной вёсцы бедны чалавек. Не меў ён, як кажуць, ні кала ні двара. І рабіць не было чаго, і есці таксама.

Надакучыла бедняку такое жыццё, падаўся ён у свет шукаць сабе якога лепшага прытулку.

Ішоў ён, ішоў і прыйшоў у вялікі густы лес. Доўга блукаў па лесе, змарыўся, а выбрацца з гушчару ніяк не можа. Нарэшце, ужо пад вечар, трапілася яму на вочы палянка. Вялікая, шырокая палянка, а на ёй трава густая ды зялёная, як на лузе. І ўся кветкамі ўсыпана. Ад іх такі прыемны пах ідзе, што аж ноздры шчыкоча.

Пачаў чалавек разглядаць палянку, бачыць — недалёка хатка стаіць. «Ну, — думае, — зайду, можа, мяне там пакормяць».

Увайшоў чалавек у хатку і дзіву даўся: сцены яе збудаваны з бліноў, печ — з тварагу, а комін — з масла... Не хатка, а цуда! І нідзе гаспадароў не відаць. Паклікаў чалавек — ніхто не адгукаецца.

Нядоўга, аднак жа, дзівіўся чалавек з цікавай хаткі: голад — не цётка! Давай ён хутчэй абдзіраць сцены, мазаць бліны маслам ды ўплятаць іх з тварагом за абедзве шчакі... Есць, аж нос гнецца. Смачна, што і казаць!

Паабдзіраў ён сцены, пакалупаў масляны комін, з'еў усю печ, адзін падпечак застаўся.

Раптам чуе — гул і тупат пайшоў па лесе.

Спужаўся чалавек. «Бяда будзе, — думае, — калі гаспадар застане мяне тут...»

Куды ж падзецца? Убачыў ён недаедзены падпечак і, доўга не думаючы, скокнуў туды.

Тым часам прыбегла да хаткі чарада коз. Усе рагатыя, усе барадатыя. Як убачылі яны сваю

хатку, — а гэта была казіная хатка, — дык усе ў адзін голас забляялі, замэкалі:

— Хто ў нашай хатцы пабываў, хто бліны ды масла паабдзіраў?

Кінуліся шукаць вінаватага. Бегалі і туды і сюды — нікога не знайшлі і ўзяліся ладаваць хатку. Як бачыш, напяклі бліноў, нарабілі твարагу, набілі масла. Комін замазалі маслам, печ заляпілі тварагом, сцены залаталі блінамі. І хатка зноў стала цэлая, як была.

Пераначавалі козы дома, а назаўтра пайшлі на пашу. Але пакінулі адну казу за вартаўніка.

Ляжыць каза ў хатцы, вокам не маргне, вартуе.

А чалавеку ўжо і есці захацелася. Ды баіцца з падпечка вылезці, каб казе-вартаўніцы на вочы не трапіць...

«Напушчу хіба на яе сон, — думае чалавек, — тады і вылезу».

Пачаў ён на казу сон напускаць. Глядзіць на яе праз дзірку з падпечка ды прыгаворвае паціху: «Спі, вочка! Спі, вочка! Спі, вочка!»

Адно казінае вока заснула.

Ён зноў: «Спі, другое! Спі, другое! Спі, другое!»

І другое заснула.

Узлез тады чалавек на хатку, наабдзіраў бліноў са сцен, накалупаў масла з коміна, тварагу з печы — ды назад у сваю схованку! Сядзіць там і есць паціхеньку.

Вярнуліся адвячоркам козы з пашы, бачаць — сцены хаткі паабдзіраны, печ і комін папсаваны, а каза-вартаўніца спіць сабе хоць бы што.

Узлаваліся козы на вартаўніцу, пачалі біць яе і нагамі, і рагамі.

— Што ж я вінавата, — кажа каза-вартаўніца. — Я старалася, як магла, добра вартавала, вачэй з хаткі не спускала. Але потым мне так захацелася спаць, што вочы самі заплюшчыліся, я нават і не пачула, як заснула.

Кінуліся козы шукаць вінаватага. Шукалі, шукалі — нікога не знайшлі. Сабраліся ў гурт ды пачалі раіцца, што рабіць. Шмат было ўсялякіх радаў, але ўсім спадабалася адна: пакінуць за вартаўніка казу з трыма вокамі. Знайшлі яны такую казу, загадалі ёй добра вартаваць хатку, а самі раніцой пайшлі на пашу.

Чалавеку тым часам захацелася есці. Выглянуў ён з падпечка і ўбачыў казу-вартаўніцу. «Э-э, — думае чалавек, — цяпер ты мне не страшная». І пачаў на яе сон напускаць: «Спі, вочка! Спі, вочка! Спі, вочка! Спі, другое! Спі, другое! Спі, другое!»

Заснула ў казы адно вока, заснула і другое. А тое, што каза была з трыма вокамі, чалавек не ведаў.

Вылез ён спакойна з падпечка і давай абдзіраць сцены!

Аж тут каза ўбачыла яго сваім трэцім вокам ды як замэкае...

Прыбеглі козы з пашы, накінуліся на чалавека. А чалавек пытаецца ў іх:

— Хто ваш гаспадар?

— Няма, — кажуць козы, — у нас гаспадара.

— Ну дык я ў вас за гаспадара застануся. Ад ваўкоў бараніць буду.

Паслухалі козы чалавека і пакінулі яго ў сябе за гаспадара.

Добра стаў тады жыць той чалавек. Пасвіў коз, даглядаў іх, даіў, сыры і масла рабіў...

Так з таго часу і пачалі людзі коз гадаваць.

## Стары конь

Быў у аднаго гаспадара стары конь. Цяжка ўжо яму стала саху цягаць, пачаў ён прыставаць. Пашкадаваў гаспадар каня, падкаваў яго сталёвымі падковамі ды пусціў на луг адпасвацца.

Пасецца конь тыдзень, пасецца другі. Паправіўся, нават падбрыкваць пачаў.

Трапіў аднойчы на гэты луг леў. Убачыў каня і здзівіўся: што за звер такі?

— Хто ты будзеш? — пытаецца ён у каня.

— Конь. А ты хто?

— А я леў. Над усімі звярамі цар. Я цябе з'ем.

— Каб з'есці мяне, — кажа конь, — трэба сілу мець...

Стукнуў леў сябе хвастом па баках, зароў:

— Я самы дужы звер!

— Го-го-го! — зарагатаў конь. — Яшчэ паглядзім, хто з нас дужэйшы. Давай сілаю мерацца!

— А як будзем мерацца? — пытаецца леў.

— Бачыш, вунь вялікі камень.

— Бачу, — кажа леў.

— Дык вось, хто стукне па гэтым камені так, каб агонь з яго паказаўся, той і дужэйшы.

— Добра, — згадзіўся леў.

Падышоў ён да каменя і пачаў біць лапамі. Біў, біў, толькі кіпцюры паздзіраў, а агню так і не выбіў.

— Гі-гі-гі, — смяецца з яго конь. — Слабы ж ты, брат, зусім. А яшчэ царом лічышся. Вось глядзі, як я стукну.

Падышоў стары конь да каменя, стаў да яго задам, падбрыкнуў і смальнуў падковамі аб камень... Іскры з каменя так і пасыпаліся...

«Ого, — падумаў сам сабе леў, — благія жарты з такім зверам».

І, нічога не сказаўшы, пабег у лес. Там сустрэўся яму воўк.

— Добры дзень, ваша царская міласць! — пакланіўся яму воўк. — Куды мелі ласку хадзіць? Што чулі, што бачылі?

— Быў на зялёным лузе, — адказаў леў. — Бачыў там самага дужага звера...

— Якога? — пытаецца воўк.

— Каня.

— Гм...— кажа воўк. — Я іх не толькі бачыў, а і з'еў нямала.

— Што ты выдумляеш! — усхадзіўся леў. — Не можа быць.

— То хадзем, ваша міласць, пабачыце, як я з ім распраўлюся.

Падышлі леў з ваўком да лугу.

— Ну, дзе ж той конь? — пытаецца воўк.

— Ды вунь там, за кустамі ходзіць.

— Не бачу, — кажа воўк.

Узяў леў ваўка пад лапаткі і падняў над сабою:

— Цяпер бачыш?

Маўчыць воўк як вады ў рот набраўшы.

Паглядзеў на яго леў — а той і не дыхае: задушыў яго цар звяроў сваімі лапамі.

Апусціў леў ваўка на зямлю і кажа:

— Ну вось бачыш: ты толькі зірнуў на яго і то ўжо самлеў. А яшчэ выхваляўся! Што ж было б, каб мы падышлі блізка да гэтага звера: з'еў бы ён і цябе і мяне...

Напалохаўся леў каня ды ўцёк.

З таго часу ён і не жыве ў нас.

## Дзяцел, лісіца і варона

Выдзеўб дзяцел у асіне дупло, збудаваў гняздо і вывеў дзетак — траіх дзетлянятак.

Растуць малыя, а дзяцел цешыцца. «Выгадую, — думае, — дзяцей, на старасць падмога будзе...»

Ды недарэмна кажуць: «Хто б дзятла ведаў, каб не яго доўгі нос?» Не ўмеў ён радавацца

сам сабе, а раструбіў на ўвесь лес пра сваіх дзяцей. Каго ні спаткае — усім хваліцца: «Якія ў мяне слаўныя дзеткі! І разумныя, і прыгожыя. Другіх такіх няма ні ў кога...»

Дачулася пра гэта лісіца. Захацелася ёй маладых дзетлянятак пакаштаваць. Але як жа іх з гнязда дастаць? На дрэвы лазіць лісіца спрыту не мае.

Дзяцел дзяцей гадуе — корміць, поіць, а лісіца каля асіны пахаджвае, зубы выскаляе і ўсё думае, як дзетлянятак са свету звесці.

І надумалася-такі. Падыходзіць аднойчы да асіны ды давай хвастом па камлі стукаць.

Высунуў дзяцел галаву з дупла:

— Што ты, лісічка, робіш? Навошта маіх дзяцей пужаеш?

— Вось як, — кажа лісіца, — дык у цябе і дзеці ёсць?

— Ёсць, — адказвае дзяцел. — І такія ж слаўныя дзеткі!

— Ну дык выганяй іх вон, ды і сам выбірайся, бо я зараз буду дрэва секчы…

— Навошта табе гэтае дрэва? — пытаецца дзяцел.

— Як гэта навошта? На дровы папілую, у печы паліць буду!

— Ой, лісанька, ой, матанька! — пачаў прасіцца дзяцел. — Дай хоць дзяцей пагадаваць, тады і сячы сабе дрэва. Куды ж я цяпер з малымі падзенуся?

А лісіца яшчэ мацней стукае хвастом па дрэве:

— Не магу я чакаць, пакуль ты дзяцей пагадуеш! Хто ж вінаваты, што ты якраз на гэтай асіне гняздо зрабіў! Мала лесу было, ці што?

— Яно-то праўда, — кажа дзяцел, — лесу нямала. Ды хто мог ведаць, што табе гэтая старая трухлявая асіна на дровы спатрэбіцца...

— Трэба было запытацца ў мяне, раней чым гняздо рабіць, — злуецца лісіца. — Сам вінаваты.

Пачухаў дзяцел сваю стракатую галаву:

— Што ж мне рабіць, лісанька? Дай раду.

Аблізнулася лісіца, пакруціла хвастом ды кажа:

— Скінь мне адно дзіця, тады не буду секчы дрэва.

Падумаў дзяцел — шкада дзіцяці, але што зробіш: хоць двое яму застануцца. І скінуў адно дзетлянятка. Лісіца схапіла яго, пабегла за куст ды з'ела.

Назаўтра зноў прыходзіць:

— Скінь яшчэ адно дзіця, а то буду дрэва секчы.

І давай хвастом па асіне барабаніць.

Як ні прасіўся дзяцел, а давялося яшчэ адно скінуць.

Спадабаліся лісіцы дзетляняты, праз дзень зноў прыйшла. Шкада дзятлу апошняе дзіця аддаваць.

— Пачакай, лісічка, хоць да заўтра, — просіцца ён. — Дай хоць трохі яшчэ з дзіцяці пацешыцца.

— Добра, — згадзілася лісіца. — Прыйду заўтра.

Сядзіць дзяцел у дупле, бядуе і ўсё думае, як яму ад лісіцы ўратавацца. Ды нічога прыдумаць не можа. Тым часам прылятае да яго ў госці кума — шэрая варона.

— Так і так, — кажа ёй дзяцел, апусціўшы нос. — Не да гасцей мне, кумка: апошняе дзіця лісіца адбірае...

Варона была птушка старая і разумная, не такая, як іншыя.

— Дурань ты, — кажа яна, — не аддавай!

— Дык жа лісіца дрэва ссячэ і ўсё роўна загубіць нас.

— Гэта яна толькі страшыць цябе. Як прыйдзе заўтра, ты скажы ёй: «Сячы сабе, я цябе не баюся!»

Зарадаваўся дзяцел, падзякаваў вароне-куме за разумную параду і нават добра пачаставаў яе за гэта жукамі-караедамі.

Прыбягае назаўтра лісіца.

— Ну, дзяцел, — кажа, — скідай апошняе дзіця, а то зараз дрэва ссяку.

А дзяцел высунуў свой доўгі нос з дупла і кажа:

— Сячы сабе, я цябе не баюся!

Здзівілася лісіца: адкуль гэта дзяцел розуму набраўся?

— Хто цябе навучыў так гаварыць? — пытаецца яна.

— Сваячка мая — варона, — смела адказаў дзяцел.

Узлавалася лісіца на дзятлаву куму — шэрую варону. «Пачакай жа, — думае, — я табе не дарую гэтага». І пайшла прэч, глытаючы сліну. Думала яна, думала, як вароне адпомсціць, і надумалася-такі. Выбегла на палянку, легла і прыкінулася мёртвай.

Убачыла гэта варона з дрэва. «Эге, — зарадавалася, — нядрэнная спажыва валяецца».

Тут яна крыламі — мах, мах! І як бачыш каля лісіцы апынулася. Дзеўбанула спачатку ў хвост, каб праверыць, ці сапраўды лісіца мёртвая. А тая — нават не зварухнулася. Ляжыць, як дохлая.

Варона пасмялела, падскочыла да галавы і ўжо намерылася дзеўбануць у вока... А лісіца як усхопіцца ды цап варону за нагу!

— Ага! — зарагатала лісіца, выскаліўшы зубы.— Папалася мне на абед замест дзетляняці. Будзеш ведаць, як дзятла вучыць.

— Ну што ж, — кажа варона, — перахітрыла ты мяне. Цяпер я толькі аднаго баюся: каб ты не мучыла мяне так, як твая маці мучыла маю маці.

— А як жа яна мучыла? Нешта я не памятаю.

— Бо ты малая тады была...

— Дык раскажы хоць, — зацікавілася лісіца.

— Добра, раскажу, — згадзілася варона. — Было яно так. Твая маці злавіла маю маці. Вось як ты мяне зараз.

— Ну, вядома, — перапыніла яе лісіца. — Мая маці была не такая дурная, як твая.

— Так, так, — адказала варона. — Яна і праўда была разумная, твая маці, бо не захацела есці маю маці з пер'ем: пер'е ж нясмачнае!

— Вядома, нясмачнае, — падтакнула лісіца.

— Дык твая маці зрабіла вось як: узяла два рэшаты, усадзіла туды маю маці, потым склала рэшаты адно да аднаго ды як пусціла іх з крутой тары, дык на маёй маці ні пярынкі не засталося — усё чыста асыпалася. Бр-р! — скаланулася варона. — Гэта самая страшная пакута для нас, варон...

«Добра ж, — падумала лісіца, — не буду я дурнейшай за сваю маці».

Дастала яна два рэшаты, усадзіла туды дзятлаву куму ды пусціла рэшаты з гары. Рэшаты раз'ехаліся ў бакі, а варона ўзнялася і паляцела на дрэва.

## Кот Максім

Жылі дзед і баба. Мелі яны сына і ката. Сына звалі Марцінам, а ката — Максімам.

Памерлі дзед і баба. Застаўся Марцін з катом Максімам.

Марцін гультай быў вялікі, усё на печы ляжаў, а кот яму яду насіў: то птушку дзе зловіць, то каўбасу ці сала ў суседзяў украдзе...

Вось так жылі яны, жылі — згарэла хата, адна гліняная печ засталася.

— Што рабіць будзем? — пытаецца кот у гаспадара.— Трэба хату будаваць.

— Ат, — кажа Марцін, — навошта нам хата? Хопіць і печы.

Пажылі яны з год на печы, а тут і печ развалілася.

— Што рабіць будзем? — зноў пытаецца кот у гаспадара.

— Ты, — кажа Марцін, — як сабе хочаш, а я надумаўся жаніцца: вазьму багатую жонку, яна мне пабудуе хату.

— Хто за такога гультая пойдзе замуж?! — смяецца кот. — Ты ж толькі любіш ляжаць на печы, у цябе і выгляд нечалавечы.

— Пойдзе! — кажа Марцін. — Няма чаго смяяцца! Сама царэўна пойдзе. Ідзі, Максім, да цара. Скажы яму — так і так, пан Марцін, па прозвішчу Глінскі-Папялінскі, сватаецца да тваёй дачкі. Ну і зрабі ўсё як трэба: нагавары яму, што багацейшага за мяне пана ва ўсім царстве не знайсці...

— Цяжкую ты загадаў мне службу, пан Марцін Глінскі-Папялінскі, — кажа кот.

— Нічога, ідзі, а то папругі дастанеш! — пагразіў яму гаспадар.

— Ну што ж, паспрабую шчасця.

Нанасіў кот гультаю Марціну яды ў запас, каб той з голаду не памёр, а сам выправіўся ў далёкую дарогу.

Ідзе ён, ідзе, прыходзіць у лес. Бяжыць насустрач заяц.

— Куды, кот, ідзеш? — пытаецца ён.

— Да цара.

— Чаго?

Кот падумаў і кажа:

— На суд...

— На які суд?

— Праўды хачу дайсці.

— Якой праўды?

— А вось якой. Дзе што кошка ўкрадзе або нашкодзіць — усё на ката звальваюць. Кот, кажуць, смятану злізаў, кот сала ўкраў... А ката там і блізка не было. Не магу я цярпець такога паклёпу на сябе.

— Пайду хіба і я з табою! — кажа заяц.

— Чаго?

— Таксама на суд. Дзе што зайчыха зробіць — усё на зайца кажуць. Хто ў садзе прышчэпы папсаваў? Заяц! Каго сабакі ганяюць? Зайца! А там зусім і не заяц быў, а зайчыха. Не магу я такой няславы цярпець. Пайду да цара на суд.

— Дык што ж ты — адзін пойдзеш? — кажа кот. — Хто табе аднаму на судзе паверыць? Там трэба сведак мець.

— А ты чаму адзін ідзеш?

— Ну, у мяне іншая справа. Там у мяне дзядзькі, бацькі, дзяды, браты жывуць. Усе па слову скажуць, мне і павераць. Вось каб ты набраў сотні тры сведак, тады можна смела ісці.

Тут як бачыш з усіх бакоў пасыпаліся зайцы. Назбягалася іх цэлая чарада.

Прывёў кот Максім зайцоў да царскіх палацаў. Бачыць — на двары вялікі хлеў стаіць. Ён і кажа зайцам:

— Пачакайце вы ў гэтым хляве. Скончыцца мой суд, тады я вашу скаргу падам цару.

Зайцы паскакалі ў хлеў, а кот — бразь! — ды і зачыніў іх там на засаўку.

Ідзе ён да царскіх палацаў, падскакваючы, у ладкі плешчучы.

Узыходзіць на ганак, стукае ў дзверы:

— Адчыніце!

Адчыніў яму салдат-вартавы.

— Чаго трэба? — пытаецца.

— Пакажы, дзе цар жыве.

Салдат паказаў.

Увайшоў кот Максім у вялікі пакой, а там цар сядзіць.

— Добры дзень, ваша вялічаства-вымператарства!

— Добры дзень, каток! — адказвае цар. — Што скажаш?

— Ды вось прыслаў табе мой гаспадар пан Марцін Глінскі-Папялінскі гасцінчыка.

— Дзе ж той гасцінчык?

— У хляве.

Прыйшоў цар у хлеў, паглядзеў, а там поўна зайцоў, як зачыніць.

— Мусіць, дужа багаты твой гаспадар, калі гэтулькі зайцоў прыслаў? — дзівіцца цар. — Мусіць, у яго яшчэ больш ёсць.

— Ён, панок-царок, такі багаты, што дай ты рады. Усяго ў яго многа, няма толькі гаспадыні ў пакоях. Прыслаў мяне тваю дачку сватаць.

Павёў цар ката ў палацы, накарміў, напаіў ды яшчэ і на дарогу ў торбу даў. А пра дачку змаўчаў.

Вярнуўся кот Максім дахаты. А яго гаспадар ледзьве дыхае: усе катовы запасы даўно паеў.

Развязаў кот торбу, дастаў адтуль усё, што з дарогі засталося, і пачаў карміць гаспадара.

Акрыяў сяк-так пан Глінскі-Папялінскі ды пытаецца ў ката:

— Ну, што табе цар сказаў?

— Нічога цікавага, — кажа кот.

— Дык ідзі яшчэ раз да цара. Толькі нанасі мне больш яды ў запас.

Нанасіў кот яму яды, а сам зноў пайшоў да цара. Прыходзіць у лес, а тут насустрач яму воўк:

— Куды ідзеш, кот?

— Да цара.

— Чаго?

— На суд.

І расказаў ваўку, на які суд ён ідзе. Воўк кажа:

— Дык і я пайду з табою! Мяне таксама часта дарэмна лаюць.

— Аднаму табе суд не паверыць,— кажа кот.

— А ты чаму адзін ідзеш?

— Што ты параўняўся са мною! Мяне ўся царская радня ведае, а ад цябе нават сабакі ўцякаюць, калі дзе ўбачаць. У мяне там дзядзькі, бацькі, дзяды, браты...

— Дык што ж мне рабіць?

— Збяры сотні тры сведак, тады паверацъ.

Падскочыў воўк, аб зямлю стукнуўся ды завыў на ўвесь лес:

— Дзядзькі, бацькі, дзяды, браты, бяжыце сюды!

Назбіралася ваўкоў з усяго лесу.

Павёў іх кот Максім да цара.

Прыходзяць на царскі двор. Нецярплівыя ваўкі кажуць:

— Мы першыя пойдзем на суд.

— Не, — кажа кот, — мая скарга там даўно ляжыць. Як скончыцца мой суд, тады я падам вашу скаргу і вас паклічуць. А пакуль што пачакайце ў гэтым хляве.

Ваўкі падагнулі хвасты ды пацягнуліся ў хлеў. Як толькі зайшлі ўсе, кот — бразь! — і зачыніў іх там. А сам падаўся ў палацы, у ладкі плешчучы.

Узыходзіць на ганак: стук, стук! Знаёмы салдат адчыніў яму. Кот проста да царскіх пакояў шыбуе. Увайшоў да цара, добры дзень даў.

— Што скажаш, каток? — пытаецца цар.

— Так і так, — кажа кот Максім, — прыслаў табе мой гаспадар пан Марцін Глінскі-Папялінскі новы гасцінчык.

— Добра, — кажа цар.

Прыйшоў у хлеў, глядзіць, а там ваўкоў лікам нялічана: і ў загарадках поўна набіта, і яшчэ пад страхою, на вышках, процьма.

Загадаў цар ваўкоў пабіць, усім сваім слугам футры пашыць, а кату кажа:

— Перадай пану Глінскаму-Папялінскаму: няхай сам да мяне ў госці прыедзе.

Прыбег кот дахаты ўночы, задыхаўшыся. Пачаў тармасіць гаспадара. Ледзьве дабудзіўся.

— Уставай, — кажа, — я ад цара прыйшоў.

Раскатурхаўся сяк-так Глінскі-Папялінскі, пытаецца:

— Што цар сказаў?

— Сказаў, каб ты сам да яго ў госці ехаў.

Пачухаў Глінскі-Папялінскі патыліцу:

— У чым жа я паеду? Я ж голы як бізун!

— Нічога, — кажа кот, — што-небудзь прыдумаем.

Сабраліся яны і бягом пабеглі да цара.

Бягуць, бачаць — недалёка ля гасцінца цэлае войска салдат спіць. Кот спыніў гаспадара.

— Пачакай, — кажа, — тут.

А сам крадком пайшоў да войска.Назнімаў у сонных салдат шапак і напакаваў імі два мяхі. Адзін мех на плечы ўскінуў, другі гаспадару даў. І пайшлі сабе далей.

Падыходзяць да рэчкі. Кату піць захацелася. Паставіў ён свой мех ля моста, гаспадара за каравульнага пакінуў, а сам палез у рэчку ваду піць. Напіўся вады, бачыць — паўзе рак у нару. Кот схапіў яго за вус і выкінуў на бераг.

Рак пачаў прасіцца:

— Пусці мяне ў ваду. Можа, я табе таксама якую-небудзь службу саслужу.

Кот падумаў і кажа:

— Якую ж ты мне можаш саслужыць службу?

— У вадзе, — кажа рак, — любую. Загадай, што хочаш, усё зраблю.

— Падкапай да раніцы маставыя слупы, — загадаў кот.

— Добра, — кажа рак. — Гэта я магу.

Пусціў кот рака, і той адразу ж ухапіўся за работу.

— А ты, — кажа кот Марціну, — як толькі абваліцца мост, раскідай шапкі па вадзе і чакай мяне тут.

Сказаў кот гэтак, пераскочыў цераз мост ды пабег да цара ў палацы.

Прыбягае, дакладвае цару:

— Так і так, ваша вялічаства-вымператарства... Ехаў да цябе ў госці мой гаспадар, пан Марцін Глінскі-Папялінскі, ды бяда здарылася: мост зламаўся, уся яго пяхота і конніца патапілася, адзін ён застаўся голы, бо абмундзіраванне з вадою сплыло...

Тут цар сеў у карэту, ката з сабою пасадзіў, прыехаў да моста. Глядзіць, і праўда: толькі шапкі ад войска па вадзе плаваюць.

Паспачуваў цар пану Глінскаму-Папялінскаму ды загадаў лепшым сваім краўцам і шаўцам пашыць яму новае абмундзіраванне.

Як бачыш пашылі краўцы і шаўцы новае абмундзіраванне. Адзеўся Глінскі-Папялінскі, прыхарашыўся і паехаў з царом у палацы.

Пагаманіў з ім цар, пачаставаў, а потым і кажа:

— А цяпер хацеў бы я паглядзець твой маёнтак: калі ты і праўда такі багаты, дык аддам за цябе дачку.

Спужаўся Глінскі-Папялінскі: якое ж ён багацце пакажа цару? Увесь яго маёнтак — адна гліняная печ, ды і тая разваліласяя.

Пачуў пра гэта кот Максім. Паклікаў ён свайго гаспадара ўбок і шэпча яму:

— Не бойся! Усё добра будзе.

Запрэглі царскія канюхі самых лепшых коней у самую лепшую карэту. Сеў цар у карэту і паехаў. А кот наперадзе пабег — дарогу паказваць.

Едзе цар, едзе, пад'язджае да маёнтка Змея Гарынавіча. Кот наперадзе бяжыць. Бачыць — пастухі вялікую чараду кароў пасуць. Падбягае ён да пастухоў.

— Чые вы? — пытаецца.

— Змея Гарынавіча.

Кот натапырыў вусы, грозны стаў:

— Не кажыце нікому, што вы пастухі Змея Гарынавіча, а кажыце — Марціна Глінскага-Папялінскага. Бо за мною ляціць Гром с Перуном — ён заб'е вас.

Сказаў так кот Марцін і пабег далей. Сустракае вялікую чараду коней. Падбег да канюхоў і пытаецца:

— Чые вы, канюхі?

— Змея Гарынавіча.

— Не кажыце нікому, што вы Змея Гарынавіча, а кажыце — пана Глінскага-Папялінскага. Бо за мною ляціць Гром з Перуном — ён заб'е вас.

Тым часам царская карэта з громам пад'ехала да пастухоў.

— Чые вы? — пытаецца ў іх цар.

— Пана Марціна Глінскага-Папялінскага,— адказваюць пастухі.

— О, — дзівіцца цар, — багаты пан Глінскі-Папялінскі!

Гэтак жа адказалі і канюхі. Пакуль цар ехаў, кот прыбег у двор Змея Гарынавіча. Убачыў самога Змея і крычыць:

— Хавайся, Змей Гарынавіч! Едзе Гром з Перуном — ён цябе заб'е і на муку сатрэ.

Спужаўся Змей Гарынавіч.

— Куды ж мне схавацца?

Кот паглядзеў і ўбачыў вялікае дупло ў старой ліпе.

— Лезь хутчэй сюды! — кажа Змею.

Залез Змей у дупло, а кот забіў дупло паленам ды яшчэ і глінаю замазаў. Потым пабег да Змеевых слуг.

— Чые вы? — пытаецца.

— Змея Гарынавіча.

— Не кажыце нікому, што Змея Гарынавіча, а кажыце, што пана Марціна Глінскага-Папялін-

скага. Бо за мною ляціць Гром з Перуном — ён заб'е вас.

— Добра, — кажуць напалоханыя слугі.

Прыехаў цар у маёнтак Змея Гарынавіча.

Слугі кінуліся сустракаць яго.

— Чый гэта маёнтак? — пытаецца цар.

— Пана Марціна Глінскага-Папялінскага! — у адзін голас адказалі слугі.

— Ну што ж, — кажа цар, — сапраўды багаты пан Глінскі-Папялінскі. Аддам за яго дачку.

Тут цар вярнуўся ў свае палацы, паклікаў музыкаў і загадаў іграць вяселле.

Усяго там было: хто што хацеў, тое піў і еў. І я там быў, еў і піў, па барадзе цякло, а ў роце не было.

# Прыгажэйшая на свеце — беларуская зямля

## Зямля з блакітнымі вачамі

*Эдзі Агняцвет*

Зямля з блакітнымі вачамі —
Раздолле рэчак і лугоў!
Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў,
Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
Прасторны шлях, далёкі шлях!
Краіна славы партызанскай,
Краіна міру і даброт!
Ты — наша гордасць,
Наша казка,
Як сонца, шчодры твой народ.
Твае сыны,
Твае унукі,
Мы любім гул тваіх бароў.
І рэкі цягнуцца, як рукі,
Да цёплых, верных рук сяброў.

## Маленькі чалавек у вялікім свеце

**(*Урыўкі*)**

*Алесь Бадак*

Дарагі дружа!

А ці ведаеш ты, дзе ты жывеш? «Ну, вядома ж, ведаю,— напэўна, адкажаш ты, — дома!» Але што такое «дом»? Правільна, гэта кватэра ці хата (для тых, хто жыве ў вёсцы), дзе ты спіш, гуляеш, ясі, глядзіш тэлевізар, — гэта твой дом. Там яшчэ жывуць твае мама, тата, брацікі, сястрычкі, там у цябе ёсць шмат цацак і кніжак.

Але вось ты з татам і мамай паехаў у іншы горад ці вёску, у госці. Паехаў, а назаўтра ўжо назад хочацца. Туды, дзе засталіся твае цацкі, кніжкі, мульцікі, дзе засталіся твае сябры, твая школа. «Мама, — просіш ты, — паехалі дадому, у Мінск». Вось яно што, аказваецца! Значыць, твой дом не толькі твая кватэра, але і ўвесь Мінск, цэлы горад! Калі ты, вядома, у ім жывеш. А нехта іншы жыве ў іншым горадзе. Значыць, і яго дом — цэлы горад! Толькі іншы. А нехта жыве ў вёсцы. Значыць, яго дом — цэлая вёска…

А цяпер паглядзі навокал. Бачыш вунь той лес? Гэта твой лес, таму што ты можаш разам са сваімі татам і мамай у любы час пайсці ў яго па грыбы ці ягады. Але гэта адначасова лес і ўсіх тваіх сяброў. І Валеркі, і Наташкі,

і Марынкі, і Сяргейкі. Бо яны таксама могуць у любы час са сваімі татам і мамай пайсці ў яго.

І рэчка, на якой ты дапамагаў старэйшаму брату лавіць рыбу, таксама агульная, наша. І кожны, хто захоча, можа прыйсці і пакупацца ў ёй.

А ўсё гэта — і лес, і рэчка, і зямля, па якой ты ходзіш, і горад, у якім ты жывеш, і вёска, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля, — усё гэта разам называецца адным словам — Радзіма. У яе і імя ёсць — Беларусь. Прыгожае імя, праўда?

Ну, а людзі, якія жывуць у Беларусі, гэта значыць мы з табой, называюцца беларусамі. На хлопчыка гавораць беларус, а на дзяўчынку — беларуска альбо беларусачка.

Ты яшчэ маленькі і пакуль вельмі мала чаго пабачыў у сваім жыцці. Ты яшчэ нават і не здагадваешся, якая вялікая і прыгожая твая Радзіма — Беларусь. Вялікая-вялікая, прыгожая-прыгожая! І столькі ж у ёй ёсць цікавага, незвычайнага, нават казачнага!

Вось толькі расці хутчэй, і ты зможаш усё гэта ўбачыць сваімі вачыма.

* * *

*Пятро Глебка*

О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка
Схіляюся перад табой.

Зямны паклон табе, Радзіма,
Тваім палям, тваім лясам,
Тваім заводам з белым дымам,
Тваім гасцінцам і шляхам.

На спелых нівах ураджайных
Ад краю ў край, ва ўсе канцы,
Махаюць крыламі камбайны,
Спяваюць жнеі і касцы.

Уся ўбрана ты квяціста,
Пад колер слуцкіх паясоў,
У строі нівы залацістай,
У шаты грэчак і аўсоў.

## Белая Русь

*Данута Бічэль-Загнетава*

Шчоку да вуснаў туліць,
Каб таямніцу спытаць:
— Белая Русь, матуля,
Гэта дзяўчынка?
Так?
Як называецца дзіўна...
Ты пра яе раскажы.
— Белая Русь — Радзіма.
Перад табой ляжыць.

Крыкні — яна адгукнецца
Звонам гарачых кос.
Кропля з ліста сарвецца,
Ускалыхнецца плёс.

Даль захлыснецца громам —
Белая Русь запяе.
І азарыцца Нёман —
Чыстае вока яе.

## Беларуска

*Уладзімір Мазго*

Беларуска, беларуска,
Па сцяжынцы крочу вузкай
Між азёраў і бароў —
На сустрэчу да сяброў.
Я спяваю людзям песні
Пра любімы родны край,
Што, як птушкі напрадвесні,
Саграваюць небакрай.
Многа кніжак прачытала
І з павагай гавару:
Багдановіч і Купала
Мне адкрылі Беларусь.
Палюбіла назаўсёды
Край жытнёва-трапяткі,
Дзе бярозкі карагоды
Дружна водзяць ля ракі.

## Родныя вобразы

*Якуб Колас*

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя смутнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня магутных дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

## Родныя словы

*Пятрусь Броўка*

Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест.
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск,
    Пінск,
        Брэст.
Калі паразважыш, няцяжка дазнацца,
Бо сведчаць на ўсю неабсяжную шыр,

Што продкі любілі спакойную працу —
Шклоў,
        Клецк,
                Мір.
А вораг находзіў,— бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі —
Пціч,
        Друць,
                Сож.
Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была, як агонь.
У сёлаў імёны, як гукі цымбалаў,—
Блонь,
        Струнь,
                Звонь!

## Прамяніся ярчэй і ярчэй

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Прамяніся ярчэй і ярчэй
Ды звіні ўсё званчэй і званчэй,
Наша простае, шчырае слова —
Беларуская мова.
Нізавошта не скажаш ніколі,
Лепш не выкажаш радасці, болю
У адзіным, адным толькі слове,
Як на мове сваёй, роднай мове.
Тут і плёскат блакітных азёраў,
Тут і гоман адвечнага бору,

Спеў салоўкі, куванне зязюлі,
Голас сэрца любімай матулі.
А ці будзеш так сам сумаваць,
Ці вясёлую песню спяваць,
А ці рэха будзіць у дуброве,
Як на мове сваёй, роднай мове?
Прамяніся ж ярчэй і ярчэй
Ды звіні ўсё званчэй і званчэй,
Наша простае, шчырае слова —
Беларуская мова.

## Сын і маці

*Янка Купала*

Сын
— Мамка, мамка, нам сягоння
Гаманілі ў школе
Аб якойсьці Беларусі,
Што жыве на волі.

Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Не люблю іначай),
Ды ніяк не мог уцяміць,
Што ўсё гэта знача.

Маці
— А вось тое, мае дзеткі,
Глянь-зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў;

Гэта поле — шнур ля шнура —
Ўзгоркі і лагчынкі,
На узмежку грушу-дзічку,
Крыж каля пуцінкі?

Бачыш логі, сенажаці,
А на іх — крыніцы,
Далей — бор зялёны, гонкі,
Што увысь глядзіцца?

А там далей, дзе ўжо вока
Дасягнуць не можа,
Тое самае пабачыш, —
А ўсё так прыгожа!

Сотні вёсак і мястэчак,
Гарадоў нямала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
З неапетай хвалай.

Там плывуць Дняпро і Сожа
Ды Дзвіна і Нёман,
Белавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.

Гарады — Мінск, Віцебск, Вільня,
Магілёў, Гародня
І Смаленск з сцяной цаглянай
Разляглі выгодне.

Аб вялікай нашай славе
Сведчаць на свет цэлы, —

Як жылі мы, панавалі
Ў родным краі смела.

Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
Й да цябе належа.

С ы н
— А! Ўжо сцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаю не буду.

Ну, а йшчэ скажы мне, мамка,
Бо я не разважыў:
Што такое беларусы,
Як настаўнік кажа?

М а ц і
— Ах, які ты йшчэ дурненькі,
Каб не скеміць гэта!
Ну, паслухай: усе людзі,
Што ад лета ў лета,

Ад пакон вякоў жылі тут
І жывуць сягоння,
Носяць світкі, носяць лапці
Ды былі ў прыгоне,

Ўсе — і ты, і я, суседзі,
Хто, па-твойму, прусы?

Дык жа ўцям: на Беларусі
Жывуць беларусы!

Ды яшчэ, каб лепей ведаў,
Мушу табе ўспомніць:
Беларусы беларускай
Гутаркай гамоняць.

С ы н
— Вось яно што! Праўда, мамка,
Ўжо сабе ўтлумачыў:
Беларус я! Ох, дам пытлю,
Хто скажа іначай.

Ну, але яшчэ не ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?

М а ц і
— Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?

Як жа мы з табой гуторым
Вось у гэту хвілю?
Як жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?

Ды паслухай, як на вёсцы
Кажа дзядзька, цётка;
Як пяюць улетку жнеі
За сваёй работкай;

Як бабуля баіць казкі
Аб нядолі-долі;
Як начлежнікі спяваюць
На начлезе ў полі?!

Сын
— Ну, ўжо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу,
Пакажу я ўсяму свету,
Хто я дый што значу!

## Рыбнае царства

*Алесь Карлюкевіч*

Жыццё ставіла чалавека ў такія ўмовы, што яго харчаванне залежала выключна ад прыроды. У рэках і азёрах хапала рыбы: у некаторых мясцінах гэта была першая сялянская ежа. Здаралася, рыбалоўныя сеткі настолькі забіваліся, што выцягвалі іх толькі коньмі. Вось і гаварылі гаспадыні: «Скубу не пер'е, ем не мяса». Альбо так: «Уехала пані ў сад, не выехала назад». Гэта ўжо пра рыбу, якая патрапіла ў нерат.

Бывала, што і рэкі судаходныя перагароджвалі сеткамі. Пакідалі, праўда, калідор для ло-

дак і суднаў. Такая лоўля называлася рыбнай заставай. Не ўся здабыча даставалася сялянам. Трэба было дзяліцца з панамі — тагачаснымі гаспадарамі. Існавалі законы, якія забаранялі самавольную лоўлю ў рэках, азёрах, сажалках.

Як жа здабывалі рыбу нашы прашчуры? Узімку ці напрадвесні глушылі яе па тонкім лёдзе драўлянымі дубінамі. Плялі з лазы лавушкі. Найбольш распаўсюджаныя былі сеткі. Яны нечым падобныя на сучасныя, хоць і хапае адрозненняў. Адно або тры сеткавыя палотнішчы нацягваліся на дзве вяроўкі. На верхнюю вешалі паплаўкі, зробленыя з хваёвай кары ці бяросты. Такія сеткі выстаўляліся далёка ад берага, таму рыбаку патрэбна была лодка.

Якіх толькі сетак майстры рыбнай здабычы не папрыдумвалі! Зімовыя і летнія невады, браднікі, мяты, муты, трыгубіцы, дрыгавіцы, сяляўныя сеткі, лешчаніцы, акунёўкі... А яшчэ ж лавушкі розныя майстравалі. Бучы выраблялі з прутоў і дранкі, нагадвалі яны конус альбо цыліндр. На Палессі ладзілі цэлыя збудаванні — катцы: у дно забівалі калы. Ды так густа, што «плот» гэты не дазваляў выйсці рыбе: яна трапляла ў абгароджаную частку вадаёма. Рабілі яшчэ і «вароты» — сеткавыя мяшкі. Унутры — перагародкі. «Вароты» з дапамогай жэрдак апускалі на дно ракі. Лавілі імі рыбу ў палонках.

А што таптух, то яны і цяпер захоўваюцца ў прырэчных вёсках. На драўляны каркас конусам

нацягнута сетка. У памяці маёй і імя майстра, «аўтара» маёй таптухі: Міхась Уладзіміравіч Ладуцька. Ён яшчэ расказваў, што раней такую прыладу майстравалі з лазы. Пра сетку, ды не толькі таптуху, таксама загадка прыдумана: «Хата рагата, вокан багата, як улезеш — не вылезеш».

За многія стагоддзі беларусы навучыліся гатаваць з рачных і азёрных багаццяў смачныя стравы. Магло здарыцца, што ў страсны год не хапала хлеба, а вось дзічына і рыба заўсёды былі.

Асабліва багаты стол быў у палешукоў. Іх край, схаваны між балот і рэчак, не меў вялікіх гандлёвых шляхоў. Рыбу лавілі, але не было куды прадаваць нават самую лепшую. І амаль усё, што сушылі і вэндзілі, трапляла на ўласны стол. Нават такі па сённяшнім часе далікатэс, як уюны, не быў у навіну. А гатавалі іх проста. Нанізвалі на тоненькія дубчыкі, падсмажвалі на вогнішчы, а пасля яшчэ і сушылі. І калі ўдавалася такое смакоцце вывезці, то перш-наперш уюны траплялі ў Кіеў і Вільню, на кірмашы. Там іх прадавалі разам з сушанымі грыбамі, салёнымі качкамі ў бочках, салам, цыбуляй, свежай і салёнай гароднінай, мёдам.

Няма ў нас мора, не абмываюць Беларусь акіянскія воды. А ўсё ж краіна была і застаецца рыбным царствам.

# Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга

(*Урыўкі*)

*Анатоль Клышка*

## Зала сарака

У Італіі, у адным з найстарэйшых у свеце Падуанскім універсітэце, ёсць славутая «Зала сарака». На покуці стаіць зробленая з тоўстых дошак, сёння паточаная ўжо шашалем трыбунка-кафедра. Яна памятае, як некалі тут чытаў лекцыі Галілей. Цяпер на гэтым месцы стаіць бюст геніяльнага вучонага.

На сценах універсітэта скрозь памятныя знакі — эмблемы, гербы славутых родаў. Падуанскі ўніверсітэт з гонарам ушаноўвае тых вялікіх, хто вучыўся альбо вучыў тут. Ды чаму не ганарыцца: адно такое імя, як Капернік ці Галілей, шмат што кажа ўсяму адукаванаму чалавецтву.

На сценах універсітэта — эмблемы... Але ў «Зале сарака» ўжо не эмблемы, а сорак вялікіх партрэтаў слаўных з найслаўнейшых. Сярод іх другі ад покуці, каля кафедры Галілея, — Францішак Скарына.

Так за тысячы кіламетраў ад Беларусі, у далёкай Італіі, ушаноўваецца памяць аб нашым першадрукару Францыску Скарыне.

Якраз са Скарынавых рук без мала пяцьсот гадоў таму назад усходняе славянства атрымала першую друкаваную кнігу.

## У слаўным горадзе Полацку

(***Скарочана***)

Дзень 6 сакавіка 1486 года запомніўся ўсім тады ў Полацку. Ды і не толькі ў Полацку.

Ранішняе сонца, якое цешыла ўжо вясновым цяплом, раптам пачало засланяцца цемраю. Людзі з жахам глядзелі, як яно ўсё меншала і меншала. Ці не канец свету? Чорны цень хутка бег па зямлі. Раптам зусім сцямнела. Набожныя пачалі горача маліцца...

Гулка бухалі званы полацкіх сабораў. Узбуджаныя, зарыкалі каровы, забрахалі сабакі. Суцэльная цемра схавала ўсё. І людзі адчулі страшэнны холад.

Але праз хвілю сонца зноў выбліснула. І ўсе ўсцешна ўздыхнулі... Мабыць, якраз у гэты час у жонкі праваслаўнага купца Лукі Скарыны нарадзіўся сын.

Бабка-павітуха, пакліканая з гэтай нагоды, абмывала немаўля і прыгаворвала:

— А дай, Божа, гэтаму дзіцяці ўсякую долю ўзяці: і хлебавую, і салявую, трэцюю — здаровейкую.

Паважаны Лука адно падтакваў: «Дай, Божа!» Бабулька далей прыгаворвала над малым:

А спі доўга,
Расці скора.
Бацьку, маці —
На пацеху,
Чужым людзям —
На паслугу...

І як у ваду глядзела. Паслужаць кнігі, «выложеныя доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька... людем посполитым к доброму научению», а нашаму народу — на ўхвалу. І як бы ўспамін аб гэтым дні на гравюрах тых кніг будзе сустракацца сонечны дыск, прыслонены паўмесяцам...

Абмыўшы дзіця, бабка прылажыла да яго пяткі кавалачак паперы. Барадаты Лука, убачыўшы, толькі заківаў галавою: «Дзе ж яе гэта раздабыла старая?» (папера была тут яшчэ ў навіну і дарага каштавала). А бабка, схіліўшыся, тым часам прыгаворвала над паперынаю:

Хай будзе вельмі вучоным малайцом,
Хай ён будзе ў бацьку — купцом!

Лука ўсміхнуўся і, вецячы старую мёдам-ліповікам, даў круглы, як сонца, бохан хлеба, а ў кішэнь ёй упусціў сярэбраную манету.

Першадрукар, перакладчык, паэт, мовазнавец, педагог, астраном, філосаф, медык, батанік, Скарына сваімі ідэямі, працаю прадвызначыў цэлыя стагоддзі ў культурнай і грамадскай гісторыі Беларусі.

Удзячныя нашчадкі помняць вялікі подзвіг свайго славутага першадрукара.

Штогод, калі з дрэў злятае першы восеньскі ліст, на радзіме асветніка праводзіцца скарынінскае свята, свята кнігі.

Імя нашага першадрукара ўбачыш ты сёння і ў назве вуліцы, бібліятэкі, друкарні.

Цудоўны помнік узняўся яму на прыгожай плошчы ў родным Полацку. Задуменна натхнёны стаіць Скарына, як бы вярнуўшыся з далёкіх дарог чужыны на бацькаўшчыну.

## Першы астраном

***(Урывак з кнігі эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля. Партрэт Беларусі»)***

*Янка Сіпакоў*

Народ — самы першы наш астраном. Вось як беларусы расказалі ў сваіх паданнях пра стварэнне свету: «Неба зроблена так, што яно мае сем столак. Мы бачым толькі першае неба. А Бог жыве аж на сёмым. З чаго зроблена неба, ніхто не ведае».

Своеасаблівую задачу мы паставілі Сонцу: ага, і ў гэтым наша беларускае разуменне справядлівасці космасу.

«Як Бог стварыў свет, то вялеў Сонейку свяціць на добрых і на ліхіх. Сонейка не хацела свяціць на ліхіх і пачало жаліцца Богу, што яму цяжка заўжды свяціць. Тады Бог пакараў Сонейка й вялеў яму свяціць толькі ўдзень, а ўночы, як гуляюць ліхія, не свяціць, а аддыхаць».

Мы бачылі, як змяняюцца квадры Месяца, і спрабавалі па-свойму растлумачыць яго ўсё новае і новае з'яўленне. Калі месяц састарваецца, Бог крыша яго на зоры. Адзін кавалачак кладзе ў дзяжу на закваску. Туды падаюць зоры, з іх ро-

біцца рошчына, цеста падыходзіць і пераліваецца цераз край дзяжы. Так і нараджаецца Месяц, Маладзік.

Аказваецца, і балота — наш космас. Хоць яго і зрабіў чорт. Нячысцік паглядзеў, што Бог сее зямлю, от ён схапіў трохі зямлі ды і схаваў яе ў рот.

Першым жа славутым не толькі ў нашай зямлі вучоным-астраномам быў Марцін Пачобут-Адляніцкі, які нарадзіўся ў 1728 годзе ў вёсцы Саламянка, што непадалёк ад Гродна. Беларускі астраном, матэматык і асветнік быў членам Каралеўскай Акадэміі навук у Лондане, членам-карэспандэнтам Французскай каралеўскай акадэміі, правадзейным членам Таварыства сяброў навук у Варшаве.

Ён арганізаваў у Вільні і амаль да самай смерці быў кіраўніком астранамічнай абсерваторыі — адной з найстарэйшых абсерваторый у Еўропе. Амаль 40 год вёў назіранні за зоркамі і планетамі, за астэроідамі і каметамі. Цікавыя яго назіранні за Меркурыем, за тымі з'явамі, якія адбываюцца на Сонцы і Месяцы.

Галоўнаю думкаю членаў астранамічнай школы была наступная: бязмежныя светы існуюць і рухаюцца ў прасторы і часе паводле адпаведных законаў. Яны нібыта пераконвалі не толькі сябе, але і нас, нашчадкаў: пазнанне свету магчымае і неабмежаванае, яно пашыраецца з новымі адкрыццямі.

Ёсць яшчэ адна вельмі цікавая і арыгінальная асоба, якая нібыта збоку стаіць у беларускім небазнаўстве — Язэп Драздовіч. Сын збяднелага шляхціца-арандатара з засценка Пунькі, што на Дзісненшчыне, якога яго сябра мастак Пётра Сергіевіч зваў беларускім Леанарда да Вінчы. Мастак, скульптар, этнограф, археолаг, разьбяр, фалькларыст, фантаст. А яшчэ ён удумлівы, дасведчаны астраном.

Ён выдаў першую на беларускай мове навукова-дакументальную кнігу па астраноміі «Нябесныя бегі»: «Я веру, што тэхніка землян па заваяванні прасторы не закончыцца на тым, што мы ўжо маем, а пойдуць далей аж да міжпланетных падарожжаў».

І ў гэта верыш! Як і ў той аўтапартрэт, напісаны на фоне космасу: моцная, але ласкавая рука трымае на далоні родную Зямлю, леваруч ад яго — Юпітэр з кольцамі, а вакол галавы — светлыя зоркі. І барада — як завіхраная Галактыка...

Язэп Драздовіч — наш першы беларускі касманаўт. Не, ён усё ж касманаўт, але не першы.

А першым нашым касманаўтам стаў Пятро Клімук.

# Жывая кніга прыроды

## Калінавая рукавічка

*Алена Васілевіч*

Чаму рукавічка, калі казка будзе пра чырвоную каліну, пра старую яліну-казачніцу, пра ветрабяздомніка?

А вось паслухай.

Расла на ўзлессі каліна. Была-была ўсё маленькай ды раптам, зусім неяк непрыкметна, вырасла. Зацвіла белым цветам, закрасавала — на дзіва і зайздрасць усім суседнім дрэвам.

— Ф-фарсуха, — пазіраючы на яе, аж трэсліся ў лажку асіны. Яны былі заўсёды бледныя і зялёныя, і заўсёды ім было холадна.

— Падумаеш, выстраілася, — шапталі хмурыя яліны. Яны насілі цёмнае адзенне і размаўлялі толькі шэптам.

Учэпістыя калючыя дубкі, што раслі на схіле пагорка, таксама непрыхільна паглядалі на маладую каліну: яна зусім не звяртала на іх увагі.

Толькі старая яліна-казачніца спачувальна пазірала на каліну-прыгажуню і жаласнаківала галавой:

— Пацвіце, пакрасуецца ды і завяне. Не яна першая, не яна апошняя...

Па лесе гуляе бура, ломіцца грубая жывёла, чалавек ходзіць... А ў яго нядобрыя рукі. Ён ломіць і крышыць усё, што ні стрэне па дарозе. Усё крышыць і ломіць.

Яліна-казачніца пражыла доўгае жыццё і ўсяго нагледзелася за свой век. Нарадзілася яна ў гэтым лесе даўным-даўно. Яшчэ да пажару. Тады тут жыла і яе маці, маладая стромкая яліна, і бабуля, гэтакая ж, як яна сама цяпер, згорбленая і пахмурая... А потым па лесе прайшоў пажар. Цэлы тыдзень, схапіўшыся загрудкі з агнём, змагаўся лес супроць смерці. Цэлы тыдзень агонь нішчыў лясны род. Згарэла маладая прыгожая яліна-маці, згарэла старая бабуля. Не засталося нікога ні з радні, ні з суседзяў. Нейкім цудам уратавалася ў гэтым пекле толькі яна — маладзенькая ялінка. Пажар не абмінуў і яе, але яна выжыла. Сагнулася на адзін бок, пакалечаная, але ўсё-такі жыла!

Мінуў год, за ім другі — і на пажарышчы пачалі адскакваць вясёлыя бярозкі, палез сям-там ельнік, пайшла ўсялякая лясная драбяза.

Мінула яшчэ некалькі гадоў, і вялікае лясное няшчасце, як і ўсё на свеце, пачало забывацца.

Вось чаму яліна-казачніца была самай старэйшай і самай мудрай у гэтым лесе.

Цэлымі днямі гойдалася яна на старэчых нагах ды моўчкі прыглядалася даляснога жыцця: як трымаюцца і пра што вядуць гутарку маладзейшыя дрэвы, аб чым пяюць птушкі, куды лятае вецер-бяздомнік... Прыглядалася, прыслухоў-

валася і ўсё шаптала сабе нешта, усё нешта шаптала...

А ноччу, калі ў лесе рабілася цёмна, хоць выкалі вока, да яліны-казачніцы прылятала старая сава. Днём яна спала, а ноччу гойсала па лесе, шукала сабе спажывы.

— Гэта ты, паўночніца, — незадаволена сустракала яе яліна, — не люблю я тваіх сквапных вачэй. Усе кругом спяць, а ты ўсё шнырыш, усё шнырыш па лесе. Сну няма на цябе.

— Я днём выспалася, — пазяхала сава, — а ноччу ў мяне паляванне: дзе дурное соннае зайчаня схаплю, дзе на мышыную сям'ю натраплю. Ху-ху-ху!

— Зладзейка ты...

— Ху-ху-ху! — зноў на самае вуха старой яліне рагатала сава. — Ты вельмі добрая... — І — мах-мах крыламі — знікла ў цемры.

— Паляцела...— бурчала ўслед ёй ялінаказачніца, пільна прыслухоўваючыся да шолаху ў вавёрчынай хаце.

Вавёрка жыла па суседству з ялінай у цёплым асінавым дупле. Яна была свавольніца і балаболка. Але старая яліна паважала вавёрку за працавітасць і спрыт. Усё лета рыжым полымем гойсала яна з дрэва на дрэва. Быццам нельга было прыдумаць іншага занятку. Але варта было толькі азвацца недзе яшчэ зусім далёка восені, як вавёрка кідала гульні і бралася за работу. Рамантавала сваю хату. Высцілала яе цёплым мохам. Заканапачвала ўсе дзірачкі. Потым з

ранку да вечара насіла ў свой свіран смачныя лясныя арэхі. Не прысядала ні на хвіліну...

Старая яліна толькі дзівілася: адкуль у вавёркі столькі сілы, каб цэлымі днямі цягаць гэтыя ношкі? І сама не вытрымлівала. Набярэ поўны прыпол духмяных зярністых шышак і высыпле вавёрцы.

— На вось табе. Будзеш зімой лускаць і дзякаваць бабулі-яліне.

— Дзякуй, дзякуй, бабулечка! Яны такія смачныя, такія смачныя, — дзякавала вавёрка, набіваючы да столі засекі ў сваім свірне.

І зноў: цок-цок — зноў рыжай маланкай мільгала ў суседнім арэшніку.

Ого, вавёрка была вельмі дбайная, вельмі руплівая гаспадыня. Пра гэта не раз гаварыла старая яліна і дзятлу-бондару, і зязюлі-мачысе.

— Паглядзі, як трэба пра дом клапаціцца ды пра дзяцей: і каб цёпленька ім было, і каб смачненька. А ў цябе, мачухно, паслухай, як плачуць дзеці,— дакарала яна зязюлю.

І сапраўды, у лясным гушчары, дзесьці далёка-далёка, чутно было адзінокае жаласнае «ку-ку»...

— Няхай не лётаюць гэтак далёка, дык і блудзіцца не будуць, няхай дома сядзяць... — адмахвалася ад папрокаў зязюля.

— Дома, — ківала галавой яліна. — Дома... Які ж у іх дом? Вунь ты падкінула іх да мухалоўкі... Ну, гадуе яна іх, ну, корміць. Але ж не родная маці. Смачнейшага чарвячка яна аддасць не тваім дзецям, а сваім...

— Не твая справа,— не жадала слухаць яліну зязюля,— усюды ты свой нос уткнеш...

— Ага, не хочацца слухаць праўду. Горкая яна... — казала ўслед зязюлі яліна і, крыху памаўчаўшы, ужо дакарала дзятла: — А ты чаму такі дурны? Вучыўся б вось у вавёркі. Глядзі, што ёй абыходзіць. Адамкнула svіран, нагрэбла арэхаў ці шышак, і гора ёй мала. Сядзіць сабе ў цяпле, ласуецца. А ты штодня з гэтым сваім долатам па лесе лётаеш. А ці многа ім заробіш, калі холад гэткі і дзень — не згледзіш, як ён і праміне...

Дзяцел-бедалак, і праўда, — зіма не зіма, холад не холад — дзень пры дні павінен быў зарабляць сабе на пражытак.

— Ат, цётачка, колькі мне чаго трэба, — звычайна адказваў ён старой яліне. — Дзяцей я пагадаваў. Старая мая, вы ж самі ведаеце, яшчэ леташняй зімы не перазімавала... Дык колькі мне аднаму трэба... От жа пражыву неяк зіму. Балазе кажух цёплы маю.

— Так, так, дзіва што пражывеш, — нездаволена бурчала яліна. Як і ўсе старыя, яна не любіла, калі з ёю не згаджаліся. Яна змаўкала, збіраючыся крыху падрамаць. Але тут налятаў халодны сівер. Ён трос яе, выкручваў скурчанае ад старасці і холаду голле і ўзнімаў такі свіст і трэск, што спуджаная вавёрка зашывалася ў сваё дупло і не дыхала, быццам яе там і не было.

— Шалёны!— адмахвалася старая яліна. — Адкуль цябе прыгнала?!

— Ой, цётухна, адкуль прыгнала, не пытай. Скажы лепей, куды гоніць! — рагатаў вецер.

— Ведаю ўжо... Ляці сваёй дарогай, шыбенік!

Сівер узмахваў доўгім расхлістаным халатом, перакручваўся некалькі разоў у паветры і імкліва знікаў — гэтак, як і прыляцеў.

— Ох, скруціць ён галаву гэтай дурной каліне! Вунь як яна хіліцца, ледзь не да самай зямлі яму кланяецца...

Старой яліне з узгорка было добра відаць усё, што рабілася на ўзлессі. І сапраўды, маладзенькая каліна яшчэ больш чырванела і харашэла, сустракаючы ветра.

— Ляцім са мною па свеце! — шаптаў ёй вецер-сівер. — Што ты тут бачыш, стоячы вунь ужо колькі год усё на адным месцы, усё пры гэтай дарозе?

— Людзі тут ходзяць і ездзяць...

— «Людзі ходзяць і ездзяць...» Дурная ты! Ты паслухай, што кажа пра гэтых людзей старая яліна. Яны загубяць цябе, паламаюць твае рукі... А ягады твае — навошта яны ім?

— Не кажы так. Мае ягады лечаць людзей... У цябе няма сэрца, і ты не ведаеш, як гэта цяжка, калі яно баліць. А людзі ўмеюць варыць з маіх ягад лекі і лечаць імі сэрца...

— «Людзі», «лекі»... Навошта яны табе здаліся! Мы з табой паляцім за мора, паляцім да такіх высачэзных гор, якіх ты і не сніла ніколі.

І ты тады забудзеш пра гэты свой лес, пра гэтую дарогу, на якую ты дзень і ноч глядзіш як утрапёная.

— І ніколі больш не вярнуся сюды?

— А чаго?

— Не, я не здолею... Я высахну і памру без свайго лесу, — плакала каліна.

— Ну дык і заставайся тут! А мне няма часу з табой валаводзіцца. Не спадзявайся, каб я яшчэ лятаў да цябе...

Вецер-сівер узмахваў сваім халатом, пранізваў каліну смяртэльным холадам. Каліна калацілася, дрыжала, і на зямлю чырвонымі ягадамі сыпаліся яе горкія слёзы.

— Пачакай, не пакідай мяне адну!.. — стагнала наўздагон ветру каліна. Але вецер ужо не чуў яе.

* * *

А калі настала зіма і ў лесе не было ўжо ніводнага зялёнага лісціка, ніводнай кветачкі, ішла гэтай самай дарогай, каля якой расла каліна, жанчына з маленькім хлопчыкам.

— Мамачка! — закрычаў хлопчык і запляскаў у далоні. — Зірні, зірні — ягады!

Яны спыніліся.

— Гэта каліна, сынок. Бачыш, якая яна: зіма, мароз, а яна не баіцца...

— Можна сарваць?

— Толькі асцярожна. Не паламі галінак.

Хлопчык ірваў чырвоныя калінавыя ягады, клаў іх у сваю рукавічку і пяшчотна прыгаворваў:

— Не бойся, калінка-малінка. Мае ручкі не злыя. Галінак тваіх не паломяць, вершалінкі не скрышаць. Толькі ягадкі сарвуць — маме на лякарства...

Так ён прыгаворваў і ўсё клаў і клаў у сваю рукавічку чырвоныя ягады. І каліна радавалася: ашукваў яе вецер і яліна-казачніца памылялася. Добрыя ў чалавека рукі, разумныя...

Вось і канец гэтай лясной казцы. Той маленькі хлопчык захацеў назваць яе казкай пра калінавую рукавічку.

Ну што ж, няхай сабе рукавічка, няхай сабе калінавая...

## Гаспадарка

*Змітрок Бядуля*

У куце сядзіць мядзведзь,
Хустку вышывае.
А лісічка-невялічка
Хатку прыбірае.
А каток пячэ аладкі,
Маслам залівае.
На тапчане мышанятка
Есці памагае.
А сабачка ўе вяроўкі —
Пугу для хлапчыны,
Дзяцел-бондар на начоўкі
Длубае асіну.
Казёл лапці папраўляе,
Скуратом мацуе,
На акенцы павучочак
Кросенкі рыхтуе.

# Грыбнік

*Рыгор Ігнаценка*

Грыбы сёлета з'явіліся са спазненнем. Але затое — колькі! Людзі носяць кашамі, кашолкамі, вёдрамі, а іх усё не меншае.

Надышла восень. Ранкамі серабрысты іней дзе-нідзе на стрэхах забялеў, а грыбы ўсё растуць. Ды якія грыбы! Найбольш баравікі і падасінавікі.

Назбіраў я гэты раз кашолку маладзенькіх падасінавікаў ды іду сабе дахаты. Бачу — бярозавы гаёк. Дай, думаю, зазірну, як там з грыбамі. Зайшоў і вачам не паверыў: баравікоў — хоць касу закладвай.

Што рабіць? Мая кашолка поўная падасінавікаў, але ж і баравікоў шкода пакідаць.

Пастаяў трохі, падумаў, потым высыпаў падасінавікі пад елачку, каб пасля забраць, ды пачаў баравікі збіраць. Пахадзіў па бярэзніку — зноў поўная кашолка.

Прыходжу назаўтра на знаёмае месца. Зірк — нехта мае грыбы на вываратні расклаў. Да таго ж — усе ўгору шапачкамі. Гэта на выпадак дажджу, каб не намоклі.

«Вось табе і на! — падзівіўся я і прысеў побач на пень. — Хто ж гэта пагаспадарыў тут? Каму мае падасінавічкі спатрэбіліся?»

Я ведаў, што вавёркі любяць грыбы. Нават сушаць на зіму. Але ж яны іх чапляюць на сучках і галінках дрэў. А гэтыя ляжаць на вываратні.

Нечакана ззаду нехта затупаў. Паварочваюся, ажно з залацістага бузінніку нетаропка барсук выходзіць. Мяне ён не бачыць і шыбуе проста да елачкі, дзе засталося яшчэ некалькі маіх падасінавічкаў. Бярэ асцярожна адзін грыбок у зубы і — да вываратня. Паклаў угору шапачкай на шурпатую кару дрэва і за другім патрухаў. Носіць звярок мае грыбы ды задаволена носам сапе.

Нарэшце, на пятым ці мо на шостым заходзе, барсук падслепаватымі вочкамі зірнуў на мяне, спалохана фыркнуў, выпусціў з зубоў грыб, крутануўся — і ў хмызняк. Толькі сухое лісце зашамацела.

Пасмяяўся я з грыбніка і ціха падаўся ў другі бок. Навошта мне гэтыя грыбы? Ці ж мала іх у лесе? Пахаджу якую гадзіну-другую і назбіраю маладзенькіх баравічкоў. А падасінавікі няхай барсуку застаюцца. Халоднай зімою спатрэбяцца.

## Джэк і Рыжык

**(*З кнігі «Арцёмкавы канікулы»*)**

*Зіновій Прыгодзіч*

У Арцёмкі ў вёсцы ёсць хвастатыя сябры — Джэк і Рыжык.

Джэк — унікальны сабака. Немагчыма вызначыць яго пароду. Яна нейкая зборная, змешаная. Пыска — як у аўчаркі, толькі меншая,

драбнейшая. Тулава доўгае, а лапкі маленькія, кароценькія, як у таксы. Поўсць доўгая, як у ёркшырскага тэр'ера. Натура незласлівая, гуллівая, дружалюбная, як у лабрадора. А вочы заўсёды хітрыя-хітрыя, як у дварняка.

Джэк вельмі любіць сваіх суседзяў, заўсёды іх прыезд сустракае шумным, радасным брэхам. Хто ведае, як ён вызначае іх машыну, але кожны раз, як толькі дзядулеў «фальксваген» зварочвае з асфальтавай дарогі на вясковую вуліцу, Джэк усё кідае і ляціць насустрач. А тады ўжо, пераняўшы машыну, бяжыць наперадзе і апавяшчае на ўсю вёску: «Прыехалі! Прыехалі!..» Пры гэтым іншы раз так захопіцца, што ніяк не можа спыніцца. Тады дзед Жэня вымушаны яго дабрадушна ўшчуваць:

— Ну-ну, хопіць ужо, хопіць...

Джэк — істота надзвычай міралюбная. Няма ў яго ніякай злосці, нікога ніколі без толку не аббрахаў, не напалохаў. А калі, бывае, і гаўкне раз-другі на таго, хто праходзіць міма двара, то такім чынам хутчэй вітаецца з чалавекам ці з цікаўнасці пытаецца ў яго, куды і дзеля чаго той ідзе. Праўда, не ўсе разумеюць яго добрых намераў і абыякава адмахваюцца.

Не разумеюць Джэка і некаторыя вясковыя сабакі. Асабліва тыя, што навязаны ў двары. Калі Джэк прабягае міма, то яны ажно рвуць ланцуг, здаецца, гатовыя з'есці яго ад злосці,

ад зайздрасці, што ён вольны, можа наведвацца да любой сяброўкі...

У Рыжыка — свая гісторыя.

З'яўленне яго на дачы было арыгінальным. Аднаго разу Арцёмка і дзядуля рамантавалі ў двары веласіпед. Нечакана адтуль, дзе ў іх садок, пачулася жаласнае мяўканне.

— Гэта ў нас? — здзівіўся Арцёмка.

— Наўрад ці... — абыякава адазваўся дзядуля. — Гэта, відаць, у суседзяў. Яны завялі сабе маленькага коціка. Можа, есці просіць.

Аднак мяўканне не сціхла. Наадварот, яно рабілася ўсё больш гучным, настойлівым, адчайным.

Арцёмка і дзядуля кінулі свой занятак і пайшлі ў садок. Якое ж было іх здзіўленне, калі на плоце пабачылі маленькі рыжы камок. Кацянё неяк ускараскалася на высокі плот, а злезці назад ужо не хапала духу. І коцік у адчаі стаў прасіць дапамогі.

Арцёмка асцярожна зняў малечу з плота і ўзяў на рукі. Але коцік, набраўшыся страху, усё яшчэ дрыжэў, ніяк не мог супакоіцца.

— Ну ціха ты, ціха, Рыжык... Дзядуля, давай яго будзем зваць Рыжыкам!

— Добра. Але ж гэта не наш каток. Што скажуць суседзі, калі мы яго забяром?

— А мы не будзем забіраць назаўсёды. Хай проста прыходзіць да нас у госці.

— Ну дык скажы яму гэта.

— А як?

— Вельмі проста. Пачастуй чым-небудзь смачным, і ён будзе прыбягаць да цябе кожную раніцу.

Арцёмка наліў у сподачак падагрэтага малака і паставіў перад Рыжыкам. Той тыцнуўся пыскай у сподачак раз, другі і, рассмакаваўшы, пачаў ахвотна хлябтаць.

— Падабаецца! Падабаецца! — цешыўся Арцёмка.

Рыжык дапіў малако і акуратна вылізаў сподачак язычком. Арцёмка зноў узяў яго на рукі і стаў гладзіць. Коцік ад задавальнення заплюшчыў вочы і салодка замурлыкаў.

Дзядуля назіраў з цёплай, задаволенай усмешкай. Калі Арцёмка нагуляўся з коцікам, сказаў:

— А цяпер мы ў плоце зробім для Рыжыка дзірачку, каб ён больш не лазіў праз верх.

І Рыжык сапраўды стаў прыходзіць да іх амаль кожны дзень.

Лета, аднак, мінула вельмі хутка, і Арцёмка, развітаўшыся з Джэкам і Рыжыкам, паехаў у горад, зноў пайшоў у школу. Але ўсю зіму ўспамінаў сваіх верных сяброў, з нецярпеннем чакаў новай сустрэчы з імі.

## Азбука птушак

**(*Скарочана*)**

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Вось вам азбука
І птушак,
Любых змалку
Вясялушак.

### Арол

Арол
Адолеў
Буры сілу,
Ляцеў
Асілак
Быстракрылы.
Акінуў позіркам
Прасторы,
Агледзеў
Лес наўкольны,
Горы.
І на гняздо,
На дуб высокі
Цар птушак
Прыляцеў
Здалёку.

### Бусел

Бусел,
Буська,
Бацянок,
Белы-белы
Кафтанок.
Басаногі ён,
Без ботаў,
Ходзіць,
Бродзіць
Па балотах.
Жабкі
Busліка
Баяцца:
У чарот
Бягуць хавацца.

### Варона

Варанятка
Птушку-матку
Кліча, кліча
ў сваю хатку.
Вечарэе,
Вецер зябкі,
Птах галодны,
Зябнуць лапкі.
А варона ўсё
Вароніць —
Дзіцяняці
Не пакорміць.

Вечарам,
Нарэшце,
Матка
Успомніла
Пра варанятка...
Накарміла,
Спаць паклала,
Калыханку
Варкавала.

### Гуска

— Дзе была ты, Гуска?
— На балоце грузкім,
Там хадзіла я,
Гуляла,
Траўку
Гэткую шчыпала,
Нашую,
Гусіную,
З мяккай
Сэрцавінаю.

### Драч

Горла
Драў
На лузе
Драч:
Драчанят няма,
Хоць плач...
Драчанятак
Драч чакаў,
Доўга-доўга
Іх гукаў.
Драчаняткі,
Як пачулі,
І прыбеглі
Да татулі.

### Елавік-крыжадзюб

Шышку крыжадзюб
Дзяўбаў,
Зерні
Елкі
Даставаў.
Зерні
Елавік
Дастаў
Сваёй моцнай
Дзюбкай,
Ежу
Дзеткам раздаваў:
— Ешце,
Крыжадзюбкі!..

### Журавель

Журавель,
Жураўка,
Жораў
Мае ціхі,
Добры нораў.
На балотах
Жураўліных

Ён збірае
Журавіны...
У трубу —
Жаленку —
Трубіць,
Танцаваць
Жураўка любіць.
Жураўліха
З ім ласкава,
Скача
Жыва,
Скача
Жвава.

### Заранка

Яшчэ свеціць
Зорка,
Зараніца
Ранкам,
А пяе ўжо
Звонка
Ранняя Заранка.
І чуваць
Выразна
Срэбны
Звон-званок,
Быццам
Звоняць
Нівы,
Травы,
Гай-лясок.

### Івалга

Ілі-цілі,
Ілі-цілі, —
Івалга
Пяе над рэчкай.
Лес шуміць
Лісцём вясновым
І ўкрывае
Ім гняздзечка.

### Каня

Каня
Канькае,
Кігіча:
— Кігі,
Кігі, —
Дожджык
Кліча, —
Кігі, Кігі, —
Хоча піць...
Над азёрамі ляціць,
Ловіць
Кропелькі-дажджынкі,
Як празрыстыя расінкі.
І ўсё
Кружыць,
І ўсё
Кружыць,
Канькае,
Кігіча,
Тужыць.

### Ластаўка

Золак
Ледзь-ледзь
Дрэў вяршыні
Кранае,
Ластаўка-
Ласкаўка
Лугам
Лятае.
Ранкам
І днём
Напявае,
Шчабеча
І заціхае
Ў хацінцы
Пад вечар.

### Мухалоўка

Мухалоўка
Мух лавіла,
Мохам,
Мурагом
Хадзіла,
Трохі
Прытамілася,
Супачыць
Спынілася...
Села,
Пасядзела,
Хутка паляцела
Ў ціхі гай,
Дзе траўка,
Мяккая
Мураўка,
Многа-многа
Мушак
І сяброўак-птушак.

### Нырок-свірок

На возеры
Нырок
Нырае,
Нічога ён
Не заўважае.
Наважыўся
На бераг плыць,
А тут як тут
Ліса бяжыць...
Нырок-свірок
Перапужаўся,
Нырнуў —
І ў хвалях ён
Схаваўся.

### Пугач

Пустальгу
Пугач
Пужаў,
Пускаў ёй
Пыл у вочы.

Ён
Птушцы
Толькі
Паграджаў,
Сам нішчыў
Мышак ноччу.

**Рабчык**

Золак ззяў,
Было ранютка.
Рабчык бег
Па лесе хутка, —
Захварэла
Рабка —
Рабак-дзетак
Матка.
Рабчык
Дзятліка спаткаў,
Пра бяду сваю сказаў:
Доктар,
Рабцы
Рады дай.
Не бядуй,
Мой родны, знай,
Вазьмі лекі —
Ёсць якраз —
Рабка вылечыцца ўраз.

**Салоўка**

Свішча
Салоўка
Майскаю ночкай,
Ранкам і днём
Спявае,
Слых
Салаўіхі
У веснім садочку
Песціць,
Суцешна ласкае.

**Турухтан**

Турухтан — кулік
Такуе,
Як палянку
Аблюбуе,
Тут і ладзіць
Такавішча,
Ток —
Вясновае ігрышча.
Турухтан —
Туп, Туп, —
Тупоча,
Запрасіць
На танцы хоча
Прыгажуню
Турухтанку,
Што выходзіць
На палянку.

**Удод**

Удод
Убор

Расквеціў свой
У колер белы,
У ружовы,
Угледзеў раз,
Упадабаў
На ўсё жыццё
Лясок сасновы.
Яго жытло тут,
У дупле
Магутнай
Стогадовай хвоі,
Укрыцца можна
Заўсягды
І жыць паціху,
У спакоі.

### Цецярук

Цецярук
Цецярука
Цешыць
Сябра-дзівака:
— Я цябе
З тваёй
Цяцерай
Запрашаю
На вячэру.
Вечар
Цёмны
Ноч прыводзіць,
Цецярук жа
Не прыходзіць,
Не заве
На вячэру
І ні сябра,
Ні цяцеру.

### Чомга

Чуйная
Чомга
Чула
Подых вясны,
З выраю
Прыляцела
У край свой
Азёрны, лясны.
З пругкіх
Чаротаў
Чомга
Домік-гняздо спляла,
Ён, нібы
Човен, гайдаўся,
Возерам
Птушка плыла.

### Шыпун-лебедзь

Шыпун
Плыве,
Шыпун
Шыпіць,
Рака
Шырокая
Шуміць.

Плывуць
За лебедзем
Крылатым
Яго малыя
Шыпуняты.

— Юць, Юць,
Юць, Юць!..—
Чуваць з сасонкі
Яго вясёлы
Голас звонкі.

### Эму

Эму — страус.
Эх, вялізны,
Эх, і быстры,
Як алень,
Прабягае
Многа-многа
Кіламетраў
Кожны дзень.
Эму ведаюць
І дзеці —
Пісьманосец
Добры ён,
Эму
Ў вёсках афрыканскіх
Свой,
Любімы паштальён.

### Юрок

Юрок вясною
Гаманлівы,
Рухавы,
Спрытны
І юрлівы.

### Ястраб

Сонечны дзень
Ясны-ясны,
Робіць кругі
Ў небе Ястраб.
Яркае сонца
Палае,
Ястраб
Здабычы шукае...
Мерае
Неба абшары,
Кружыць,
Знікае пад хмары.

## Скарб

*Змітрок Бядуля*

Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць. Праца ў яго заўсёды кіпела ўночы, калі, бадай, усе жывыя істоты спалі, калі спяваў адзін салоўка і месячык рэчку фарбаваў.

У кузні ў хохліка было некалькі памочнікаў. Светлячок раскладваў агонь на горне. Цвыркун працаваў малатком пры кавадле. Жаба дзьмухала кавальскімі мяхамі.

Пад карэннямі вольхі, ля рэчкі, крот выкапаў патаемныя падзямеллі, дзе хохлік хаваў свой багаты скарб — скрыні з золатам. Разнеслася вестка па ўсёй ваколіцы ля рэчкі, што хохлік вельмі багаты і мае незлічоныя скарбы пад вольхай.

— Сама сваімі вушамі чула,— казала маленькая плотачка ў рэчцы,— цэлымі начамі куе ды куе ў сваёй кузні, грукае і стукае і нам, рыбкам, проста спаць не дае.

— Сама сваімі вачыма бачыла,— казала варона, — усё там у яго ў кузні блішчыць і блішчыць. Свеціць, як маланка, ажно вочы слепіць мне, старой. І я мусіла сабе купіць цёмныя акуляры, бо доктар драч напужаў мяне, што зусім аслепну пад старасць, калі не буду асцерагацца. Адно гора з гэтым хохлікам!

— Ку-ку! Ку-ку! Раз-два! Тры-чатыры! — кукавала зязюля на вольсе. Яна ў цёплыя раніцы сядзела на дрэве ды ўсё лічыла багацце хох-

ліка. Але зязюля ў лічбах надта някемная: лічыць-лічыць, зблытаецца ды зноў спачатку пачынае, і гэтак штодня.

— З-з-з-м-м-м! З-з-з-м-м-м! — гудзеў авадзень над рэчкай. — Гэта ж проста бяда, аднаму ўсё, а другому нічога. Я лётаю-лётаю, б'юся як рыба аб лёд і нічагуткі не маю, а хохлік увесь свет захапіў.

— Ш-ш-ш! — казаў чарот.— Не шуміце так, не грыміце ды не зайздросце. Працуйце, дык і вы будзеце мець. Я вось сведка, як хохлік са сваёй сям'ёй працуе да поту.

— Дурань, дурань, дурань! — крыкнуў дзяцел чароту. — Не лезь куды цябе не просяць. Маўчы, ды годзе. А вось давайце, браткі, будзем дзяліць хохлікава дабро!

— Давайце! Давайце! — крыкнулі вераб'і.

— І мы, і мы да кампаніі! — загулі камары.

— Калі ўсім, дык і нам! — закудахталі куры. Падняўся шум, гармідар, крыкі. Наляцелі з усіх бакоў звяры і птушкі, мухі і ўсе жывыя істоты, хто толькі даведаўся аб багацці хохліка. Усе рынуліся да хохліка ў кузню, каб яго абрабаваць.

Але хохліка таксама ўлегцы не возьмеш. Ён схаваў свае скарбы спрытна. Закопваў па ўсёй ваколіцы ў розных мясцінах — па лясах, па лугах, пад крушнямі, пад дрэвамі. Не было лапінкі зямлі, дзе не ляжалі б яго скарбы. Але ніхто іх знайсці не можа. Грабуцца куры на сметніках. Капаюцца птушкі на палях. Порацца звяр'ё пад карчамі, рыба ў вадзе.

Шукаюць, шукаюць, але нічога з гэтага не выходзіць.

Наслухаўся малы Саўка ад свайго старога дзеда, каторы жыў у млыне ля рэчкі, шмат баек аб багатых скарбах. Яны захаваны ў зямлі, іх усе шукаюць пад карчамі і знайсці не могуць.

— Іх трэба шукаць апоўначы ў купальскую ноч, калі кветка папараці цвіце, — казаў дзед, — тады можна іх знайсці.

Вось у купальскую ноч, калі дзед ужо спаў, малы Саўка выйшаў ціхенька з хаты, узяў з сабою рыдлёўку і пабрыў скарбаў шукаць. Убачыў ён здалёку агеньчык, які блішчэў на полі ля крушні і вабіў да сябе.

«Гэта, пэўна, скарб!» — падумаў Саўка і пайшоў на гэты агонь. Ён да агню, а агонь ад яго далей і далей, і завёў агонь хлопчыка ў самы цёмны гушчар. Страшна і жудасна было ў гушчары. Дрэвы, як жывыя істоты, шапталіся паміж сабою і нібы дзівіліся, што такі малы хлопчык не баіцца адзін швэндацца ў лесе па начах. Тым часам агонь знік, а замест агню залаты пеўнічак заблішчаў на карчы.

— Вось дзе скарб! — узрадаваўся Саўка і трах рыдлёўкай пеўнічка па галаве. Пеўнічак запяяў і знік, а замест пеўнічка паказаўся залаты зайчык. Саўка зрабіў тое ж самае з зайчыкам... Паказалася залатая лісічка... Затым — залаты ваўчок... Залаты мядзведзь... Але ён дзіка раўнуў і глынуў Саўку.

Ачухаўся Саўка праз некалькі хвілін. Ажно стаіць ён пад зямлёй, а на яго глядзіць і ўсміхаецца хохлік малюсенькі і тоненькі, як травінка, прыбраны ў шоўк і ядвабу. На галоўцы ў яго залатая карона з дарагімі камянямі.

— Вось ты і папаўся, Саўка, у мае рукі! — сказаў хохлік.

— А я цябе не баюся,— загарачыўся Саўка.— Зачэпіш мяне, дык я цябе вось адным пальцам задушу! — і паказвае хохліку свой палец. Але як глянуў сам на палец, дык адразу анямеў ад страху: палец цянюткі, як павуцінка. Тады давай Саўка аглядаць усяго сябе. Ажно ён сам такі ж маленькі, як хохлік. Тут Саўка спужаўся і заплакаў.

— Не плач,— сказаў хохлік.— Давай цяпер, калі ты ростам такі, як я, будзем аглядаць мае скарбы пад зямлёю.

— На волю хачу, да дзеда! — яшчэ галасней заплакаў Саўка, бо ў яго ўжо адпала ахвота скарбы глядзець.

— Вось табе і адважны!— пачаў кпіць з яго хохлік. — Звяроў страшных не баяўся, а цяпер плачаш. Сорам, а яшчэ такі хлопец! Глянь, Саўка, налева і дзівіся!

Як глянуў Саўка налева, дык адразу плакаць перастаў, бо сярэбраныя палацы замігацелі пад зямлёй. Увёў хохлік Саўку ў палацы. Як заблішчалі залатыя сцены і дарагія камяні на сталах, дык Саўка аж засмяяўся з радасці і забыўся аб усім на свеце.

— Гэта мае палацы, — тлумачыў яму хохлік. — Я тут жыву з усёй маёй вялікай грамадой. Мы ўсе вельмі багатыя. Мая грамада разышлася па ўсіх кутках зямлі на працу. Кожны хохлік мае багатыя скарбы — куе і куе золата і дае багацце таму з людзей, хто шчыра працуе. Маткa-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць. Без мазалёў і поту ніякіх скарбаў не знойдзеш.

Раптам пачуўся шум пад зямлёй. З усіх бакоў, з усіх шчылін пачалі сыпацца хохлікі, як залатыя сняжынкі, як брыльянтавы мак, як жывы каляровы дождж. Малюсенькія-малюсенькія, драбнюткія-драбнюткія і многа-многа, ажно ў вачах мігацела, гледзячы на іх. А ўсе, відаць, працаўнікі заядлыя, майстры адукаваныя: хто з сякерай, хто з рыдлёўкай, хто з малатком, хто з мяшочкам за плячыма, а хто з такім дзіўным інструментам, што Саўка і не ведаў, што гэта.

— Гэта мая сямейка на вячэру прыйшла... Гэй ты! — паклікаў хохлік аднаго з кампаніі. — Як расце поле таго ратая, што раней за ўсіх у вёсцы на шнур свой выходзіць?

— Вельмі добра расце... Я сам даглядаю жытнія зярняткі, кармлю іх зямельным сокам і паю расіцай.

— А ты што сягоння зрабіў? — строга крыкнуў ён другому.

— Я глядзеў за тым, каб сад добра расцвітаў, каб вецер без пары́ кветак не зрываў.

— Ну, глядзі, бо гаспадар дзень і ноч у садзе капаўся, трэба, каб яблыкі былі, як гарбузы, а грушы — як кулакі.

— А ты, жэўжык, што рабіў? — звярнуўся ён да трэцяга.

— Я пільнаваў агарод з агуркамі. Лічыў і лічыў, бо трэба, каб сёлета было шмат агуркоў. — І хохлік пачаў лічыць па пальцах: — Пяць коп гаспадару; шаўцу, што яму боты шыў, — тры капы; кавалю за рыдлёўку — тры капы; хлопчыку, які ваду цягаў,— тры...

— Ах ты такі і сякі! — зазлаваўся старшы хохлік. — Чаму ты гэтакі скупы? Глядзі, каб усім было не меней як па дзесяць коп!

— Буду старацца,— пужліва сказаў працаўнік.

Падышоў новы хохлік з кнігай і пачаў чытаць аб тым, як хлопчыкі ў школах вучацца, хто стараецца і хто толькі мух ловіць. Доўга чытаў ён аб гэтым, пералічваючы ўсіх сяброў і знаёмых Саўкі.

— Рыхтаваць стараннным хлопчыкам самыя найлепшыя гасцінцы, а гультаям і абібокам нічога не даваць! — загадаў старшы хохлік.

Пасля розных распытванняў працавітыя хохлікі селі вячэраць. Чаго-чаго там ні было на вячэру: самыя найлепшыя прысмакі, якія толькі ёсць на зямлі. Саўку, як госцю, вядомая рэч, пападаліся найсмачнейшыя кавалкі.

Павячэраўшы сытна, Саўка заснуў і не паспеў азірнуцца, як апынуўся на ложку сваім у дзедавай хаце.

З таго часу болей Саўка не шукаў скарбаў, бо ведаў, што матка-зямля мае іх у сябе вельмі шмат, але дае толькі тым, хто працуе. І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.

## Арцёмка і яго сябры

*Зіновій Прыгодзіч*

Шмат клопатаў у Арцёмкі на дачы. Найперш — назіраць за бусламі. Адразу за агароджай на дрэве зроблена буслянка. Зранку і да позняга вечара тут кіпіць работа. Калі Арцёмка прыязджае на канікулы, у гняздзе ўжо паяўляецца двое, а то і трое маладых буслянят. Пацешна глядзець, як яны вучацца лётаць: стануць на край буслянкі і доўга не адважваюцца скокнуць уніз. Але бацькі ім строга выгаворваюць за нерашучасць — незадаволена клякочуць, а калі і гэта не дапамагае, то проста выпіхваюць іх з гнязда. Арцёмка бачыў гэта на ўласныя вочы. Падаючы, маладыя буслікі пачынаюць сутаргава махаць крыламі, спыняюць падзенне і нават крыху набіраюць вышыню. Але далёка ляцець яшчэ баяцца: зрабіўшы круг, вяртаюцца ў гняздо. А праз нейкі час урок гэты паўтараецца. І з кожным днём палёт маладых буслоў становіцца ўсё больш упэўненым.

Летась тут ледзьве не здарылася бяда. Раніцаю, як звычайна, Арцёмка прыбег у альтанку, каб паназіраць за бусламі. Але ў той дзень яны паводзілі сябе неяк нязвыкла: кружылі вакол дрэва, то апускаючыся амаль да самай зямлі,

то зноў набіраючы вышыню, і ўвесь час трывожна клекаталі. Падышоўшы бліжэй, Арцёмка ўбачыў, што ў траве пад дрэвам бездапаможна трапечацца малое бусляня. Напэўна, неасцярожна крутнулася і выпала з гнязда.

Арцёмка паклікаў дзеда. Удваіх яны ўважліва агледзелі перапалоханае, насцярожанае бусляня. На шчасце, ні крылцы, ні лапкі ў яго не былі пашкоджаныя. Аднак самастойна вярнуцца ў гняздо птушаня не магло: ці то балюча ўдарылася, ці то яшчэ не хапала сілы.

Дзеду з Арцёмкам самім рады даць не ўдалося. Залезці на высокае дрэва яны не змаглі, а такой лесвіцы, каб яна дастала аж да буслянкі, у іх не было. Тады дзядуля пазваніў мясцовым ратавальнікам. Тыя прыехалі на машыне з кранам і за некалькі хвілін даставілі няўдачлівую малечу ў гняздо.

Калі машына паехала, Арцёмка з дзедам яшчэ доўга сядзелі ў альтанцы і назіралі за бусламі. Спачатку бацькі незадаволена клекаталі — відаць, ушчувалі малое за неасцярожнасць. Пасля па чарзе сталі лётаць, насіць яму ежу.

— Дзядуля, а што буслы ядуць? — папытаўся Арцёмка.

— Усе чамусьці думаюць, што іх галоўная ежа — жабы, — адказаў той. — Напэўна, раней, калі вакол стаялі балоты, так яно і было. Цяпер жа багну асушылі, знайсці жаб няпроста. Таму буслы пашырылі сваё меню — сталі ўжываць розных жукоў, стракоз, конікаў.

— Конікаў? — засмяяўся Арцёмка.

— Ну, не тых, што пасуцца на поплаве, — усміхнуўся і дзядуля. — А тых, што сакочуць у траве, у бульбе. Такія зялёненькія, прыгожыя стварэнні.

— Ведаю, ведаю.

— Ну вось... Не грэбуюць буслы таксама яшчаркамі, вужыкамі, мышамі-палёўкамі. Нават ужываюць дажджавых чарвякоў. Ты, напэўна, бачыў: калі хто арэ зямлю, то следам баразною ідзе бусел — вышуквае чарвякоў. Канечне, гэта не вельмі добра, бо дажджавыя чарвякі паляпшаюць глебу.

— Значыць, нам трэба разводзіць чарвякоў і абараняць іх ад буслоў.

— Не, буслы тут ні пры чым. Шкода ад іх мізэрная, а вось карысць — вялікая. Знішчаючы розных насякомых, яны засцерагаюць нашы агароды і сады ад шматлікіх шкоднікаў. Нездарма ж людзі буслоў любяць і шануюць, радуюцца іх суседству. Здавён лічыцца: калі побач паселіцца бусліная сям'я, то яна будзе прыносіць удачу, прыбытак гаспадарам.

— Дзядуля, а дзе буслы зімуюць?

— Яны, унучак, адлятаюць у вырай. Але там яны не ўюць гнёздаў, а птушанят выводзіць прылятаюць дадому.

— Дзядуля, а як жа яны знаходзяць дарогу?

— Як? Птушкі выдатна арыентуюцца па сонцы, па зорках. А яшчэ з дапамогай магнітнага

поля зямлі. Компас у іх куды больш дасканалы, чым той, што мы з табой маем. Ляцяць птушкі звычайна чародамі. За парадкам сочыць вопытны важак. Па яго камандзе птушкі садзяцца на зямлю адпачыць, падсілкавацца, пры гэтым абавязкова выстаўляюць вартавых...

Яшчэ Арцёмка дазнаўся ад дзядулі, што маладыя шпакі, аўсянкі, зяблікі, некаторыя іншыя птушкі адпраўляюцца ў небяспечнае тысячакіламетровае падарожжа хоць і чародкамі, але самастойна, без вопытных бацькоў — тыя адлятаюць у вырай крыху пазней. А зязюлі, вальдшнепы, жаўранкі наогул ляцяць у адзіночку. Як яны арыентуюцца ў неабсяжных прасторах, беспамылкова знаходзяць месцы сваіх зімовак, пакуль дакладна невядома. Арцёмка з дзядулем прачыталі ў энцыклапедыі прыроды толькі тое, што ў птушак ёсць нейкае асаблівае чуццё, дзякуючы якому яны вызначаюць неабходныя каардынаты.

Любіць Арцёмка гутарыць з дзядулем!

## Як кот грыбы збіраў

***Быль***

*Галіна Васілеўская*

Кузю мне падарыла сяброўка. У коціка быў белы гальштучак і белыя лапкі. Сам жа акуратны і надзіва сімпатычны. Не ведала сяброўка, што ён яшчэ і вельмі кемлівы.

Калі коцік падрос, то спаў толькі ў маім пакоі, на маім ложку. Калі ён уладкоўваўся на маіх нагах, яны адразу ж пераставалі балець.

Потым я заўважыла, што Кузя ўвесь час за мной назірае. Нібы нечаму вучыцца ў мяне. Першы раз я гэта заўважыла, калі ён самастойна адчыніў дзверы ў мой пакой. Я пайшла да сябе і механічна зачыніла дзверы. Чую, Кузя за дзвярыма стаў мяўкаць. Потым падскочыў і пярэднімі лапамі павіс на дзвярной ручцы. Дзверы адчыніліся. Кузя ўвайшоў і спакойна лёг на мае ногі.

У маім пакоі ля ложка стаіць таршэр. Ад лямпачак звісае шнурок. Пацягну яго ўніз — лямпачкі запальваюцца. Пацягну другі раз — гаснуць. Аднойчы ўдзень кот сеў на табурэт, на якім стаіць хатні тэлефон, і дзвюма пярэднімі лапамі стаў шморгаць за шнурок. Запаліць святло, потым пагасіць. Запаліць — пагасіць. Такая гульня яму вельмі падабалася.

Летам мы жылі на дачы ля самага лесу. Кузя сядзеў побач і глядзеў, што я раблю. Нават нюхаў тыя грыбы, якія я клала ў міску. Потым пайшоў за мной у лес. Абагнаў і патрусіў наперадзе. Калі бачыў грыб — садзіўся ля яго і клікаў мяне. Мяўкаў. Чакаў, каб падышла і зрэзала грыб. Так было некалькі разоў. Потым, відаць, яму надакучыла чакаць мяне, і Кузя пачаў сам выцягваць грыбы з зямлі і ў зубах несці мне ў кошык. Ні разу не памыліўся, не сарваў паганца. Прыносіў толькі такія, якія збірала я.

Былі ў Кузі і любімыя грыбы — падасінавікі. Калі ён бачыў здалёк чырвоны капялюш, то куляй імчаўся туды, асцярожна браў у зубы ножку грыба, выцягваў з зямлі і нёс мне.

Потым Кузя знайшоў у лесе невялічкую палянку, на якой густа раслі тоўсценькія лісічкі. Насіць па адной не стаў. Прыбег да мяне, схапіў за калашыну і пацягнуў за сабой. Я ледзь паспявала за катом. Між дрэў убачыла шмат лісічак. Нарэзала цэлы кошык.

А аднойчы ў лесе прапаў мой Кузя. Клікала, клікала — цішыня ў адказ. Пачала ўсур'ёз хвалявацца. Іду міма старой, вялізнай, разлапістай елкі і раптам бачу: высоўваецца з-пад яе знаёмы чорны пушысты хвост, задраны кверху. Я спынілася, чакаю, што гэта кот мой цягне задам. Аказваецца, вялізны-вялізны баравік. Чысценькі, ніводнай чарвіначкі. Такога прыгажуна я за жыццё сваё не бачыла.

Хваліла коціка, а ён сядзеў такі задаволены, нібы разумеў, які цуд выцягнуў з-пад елкі.

## Маленькія памочнікі

*Васіль Гурскі*

Дзед Базыль жыве адзін. Жонка памерла, а дзеці ў горадзе працуюць. Сумуе, але з працай сябруе. Узяў граблі і пайшоў у агарод. Там расце бульба і розная агародніна. Спыніўся каля градак з бульбай. Яна не ўзышла яшчэ, а глеба пакрываецца зялёнымі лісточкамі пустазел-

ля. Гэта зелле высмоктвае з зямлі сокі, якія спатрэбяцца бурачкам і агурочкам, бульбачцы і клубніцам. Знішчаць пустазелле трэба хутчэй.

Шчыруе стары, тасуе граблямі глебу, перамешвае яе, адрывае карэньчыкі пустазелля, пакідае іх наверсе. Хай засыхаюць на сонцы. Апрацаваў адну градку, перайшоў на другую. Азірнуўся і ўбачыў на першай маленькую птушачку. Пліскай завецца. Часта ківае галоўкай, доўгім хвосцікам памахвае, штосьці збірае. А то ўспырхне, схопіць казяўку, якая ўцячы хоча, зноў апусціцца на зямлю, шнуруе вакол дзеда, падбягае да яго, ціха папіcквае, быццам гаворыць з дзедам. Спыніўся стары, запытаў ціха:

— Што сказаць мне хочаш, плісачка?

— Дзякуй, дзядуля.

— За што?

— Што хатку мне змайстраваў і павесіў у садзе, а сёння снеданнем частуеш. Я ў доміку дзетак гадую. А табе памагаць прыляцела з казяўкамі, чарвячкамі, вусенямі змагацца.

— І табе дзякуй, маленькая памочніца. Пустазеллю дам рады, а з насякомымі не спраўлюся без цябе. Памагай, памагай!

Плісачка схапіла чарвяка і паляцела.

— Куды ж ты ўцякаеш, маленькая?

— Не ўцякаю, а дзеткам гасцінчык смачненькі занясу, каб раслі хутчэй.

Неўзабаве плісачка зноў апусцілася на градку, стала бегаць і шукаць шкоднікаў.

— Маленькая ты, плісачка, ды ўдаленькая. Дзякуй за дапамогу!

— Несправядлівы ты, дзядуля, — засвісцеў шпачок на яблыні.

— Чаму несправядлівы?

— Плісачку толькі хваліш, дзякуеш ёй.

— Дык яна ж збірае шкоднікаў, побач бегае.

— Ранняя птушачка носік чысціць, а твая плісачка вочы працірае. І мы памагалі табе.

— Чаму ж цяпер няма шпачкоў каля мяне. Баязліўцы вы?

— Асцярожныя, а не баязліўцы. Ды не такія соні, як ты з плісачкай. Мы наеліся і адпачываем. Не спі так позна, а ўставай раней ды паглядзі, як мая сямейка шчыраваць будзе.

— І прыйду. Пагляджу-у!

Назаўтра дзядуля раней устаў і пайшоў на агарод. Паглядзець трэба бульбачку, калі пачала ўсходзіць, і словы шпачка праверыць. Спыніўся за плотам, зірнуў на градкі. Сапраўды, шпачкі ўжо шчыруюць тут. То адзін шпачок, то другі хапае шкоднікаў.

— Дзякую, шпачкі, шкоднікаў на дрэвах знішчаеце. І вы малайцы! Сапраўдныя памочнікі!

Так усё лета сябруюць маленькія памочнікі з дзедам, дзякуюць яму, што домікі змайстраваў. Песнямі радуюць. Сапраўдныя памочнікі, надзейныя сябры.

## Слімак

*Леанід Улашчанка*

Кацярынка адчыніла дзверы ў пакой дзеда Лявона і проста з парога запатрабавала:

— Пра Слімака раскажы!

— Пра якога Слімака? — перапытаў дзед, не адрываючыся ад працы.

— Ну памятаеш, як чарвякі, слімакі і смаўжы страцілі свае ножкі? Ты абяцаў!

— Памятаю, памятаю! Калі абяцаў, дык раскажу.

Кацярынка ўвайшла ў пакой і села на зэдлік каля стала. Відаць было, што яна зручна ўладкавалася.

— Што гэта ты ўселася, як жабка на купіне, — лагодна сказаў дзед Лявон, адкладваючы ўбок аловак, якім нешта занатоўваў у вялікім сінім сшытку.

— Слухаць! — адказала Кацярынка.

— Слухаць? А да сну хто рыхтавацца будзе?

— А казку хто абяцаў распавесці? — падхапіла Кацярынка, хітра прыплюшчыўшы вока.

— Калі абяцаў, дык распавяду. Але толькі тады, калі будзеш у ложку.

— Ну дзядулечка, ну...

— І не дзядулечка, і не родненькі... — перапыніў дзед Лявон Кацярынку. — Ты ў ложак, а я з казкаю — каля ложка. Дамовіліся?

— Ну што з табою зробіш, дзядулечка! — уздыхнула Кацярынка.

Неўзабаве дзяўчынка стаяла перад дзедам, выцягнуўшы рукі.

— Бачу! Чыстыя! Малайчынка! — сказаў дзед Лявон, абдымаючы ўнучку. — А цяпер у ложак.

Кацярынка хуценька шмыгнула ў ложак і нацягнула на сябе коўдрачку.

— Ну, я гатовая. Кажы казку.

— Казку? Калі ласка! Толькі якую?

— Як якую? — замігала хутка-хутка Кацярынка сваімі доўгімі вейкамі. — Пра Слімака! Ну памятаеш, як Сараканожка забрала ножкі ў чарвякоў, слімакоў, смаўжоў...

— Вядома ж, памятаю, — узрадаваўся дзед Лявон Кацярынчынай падказцы. — Ачомаліся чарвякі, слімакі, смаўжы і ўсе астатнія «гулякі», што страцілі свае ножкі гэтак бяздумна, і папаўзлі іх шукаць.

— Чаму папаўзлі? Яны што, спалохаліся нечага?

— Папаўзлі не ад страху, а таму, што не было чым ісці. Ножкі ж зніклі!

— Ага!.. Іх забрала Сараканожка, — пагадзілася Кацярынка.

— Не Сараканожка, а Бязножка, — паправіў дзед Лявон. — Раней яна была Бязножкай, а зараз ужо стала Сараканожкай. Дык вось, Чарвяк вырашыў, што ягоныя ножкі скрозь зямлю праваліліся. Стаў ён у зямлю закопвацца, ножкі свае шукаць. Да гэтага часу ў зямлі корпаецца — ножкі свае шукае. Смоўж на грыб палез, каб з яго лепш разгледзець, дзе яго ножкі

падзеліся. Куснуў грыб, а той смачным яму здаўся. Ён заадно і павячэраў. З таго часу грыбамі і ласуецца.

— А Слімак?.. — не вытрымала Кацярынка. — Куды Слімак папоўз?

— Слімак папоўз да свайго дамка. Паўзе і бурчыць сам сабе: «Можа, свае ножкі я дома забыўся?» Папоўз Слімак да сябе ў дамок. Агледзеў усе завіткі-завітушкі — і не знайшоў! — адказаў дзед Лявон.

— Шкада, — сказала Кацярынка засмучана.

— І Слімаку шкада, — пагадзіўся дзед Лявон. — Высунуў ён свае рожкі з дамка, туды-сюды імі водзіць. За дамок зазірнуць хоча, а з дамка не вылазіць. «Яшчэ і дамок згублю», — думае. І папоўз разам з дамком на пошукі сваіх ножак. А за сабой след пакідае, каб іншым разам на гэтым месцы ўжо не шукаць. Так і поўзае з дамком на спіне.

— Хітрун, — зазначыла Кацярынка, пазяхаючы.

— Вядома, хітрун, — пагадзіўся дзед Лявон, укрываючы Кацярынку. — З таго часу, калі хто знойдзе Слімака, то абавязкова скажа яму: «Слімак, Слімак, выстаў рожкі. Дзе згубіў свае ты ножкі?» Раней Слімак адказваў: «Я нідзе іх не губляў, іх, напэўна, нехта ўзяў». Але потым надакучыла яму так казаць, і зараз ён проста хаваецца ў сваім дамку. Ну, а цяпер спаць…

— А раскажы яшчэ пра жабку, — падхапілася Кацярынка.

— Пра якую жабку?

— Якая сядзела на купіне, як я на зэдліку.

— Успомніла! Не, галубка мая, на сёння хопіць казак. Спаць пара, а пра жабку я табе іншым разам распавяду. Кладзі ручкі пад шчочку, як цябе баба Наталля вучыла, і засынай.

Кацярынка так і зрабіла.

— Прыемных табе сноў, — сказаў дзед Лявон і на дыбачках пакрочыў з пакоя.

## Лёс Дунканa

**(*Скарочана*)**

*Віталь Вольскі*

### Хто такі Дункан?

Загадзя мушу папярэдзіць, што Дункан — леапард.

На зямлі жыве акрамя нас і побач з намі даволі вялікая колькасць розных істот, у першую чаргу — звяроў і птушак, якія знаходзяцца з намі ў рознабаковых, часам складаных і супярэчлівых узаемаадносінах. Мы мала іх ведаем, а некаторыя зусім не ведаюць. Маюць аб іх вельмі цьмянае, а то і няправільнае ўяўленне.

Чалавек, жадае ён ці не жадае, ведае ці не ведае, арганічна і непарыўна звязаны з прыродай — з лясамі, палямі, гарамі, стэпамі і пустынямі, з морамі, рэкамі і балотамі, звярамі, птушкамі і рыбамі. Ён не можа без іх існаваць, як не можа існаваць без паветра, вады і ежы, без

святла і цяпла. Чалавек — усяго толькі частка прыроды, частка навакольнага асяроддзя. І як ён уплывае сваёю дзейнасцю, самім фактам свайго існавання на прыроду, так і прырода ўплывае на яго. Жыццё, здароўе, самаадчуванне і настрой чалавека залежаць і ад змен надвор'я, атмасфернага ціску, ад тэмпературы паветра і вады, ад ураджаю ці недароду тых ці іншых раслін, ад наяўнасці ці адсутнасці некаторых звяроў і птушак, ад вялікага мноства розных, часам невядомых і незразумелых прычын, звязаных са з'явамі прыроды. Чым больш мы будзем цікавіцца імі, тым лепш для нас. І ў першую чаргу гэта датычыцца нашых узаемаадносін з усё яшчэ таямнічым светам звяроў і птушак, якія нас акружае з маленства.

Вось у мяне і з'явілася жаданне напісаць пра жыццё леапарда Дункана, які існаваў у сапраўднасці і якога не забылі яшчэ і да гэтых дзён.

## Сіротка

У заапарку горада Гродна самка леапарда нарадзіла трох малых. Гэта ўсхвалявала і ўзрадавала ўсіх работнікаў заапарка. Толькі сама парадзіха аднеслася да падзеі з дзіўнай абыякавасцю. Спачатку яна ляжала з малымі, саграваала іх цеплынёю свайго цела і карміла малаком, але неўзабаве раптам паднялася і адышла ў другі бок клеткі. Адбылося гэта ўначы. Калі работнікі заапарка з'явіліся раніцай на работу і падышлі да клеткі, то ўбачылі, што двое малых

ужо загінулі. Трэцяе, крыху буйнейшае за іншых, было яшчэ жывое.

Сляпое і бездапаможнае леапардзяня калацілася ўсім целам ад холаду і тоненька, ледзь чутна папісквала, як хворае кацяня, тыцкаючыся носікам у падлогу, але маці не звяртала на яго ніякай увагі. Яна не хацела нават і глядзець на сваё дзіця. Матчын інстынкт, як гэта часта бывае ў дзікага звера ў няволі, пакінуў яе. Зрэдку, праўда, падыходзіла яна, паглядала на сына з яўнай непрыхільнасцю, а потым падштурхвала носам, як нейкую непатрэбную рэч, адсоўвала ўбок, пазяхала і адыходзіла з абыякавым выглядам.

Што рабіць? Як ратаваць малога?

Яму пагражала пагібель. Леапардзяня амаль зусім скалела і нерухома ляжала на падлозе.

І тут яго ўзяла на рукі экскурсаводка заапарка і занесла да сябе на кватэру.

Вельмі гэта была складаная справа гадаваць на гарадской кватэры леапарда! Дункана, так назвалі леапардзяня, кармілі спачатку каровіным малаком, разбаўленым гатаванай вадой, цукрам і вітамінамі. Потым зменшылі колькасць вады і пачалі дадаваць у малако сырое яйка і цёртую сырую пячонку.

Праз тыдзень у Дункана прарэзаліся вочы — спачатку адно, а потым і другое. Ён пачаў глядзець на белы свет, але погляд яго быў яшчэ пазбаўлены сэнсу. Дункан недарэчна ўглядаўся

ў прадметы. Хадзіў па падлозе слаба, няўпэўнена. Часта хістаўся, траціў раўнавагу і падаў.

Праз месяц пасля нараджэння леапардзяня зрабілася «зубастым»: у яго прарэзаліся ўсе зубы і іклы, верхнія і ніжнія. Дзень пры дні сіротка рос і папраўляўся.

Дункан выжыў, вырас і з малой бездапаможнай істоты ператварыўся ў маладога, прыгожага і спрытнага звера.

## Гульні на двары

На двары з'яўленне Дункана кожны раз шумна і радасна сустракалі дзеці. Весела ганяўся ён за Мішам і яго сябрамі. Гуляючы з імі, спрытна ўзлазіў на дрэвы і саскокваў адтуль на зямлю, бегаў за дзецьмі ўсюды, як сабака. Кідаўся за хлапчукамі, а тыя з крыкам і смехам уцякалі ад яго ў розныя бакі. Часам ён збіваў іх з ног, валіў на зямлю, і яны былі гэтым вельмі задаволены. Ніхто ніколі не быў паранены ці падрапаны, бо Дункан хапаў іх мяккімі лапамі. У час гульні і забаў ён не пускаў у ход кіпцюры і зубы. То адзін, то другі з хлапчукоў падкідваў сваю шапку ўгару, а Дункан высока падскокваў і лавіў шапку лапамі ў паветры.

Любіў Дункан гуляць і ў мяч. Хлапчукі падбівалі футбольны мяч нагамі, а Дункан гнаўся за ім і хапаў лапамі з-пад самых ног у заўзятых футбалістаў. Асцярожна і далікатна гуляў ён з дзяўчынкамі, падштурхоўваючы маленькі каляровы мячык носам.

У такіх гульнях час праходзіў непрыкметна і для дзяцей, і для Дункана.

Дзеці, мабыць, здаваліся Дункану яго родзічамі, такімі ж малымі леапардамі. Толькі, можа, крыху нязграбнымі, не вельмі спрытнымі і дужымі, не вельмі шпаркімі ў руху. Але Дункан любіў дзяцей, як і дзеці — яго. Ён быў агульнапрызнаным любімцам усіх хлапчукоў і дзяўчынак двара, а двор гэты — вялікі, бо аб'ядноўваў некалькі шматкватэрных дамоў па вуліцы Міра.

**Сутычка з грозным веліканам**

У суседнім доме жыў у прафесара вялізны і страшэнны чорны дацкі дог, вельмі дужы і вельмі люты. На двары ён трымаў сябе як гаспадар. Нікому спуску не даваў. Усе яго баяліся: і сабакі, і людзі. Адзін толькі Дункан, тады яшчэ зусім невялікі, не спалохаўся.

Калі дог пры першай сустрэчы кінуўся на яго, Дункан не ўцёк, не саступіў з дарогі. Ён застаўся стаяць на месцы, толькі зашыпеў, прыгнуўся, зморшчыў нос і выскаліў у знак перасцярогі вострыя белыя іклы.

Грозны велікан з разгону падляцеў да дзёрзкага смельчака. Ён прывык да хуткіх і бліскучых маланкавых перамог, але на гэты раз пралічыўся. У наступную хвіліну дог уцякаў з крывавымі ранамі на грудзях, на баку і на спіне. Ён жаласна скавытаў, забыўшыся на ўсю сваю сілу і на свой аўтарытэт. Дог хацеў зараз толькі аднаго — каб найхутчэй апынуцца на знаёмай надзейнай

лесвіцы і схавацца там на пляцоўцы другога паверха. А Дункан застаўся на месцы. Ён стаяў з абыякавым выглядам, быццам абсалютна нічога тут не здарылася.

З таго моманту малады леапард пачаў лічыць сабак сваімі ворагамі.

Пасля памятнай сутычкі грозны дог стараўся ніколі не трапляць на вочы Дункану. Ён заўсёды абмінаў леапарда, далёка яго абыходзіў.

Становішча дога на двары моцна і непапраўна пахіснулася.

## Чомга

*Віталь Вольскі*

### У лясніцтве

Быў ясны жнівеньскі вечар, калі я падышоў да будынка лясніцтва ў вёсцы Белы Лясок.

Да пярэдняй сцяны дома, з абодвух бакоў высокага ганка, былі прыхілены ў некалькі радоў веласіпеды — верная адзнака таго, што ў доме адбываецца сход.

Я сеў на лаўку пад вязам.

На ганак выйшла з дзвярэй некалькі чалавек. Не спыняючы ажыўленай гутаркі, яны пачалі разбіраць веласіпеды, ці, як тут кажуць звычайна, ровары. За імі высыпала з дому яшчэ чалавек пятнаццаць.

Сход, відаць, скончыўся. Людзі разыходзіліся і раз'язджаліся ў розныя бакі. Крыху пачакаўшы, я ўвайшоў у хату. У пракураным, задымленым памяшканні нікога ўжо не было.

Я заглянуў у бакавы пакойчык, дзе змяшчалася канцылярыя. Першае, што кінулася ў вочы, была невялікая, дзіўнага выгляду птушка, велічынёю, можа, крыху большая за качку. Яна стаяла на падлозе каля зачыненага акна, выцягнуўшыся на ўвесь рост, і нагадвала сваёй паставай пінгвіна.

У птушкі была невялікая галава на доўгай, гнуткай шыі. На галаве тырчалі ззаду пучкі пер'я, нібы чорныя рожкі ці вушкі, а вакол шыі тапырыўся старамодны каўнер залаціста-рыжага колеру з цёмна-карычневай, амаль чорнай аблямоўкай. Шчокі, шыя і ўся ніжняя частка тулава былі бліскуча-белыя, з цёмна-ржавымі і зеленаватымі паскамі па баках. Спіна ў птушкі бурая.

Асабліва характэрнымі былі лапы. Пляскатыя, цёмна-зеленаватага колеру, яны не мелі плавальных перапонак, якія мы прывыклі бачыць на лапах гуся ці качкі. Шырокія пальцы птушкі, кожны паасобку, былі нібы абшыты скуранымі шматкамі. Такіх лап, такога каўняра і такіх рожкаў няма ні ў адной іншай птушкі. Перада мной была паганка, ці, як яшчэ называюць яе, чомга.

Сваякоў чомгі — гагар — мне даводзілася бачыць у свой час на Карэльскім перашыйку. Я не раз наглядаў летнім ранкам, як гулялі гагары пасля ўсходу сонца на роўнай вадзяной гладзі. Яны ганяліся адна за адной па возеры, пакідаючы пасля сябе серабрыстую дарожку, а потым плылі чародкай, выставіўшы з вады галовы, як перыскоп падводнай лодкі. Гульні гагар

на возеры Хэпо-Ярві надоўга засталіся ў маёй памяці.

Я разглядаў незвычайную птушку з усіх бакоў, а яна з пагрозай раскрывала сваю невялікую, тонкую і вострую на канцы дзюбу і кожны раз моўчкі паварочвала галаву ў той бок, з якога я набліжаўся. Тулава яе пры гэтым заставалася нерухомым. Птушка не змяняла сваёй паставы і не рухалася з месца.

Супрацоўнікі лясніцтва сказалі мне, што чомгу злавілі на балоце і што заўтра яе аднясуць у заалагічны музей запаведніка.

На жаль, чалавека, які злавіў гэтую цікавую птушку, тут не было і я не мог пагаварыць з ім падрабязна. Між тым мне вельмі хацелася хутчэй убачыць паганку на волі.

Распытаўшы людзей пра мясцовасць, дзе была злоўлена чомга, я на другі дзень рушыў туды адзін.

## На лясным возеры

Наперадзе бліснула між кустоў вада.

Па вузкай, ледзь прыкметнай сцежцы сярод высокіх духмяных траў я выйшаў да невялікага ляснога возера, нізкія берагі якога густа зараслі лазняком, вольхаю, трысцём і асакою.

Уласна кажучы, гэта было не возера, а лясная рэчка, якая разлілася па балоцістай нізіне, утварыўшы тут невялікую, але даволі глыбокую затоку, акаймаваную з бакоў непраходнымі зараснікамі.

Цёмным колерам сваёй вады ў рамцы асакі і трысця глухі лясны вадаём нагадваў вядомую карціну Васняцова. І камень тут каля вады нібы той самы, на якім сядзела ў журботным задуменні Аленка.

Я выбраў сабе зручны назіральны пункт ля раскідзістай дуплаватай вярбы і сяджу ў засені, наглядаю за вадзяным люстрам перад сабой.

Стары лес высокай і цёмнай сцяной абступіў возера. Па чыстаму сіняму небу павольна плывуць рэдкія белыя воблачкі. Свежае і вільготнае паветра насычана гаркаватым пахам лазы і балотных зёлак.

У маленькіх затоках між асакі паверхня вады пакрыта зялёнай раскай. Крыху далей, дзе вады больш, зіхацяць на сонцы шырокія, круглыя, нібы наглянцаваныя лісты. Белыя гарлачыкі — русалчыны кветкі, апаэтызаваныя народнай фантазіяй, раскрыліся насустрач сонцу.

На адным з лістоў сядзіць нерухома зялёная жаба. Пукатыя вочы яе абведзены залацістым абадком. Над вадою лятаюць стракозы. Яны таксама час ад часу садзяцца на бліскучыя цвёрдыя лісты гарлачыкаў.

У ціхай і цёплай вадзе кіпіць жыццё. Гэта — своеадменны, своеасаблівы свет. Плаваюць залацістыя карасікі. Слізгаюць па паверхні вадамеры. Усплывае, вяслуючы заднімі ножкамі, сур'ёзны вадзяны жук-плывунец.

Сонца пачынае прыпякаць. Я гляджу на цёмную, але чыстую ваду, і мне ўспамінаюцца

словы Мапасана: «Ваду я люблю нястрымна: люблю мора, хоць яно занадта вялікае, неспакойнае, непакорнае; люблю рэкі, яны прыгожыя, але толькі яны імчацца міма, яны цякуць, уцякаюць; і асабліва люблю я балоты, дзе трапеча невядомае нам жыццё падводных істот. Балота — гэта асобны свет на зямлі, тут сваё быццё, тут свае аселыя і вандроўныя насельнікі, свае галасы і шолахі, а галоўнае — свая таямніца... Магчыма, таямніца светабудовы! Хіба не ў застойнай, цінiстай вадзе, не ў вільготнай зямлі, якая не прасыхае ад сонечнай спякоты, заварушыўся, затрапятаўся і ўбачыў свет першы зародак жыцця?»

Пачуўся лёгкі, невыразны плёскат. Ледзь улоўны шолах трысця перапыніў мае думкі. Па цёмнай вадзе павольна, амаль непрыкметна плыве невялікі круглы астравок — куча зламаных сцяблоў трысця.

Гэта — гняздо чомгі.

Сама чомга стаіць пасярэдзіне свайго плывучага астраўка, як капітан на палубе карабля. У яе тая самая пастава, у якой злоўленая чомга стаяла на падлозе ў доме лясніцтва.

Лёгкі ветрык падганяе астравок, які падпарадкуецца яго павевам. Павольна пасоўваецца ён па роўнай, крыху пасярэбранай гладзі.

Вось плывучы астравок прыткнуўся да сцяны чароту і спыніў свой рух. Чомга саслізнула з гнязда і знікла пад вадой. Птушаняты ў яе

ўжо выраслі, і цяпер яна карыстаецца гняздом, напэўна, толькі як месцам для адпачынку.

На другі дзень я зноў убачыў гняздо чомгі, але на гэты раз без гаспадыні. На астраўку знаходзіўся другі пасажыр. Гэта быў вялізны пацук. Ён сядзеў на сцяблах, з якіх было складзена гняздо, пазіраў навокал нахабным позіркам і самаздаволена чысціў пярэднімі лапамі вусы.

Мяне гэта не здзівіла. Я чуў і раней, што вадзяны пацук выводзіць часам дзяцей у гняздзе чомгі. А можа, ён проста вылез з вады, каб таксама адпачыць на плывучым востраве?

### Дзіўная птушка

Чомга — птушка своеасаблівая не толькі з выгляду. Сваімі дзіўнымі звычкамі яна адрозніваецца ад усіх іншых птушак.

Мне расказвалі ў лясніцтве, што калі чомга плавае па вадзе, малыя дзеці яе сядзяць на спіне ў маткі. У выпадку небяспекі чомга ныраe ў ваду разам з імі. Кажуць таксама, што разам з малымі на спіне чомга ўзлятае, калі трэба, у паветра. Такім чынам яна пераносіць сваіх птушанят з месца на месца не толькі водным, але і паветраным шляхам. Спіна маткі ператвараецца для іх з вадаплаўнага судна ў самалёт.

Жывуць чомгі парамі. Вясной пасярэдзіне плывучага гнязда, на подсцілцы з балотнай травы, самка адкладае тры ці чатыры яйкі. Калі чомга ў выпадку неабходнасці пакідае хоць на кароткі час гняздо па сваіх патрэбах, яна заўсёды

маскіруе яйкі, накрываючы іх зверху сцяблamі трысця. Вада часам залівае яйкі, але гэта ім не шкодзіць. Спачатку яйкі чомгі маюць белы колер, але праз некалькі дзён, з прычыны таго, што ляжаць на гнілых раслінах, яны робяцца бурымі і, нарэшце, цёмна-зеленавата-карычневымі. Чомгі, самец і самка, сядзяць на яйках па чарзе. Пазней, калі птушаняты выведуцца і падрастуць, бацька пакіне сям'ю і будзе трымацца асобна.

Ногі ў чомгі настолькі адсунуты назад, што яна амаль не ходзіць і на зямлі можа стаяць, толькі абапіраючыся на кароткі хвост. Каб рухацца па зямлі, чомга павінна паўзці, прыпадаючы грудзьмі і абапіраючыся на крылы. Узняцца з зямлі ў паветра чомга не можа. Яна ўзлятае толькі з вады — спачатку шпарка плыве, лопаючы крыламі і высунуўшыся напалову з вады, потым, узяўшы разгон, адрываецца ад вадзяной паверхні.

Затое плавае і нырае чомга надзвычай добра, шпарка і спрытна.

З выраю чомгі вяртаюцца ў красавіку і жывуць на радзіме да лістапада. Кормяцца яны дробнай рыбай, вадзянымі насякомымі, рачкамі, жабкамі, апалонікамі. Восенню, перад адлётам, чомгі збіраюцца ў чароды.

Некалькі дзён правёў я на лясным плёсе, заўсёды на тым самым месцы каля дуплаватай вярбы. Адсюль добра было наглядаць за ўсім люстрам вадаёма, але ўбачыць яшчэ раз чомгу мне не ўдалося.

Чомга сустракаецца часта на рэках і азёрах Палесся, а гагары, блізкія сваякі чомгі, вядуцца на Князь-возеры і на Прыпяці.

## Багіра

*Янка Маўр*

Вы, вядома, чулі гэтае імя. Пэўна, ведаеце чорную пантэру, прыяцельку Маўглі.

Але цяпер гутарка будзе ісці хоць і пра дальнюю сваячку, але ўсё ж такі не пра пантэру, а пра кошку. Звычайную кошку, толькі, вядома, чорную. І, мусіць, не менш разумную, як тая Багіра.

Трапіла яна да нас самым незвычайным чынам. Раз у марозны веснавы вечар, досыць позна, вярталіся мы з дачкой дахаты. Жылі тады на ўскраіне горада. Людзей хадзіла мала. Свяціў месяц, хрумсталі падмерзлыя лужыны.

І вось тут прычапілася да нас чорная кошка, жаласна мяўкае, трэцца каля ног. А як толькі мы спынімся, яна, азіраючыся, ідзе назад. Пойдзем мы далей — яна зноў даганяе нас, крычыць, блытаецца між ног, забягае наперад, нібы не пускае ісці ў той бок. Справа ясная: яна хоча, каб мы пайшлі за ёю кудысьці назад. Нічога не зробіш: калі яна так выразна і настойліва патрабуе — трэба ісці.

Як толькі мы зрабілі пару крокаў назад, яна ўзрадавалася, шпарка паскакала ў той бок і знікла. Што яна: жартуе з намі? Мы сталі. Тады

кошка зноў з'явілася і зноў пачала мяўкаць і церціся. Мы зноў пайшлі за ёю — і зноў яна пабегла наперад, мяўкаючы здалёк.

Тым часам на бліжэйшым двары забрахаў сабака і кінуўся ў наш бок. Але тут раздаўся такі сык, так люта накінулася на яго кошка, што бедны сабака з жаласным скавытаннем паляцеў як мага далей. А кошка выбегла на тратуар і хуценька скруцілася на зямлі.

Калі мы падышлі бліжэй, то ўбачылі, што яна абкруцілася вакол кацяняці. Адкуль яно ўзялося? Мы толькі што ішлі па гэтым самым месцы — і нічога на тратуары не мелася. Значыцца, кацянё было недзе схаванае, мусіць, за плотам. Калі кошка ўбачыла нас, то парашыла звярнуцца за дапамогай, спыніла нас, прымусіла павярнуць назад, а сама тым часам вынесла на дарогу сваё дзіця ды яшчэ паспела прагнаць сабаку. Разам з тым яна не забывалася, што кацянятка толькі што нарадзілася і не павінна было мерзнуць на холадзе... І вось кошка нават на тую хвілінку, пакуль мы падыходзілі, абкруцілася вакол свайго дзіцяці і сагравала яго. Можна было б пажадаць і кожнаму добраму чалавеку столькі спрыту і энергіі.

— Ну што ж,— сказаў я,— нічога не зробіш, хадзем ужо да нас.

— Не хочацца толькі браць у рукі гэтае мокрае кацянё,— сказала дачка.

Але кошка і не збіралася прасіць нас аб гэтым. Яна сама ўзяла сваё дзіця зубамі за ка-

рак і пайшла побач з намі. Так мы прыстойнай сямейкай і прыйшлі ў сваю хату.

У кухні пліта была яшчэ цёплая, і тут жа быў чалеснік рускай печкі. Кошка адразу знайшла сабе месца, дзе ёй будзе лепей за ўсё, — у печцы, ля цёпленькай пліты.

— Ну і добра,— сказалі мы,— жыві сабе тут. Толькі, мусіць, павячэраць табе трэба даць.

Але не паспелі мы падрыхтаваць ёй вячэру, як яна выскачыла з печкі і пачала прасіцца за дзверы. Мы сталі ўгаворваць яе:

— Ды пачакай трохі. Куды ты?

Але яна і слухаць не хацела — усё крычала і драпала дзверы.

Тады мы сцямілі, што перашкаджаць ёй не трэба: яна, відаць, з прыстойнай сям'і, добра выхавана і хоча выйсці на двор на хвілінку.

Выпусцілі яе. Прайшло колькі хвілін, чуем — скрабецца яна ў дзверы. Адчынілі — і бачым: яна прынесла другое кацянё. І зараз жа з ім у тую самую печку.

Не скажу, каб мы былі надта ўжо рады, што сям'я наша так хутка павялічваецца, але кошку ўсё ж такі пахвалілі:

— Добрая маці. — А дачка дадала: — Маладзец, Багіра.

Тут мы ўсе заўважылі, што яна сапраўды нагадвае Багіру, і аднагалосна зацвердзілі гэтае імя.

Дачка зноў хацела даць ёй вячэраць — і зноў Багіра стала прасіцца за дзверы. Ці не хоча яна яшчэ прынесці нам дзіця? Дзякуем за ласку.

Але што з ёю рабіць? Не пускаць за дзверы, ці што? Прыйшлося зноў выпусціць. А праз некалькі мінут яна сапраўды прынесла трэцяе кацянё...

Такім чынам, праз якія паўгадзіны сям'я наша адразу павялічылася на чатыры адзінкі. Сказаць, што мы былі рады, — ніяк нельга. Але да кошкі-маткі адчулі вялікую павагу. Якая яна была сур'ёзная, руплівая! Як ні павернецца, што ні зробіць — усё правільна, разумна, таксама як зрабіў бы кожны з нас. За ўвесь гэты час яна ніводнай мінуты не патраціла дарэмна і не зрабіла нічога лішняга, не сунула свой нос, куды ёй не трэба, не пацікавілася нічым, апрача сваёй справы.

Мы гаворым, што ў жывёл не розум, як мы яго разумеем, а інстынкт, гэта значыць прывычныя, але несвядомыя рухі і дзеянні, патрэбныя ім для жыцця. Пчала робіць сваю ячэйку, зусім не думаючы, што, як і дзеля чаго яна робіць. Мурашка цягне ў свой бок галінку, а яе зямляк падбяжыць дапамагаць і пачне цягнуць у другі бок — і яны абодва так і будуць тузацца, не ведаючы, што яны робяць.

Мы самі, калі дакранаемся рукой да агню, то зараз жа інстынктыўна торгаем руку назад, а потым ужо сваім розумам цямім, у чым тут справа. Усё гэта — праявы інстынкту. Няўжо ж і наша кошка затрымлівала на вуліцы людзей, прасіла іх вярнуцца і памагчы яе дзіцяняці, сачыла, каб дзіця не замерзла, памятала пра іншых сваіх

дзяцей і прыносіла іх у хату — адным словам, развіла шырокую дзейнасць, зусім не разумеючы, што і дзеля чаго яна робіць. Не, хай сабе вучоныя людзі гавораць, што хочуць, а мы не згодны з гэтым. Наша кошка, відаць, зусім разумная асоба, і з ёю жыць можна будзе. Нездарма яна нагадвае Багіру, а тая, калі верыць Кіплінгу, магла разважаць лепш за якога-небудзь не надта разумнага чалавека.

Але на другі ж дзень выявілася, што наша Багіра, можа, наогул і вельмі разумная, у арыфметыцы ўсё ж крыху адстала. Дзеці, гуляючы на суседнім двары, знайшлі там мёртвае маленькае кацянё. Відаць, яно замерзла ў гэтую ноч. Не было ніякага сумнення, што гэтае кацянятка — родны брат трох нашых. Кошка, прынёсшы да нас першага, ведала, што там у яе яшчэ ёсць дзеці. Ведала яна гэта і пасля другога. А пасля трэцяга ўжо не ведала. Выходзіць, што яна ўмела лічыць толькі да трох. Але няхай сабе і так. Усё роўна не ў кожным доме знойдзеш кошку, якая ўмее табе лічыць да трох.

Такім чынам, зажылі мы ўсе разам дружнай сям'ёй. Наша Багіра карміла і песціла сваіх дзяцей, як лепей і быць не можа. І ў якой чысціні яна іх трымала! Лізала іх безупынна і ўсюды, не спыняючыся ні перад якім брудам. Затое ж і блішчалі яны ў яе, як цацкі. Ды яны для нас і сапраўды былі цацкамі.

Хто не ведае, якімі мілымі і пацешнымі бываюць малыя кацяняты! Асабліва калі разгуляюцца. Колькі смеху было нам, калі аднаго разу двое з іх пацалаваліся як мае быць: абнялі лапкамі адзін аднаго за шыю і тыцнуліся насамі. Не было такога чалавека, які мог бы прайсці міма іх, калі яны дурэюць. Затое іх маці трымала сябе аж занадта сур'ёзна: ні разу не скокнула, не пажартавала, нават ні разу не ўсміхнулася. Вельмі важная і разумная была Багіра. Як жа было яе не шанаваць!

А праз некаторы час яна паказала яшчэ, што мае і высакароднае сэрца. На наш двор аднекуль прыблудзіла чужое чорнае кацянё. Узросту яно было прыблізна такога, як і нашы, толькі надта брыдкае і няшчаснае: худое, аблезлае, пузатае, з хворымі вачыма і абарваным вухам. Дзеці яго гналі, штурхалі, а яно ледзь рухалася. Ішла раз міма яго Багіра: кацянё пасунулася было да яе, але кошка грэбліва ўхілілася ад яго. А праз дзень бачым — вядзе яго да нас у хату, корміць, ліжа.

Гэтага толькі не хапала. Поўная хата катоў, а тут яшчэ нейкага бруднага прымай. Але як было нам, добрым і разумным людзям, праганяць няшчаснае кацянё, калі нават жывёліна пашкадавала яго? Няўжо мы будзем горшымі за жывёлу? Тады нам сорамна будзе глянуць у вочы паважанай Багіры. Тады і яна і суседскія куры засмяюць нас. Ды і не мы будзем яго гадаваць.

Хай сама Багіра і ставіць яго на ногі. Так яна і зрабіла.

Калі кацяняткі падраслі, мы сталі аддаваць іх у людзі. Цэлая чарга стварылася з нашых суседзяў па доме. Калі аддалі першую шэранькую кошачку ў кватэру сёмую, Багіра нібы не заўважыла яе адсутнасці. А вось калі аддалі другое кацянё, у кватэру чацвёртую, і ў нас засталося ўсяго два, тады маці адразу заўважыла, бо лічыць жа да трох умела. Крычыць, шукае па ўсіх кутках, не дае есці тым, што засталіся з ёю, імкнецца за дзверы. Так, галосячы, і з хаты пайшла.

Вярнулася спакойная. Глянула гаспадарскім вокам у адзін куток, у другі, пакарміла дзяцей, памыла іх — і зноў пайшла. Ніякага гора, ніякага крыку. Мала таго — нават начаваць не прыйшла дадому. Што гэта з ёю? Можа, так пакрыўдзілася, што зусім пакіне нас?

Але на другі дзень яна прыйшла. І нават мышку прынесла. Пагасцявала трохі, дагледзела дзяцей — і зноў пайшла гуляць. Вось табе і паважаная Багіра. Трымае сябе, як немаведама хто... А калі праз колькі дзён мы аддалі яшчэ адно кацянё, у кватэру шостую, і ў нас засталося ўсяго адно, то наша Багіра аднеслася да гэтага так, нібы такая справа яе зусім і не датычылася. Толькі яшчэ радзей стала наведваць нас.

Што такое з ёю здарылася?

Але трэба сказаць праўду: дзіця яе ад гэтага ані трохі не цярпела. Усё ж такі некалькі разоў

на дзень маці прыйдзе, накорміць, памые, нават паляжыць трохі з ім, — а потым зноў пойдзе.

Глядзім мы раз праз акно — нясе Багіра мышку свайму дзіцяці. Мы пайшлі адчыняць ёй дзверы, але яна... прайшла міма нас і панесла мышку ў кватэру шостую...

Дык вось у чым справа. Вось чаму наша Багіра не гаравала. Вось чаму яна дома не сядзела.

Яна даглядала сваіх дзяцей ва ўсіх кватэрах разам...

У кожнай кватэры лічылі, што кошка толькі і ведае, што іхняе кацянё: прыходзіць, корміць, мые, прыносіць мышэй, гуляе з дзіцем — нібы ў яе іншага клопату няма. А яна гэткім чынам працавала аж на чатыры кватэры. Вось чаму яна была такая заклапочаная, не траціла дарэмна часу, доўга не бавілася ў нашай хаце.

Цікава было яшчэ тое, што мышэй і пацукоў яна насіла па чарзе ва ўсе кватэры, нікога не крыўдзіла.

Аднаго разу было так: скрабецца яна ў нашы дзверы, просіцца; яе сынок пачуў і падбег ужо да дзвярэй. Адчынілі мы, глядзім — прынесла Багіра мышку, якую наш каток зараз жа і схапіў. Маці тады завярнулася і пайшла сабе назад: прынесла, аддала — навошта ёй і ў хату ісці? І без таго работы многа: і ў чацвёртай кватэры чакаюць, і ў сёмай, і ў шостай — хоць ты разарвіся.

Можа, хто захоча спытацца: якім чынам Багіра магла абслугоўваць чатыры кватэры, калі сама ўмела лічыць толькі да трох? Нялёгка, вядома, адказаць на такое запытанне замест Багіры, але думаем, што яна сваю хату не лічыла — вось тады і застанецца тры.

Як бы там ні было на самай справе, а мы лішні раз пераканаліся, што наша Багіра — найлепшая кошка ў свеце. Мы нават гатовы былі прасіць у яе прабачэння за тое, што падумалі, нібы яна сапсавалася і загуляла.

Нарэшце прыйшоў час, калі Багіра зусім пакінула ўсіх сваіх дзяцей і забылася на іх. Мы ахвотна аддалі людзям і апошняга катка, каб жыць толькі з адной іхняй маткай. Ды і хто не хацеў бы жыць з такой разумнай асобай!

Але хутка ў нас з ёю пачаліся непаразуменні. Калі яна пазбавілася клопату аб дзецях і ёй больш не было чаго рабіць, яна пачала ўмешвацца ў нашы гаспадарчыя справы, ды так нахабна, што ніякай рады нельга было даць. Калі хоць трохі адвернешся, недагледзіш — яна зараз жа нашкодзіць. Нічога ад яе не схаваеш — усюды дабярэцца. Калі збан малака накрыты сподкам — яна сподак скіне, калі завязаны — яна перакуліць. Калі буфет зачынены не зусім шчыльна — яна сама яго адчыніць. А раз ухітрылася выцягнуць з закрытай каструлі мяса — і каструля засталася закрытай. А ноччу часам адбываліся такія выбухі ад скінутых рэчаў, што, здавалася, самалёты робяць бамбёжку.

Ужо ж як мы яе ўгаворвалі, саромілі, выхоўвалі, дрэсіравалі — нічога не выйшла, ніяк не маглі з ёю дагаварыцца. Нічога яна не магла ці не хацела зразумець, хоць і ўмела лічыць да трох.

І цяпер мы шкадуем, што так яе расхвалілі на ўвесь свет.

## Чырвоная кніга

*Уладзімір Ліпскі*

Магутны лясны асілак Зубр задумаў цікавае падарожжа па Беларусі. Даўней яго продкі, равеснікі мамантаў, жылі паўсюдна. Цяпер зубры насяляюць ці не адну толькі Белавежскую пушчу. Хто ж яшчэ са старажылаў жыве ў лясных нетрах рэспублікі?

Ішоў, ішоў Зубр і спаткаў Бурага Мядзведзя. Сумную навіну паведаміў яму лясны сябар:

— Сто гадоў назад прывольна жылося нашаму брату ў Беларусі. Гулялі ў дрымучых лясах, па мохавых балотах. Цяпер знаходзім прытулак у Бярэзінскім запаведніку. Там высякаць старыя лясы забаронена.

Задумаўся Зубр, страсянуў паджарай грывай і сказаў:

— Пойдзем разам, можа, яшчэ каго спаткаем.

Ідуць яны ды прыгадваюць даўнейшых лясных насельнікаў. На Палессі трапляўся дзікі кот. Каля Брагіна і Пінска вадзіліся рукакрылыя жывёлы — гіганцкая вячэрніца і вялікая начніца.

Пачуў іх размову Барсук, папрасіўся ў кампанію. Растлумачыў:

— Усе, каго вы ўспаміналі, як і мы з вамі, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

— Што за кніга? — спытаў Зубр.

— У яе запісваюць рэдкіх жывёл, птушак, рыб, расліны.

— А ты адкуль ведаеш? — зацікавіўся Буры Мядзведзь.

— Падслухаў у паляўнічых. Яны гаварылі, што на нас цяпер строга забаронена паляванне. Нас усе берагчы павінны.

Яшчэ больш здзівіліся лясныя жыхары. Выйшлі да Прыпяці, пачалі знаёміцца з мясцовым запаведнікам. Пачулі трубнае курлыканне шэрага жураўля. Барсук-усёвед разгадаў трывожныя крыкі:

— Жораў расказвае, што іх сем'яў усё менш застаецца на балотах, бо і балот меншае.

На сваю адзіноту паскардзіліся чырвоны каршун, чорны бусел, беркут, белая курапатка, лебедзь-шыпун, трохпальцы дзяцел.

Пайшлі сябры далей. Трапілі ў край блакітных азёр, на Віцебшчыну. Прылеглі адпачыць. Матылькі лятаюць, конікі стракочуць. І сярод насякомых убачылі насельнікаў Чырвонай кнігі. Гэта былі з прыгожай афарбоўкай матылькі — чорны апалон, махаон, адмірал. А на старым дубе сядзеў жук-алень — самы буйны жук у Беларусі. Вясёлы сонечны зайчык трапятаўся на яго

чорна-матавым целе. Рогі вялікія, як у сапраўднага аленя.

Раптам з вады паказалася вялікая галава з маленькімі вачамі і доўгімі вусамі. Звяры спалохана падхапіліся, а «галава» кажа:

— Не бойцеся, я — азёрны сом. Мае браты водзяцца ў рэках. Мялеюць рэкі, няўтульна становіцца ў іх. Вось і мы трапілі ў Чырвоную кнігу.

— А яшчэ якіх рыб ахоўвае чалавек? — спытаў Зубр.

Сом пакруціў вусамі, падумаў і адказаў:

— Прыгажуню сцерлядзь, якая водзіцца ў Дняпры, Прыпяці, Сожы, Бярэзіне. А яшчэ ручаёвую стронгу з Нёмана, еўрапейскую рапушку з Заходняй Дзвіны, звычайнага харыўса з Віліі, рыбца з Заходняга Буга...

— Слухай, Сом, — папрасіў Буры Мядзведзь, — на паверхні твайго возера растуць гарлачыкі, белыя і жоўтыя. Падплывi, нарві букет. Мы падорым яго добрым людзям, якія беражліва ахоўваюць нас.

— Не магу выканаць тваю просьбу.

— Чаму? — здзівіўся нават Барсук-усёвед.

— Таму што і гарлачыкі занесены ў Чырвоную кнігу. А разам з імі і некаторыя іншыя расліны, — адказаў Сом і на развітанне шумна пляснуў хвастом па вадзе.

Задумаліся звяры. Можа, і сярод тых раслін, якія яны ядуць, па якіх ходзяць, ёсць рэдкія? Іх жа берагчы трэба!

# У любую пару года слухай роднуюпрыроду

## ЗІМНЯЯ СТАРОНКА

### Зіма

*Васіль Жуковіч*

Зіма хадою смелаю
Да нас прыйшла здаля,
І стала белай-белаю
Уся вакол зямля.
Такія гурбы выраслі:
Як прывіды стаяць.
Эй, саначкі мы вынеслі —
Давай гуртом гуляць.
У саначках бліскучыя,
Як струны, палазы.
Не страшны нам траскучыя,
Тугія маразы.

### Зіма

*Якуб Колас*

Надышлі маразы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Шэранем убралі.
Замялі дарогі
Ветрыкі снягамі.

Лес, як дзед убогі
З доўгімі вусамі,
Апусціў галіны
І стаіць журботна,
Зрэдку верхавіны
Зашумяць маркотна.
Мяккая пярына
Вочы адбірае.
Белая раўніна —
Ні канца, ні краю.
Пад пялёнкай белай
Травы і лісточкі.
Рэчка анямела,
Змоўклі ручаёчкі.
Амярцвелі лозы,
Чуць галлём хістаюць,
А ў палях марозы
Ды вятры гуляюць.

## Першы снег

*Васіль Жуковіч*

Янка ўстаў асеннім ранкам,
на гадзіннік глянуў Янка.
«Сем гадзін, ды — што такое? —
пасвятлела у пакоі».
Хлопчык да акна падбег:
вось дык дзіва — выпаў снег!
— Тата, мамачка, не спіце,
у акно хутчэй зірніце!..

Першы снег, бялюткі снег,
колькі ён прысыпаў стрэх,
і сцяжынак, і дарог,
на варотах нават лёг,
двор старанна абяліў,
наваколле асвятліў.
Першы снег, бухматы снег!
Дзе ўжо болей тут заснеш…
Не паспеў паснедаць Янка,
кажа тату:
— Хачу санкі.
(Акурат была нядзеля,
дома ўся сям’я сядзела.)
Тата саначкі прынёс,
а каб хлопчык не замёрз,
малахай дастала мама,
шубку лёгкую таксама.
Цэлы ранак, цэлы ранак
Янка наш правёў ля санак.
І гулялі разам з ім
Ніна, Галя і Яўхім.
А яшчэ на снежны двор
выйшлі Петрык, і Рыгор,
і маленькі Васілёк —
дзеці зблізку і здалёк.
Дружна дзеці снег ляпілі,
крэпасць моцную рабілі.
Там пайшлі ў атаку снежкі,
за разведкай — перабежкі,—

там гарачыя баі
«нашых» з «белымі» былі.
Завадатарам галоўным
Янка быў — ён быў няўлоўны.
Першы снег — усім на ўцеху:
мора гоману ды смеху...
А тым часам пацяплела:
крыху сонейка прыгрэла,
пацякло з высокіх стрэх,
стаў, як мокры цукар, снег.
Крэпасць грозная асела,
горка мігам палысела.
І прыціхлі каля горкі
Янка, Петрык і Рыгорка,
Ніна, Галя і Яўхім...
Першы снег, пусці дадому:
боты мокрыя зусім.

## Цудоўныя святы

*Васіль Жуковіч*

Вялікую радасць
на вуліцы, ў хаты
прынеслі Каляды,
зімовыя святы.

Прынеслі забавы,
і жарты, і песні,
загадкі, і гульні,
і танцы прынеслі.

Не спі, пані скрыпка,
і, бубен, прачніся —
цудоўныя святы
у нас пачаліся.

## Карнавал

*Валянцін Лукша*

Шчодры і руплівы снежань
Клопатна зямлю аснежыў.
З лесу ёлка завітала
Першай госцяй
Карнавалу.
Мы на ранішнік вясёлы
Запрасілі шчыра ў школу
Безліч дарагіх гасцей —
Будзе свята весялей!
Ў залу светлую прыйшлі
Пасланцы ўсяе зямлі —
Рады ўсе заўсёды Новаму году.
— Добры вечар!
— Добры вечар!
Вы прыехалі дарэчы!
Станем дружна ў карагод
Ды сустрэнем Новы год!
Патанцуем, паспяваем,
Ля ялінкі прыгадаем,
Дзе і як гуляюць,
Свята адзначаюць.

Дзед Мароз,
На выгляд строгі,
Ўсе прайшоў шляхі-дарогі.
— Раскажы нам, Дзед Мароз,
Што цікавага прынёс?
Не спяшайся, Дзед, з адказам.
Па чарзе — не ўсё адразу.
— Поруч ля мяне — Снягурка
Ў вышываных белых бурках.
Звоняць звонкія званочкі —
Год стары падаўся ўпрочкі.
І вітае ўвесь народ
Добры, мірны
Новы год.
У брытанцаў —
Дзіўны звычай:
Да сябе гасцей не клічуць.
Але кожны падарожны
Стаць жаданым госцем можа.
А як трапіш да балгараў,
Не крыўдуй, прашу, таварыш, —
Сябра б'юць сучком кізілу,
Каб заўсёды меў ён сілу.
Посуд вобзем кінуць шведы,
Каб міналі хату беды:
Больш асколкаў ля дзвярэй —
Будзе год шчаслівей!
А румынскі хлопчык жвавы —
Да сястры: «Што ходзіш павай?
Не вазьму я твой пірог!»
Здагадацца ён не мог —

Ў пірагу лісток паперы:
У навуках будзеш першы!
У індусаў каляровы
Змей у небе папяровы.
Ён над джунглямі лунае,
Першым свята сустракае.
У галандцаў параходы
Покліч шлюць прыветны году.
Ўсмак тут піражкі ядуць —
Шмат да свята іх пякуць.
У Гвінеі зноў і зноў
Вуліцай вядуць сланоў,
І танцуюць, і спяваюць —
Гэтак Новы год вітаюць.
Ну, а ў Бірме,
Ну, а ў Бірме
Замест снегу
Хвошчуць ліўні.
Тут са святам так вітаюць:
Ўсіх вадою абліваюць!
А на свята у В'етнам
Не паспець у тэрмін нам —
Карнавал віруе тут
І у студзені, і ў лютым, —
Месяцовы каляндар
Карнавалу гаспадар.
Не сустрэнеш тут ялінак,
Карагод — ля мандарына.
Чэхію б наведаць мне
На чароўным скакуне.

Цацкі дзецям дораць людзі,
А як зноў надыдзе будзень,
Можна цацкі тыя ўзяць
Ды у краме абмяняць.
Над паперай гнецца ў крук
У Японіі хлапчук.
«Што малюеш, —
Кажуць людзі, —
І на яве тое будзе...»
Новы год шумлівай хваляю
Праімчаўся па Італіі.
З дому ўсю старызну вон!
Ў дом — курантаў перазвон!
Дзед Мароз пытае:
— Можа,
Час нам скончыць падарожжа?
Дзеці дружна у адказ:
— У добры час!
— У добры час!
Не сціхаюць песні ў зале
На святочным карнавале.
Нездарма, відаць, у школу
Мы на карнавал вясёлы
Запрасілі шмат гасцей —
Стала свята весялей!
Рады мы заўсёды
Новаму году!

## Калі прыходзіць Дзед Мароз?

*Васіль Жуковіч*

Браты Алеська і Максім
Жывуць на свеце белым.
Не ўсё пакуль вядома ім,
Не ўсё ім зразумела.
Пытанне ўзнікла усур'ёз
У двух братоў аднойчы:
— Калі прыходзіць Дзед Мароз?
— Калі ж? Напэўна, ноччу.
Якраз у ноч пад Новы год
Браты амаль не спалі,
Мароза-дзеда ўсё ж прыход,
Падобна, прамаргалі.
Бо раніцой знайшлі браты
Пад ёлачкай пакункі,
Ляжалі у пакунках тых
Сямейцы падарункі.
Было там дзіва для братоў —
Яны не разумелі,
З двара як Дзед Мароз прыйшоў,
Што й дзверы не рыпелі.
Які цудоўны Дзед Мароз:
Нясе такую ношу!
Вось падарункі ўсім прынёс
І ўсім настрой харошы.

## Ёлка

*Мікола Чарняўскі*

Завітала ў госці ёлка —
З намі Новы год спаткаць,
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Рада пець і танцаваць.
Зухаваты, барадаты
Сыпле жарты Дзед Мароз.
Са Снягуркаю на свята
Падарункі ён прынёс.
Вочы весняцца ў Снягуркі,
Добра ўсім каля яе:
Нам Снягурка падарункі,
Як усмешкі, раздае.
Што за дзіва — наша ёлка!
Што за свята — Новы год!
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Водзіць з намі карагод.

## Ёлка-вясёлка

*Уладзімір Мацвеенка*

Надвячоркам у бары
Гуртам збегліся звяры,
Каб наладзіць карагод
І паклікаць Новы год.

Падказаў адразу Лось:
— Побач тут палянка ёсць,
На ёй ёлка гожая,
Стройная, прыгожая...

Першым шэры Воўк прыбег
І вакол расчысціў снег.
Тут Вавёрка з дрэва — скок,
Развязала свой мяшок:

— Ёсць грыбы, арэхаў з дзесяць,
Трэба будзе іх развесіць...
Прапішчала з норкі мышка:
— А ў мяне старая шышка.

Зай тры морквіны прынёс
І расчуліў аж да слёз,
Як сказаў: «На жаль, сябры,
Засталося толькі тры...»

А Лісіца ўздыхае:
— Нам чагосьці не хапае...
— Паглядзіце! — крыкнуў хтосьці. —
Дзед Мароз шыбуе ў госці!..

Дзед як выйшаў на паляну,
На звяроў з усмешкай глянуў:
— Не сумуйце! Як магу,
Вам, сябры, дапамагу.

Ёлку ён паварушыў,
Шэранню прыцярушыў
І паклікаў:
— Снегіры,
Не хавайцеся ў бары,
На паляну прылятайце
І на ёлачку сядайце!

Прыляцелі снегіры,
Як чырвоныя шары,
І, нібыта на арэлі,
На галінкі важна селі.

Упрыгожаная ёлка
Зазіхцела, як вясёлка.
І запляскалі ўсе ў ладкі,
І наўкруг пайшлі ўпрысядкі...

## Дзед-госць

*Якуб Колас*

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.

Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай посцілкай-кажухам.

Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.

А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.

Тут лісічка, зайчык, мышка,
Рыбкі, буслік даўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы!

Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.

Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

## Верабейчык

*Алесь Пальчэўскі*

Той зімою мы будавалі ў сяле магазін: прасторны, высокі, на цагляным падмурку. Пад канец студзеня, упершыню ад пачатку зімы, пачалася адліга. Дыхнуў з поўдня цёплы ветрык, і заслязіліся стрэхі. Снег памякчэў, і на вуліцы, куды ні глянь, гаманлівыя дзеці гулялі ў снежкі.

Увесь дзень мітусіліся і шчабяталі вераб'і, смялейшыя купаліся ў лужынах. Птушкам, больш чым людзям, абрыдзелі маразы, і адліга нагадала ім цёплую вясну.

Надвячоркам некалькі верабейчыкаў заляцела на гарышча новага магазіна і зашылася начаваць у прагале паміж кроквай і жалезным дахам.

Чаму ім прыйшло ў галаву аблюбаваць такое месца для начлегу, цяжка сказаць.

Уначы нечакана прыціснуў мароз. Падзьмуў паўночны вецер, і раніцай тэрмометр паказаў трыццаць пяць ніжэй за нуль!

Калі мы прыйшлі на работу, знайшлі верабейчыкаў замерзлых. Хтосьці з цесляроў параіў занесці іх у цёплую дзяжурку: можа, адыдуць яшчэ.

Мы хуценька сабралі птушачак у шапку і гуртам кінуліся ратаваць. У дзяжурцы кожны ўзяў па адной у прыгаршчы і пачаў хукаць. Сваім цяплом мы хацелі вярнуць ім жыццё, але ні адна не падавала надзеі.

І раптам на маёй руцэ верабейка расплюшчыў вочы.

— Хлопцы, ажыў! — крыкнуў я ад радасці. — Глядзіце!..

Мы ўсе пяцёра нахіліліся над ім.

— Міргае! Хукай, яшчэ хукай! — раілі мне цесляры, і самі таксама дыхалі на птушачку, якая ляжала бачком на маёй далоні і пазірала на нас. Але чаму ж гэта асцярожнае, такое недаверлівае да людзей стварэнне не спрабуе ўцякаць?

Я павярнуў верабейку на жывоцік. Ён памкнуўся стаць на ножкі, каб адштурхнуцца ад мае далоні, і зноў лёг на бок.

— Падкінь асцярожна ўгару, а мы падставім шапкі. Калі будзе падаць, падхопім,— параіў старэйшы ў нашай брыгадзе.

Я паслухаўся і падкінуў. Верабейка закружыўся пад столлю. Відаць, сам сабе не верыў, што можа лятаць, бо так весела заціўкаў: «Жыў, жыў!», што і нам усім стала радасна.

Верабейка абляцеў некалькі разоў пакойчык і апусціўся на цвік у сцяне. Хацеў ашчаперыць яго сваімі кіпцюрыкамі, як рабіў гэта на тоненькай галінцы, і не змог: паляцеў уніз. Каля падлогі распасцёр крылцы і зноў закружыў па дзяжурцы. Стаміўшыся, сеў на каўнер брыгадзіравага кажуха, што вісеў каля акна.

Мы знялі яго, паклалі на стол, накрышылі хлеба, налілі ў спадачак вады, а самі пайшлі працаваць. Мароз марозам, а рабіць трэба.

У час абеду заўважылі: верабейка трошкі падсілкаваўся і спакойна ляжаў.

Усю зіму верабейка пражыў у нашай цёплай дзяжурцы.

Штораніцы ён весела адгукаўся на прывітанне кожнага, хто прыходзіў да нас.

## ВЯСЕННЯЯ СТАРОНКА

### Вясна

*Янка Купала*

Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы,
Болей не мерзне душа ні адна,
Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.

Рэчкі бурлівыя, ўчора санлівыя,
Сёння усталі, плывуць і бурляць;
Рыбкі шмыглівыя скачуць, купаюцца,
К небу прыветна з вадзіцы глядзяць.

Пушчы паважныя, зімку праспаўшыя,
Радасна песні зайгралі свае;
Лісці зашасталі, птушкі зачыркалі,
Свішча салоўка, і дзяцел клюе.

Поле травіцаю сочнай адзелася,
Выйшла скацінка і дружна скубе,
Каля скацінкі падпасвіч з жалейкаю
Ходзіць навокал ды йграе сабе.

Грай, грай, жалеечка! Грай, грай, вясёлая!
Выйграй з вясною і долечку мне;
З пушчаю, з птушкамі, з вольнымі ветрамі
Грай мне аб шчасці, грай аб вясне!

## Краска

*Якуб Колас*

Краска, мілая мая,
Госця веснавая!
Як ты хораша цвіцеш
У глушы, любая!

З ціхім усмехам з табой
Вецярок жартуе,
І цябе ў вясёлы дзень
Сонейка цалуе.

Што ж на тварыку тваім
Легла задуменне?
Што нявесела глядзіш,
Мілае стварэнне?

І не радуе цябе
Дзень вясёлы мая,
Голас радасны вясны,
Песня маладая?

Я хацеў бы адгадаць
Дум тваіх гаворку,
Я б хацеў развесяліць
Краску, маю зорку.

Што гаруеш ты аб тым,
Што і ты без волі,
Што краса ўся адцвіце
Без пары і долі?

Ці па тым, што вецярок
Разлучыў з лугамі,
Дзе б ты гутарыць магла
З пчолкамі, з чмялямі?

Я любуюся табой,
І мне смутна стане,
Што ў астрозе хараство
Усё тваё завяне.

Што адна ты адцвіцеш
Век свой сіратою, —

А багата ж адарыў
Май цябе красою!

Краска, красачка мая,
Мілае стварэнне!
Што ж на тварыку тваім
Легла задуменне?

## Сыход зімы

*Алесь Клышка*

Кропелька ляціць у лужы,
З ледзяшоў зіма сцякае.
Маразы, завеі, сцюжы
З ручаінай уцякаюць.
Хто паспеў у рацэ схавацца,
Хто пад лёдам у азерцы,
Кожны мусіць ратавацца...
Цесна снегу у вядзерцы.
Бо яму таксама трэба
У ваду ператварыцца,
Каб затым узняцца ў неба
І на луг дажджом праліцца.
Сонца лужы прыпякае,
Як ў люстэрка ў іх глядзіцца,
Куркі смагу наталяюць —
Дужа смачная вадзіца.
Хлопцу Ясіку раздолле —
Карабель свой адпускае
У струмень імклівы, вольны,
Што да мора паспяшае.

Хутка ад зімы і следу
Не пакінецца ў прыродзе.
Панавала да абеду.
— Выйшла, — кажуць у народзе.

## Пралескі

*Мікола Хведаровіч*

На сонечным узлеску
Апошні снег растаў.
Вясёлыя пралескі
Зірнулі з-пад куста.
Празрыста ззяюць вочы,
Нібы блакіт нябёс.
Халоднай весняй ноччу
Іх не кране мароз.
Пралескі на пагорку
Пад леташняй травой
Зіхочуць, быццам зоркі,
Агністай сінявой.

## Перад паводкай

*Максім Багдановіч*

Праясняецца пагода,
Бо вярнулася вясна.
Усё чакаеш, што прырода
Устрапянецца ада сна.

І пад птушы крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадыме бацька Нёман
На хрыбце магутным лёд.

Зазвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Снег, размоклы ў час адлігі,
Змые з луга без сляда.

Дык разлійся жа раздольна
Ў чыстым полі і гаю
І красой паводкі вольнай
Душу выпрастай маю!

## Ірынка

*Максім Танк*

Ірынцы спадабалася
Цудоўная вясна.
Як восені дaждалася,
Пайшла прасіць яна,
Прасіць нябёс не хмарыцца,
Вятроў — не галасіць,
Срабрыстых росаў раніцай
На травах не гасіць;
Каб сонейка высокае
Свяціла на палі,

А кветкі сінявокія
Зноў на лугах цвілі;
Прасіць сям'ю крылатую
З лясоў не адлятаць,
Бярозку расахатую
Лістоў не атрасаць...
Прасіла яна шчыра так,
Прасіла ўсю зіму,
І мо вясна аж з выраю
Вярнулася таму.
Вярнулася, пяе ізноў
З бярозкай над ракой,
Пяе сярод дуброў, лугоў
З Ірынкаю малой.

## Садзіце лясы!

*Максім Танк*

Садзіце лясы! Садзіце лясы
Ва ўсе гадавіны, прыгоды, часы!

І саджанцам, як немаўлятам, зялёным
Давайце на хрэсьбінах гэтых імёны —

Імёны сваіх незабыўных бацькоў,
Імёны каханых, імёны сяброў.

Імёны падзей, што палаюць зарою,
Імёны авеяных славай герояў

І рознапляменных народаў, дзяцей,
Імёны сузор'яў і нашых надзей.

Каб дрэвы і ранняй, і позняй парой
Заўсёды шумелі над мірнай зямлёй.

## ЛЕТНЯЯ СТАРОНКА

### Васілёк

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Стаіць,
Выглядаючы з жыта,
Як зорачка-знічка
Здалёк,
Што ўпала
Іскрынкай
З блакіту,
Палеткаў краса —
Васілёк.
Калі расцвітае
Цуд гэты,
На полі
Яшчэ гарачэй,
Буяе,
Квітнеецца лета
І фарбы прыроды —
Ярчэй.

Стаіць,
Паглядае з пагорка,
Як зорка
Аднекуль здалёк,
Часцінка
Любімай старонкі,
Часцінка зямлі —
Васілёк.

## Галінка і вярбінка

*Максім Танк*

— Галінка-вярбінка, —
Прасіў верабей, —
Мо пакалыхала б
Маіх ты дзяцей?

Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.
— Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!

Казулі не хочуць.
— Ідзіце, ваўкі,
Лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць.

Ваўкі не схацелі.
— Прыходзьце, стральцы,
Каб непаслухмяных
Ваўкоў правучыць,
Якія не хочуць
Казуляў караць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць...

Пайшлі паляўнічыя
Ў лес на ваўкоў:
Спалохана зверы
Пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў
Лавіць і караць;
Казулі пабеглі
Галінку ламаць;
Галінка ж вярбінка
Са страху хутчэй
Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.
З тых дзён без спачынку,
Каб кожны быў рад,
Калыша галінка
Усіх птушанят.

# ВОСЕНЬСКАЯ СТАРОНКА

## Залатая, асенняя раніца!

*Уладзімір Дубоўка*

Залатая, асенняя раніца!
Харaством ты на свеце адна.
Сонца ў пушчы глыбокай купаецца
І ніяк не дастане да дна...

Мітусіцца лісцё па аселіцы,
Як Дзвіна матылькоў-мітульгі.
І ўзвее яна, і пасцелецца,
Распаветрыцца на берагі.

А яны, берагі-беражыстыя,
Не стрымаюць асенні напеў.
І ліецца, віецца сукрысты ён,
І разгортваецца каля дрэў.

Прытулі, прыхіні на апошняе
І згадай гэты дзень залаты,
Што над пушчай, згалелымі пожнямі
Рассыпаў залатыя лісты.

## Восень

*Ірына Багдановіч*

Восень абсыпала дрэвы
Жоўтым прыгожым лістком,
Восень сабрала пасевы
З поля пагодным дзяньком,

Збожжа ў гумно накладала,
Бульбу ссыпала ў мяхі,
У косы цыбулю сплятала,
Вешала іх ля страхі.

Лушчыла ў торбы сланечнік,
Мак, і хвасолю, і боб.
Восень у клопаце вечным,
Хай дапаможа ёй Бог!

## Чаму птушкі адлятаюць

*Цётка*

Тыя птушкі, якія мусяць жыць вясну і лета ў адным краі, а восень або толькі часць восені і зіму ў другім краі, называюцца пералётнымі.

Птушкі на халодны час пералятаюць у цёплы край, бо яны ўсе жывяцца рабакамі, казюркамі, жучкамі... А ўсе гэтыя страшэнныя ворагі нашых дрэў і раслін на зіму гінуць, дык птушкам не было б чым жывіцца.

Каб мог здарыцца такі год, што птушкам дзеля якой прычыны нельга было б вярнуцца да нас, якім жа страшным, глухім і спустошаным праз гэта стаўся б наш край: замест мілага шчэбету, замест песняў звонкіх толькі голыя веткі і галіны шапацелі б замест багатых рознакаляровых ніў — поле ляжала б, як чорны папар, бо ўсё багацце нашага краю зніштожылі б, аб’елі б жукі, рыбакі, мошкі.

## Лістапад

*Янка Купала*

З буйных ліп і бяроз
Лісты валяцца.
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.

Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя,
Увысь галінкі глядзяць
Пусталістыя.

А як прыйдзе вясна —
Усё адменіцца,
І галінкі ізноў
Зазяленяцца.

# Чароўны свет малецтва

## Сябры

*Мар’ян Дукса*

Сябры
Сябруюць —
Ніколі не скажуць «не дам».
Усё яны дзеляць
Заўжды папалам:
Суніцы, чарніцы,
Банан, вінаград,
Пячэнне, халву,
Апельсін, шакалад.
Адзін будзе грэцкі арэх,
Як на грэх, —
Пароўну падзеляць
І грэцкі арэх!
Сябры яны —
Проста вадой не разліць.
І сталі нарэшце
Сабаку дзяліць.
А як ты падзеліш,
Калі ён адзін,
Яго не разрэжаш,
Нібы апельсін.

Рашылі:
Пабудзе ў адным будане,
А потым, праз дзень,
У другі зазірне.
Вось так падзялілі
Сабаку сябры,
І той не крыўдуе —
Мяняе двары.
І будзе ён бегаць
Вось так і далей —
Прыемна сябрам,
І яму весялей.

## Сланечнікі

*Ядвіга Бяганская*

Жэнік увесь дзень чым-небудзь заняты. То ён дапамагае маме і бабулі на кухні, то разам з братам майструе што-небудзь, то з дзедам у садзе корпаецца.

— Гультаям сумна жыць на свеце,— часта кажа бабуля.

І гэта праўда. Жэня сам ведае: варта яму нейкі час застацца без работы, і адразу робіцца сумна. Тады ён пачынае хадзіць з пакоя ў пакой і надакучаць:

— Ну дайце мне якую-небудзь работу! Ну што мне рабіць?

І, баючыся, каб мама не сказала заняцца кубікамі або якой-небудзь гульнёй, ён тут жа дадае:

— Я хачу табе дапамагаць. А дапамагаць ён любіў.

Ды гэта і зразумела: дапамагаючы дарослым, можна даведацца столькі цікавага!

Увесну, калі бабуля з мамай рабілі градкі, Жэнік пачаў прасіць:

— Бабулька, я хачу зрабіць сабе градку. Можна, бабуля?

Ну як тут не дазволіць хлопчыку, калі ён так просіцца, так ласкава зазірае ў вочы?

Хутка ў Жэніка з'явіліся і рыдлёўка, і граблі, і палівачка. Рыдлёўку і палівачку мама купіла ў магазіне, а граблі зрабіў сам дзед.

Градку дапамагаў капаць старэйшы брат, Уладзік. Хлопчыкі слухаліся бабулю і стараліся рабіць усё так, як раіла яна.

Калі градка была гатова, пачалася сяўба.

Жэніку хацелася, каб на яго градцы было ўсё, што сеяла бабуля на вялікіх градах. Але, параіўшыся, браты вырашылі, што для ўсяго не хопіць месца, і таму пасеялі толькі салодкі гарошак, моркву, рэпку і мак. А па краях градкі пасадзілі сланечнікі.

Першым на градцы ўзышоў гарох. Следам за ім вылезлі з зямлі сланечнікі, за сланечнікам — рэпка, морква і мак.

Хлопчыкі вельмі старанна даглядалі свае пасевы. Асабліва Жэнік. Уладзік, дык той, бывала, пойдзе з сябрамі рыбу лавіць або суніцы збіраць і забудзецца на градку. А Жэнік увесь дзень

ля яе пахаджвае: то пустазеліну якую вырве, то яшчэ раз палье раслінкі.

— Паглядзі, Уладзік, як няроўна яны растуць,— сказаў аднойчы Жэнік.— Рэпка з морквою растуць паволі, а гарох, мак і сланечнік вунь якія ўжо!

— Яны, відаць, навыперадкі стараюцца — хто каго абгоніць,— пажартаваў Уладзік.

Зацвіў нарэшце на градцы вусаты гарох, а неўзабаве распусціліся белыя і ружовыя макі. Над кветкамі з ранку да вечара лёталі матылькі, весела гулі працавітыя залатыя пчолкі. Жэнік з цікавасцю назіраў, як пчолы залазілі глыбока ў кветачкі і, усміхаючыся, падганяў іх:

— Спяшайцеся, спяшайцеся, бо хутка зойдзе сонца і кветкі заплюшчаць на ноч свае вочкі.

Але больш за ўсё хлопчыку падабаліся сланечнікі. Яны так спяшаліся расці, што хутка перараслі самога Жэніка.

— Яны ўсіх перарастуць,— казала бабуля.

— І маму? — недаверліва пытаўся хлопчык.

— І маму, і тату,— усміхалася бабуля. Мінуў некаторы час, і Жэнік сам пераканаўся, што бабуля гаварыла праўду.

— Тата, стань побач з маім сланечнікам,— папрасіў аднаго разу Жэнік.

Тата падышоў да сланечніка. І што ж вы думаеце? Сланечнік быў куды вышэйшы за тату!

— Хутка яны да самага неба дарастуць!— смяяўся Уладзік.

Да неба сланечнікі, вядома, не дацягнуліся, але выраслі высачэзныя. А потым зацвілі. Кветкі ў іх былі ярка-жоўтыя і, мусіць, большыя за татаў саламяны капялюш.

— А ведаеце, унучкі, чаму яны сланечнікамі называюцца? — сказала аднойчы бабуля.

— Чаму? — у адзін голас запыталі браты.

— Бо яны самі нібы сонца. Бачыце, якія агністыя іх праменні-пялёсткі! І няўжо вы дагэтуль не заўважылі, што сланечнік заўсёды паварочвае свой тварык да сонца?

Непрыкметна мінула квяцістае цёплае лета. На гародзе ўсё пачало даспяваць. Даспелі і Жэневы сланечнікі. І тады на градку пачалі прылятаць вераб'і. Яны зляталіся цэлымі чародкамі, садзіліся на сланечнікі і спрытна выдзёўбвалі з іх пукатыя буйныя зярняты. Але хлопчыкі не крыўдзіліся на птушак. На кожным сланечніку была такая безліч зярнят, што іх хапіла і птушкам, і Уладзіку, і Жэніку з сябрамі.

А самы вялікі сланечнік хлопчыкі занеслі на школьную выстаўку. Ён яшчэ і цяпер там красуецца.

## Новы сшытак

*Лідзія Арабей*

Касцік вельмі любіў пачынаць новы сшытак. І першыя старонкі пісаў заўсёды вельмі акуратна, старанна. Літары выходзілі роўныя і прыгожыя.

Але чым далей пісалася ў сшытку, тым бруднейшыя выходзілі старонкі, крывейшыя літары.

А як пераварьвала за палавіну, тут ужо невядома што рабілася. Літары пачыналі нібыта скакаць — то вылазіць зверху за лінейку, то сягаць пад яе, рабіліся нібы гарбатыя.

Косціку і самому брыдка было глядзець на сапсаваны сшытак, і ён, не дапісаўшы яго да канца, кідаў і браў новы. Але з новым сшыткам выходзіла тое самае: зноў мазаніна, крывыя літары. І зноў прыходзілася браць новы.

Аднойчы тата спыніўся каля стала, за якім рабіў урокі Косцік. Узяў у рукі адкінуты сшытак.

— Бачу, сынок, не цэніш ты людской работы,— сказаў ён.

— Якая работа! — запярэчыў сын.— Колькі там той сшытак каштуе!

— Колькі каштуе... — паківаў з дакорам галавою тата.— А ці ведаеш ты, колькі трэба працы, каб такі сшытак зрабіць?

— Падумаеш,— сказаў Косцік.— Некалькі лісткоў сашчапіць!..

— А як тыя лісткі робяцца, ты ведаеш?

— З паперы.

— Так, з паперы, а папера з чаго?

Косцік маўчаў.

— Папера з дрэва робіцца,— пачаў тлумачыць тата.— Значыць, каб сшытак зрабіць, трэба дрэва спілаваць... А каб дрэва спілаваць, бензапіла патрэбна... А пілу з металу робяць... А каб метал атрымаць, трэба спачатку руду знайсці... Потым вывезці яе з шахтаў на машынах, на цягніках... А машыны ды цягнікі таксама

зрабіць трэба. Так што на твой сшытак сотні людзей працуюць, а можа, і тысячы. Геолагі руду шукаюць, сталявары метал выплаўляюць, рабочыя машыны робяць, машыністы ды шафёры водзяць цягнікі, самазвалы. А для той пілы, для самазвала яшчэ і бензін патрэбен, значыць, і нафту трэба з зямлі здабыць...

Косцік слухаў тату і дзівіўся. Ён ніколі не думаў, што звычайны сшытак робяць так шмат людзей.

— А тое дрэва? — гаварыў тата.— Яно расло, можа, сто гадоў, а яго спілаваць трэба, завезці на фабрыку, каб паперу на твой сшытак зрабіць. У клетачку ці ў лінейку. А ты дапішаш сшытак да палавіны і выкідаеш... І новы пачынаеш...

«Цікава, — думаў Косцік. — Калі на звычайны сшытак працуе тысячу чалавек, то як жа на ўсё астатняе?» І ён спытаў:

— А штаны мае таксама многа людзей рабіла?

— Таксама, сынок,— адказаў тата.— Спачатку трэба было лён пасеяць ды даглядаць лён, каб вырас. Потым на станках ніткі сукаць, фарбаваць іх. З тых нітак тканіну ткаць, потым на машынах з тканіны штаны шыць. А станкі ж ды машыны зноў з металу робяць, а метал — з руды... Усюды праца чалавечая, каб не яна, нічога не меў бы ты, а жыў, як першабытны чалавек, у пячоры.

Косцік агледзеў свой стол. На ім ляжалі кніжкі, сшыткі, каляровыя алоўкі, ручка, лінейка. Ён узяў у рукі лінейку. І раптам уявіў, колькі людзей рабіла гэтую няхітрую прыладу. Асцярожна паклаў лінейку на стол, падсунуў да сябе недапісаны сшытак. І даў цвёрдае слова — пакуль гэтага не дапіша, новага не пачне.

## Васьмёрка не ў радасць

*Ганна Скаржынская-Савіцкая*

Дзімка і Косцік вярталіся са школы.

— Вясна, дома не ўседзець, — разважаў Косцік. — А тут яшчэ вялікі верш на памяць трэба вучыць!

— Людміла Паўлаўна нібыта здзекуецца з нас, — згаджаўся Дзімка. — Давай удвух не вывучым. Скажам, што ў дзённіку не запісана, не ведалі.

— Атрымаць двойку ў канцы чвэрці — непрыемна, — вагаўся Косцік. — Дый мама што скажа?

— Нічога нам не будзе, — не адступаў Дзімка. — Не вывучым жа ўдвух.

— Добра, тады не вучым! — згадзіўся нарэшце Косцік.

Яны разышліся. Праз гадзіну недзе сустрэліся зноў і пачалі ганяць мяч у двары. Нагуляўшыся, развіталіся і пайшлі дадому.

«Верш на памяць! — успомніў Дзімка. — Двойка ў канцы чвэрці сапсуе ўсе адзнакі. Трэба вучыць». Ён дастаў падручнік і пачаў чытаць верш.

А Косцік спакойна павячэраў і лёг спаць.

Назаўтра панурыя дружбакі крочылі ў школу. Размаўляць не хацелася. Кожны думаў пра сваё. У класе ўжо Косцік спытаў у Дзімкі:

— Верш не вывучыў?

— Не, — схлусіў Дзімка.

На ўроку Косцік сядзеў як на гарачым прыску. Сэрца сціскалася, калі Людміла Паўлаўна глядзела ў журнал, выбіраючы, каго выклікаць да дошкі.

— Верш прачытае Дзіма Жук, — сказала настаўніца.

Дзімка ўстаў і пайшоў да дошкі. Ён «шпарыў» верш і амаль не памыліўся.

— Добра, — пахваліла Людміла Паўлаўна. — Пастаўлю табе восем.

Аднак васьмёрка не цешыла Дзімку: ён адчуваў, што выглядае ў вачах сябра здраднікам.

А Косцік, як толькі Дзімка сеў побач, схапіў свой ранец, не дачакаўшыся званка, выбег з класа з вачыма, поўнымі слёз.

— Што здарылася, Дзіма? — спытала настаўніца. — Чаму Косця пайшоў з урока?

— Косцік мне не прабачыць, — апусціўшы галаву, прашаптаў Дзімка. — Я толькі што згубіў сябра.

— За што не прабачыць? — дапытвалася Людміла Паўлаўна.

І яна, і вучні здзіўлена пазіралі на Дзімку. Ніхто нічога не разумеў. Не разумеў і Дзімка, чаму ён так абышоўся з сябрам.

## Далонькі з пушынкамі

*Тамара Бунта*

Уладзік зайшоў на кухню і моўчкі сеў за стол. На кухні смачна пахла: бабуля пякла блінкі. Але Уладзік незадаволена нахмурыў бровы.

— Хочаш блінок? — спытала бабуля. — Для цябе пяку!

Яна стаяла каля пліты і не бачыла, што ўнук хмурыцца.

— Не хачу! — незадаволена адказаў Уладзік.

Бабуля зняла з патэльні апошні блінок і падышла да ўнука. Яна ласкава пагладзіла яго па галоўцы.

— Не трэба! — зноў незадаволена сказаў Уладзік і, матлянуўшы галавой, скінуў бабуліну руку.

— Чаму ж не трэба?.. — сказала бабуля, усміхаючыся. — Я ж цябе люблю…

Яна села побач на крэсла.

— Ну, што здарылася?

«Што здарылася, што здарылася?! — сярдзіта падумаў Уладзік. — Нічога не здарылася!» І праўда: нічога не здарылася. Яму проста стала сумна. Нядаўна ён хварэў, і таму пакуль сядзіць дома. Вось яму і сумна.

— А ты мяне любіш? — раптам спытала бабуля.

Уладзік, насупіўшыся, упарта маўчаў.

— Пагладзь мяне па руцэ, — папрасіла бабуля і паклала сваю руку на стол. — Калі ласка…

Уладзік сціснуў рукі ў кулачкі і схаваў іх за спінай.

— А-а, разумею… У цябе на далоньках, мусіць, выраслі злыя калючкі, і ты баішся мяне падрапаць? — сказала бабуля.

— Няма ў мяне ніякіх калючак! — запярэчыў Уладзік. Але неяк не надта ўпэўнена запярэчыў.

— Давай праверым! — прапанавала бабуля. — Ану, пакажы свае далонькі!

Уладзік трохі павагаўся, але ўсё ж такі дастаў рукі з-за спіны і расціснуў кулачкі. Яму і самому хацелася паглядзець, ці не выраслі на яго далонях калючкі ад таго, што ён чамусьці сярдуе на бабулю.

— Ура! — узрадавалася бабуля. — Аніякіх злых калючак у цябе няма, і ты можаш смела пагладзіць мяне па руцэ!

Яна сама ўзяла руку Уладзіка і правяла ёю па сваёй.

— Ды ў цябе далонькі не з калючкамі, а з пушынкамі! — усклікнула бабуля.

— І пушынак аніякіх у мяне няма! — сказаў Уладзік, але ўжо зусім не сярдзіта.

— Як гэта няма? — здзіўлена спытала бабуля. — А чаму ж тады твае далонькі такія пяшчотныя і ласкавыя?

Уладзік памаўчаў, а потым сказаў:

— Таму што я таксама цябе люблю.

# Мікіткаў сон

**(*Скарочана*)**

*Лідзія Арабей*

На вуліцы было надта горача. Сонца пякло, награваючы сцены дамоў, б'ючы ў шыбы і адсвечваючы ад іх новымі гарачымі промнямі. Было так млосна, што не хацелася гуляць ні ў якія гульні, і хлопчыкі ў двары сядзелі як асалавелыя.

І раптам Мікіта, які заўсёды быў здатны на выдумкі, зірнуў на ўсіх павесялела і крыкнуў:

— Давайце аблівацца вадою!

Хлопчыкі ўміг ажылі, ускочылі з лаўкі і пабеглі дахаты па бутэлькі. У іх налівалі ваду, у корках рабілі дзірачкі — і бутэлька-палівачка гатова. Дзеці не раз забаўляліся такім абліваннем, і цяпер, у гарачыню, хіба можна было прыдумаць забаву весялейшую?

Скора хлопчыкі бегалі па двары з тымі бутэлькамі і аблівалі адзін аднаго. Струмень трапляў то спераду, то ззаду, то з бакоў, і скора хлопчыкі былі мокрыя з ног да галавы. Больш не было горача, але дзеці абліваліся б, мусіць, да вечара, каб іх з дому не паклікалі абедаць.

Прыбег дадому і Мікітка. Бабка аж завохкала, убачыўшы такога мокрага ўнука, пачала яго выціраць, а потым пакарміла і загадала:

— Спаць! Пасля абеду — ціхі час!

Прывык Мікітка бабку слухацца. Спаць дык спаць. Лёг у свой ложак і ўміг заснуў.

І прыснілася яму, што бегаюць яны з хлопчыкамі па двары і вадою з бутэлек абліваюцца. І так ім весела, так хораша! І раптам — галасок, тоненькі, кволы. Не то скарга, не то песенька:

Не магу я з дзеткамі забаўляцца
І вадой з бутэлечкі абліваццa.
Прырасла я ножкаю да зямлі,
Можа б ты, Мікітка, мяне паліў...

Азірнуўся Мікітка ў сне і бачыць — кветачка, што расла ў іх агародчыку пад акном, апусціла галоўку, абвяла лісточкамі, сагнулася сцяблінкаю ледзь не да зямлі і плача, але плача без слёз. На слёзы вада патрэбна, а кветачка ні кроплі вады не мае, усю высушыла пякучае сонца.

І цікава ў сне Мікітку — няўжо кветачка ўмее спяваць, гаварыць? Хіба яна жывая?

А калі прачнуўся — адразу ў двор і пад акно, туды, дзе і праўда расла кветачка. Глядзіць — ну і дзіва! Зусім як у сне — абвяла кветачка, галоўку апусціла, лісточкі вісяць; толькі нічога не гаворыць кветачка, не спявае сваёй песенькі, маўчыць. А Мікіта ж помніць тую песеньку слова ў слова:

Не магу я з дзеткамі забаўляцца
І вадой з бутэлечкі абліваццa.
Прырасла я ножкаю да зямлі,
Можа б ты, Мікітка, мяне паліў...

Пабег Мікітка дадому, набраў поўную бутэльку вады і назад у двор. Нахіліўся да кветачкі і пачаў струменьчыкам ліць ваду пад яе ножку.

Кветачка прагна піла. Мікітка ліў, ліў, а яна ўсё ніяк не магла здаволіцца. Хутка бутэлька была пустая, і Мікітка пабег дадому, каб набраць яшчэ вады.

А калі з поўнаю бутэлькаю вярнуўся назад, то ўбачыў цуд. Сцяблінка выпрасталася, лісточкі падняліся ўгору, а вясёленькая кветка глядзела на Мікітку і ўсміхалася. Так, так. Усміхалася!

А тут мама з работы ідзе, прысела каля Мікіткі паглядзець — на што ён дзівіцца. Мікітка ў яе пытаецца:

— Мама, а хіба кветачка жывая?

— Канечне, жывая, — адказала мама.

## Каштанчык

*Галіна Пшонік*

Увосень на сумнай пустцы побач са школай дзеці пасадзілі каштаны. Саджанцы маладыя і тонкія, таму ўсю зіму дзеці перажывалі, ці не змерзнуць яны, ці прымуцца. І ўявіце сабе: вясной на ўсіх шасці дрэўцах з'явіліся вялікія, радасна-зялёныя лісточкі. Усе каштаны прыняліся! Пустка, дакладней, былая пустка стала вельмі ўтульным і вясёлым месцейкам.

Але праз некалькі дзён у вясёлым месцейку адбылося зусім невясёлае здарэнне. Нехта бяздушны, або бяздумны, або злы адламаў у самага крайняга дрэўца галінку. Астатнія каштаны абурана шапацелі сваімі ўзорыстымі лісточкамі і гучна спачувалі параненаму дрэўцу. А паранены

каштан зусім не хацеў выглядаць бездапаможным і жаласным. Ён хацеў быць прыгожым, моцным і шчаслівым. Нават без адной галіны.

І вось адной светлай майскай раніцай пяць каштанаў заўважылі на шостым, з адламанай галінкай, дрэўцы асляпляльна-прыгожую бела-ружовую кветку. Велічна і пяшчотна пазірала яна на іх амаль з самай вершаліны дрэўца. І хоць ні ў аднаго з пяці каштанаў такога дзівоснага ўпрыгажэння яшчэ не было, кожны з іх шчыра радаваўся за сябра. Усе, хто праходзіў побач, захапляліся цудоўнай кветкай і мужным дрэўцам. Прызнацца, каштану з адламанай галінкай гэта было надзвычай прыемна.

Але паступова бела-ружовыя танюткія пялёсткі, якія рабілі кветку такой асляпляльна-прыгожай, пачалі асыпацца, а потым і ўвогуле на іх месцы з'явіліся тры маленькія зялёныя шарыкі, спрэс у калючых іголках. Каштан спачатку засмуціўся. Аднак шарыкі былі такімі забаўнымі і смешнымі, што ўрэшце ён палюбіў іх.

Зноў надышла восень. Вецер усё часцей завітваў да дрэўцаў і аднойчы так расхістаў калючыя шарыкі, што яны адзін за адным адарваліся ад галінкі і ўпалі на зямлю. А самы вялікі з іх нават раскалоўся на дзве палавінкі. З іх выкаціўся вільготны карычневы каштанчык і адразу злавіў прамень ласкавага восеньскага сонейка.

— Які бліскучы, які цудоўны! — усклікнула дрэўца з адламанай галінкай.

І палюбіла яго гэтак жа моцна, як бела-ружовую кветку і зялёныя шарыкі. Каштанчык бестурботна ляжаў у сакавітай траве і грэўся на ласкавым сонейку.

У гэты час па дарожцы ішоў хлопчык. Менавіта ішоў, а не бег, як усе іншыя хлопчыкі, таму і паспеў заўважыць у траве бліскучы каштанчык. Падняў яго, задуменна разгледзеў і паклаў ў кішэню.

— Адчуваю, мой каштанчык трапіў у добрыя рукі, — супакоена зашапацела пажоўклай лістотай дрэўца.

Хлопчык дайшоў да бліжэйшай лавачкі, сеў на яе і цяжка ўздыхнуў.

— Хлопчык, ты сумны? — спытаў каштанчык.

— Я зусім сумны, — адказаў хлопчык.

— Чаму ж ты зусім сумны? — занепакоіўся каштанчык.

— Хутка ў нашым класе вялікае восеньскае свята. Усе будуць спяваць, танцаваць, расказваць вершы. А я вельмі дрэнна спяваю, ніколечкі не ўмею танцаваць і ў мяне не атрымліваецца расказваць вершы, — прызнаўся хлопчык. — І зноў мая мама засмуціцца і будзе шкадаваць мяне.

— Тады прыдумай і распавядзі на свяце казку! — прапанаваў каштанчык.

— Але казак у нас яшчэ ніхто ніколі не распавядаў, — засумняваўся хлопчык.

— Вось ты і будзеш першы! — не здаваўся каштанчык. — Я нават ведаю якую.

Пэўна, і вы, сябры, здагадаліся, пра што будзе тая казка. Ну, вядома ж, пра дрэўца з адламанай галінкай.

Хлопчык радасна сціснуў у руцэ каштанчык і шпарка пабег дамоў — запісваць казку.

## Дабрадзей для ўсіх дзяцей. Юні-Юні клапоціцца пра здароўе

*Уладзімір Ліпскі*

Летам, здаецца, спяваюць усе: птушкі і пчолы, дрэвы і травы, сонца і кветкі. Якое наўкол хараство!

Такой парой Вася Вясёлкін заўсёды збірае сваіх сяброў у дачным пасёлку Зялёная Гара. Адтуль амаль кожны дзень яны вандруюць па наваколлі, адпачываюць і робяць для сябе адкрыцці.

Тым днём у дарогу з юнымі краязнаўцамі адправіўся і Юні-Юні. З чыстага неба шчодра ліліся сонечныя промні. Нават гуллівы ветрык прылёг на лугавінах, каб пагрэцца і паслухаць спевы лета.

Спявалі і дзеці. Запяваламі ў іх былі Вася Вясёлкін і Юні-Юні. А хлопчык Толік весяліў усіх сваёй дудачкай:

Слухаць дудку прыляталі
Матылёчкі і жучкі.
А мы песню ім спявалі
Пад бярозай ля ракі…

Першы прыпынак вандроўнікі-краязнаўцы зрабілі каля невялікага азярца, зарослага чаротам, асакой, раскай. На мелкаводдзі Надзейка агледзела цэлую «хмарку» жабіных дзяцей — апалонікаў. Дзеці прыгаршчамі выцягвалі іх з вады і кідалі ў пустое вядзерца.

І раптам з вадзяной травы пачуўся хрыплы голас:

— К-ква-к-ква, што р-робіце?.. Э-эх, ква-ква — дзятва!..

Перакладчыкам жабінай мовы выступіў Юні-Юні:

— Ведайце, сябры, гаспадыня азярца Зялёная Жаба нагадвае вам, што яе дзеці маюць права на жыццё і ахову здароўя.

— Праўда, давайце не чапаць жабіных дзетак, — пагадзіўся Вася Вясёлкін. — Яны вырастуць і будуць карыснымі для прыроды, праспяваюць для нас сваю песню-квакалку.

Хлопчыкі і дзяўчынкі выпусцілі ў ваду чорных апалонікаў. А яны, у знак падзякі, павілялі ім доўгімі хвосцікамі.

У Зялёнай Дуброве вандроўнікаў чакаў сюрпрыз. Яны знайшлі сярод кустоў птушаня. Яно хавалася ў траве. А калі дзеці прыкмецілі яго і пачалі лавіць, то шэры пухнацік нават паспрабаваў уцекчы. Бег, куляўся, узлятаў. Толік дагнаў птушаня. Яно затрымцела ў яго руках. Калі ўсе падбеглі да лаўца, то згледзелі, што ў птушаняці паскубенае і падзюбанае правае крыльца.

— Нейкі злыдзень пасягнуў на здароўе і жыццё гэтага птушынага дзіцяткі, — з сумам заначыў Юні-Юні. — Птушачцы трэба тэрмінова дапамагчы.

— Мо хуткую машыну з Мінска выклічам? — прапанаваў Дзяніс.

— Ты што, хуткая ратуе толькі людзей, — патлумачыў Вася Вясёлкін. — Давайце самі станем медыкамі-выратавальнікамі для параненага.

У дарожнай аптэчцы вандроўнікі знайшлі вату, бінт, ёд, пластыр. Пачалі прыгадваць: каму, хто і як лячыў ранкі. Вася Вясёлкін узяўся лекаваць птушаня. Прамыў акрываўленае крыльца, працёр яго ваткай, апрацаваў ранкі ёдам. Увесь гэты час птушаня сядзела, заплюшчыўшы вочкі.

— О, яно пазірае на нас! — радасна ўсклікнуў Толік.

— Будзе жыць! — запэўніў Вася Вясёлкін.

— Павінна жыць, бо мы змагаліся за гэта, абаранілі яго права быць здаровым і мець медыцынскае абслугоўванне, — падсумаваў Юні-Юні і скіраваў свае ласкавыя, гаючыя промнікі на параненую птушачку.

Дзеці агледзелі наўкол усе арэхавыя кусты і знайшлі на адным з іх гняздо. Туды і падсадзілі параненага пацыента.

Тым днём сябры Васі Вясёлкіна трапілі ў сасновы лес. Знайшлі там цэлую паляну чарніц і ўдосталь наеліся сакавітых, лекавых ягад. У кожнага ад іх рот стаў чырвона-сінім, а рукі — чарнічнымі. Смяяліся адзін з аднаго, весяліліся. А гэта і ёсць прыкметы добрага здароўя.

Пад канец лета, калі на жытнёвае поле выйшаў камбайн, зялёнагорцы з Васем Вясёлкіным кінуліся паназіраць за ўборачнай машынай. Бегалі па ржышчы, прыветна махалі рукамі механізатару. Ды раптам з высокага жыта, перад самым матавілам камбайна, сігануў Русы Зай. Доўгія вушы ляжалі на яго спіне, а лапы ледзь краналіся зямлі. Заяц, здаецца, не бег, а крывой маланкай ляцеў па полі.

Камбайнер тармазнуў машыну, выскачыў з кабіны. Разам з дзецьмі ён знайшоў у жыце маленькае, кволае зайчаня. Яно не ўцякала: ці то вельмі напалохалася рокату і шуму, ці то не ўмела хутка бегаць. Дзядзька ўзяў за вушы русачка і перадаў Васю Вясёлкіну:

— Прымайце знаходку. Падкарміце, падгадуйце і абавязкова выпусціце ў лес.

Дзеці помнілі наказ Юні-Юні, што кожнае дзіця мае права на здароўе і жыццё, таму хорам адказалі:

— Мы так і зробім, дзядзечка!

Стракозы весела праляцелі над галовамі спагадлівых вандроўнікаў. Конікі ў травяным іржышчы пусціліся ў скокі. Сінія васількі ў жыце лагодна затрывалі галоўкамі. А дзеці заспявалі новую песню:

Сонца светлае, як мама,
У высокім небе стала,
Каб з шляхоў прасторных, вольных
Прывітаць наш край азёрны.

# Шчасце

*Янка Маўр*

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ як мага, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і ўсялякая зеляніна, што жыве навакол, дыхае, шамаціць і запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і мне. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскокваючы на адной назе.

Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць. Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. Я лагодна ўсміхаюся яму, ківаю галавой і кажу:

— Добра жыць на свеце, браток, га?

Тварык хлопчыка засвяціўся яшчэ больш, але ён нічога не сказаў.

Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык. Здавалася, што ён вось-вось нешта скажа.

Я яго разумеў. Але ён, відаць, гэтага не ведаў, бо ўсё глядзеў мне ў вочы, нібы чагосьці чакаючы ад мяне. Ён заліваў мяне сваім шчасцем, а я ў адказ нічога не мог яму даць. Мне трэба яму нешта сказаць. Але што? Што яму сказаць, каб перадаць усю тую цеплыню, якую я ад яго адчуваю?

— Як цябе зваць? — сказаў я нарэшце, каб толькі не маўчаць.

Хлопчык нічога мне не адказаў. Сваім дзіцячым інстынктам ён, відаць, зразумеў, што словы гэтыя сказаны так сабе, абы сказаць. Мала таго: твар яго перастаў свяціцца, нават неяк балюча скрывіўся. А потым... потым з грудзей яго вырваўся крык!.. Два словы толькі было ў гэтым крыку:

— Дзядзька!.. Шапка!..

Але гэтага было досыць, каб зразумець, хоць і са спазненнем, усю тую трагедыю, якая адбылася тут, на мосце, у гэты радасны летні дзень.

У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў, відаць, першы раз. Добрая шапка, шэрая, каляная. Яна ахапіла не толькі галаву хлопчыка, але ўсё цела і душу. Гэта ж праз яе сёння такі цудоўны дзень, а я гэтага не ведаў. І сонца так шчодра свеціць толькі дзеля таго, каб усе здалёк маглі бачыць шапку, а я не заўважыў яе і зблізку. Адзін усяго толькі крок заставалася зрабіць — і ўся сустрэча пайшла б прахам. Ці магла чулая дзіцячая душа сцярпець такую несправядлівасць, такое халоднае бяздушша? І яна не сцярпела...

Я адчуў сябе вельмі вінаватым і кінуўся выпраўляць сваю віну.

— Ах, якая цудоўная ў цябе шапка! — крыкнуў я.— Пакажы, пакажы!

Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю. Я зняў з яго галавы шапку. Яна сапраўды хрусцела, як бляшаная. Хлопчык глядзеў на мяне ўдзячнымі вачыма, бы на свайго збаўцу.

— Які казырок! І шнурок! І гузікі два! — стараўся я. — А падкладка якая цудоўная! Хто купіў?

— Мамка! — з гордасцю адказаў хлопчык. Несправядлівасць была выпраўлена.

І мы абодва, зноў шчаслівыя, разышліся кожны сваім шляхам.

## Пра хлопчыка «Ай»

*Уладзімір Ліпскі*

Жыў у нашым доме трэцякласнік Дзімка. Вельмі любіў ён слова «ай».

— Дзімка, збегай у магазін, купі хлеба, — просіць мама.

— Ай!

— Сынок, памажы памыць посуд.

— Ай!

— Абгарні падручнікі ў чыстую паперу. Вучы ўрокі.

— Ай! Ай! Ай!

Так яго і клікаць сталі: Дзімка-ай.

Аднойчы здарылася з Дзімкам бяда. Сабраўся ён у школу ісці, глядзіць — а партфель пусты. Зніклі ўсе яго падручнікі.

Дзімка спачатку ўзрадаваўся. «От добра, у школу не буду хадзіць. Урокі не трэба вучыць». Сноўдаўся з кута ў кут колькі часу…

Можа, пачытаць пра Карлсана, які жыве на даху? Але і гэтай кніжкі не знайшоў.

Засумаваў хлапчук. І чым далей, тым больш пачаў шкадаваць свае кнігі. Нецікава зрабілася яму жыць на свеце.

— Мама, чаму ад мяне кнігі ўцяклі? Мне так блага без іх, — скардзіцца малы.

— Не шанаваў ты іх, не любіў, — адказала мама і ўздыхнула.

І надумаўся Дзімка свае кнігі адшукаць. Але дзе іх шукаць? Пайшоў куды вочы глядзяць... Ішоў, ішоў, аж насустрач — бабуля. Села з ім разам адпачываць у цянёк. І расказаў ёй Дзімка пра сваю бяду.

— Дапамагу я табе, — сказала бабуля. — Але больш ніколі-ніколі не крыўдзі кнігі.

Развязала яна сваю торбачку, выняла клубок нітак.

— Вось вазьмі! Гэта чароўны клубок. Куды ён пакоціцца, туды ідзі за ім. І не палохайся нічога...

Падзякаваў Дзімка бабулі, апусціў клубок на зямлю і пабег услед.

Як толькі раскруціўся ўвесь клубок, Дзімка глянуў, а перад ім — прыгожы размаляваны домік, падобны на вялізны «Буквар». Ёсць і вокны, і дзверы.

Падышоў Дзімка да дзвярэй і ціхенька пастукаў.

— Заходзьце, заходзьце, — пачуў ён ветлівы голас. — Мае дзверы адчынены заўсёды. Калі ласка, заходзьце...

Увайшоў Дзімка ў домік, а там поўна ўсялякіх кніг. Невялічкі чалавечак з сівой барадой гартаў самую тоўстую.

— Добры дзень, хлопчык, — прыветна сустрэў ён Дзімку.

— Д-дзень д-добры, — чамусьці пачаў заікацца Дзімка і пачырванеў.

— Што цябе прывяло да мяне? Чым ты ўсхваляваны? — пацікавіўся гаспадар.

— Мае кнігі некуды зніклі. Я іх шукаю.

— Не бядуй, хлопчык, — уважліва паглядзеў на Дзімку дзядуля. — Знойдзем мы тваю прапажу. Толькі раней дапамажы мне паставіць вось гэтыя кнігі ў шафу.

Дзімка зірнуў на вялізную гару кніг і хацеў, як звычайна сказаць «Ай!», але падумаў і згадзіўся.

— Тады за працу! — падахвоціў яго стары.

Сонейка зайшло — яны працуюць... Нарэшце ўсё зрабілі.

Гаспадар пагладзіў сваю бараду, ласкава ўсміхнуўся:

— Малайчына, хлопчык! Добра папрацаваў. За гэта і я табе дапамагу. Ідзі дадому. Твае кніжкі ўжо там. Чакаюць цябе.

— Як жа я цяпер знайду свой дом? — захваляваўся Дзімка.

— Не спяшайся, усё будзе ў свой час... Вось табе чароўны каменьчык. Кінь яго цераз правае плячо і назаві ўсе кніжкі, якія ад цябе ўцяклі...

Не паспеў Дзімка назваць апошнюю, як апынуўся дома. На пісьмовым стале ляжалі ўсе ягоныя кнігі.

І я там быў і на свае вочы бачыў: Дзімка цяпер кнігі шануе, урокі вучыць старанна. А слова «ай» забыў зусім.

## Саўка за сталом

*Эдзі Агняцвет*

Ляжаць ля талеркі відэлец і нож.
Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.
— Ну і што ж?
Ляжаць — хай ляжаць, іх не буду чапаць.
Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.

З талеркі ён сёрбае крупнік — ой-ой!
Кавалачак мяса хапае рукой.
Ён з пальцамі лезе ў гарачы кампот,
Абрусам ён выцер і шчокі і рот.

Пасля на талерку падручнік паклаў —
І кнігу карміў ён аб'едкамі страў...

Відэлец не ўцерпеў:
— За цэлы мой век
Мне трапіўся першы такі чалавек!

Ускочыла лыжка і ну рагатаць:
— Хі-хі, ха-ха-ха, ён дурненькі, відаць!

А нож узлаваўся і тупнуў нагой:
— Давайце паслужым мы справе другой!
Пакінем яго аднаго за сталом,
А самі запішамся ў ме-та-ла-лом!

Саскочылі разам яны са стала —
Ніякая сіла спыніць не магла.
Відэлец, і лыжка, і нож — ля дзвярэй.
Збянтэжыўся Саўка:
— Чакайце, э-гей!

А тыя ляцяць, азірнуцца не хочуць.
— Хі-хі, ха-ха-ха! —
Толькі лыжкі рагочуць.
Бяжыць недарэка з пустымі рукамі...
Чым скончыцца ўсё?
Вы прыдумайце самі.

## Грамацеі

*Эдзі Агняцвет*

Саня — першы грамацей,
А за ім ідзе Мацей.
Саня піша:
«Роўна ў восім
На футбол з'евіцьца просім».
— Непісьменная аб'ява,
Класу нашаму — няслава!
Раззлаваўся грамацей.
Перапісвае Мацей:
«У нідзелю роўна ў восям
На футбол з'явіца просям».
— І куды вы ўсе глядзелі?
Не ў «нідзелю»,
А ў «недзелю», —
Хомка — трэці грамацей —
Напісаў яшчэ працей.
Цэлы стос паперы чыстай
Сапсавалі футбалісты...

## Савось-распуснік

*Якуб Колас*

### I

Вось што, дзеткі, мае краскі:
Што хадзіць за многа міль?
Можа лепей замест казкі
Расказаць вам адну быль?
    Згодны?
    Добра.
    Ну дык вось:
Зваўся хлопчык наш Савось.
Ой, і быў жа ён дураслівы!
У сад лазіў па грушы, па слівы,
Дзіркі ўградах рабіў —
Моркву вырваць любіў
І маку ён скручваў галоўкі, —
Ну, на гэта быў страх які лоўкі!
    А рукі ў яго не мыты,
    А сам ён сярдзіты,
    Такі задзірака,
    Такі забіяка,
    Буян,
    Грубіян.
Зачэпіць старога,
Пакрыўдзіць малога, —
Такі ўжо нягоднік,
Ды гэтакі шкоднік!
Бегаў загуменнямі,
Кідаўся каменнямі,
Пападаў у шыбы, —
Хоць гані з сялібы!

Меў на зло смякалку, —
Зніме з вежы галку,
І такі гарачка,
Няхай яго качкі!

## II

У Савосева суседа
Быў пярэсценькі каток,
Выхаванец Паўла-дзеда,
Такі слаўны пестунок!
Нос чарнявы,
Хвост бялявы,
Задзірасценькі;
Кіпцік-шчыпчык
Заграбасценькі;
Лапкі-драпкі
Машастовыя,
А шарсцінaчкі
Шаўковыя;
Губкі, зубкі
Адмысловыя;
Вусы-русы
Патырчастыя;
Тая спінка,
Як націнка,
Выгінастая.
Вушкі-слушкі
Не мыляюцца,
Вочкі ў ночку
Запаляюцца.
Ну, такі каток харошы,
Як драпянка за тры грошы!

Хадзіў коцік пад масток,
Лавіў рыбку за хвасток,
Потым дзеду ён на печы
Казкі-байкі варкаваў,
Белым хвосцікам дарэчы
Тахты спевам адбіваў.
Коцік з дзедам жыў у згодзе,
Не сварыліся за печ.
Быў раз коцік на паходзе —
На мышэй падняў ён меч!
Шоў каток з паходу,
Разагнаўшы мышак,
І сеў на калоду
Пад стрэшку ў зацішак.
Грэе сабе спінку,
Мордачку і лапкі.
Зірк — Савось з будынку
Выскачыў без шапкі!
За Савосем — Рудзька.
— Кусіката, цюцька!
Коцік бедны ўвесь жахнуўся,
Ды на шчасце быў тут плот,
А пры плоце дуб, — і кот
Толькі фыркнуў, мільгануўся
І на дубе апынуўся.
Сеў каток
На дубок,
Кажа забіякам:
— Эх, Савось, шалапай!
Ты мяне не чапай
І не цкуй сабакам!

Не ўдалося Савосю
Катка падкусіць
І прыйшлося Антося
На помач прасіць.

### III

Вось Савось
І Антось
Сталіся дружакі.
Каля клуні стаяць,
На ліхое таяць,
Закідаюць знакі,
Як злавіць ім катка
І аддаць з малатка
Рудзьку на расправу.
Падшывальцы ж яны,
І іх розум дурны
Выдумаў забаву!
А па тэй нарадзе
Саўка торбу крадзе,
Анцік — хлеб сабаку.
А каток на печы
Сеў, як той старэчы,
Яму і не ў знаку.

Эх, пярэсценькі каток!
Сцеражыся ты, браток!
Не хадзі ты па надворку,
Не хадзі гуляць на горку —
Там бяда цябе чакае,
Сам не ведаеш якая.

Асцярожненька хадзі,
За Савосем ты глядзі,
Бо Савось замысліў штось,
Нездарма з ім і Антось.

Затаіўся ў кутку
Наш Савось і катку
Замаўляе зубы
Для кацінай згубы:
«Ах ты, коцічак мой!
Які файны ты, ой!
Што за спіначка!
Ну, карціначка!
Ідзі, коцік, да мяне,
Не пакрыўджу цябе, не!
А якія вочкі!
Бачаць сярод ночкі.
А якія лапкі!
Ды як яны цапкі!
Ах ты, мой каточак,
Чорненькі насочак!
Ідзі ж, коцік, да мяне:
Не пакрыўджу цябе, не».

Яўкнуў коцік, выгнуў спінку,
Хвост падняў, як корбу,
Але ў тую жа хвілінку —
Шусь каток у торбу!

**IV**

І катка панеслі ў поле,
А там чыста — ні кусточка,
Ні хвілінкі, ні дубочка,

Адны межачкі ды ролі.
Няма дзе катку схавацца:
Чуць сінее лес далёкі,
І сяло за тры валокі, —
Як катку там ратавацца?

Плача ў торбе коцік, плача:
— Мяў, мне душна!
— Мяў, мне цесна!
Б'ецца сэрцайка балесна,
Бо мне грозіць смерць, няйнача!
Кот бурчыць і гурчыць,
Лапамі дзярэцца,
А Савось хоць бы што —
Цешыцца, смяецца.
— Ну, спыніся, Антось,
Падзяржы сабаку:
Толькі выпушчу ката,
Цкуй тады ў атаку.
Адышоўся Савось,
Анцік прытаіўся,
І тут коціку астрог
Раптам адчыніўся.
З торбы выскачыў, прысеў —
Трэба ж разглядзецца.
Зірк — там Рудзька! Што рабіць?
Дзе яму падзецца?
— Цкуй! Пускай! — крычыць Савось.
— Кусі ката, Рудзька!..
Ша! чаго ж так закрычаў
Наш Савось нялюдска?
Глянуў Анцік — вось дзівота!
Вось дзе ліха, вось бяда!

Што зрабіла ім дурота
І што сталася з ката!
Вось папаліся дзе змоўцы —
Проста шкода малышоў:
На Савосевай галоўцы
Коцік схованку знайшоў!
Лямантуе бедны Саўка,
Ашалелы, чуць жывы:
Кот упіўся, ну, як п'яўка,
І не знімеш з галавы!
Запусціў кіпцюр у скуру
Аж да самае касці.
Скача Саўка з таго дуру
Ды крычыць: «Пусці! Пусці!»
Рудзька круціцца навокал,
Брэша, цапае катка.
Ай, Савоська, ты мой сокал!
Справа дрэнна і брыдка!

Ой, нагараваліся,
Ой, бяды набраліся
Хлопцы з тым катом!
З поля як вярталіся,
Людзі з іх смяяліся,
Ды дружна, гуртом.

Шоў Антось уперадзе,
Рудзьку вёў на прывязі,
Пазіраў уніз,
А Савось наводшыбе,
На галоўцы з коцікам,
Шэпчучы: «Кіс-кіс!»
І хоць ён не піянер,
А чырвоны меў каўнер.

## ЗАГАДКІ

*Іван Стадольнік*

### Пра Ігнатку

Мама кажа раз Ігнатку:
— Падмяці, сыночак, хатку.
А Ігнат ураз надзьмууся,
Падмятаць і не кранууся.
Ён ад кніг адводзіць вочы,
Пагуляць заўжды ахвочы.
Падкажы нам, адгадай:
Хто такі Ігнат?..

### Пра Натку

Добра вучыцца дзяўчынка,
Памагае дома шчыра
Маме і сябрам таксама.
Натку вельмі хваліць мама.
Хто яна?
Мо чараўніца?
Не, дзяўчынка — ...

## Дарога

*Васіль Ткачоў*

Максімка з татам сабраліся ў суседнюю вёску — праведаць бабулю з дзядулем. Купілі гасцінцаў і раніцай пакрочылі на аўтобусны прыпынак. Селі на лаву, чакаюць. Аўтобуса ўсё няма. Можа, зламаўся? Тата, пачакаўшы трохі, прапанаваў:

— А давай, Максім, пехам пойдзем. Што нам той аўтобус!

Хлопчык насупіўся:

— Я пехам не хачу. Гэта ж няблізка. Ды і навошта тады аўтобус прыдумалі?

— Бачыш: няма яго, аўтобуса, — развёў рукамі тата.

— Лепш пачакаем, — Максімка, седзячы на лаве, боўтаў нагамі. — А то пойдзем, а ён нас дагоніць. Тады крыўдна будзе. Ішлі, ішлі, і ўсё дарэмна...

Тата не стаў пярэчыць. Сядзяць, чакаюць. І размаўляць быццам няма пра што. Усё ж тата не вытрымаў, першы ўзняўся з лавы:

— Аўтобуса, відаць, сёння не будзе. Але ж ты лянуешся ісці да дзядулі з бабуляй, то заставайся дома, а я пайду адзін. Добра?

— Не, хадзем, тата, разам, — пагадзіўся хлопчык і хуценька ўскочыў з лавы: ён ужо засумаваў па бабулі з дзядулем.

Сын і бацька, узяўшыся за рукі, крочылі па дарозе, а яна шэрай стужкай бегла і бегла наперад. Свяціла сонейка, твары абвяваў свежы ветрык, а ў небе пырхаў жаўрук і, здавалася, радуючыся людзям, пасылаў ім з неба сваю песню.

— Гэта ён нас хваліць, што пешшу ідзём, — заўважыў тата.

Максімка памахаў жаўруку і гучна сказаў:

— Дзякуй табе, птушачка!

Прайшлі яшчэ трохі полем, і дарога нырнула ў лес. Тата запаволіў хаду, паглядзеў на сына:

— Чуеш? Гэта дзяцел тукае: тук-тук-тук! А чаму ён так тукае, ведаеш?

Максімка паціснуў плячыма:

— Забаўляецца, мусіць?

— Не, сынку: гэта ён корм сабе і сваім дзеткам здабывае. Пад карой у старых дрэў шмат розных казюрак жыве, вось ён і дастае іх. Працавітая птушка дзяцел. Ён не толькі корм здабывае — і лес ратуе ад розных караедаў.

Перад крынічкай спыніліся, напіліся халоднай, як лёд, вады. Крышачку адпачылі і пайшлі далей.

— А вунь, бачыш, ямы, — паказаў тата на акопы, што зараслі ўжо густым кустоўем. — Іх нашы салдаты ў вайну капалі, калі займалі тут абарону, каб вораг не прайшоў у нашу вёску.

— І не пусцілі? — зацікавіўся Максімка.

— І не пусцілі, — упэўнена сказаў тата. — Бачыш, наша вёска жыве... А маглі б і спаліць яе немцы. Тады і мы не жылі б тут. Трэба дзякуй сказаць салдатам.

Хлопчык ледзь чутна прашаптаў:

— Дзякуй... — і падаў тату руку: з ім нястрашна.

А потым закукавала зязюля: «Ку-ку! Ку-ку! Ку-ку!» Тата папрасіў Максімку, каб той лічыў, колькі разоў пракукуе птушка. Максімка лічыў, лічыў... і збіўся.

— Ну, і колькі ж? — спытаў тата.

Хлопчык развёў рукамі, а потым знайшоўся:

— Багата разоў!

Тата ўсміхнуўся:

— Значыць, у нас з табой наперадзе яшчэ ўсё жыццё. Калі зязюля накукавала нам шмат гадоў.

Амаль каля самай дарогі яны ўбачылі сунічную палянку. Ягад было столькі, што яны і самі наеліся, і для бабулі з дзядулем назбіралі.

Перад самай вёскай Максімку з татам дагнаў аўтобус. Шафёр прытармазіў, вызірнуў з акенца і кіўнуў галавой: «Залазьце, пешаходы!»

— Дзякуй, мы ўжо прыйшлі, — адказаў яму тата.

— Матор закапрызіў, — быццам апраўдваўся шафёр перад хлопчыкам і ягоным татам. — Давялося падлячыць яго. Спазняцца больш не будзем.

І націснуў на газ. Але Максімка зусім не шкадаваў, што пешшу прыйшоў да бабулі з дзядулем. Якая, аказваецца, цікавая гэтая дарога!

# Дабру вучыся змалку

## Добрае сэрца

*Георгій Марчук*

Здарылася бяда. Маленькае варанятка ўпершыню ўскараскалася на край гнязда, але нечакана наляцеў парывісты вецер, і птушаня не ўтрымалася, звалілася ўніз. Падаючы, пабіла лапку і параніла крыльца. Перапалохаўшыся, забылася нават паклікаць на дапамогу сваю маму-варону, якая шукала корм побач, у двары дзевяціпавярховага дома. Кульгаючы на правую лапку, варанятка схавалася ў траве. І тут заўважыла, што з дзіцячага садка да яго кіруецца чорна-белы кот. Варанятка скеміла: трэба ўцякаць ад гэтага ліха. Дрыжучы ад страху, зашылася ў густы куст і вырашыла чакаць сваю маму.

Два хлапчукі, якія кідаліся камячкамі зямлі, заўважылі варанятка. Адшукалі дубчыкі і пачалі праганяць птушаня з куста. Але яно трымалася мужна і не пакінула свайго часовага сховішча. Хлапчукам надакучыла палохаць варанятка, і яны ўцяклі. Тут яго і знайшла маці-варона. Пакарміла, строга загадала не вылазіць з куста, а сама села на дрэва і ўсю ноч не заплюшчыла вачэй, пільнуючы варанятка.

Раніцай нейкі дзядзька вывеў на прагулку свайго сабаку. Сабака гойсаў па пляцоўцы без павадка і на ўсіх брахаў. Варанятка стаілася, але гаспадар сабакі заўважыў яго, пачаў цкаваць: «Хапай яго, Пірат! Кусай!» Да сына адразу ж прыляцела маці-варона. Яна бараніла яго з апошніх сіл. У доме насупраць каля акна сядзела бабулька, да слёз пераживала за варанятка і яго маці-варону. Але дапамагчы не магла: яна была вельмі старэнькая і ўжо не выходзіла на вуліцу. Бабулька слабенькай рукой стукала па шыбе алоўкам, спадзеючыся хоць так суняць раз'юшанага сабаку. Тады варанятка вырашыла само дапамагчы маці. Выбралася з куста, узмахнула крыльцамі і — дзіва! — узляцела на самую нізкую галінку бярозы. Імгненна побач з ім апынулася і стомленая маці-варона. Злы сабака ўжо не мог да іх дацягнуцца, а толькі хрыпла, з пенай на іклах, брахаў унізе. Варанятка моцна трымалася лапкамі за галінку.

— Патрывай яшчэ, сынок, — прасіла маці. — Набярэшся сілы, і мы ўзляцім вышэй...

Другую ноч варанятка спала ўжо побач з мамай, тулячыся да яе цёплага крыла. Раніцай з дома насупраць выбег хлопчык. Убачыў іх, пачаў цэліць з рагаткі. Маці-варона гучна каркала, нібы сарамаціла хлопчыка. Але ён не зважаў на яе крык, выбіраў для рагаткі буйнейшыя каменьчыкі. Адзін каменьчык балюча даў па лапцы, і варанятка рызыкнула ўзляцець. Ура-а! Атрымалася! Вецер падхапіў яго, і яны разам з мамай

узляцелі высока-высока, на самы дах дома. Варанятка села на краёчак і глянула ўніз. Адсюль, зверху, дзядзькі і цёткі, сабака, хлопчык з рагаткай здаваліся ўжо не такімі вялікімі і страшнымі.

Да іх падляцеў дзядуля — стары аднавокі крумкач. Ён прынёс у дзюбе камень і сказаў варанятку:

— Вазьмі камень і кінь на сваіх крыўдзіцеляў. Яны некалі мне, маломý, вока выбілі. І цябе ледзьве не загубілі.

Варанятка ўзяло камень у дзюбу і наважылася кінуць. Потым паглядзела на маці. Тая маўчала. Тады варанятка адклала камень убок і сказала:

— Не, не магу кінуць. Мне іх шкада. Яны не ўмеюць лятаць, як мы.

— Яны злосныя і жорсткія, — даводзіў дзядуля-крумкач.

— Можа, зробяцца дабрэйшымі, — адказала варанятка. — Няхай жывуць!

Маці абняла варанятка крылом і ласкава сказала:

— Ты будзеш шчаслівым, сынок, таму што ў цябе добрае сэрца.

## Выратаванне ластаўкі

**(*Урывак з аповесці «Арцёмкавы канікулы»*)**

*Зіновій Прыгодзіч*

Была нядзеля. На дачы ў гэты дзень нічога не рабілі: бабуля не палола грады, дзядуля не браўся за свае інструменты. Арцёмку ж сядзець

і нічым не займацца сумна. Таму ён падышоў да дзядулі і прапанаваў з'ездзіць паназіраць за ластаўкамі-беражанкамі. Дзед ахвотна падтрымаў унука. Яны асядлалі веласіпеды і пакацілі. Джэк, як заўсёды, дробненька перабіраючы лапкамі, бег наперадзе.

Пад'язджаючы да азярца, Арцёмка і дзядуля яшчэ здалёк убачылі, што там адбывалася нешта незвычайнае. Вялікая чарада ластавак кружыла на адным месцы і шумна, трывожна крычала.

— Што гэта з імі? — запытальна паглядзеў на дзядулю Арцёмка.

— А хто яго ведае… Вось зараз пад'едзем бліжэй — убачым.

Аказалася, птушкі кружылі не над вадаёмам, а над вялікай чорнай лужынай смалы.

— Дзядуля, дзядуля! — усхваляваны Арцёмка паказаў рукою на лужыну. — Там ластаўка!..

Дзед прыгледзеўся — і праўда: бедная птушка завязла кіпцікамі ў смале, біла адчайна крылцамі, стараючыся вырвацца з гібельнага палону, але гэта ёй не ўдавалася.

— Ай-яй-яй… — забедаваў дзядуля. — Трэба ластаўку тэрмінова ратаваць, інакш смала яе засмокча.

На шчасце, паблізу ляжала шырокая дошка. Дзед Жэня падняў яе і адным канцом паклаў на смаляную лужыну, бліжэй да птушкі. Хуценька, пакуль дошку не засмактала, падышоў да ластаўкі і асцярожна, каб не пашкодзіць лапкі,

вызваліў яе са смалы. Худзенькае цельца птушкі дробна дрыжэла ад перажытага страху.

— Не бойся, мая харошая, — гладзіў ластаўку па галоўцы расчулены Арцёмка. — Мы цябе не пакрыўдзім. Не бойся...

Ластаўка ў цёплых дзядулевых далонях паціху супакойвалася. Але ж адпускаць яе пакуль нельга: на лапках наліплі камякі смалы.

— Арцёмка, схадзі да веласіпедаў, там на маім багажніку, у пакеце, ёсць палатняная сурвэтка. Прынясі яе хуценька сюды.

Пачалі выціраць смалу сурвэткай. Ластаўка зноў устрывожылася, затузалася — відаць, ёй было балюча. Тады дзед Жэня і Арцёмка сталі сваім дыханнем грэць смалу, каб яна лягчэй выціралася з лапак. І гэта ім, здаецца, удалося, бо птушка зноў супакоілася.

— Ну вось і ўсё, — з палёгкай сказаў дзядуля, прыдзірліва аглядаючы сцішаную ластаўку. — Канечне, добра было б яе лапкі прамыць яшчэ бензінам, але, думаю, рэшткі гэтай смалы не будуць перашкодай.

Дзед Жэня выцягнуў руку перад сабою і раскрыў далонь:

— Ну што, гаротніца, ляці!

Ластаўка нейкае імгненне яшчэ пасядзела на далоні, нібы не верачы сваёй волі, а потым узмахнула крыламі і рэзка набрала вышыню.

Чарада птушак, якія ўвесь гэты час устрывожана кружылі над імі, радасна кінулася следам за выратаванай ластаўкай.

# Як Агапка мальвы ўратавала

*Георгій Марчук*

Быў май. Дзесяцігадовая кірпатая, з доўгай густой касой дзяўчынка Агапка гасцявала ў сваіх дзядулі і бабулі. Агапкавы бацькі — смелыя і шчырыя людзі. Яны працавалі выратавальнікамі і таму накіраваліся ў далёкую краіну Грэцыю, каб гасіць лясныя пажары. Агапка любіла вёску і ёй там было цікава. А яшчэ ва ўтульным доме бабулі і дзядулі была печка, у якой бабуля рабіла смачныя бліны і варыла прасяную кашу. А яшчэ бабуля навучыла Агапку даіць казу Марфу.

Часцяком да іх увечары прыходзіў суседскі кот Фокус, каб пачаставацца малаком. У Фокуса была гаспадыня — адзінокая старая, якая чытала газету, трымаючы ў руках вялізную лупу. Яны не мелі ні каровы, ні казы, ні качак, ні гусей. Кот меў здольнасць дэманстраваць розныя фокусы, таму і мянушку яму далі — Фокус. Скокне, здаралася, на вакно, а праз імгненне вылезе ўжо праз комін на страху. Ці вытыркне праз шчыліну ў плоце свой шыкоўны хвост і пачынае ім круціць, палохаць галубоў ды вераб'ёў. Меў Фокус адну незвычайную мару: трапіць у той горад, дзе жыве Агапка. Ён жа далей за сваю вёску нідзе не быў. Нават на другі канец адной-адзінай вуліцы не хадзіў — баяўся. Там жыў пануры і заўсёды ўсім незадаволены былы вартаўнік малочнай фермы Пілiп Барабанадуля.

У двары ягонага дома бегаў на дліннным ланцугу гэткі ж злосны, як і гаспадар, сабака Пірат. Барабанадуля нават не вітаўся з Агапкавымі бабуляй і дзядулем, калі ехаў на ровары паўз іхні дом. Ён майстраваў клеткі для птушак, прылады розныя, каб лавіць мышэй ці птушак і вазіў іх на кірмаш — прадаваў. Ён быў малы, заўсёды насіў чорны капялюш. Востры нос, як у каршуна дзюба, ды густыя чорныя вусы рабілі яго яшчэ больш панурым і насцярожаным. «Мне не зманіш. Старога вераб'я на мякіне не ашукаеш. Я вас усіх добра ведаю», — заўсёды казаў ён адно і тое, калі сустракаў людзей. Ён і Пірата свайго амаль не карміў, каб той быў зусім злосны.

Агапкаў дзядуля быў мастаком. Ён маляваў гэткія прыгожыя кветкі, што проста дзіва. Усе нібыта жывыя — і півоні, і гладыёлусы, і браткі, і лілеі. Проста вачэй не адвесці ад яго карцін, прыгажосць такая. Не было на дзядулевых карцінах толькі адной кветкі — мальвы. Адна на ўсю вёску мальва расла як раз пад плотам Барабанадулі. Ды вось гора, не мог дзядуля выправіцца ў такі далёкі шлях: цяжкая хвароба не дазваляла. З цяжкасцю ён соваўся па хаце ды часам у цёплы сонечны дзень выходзіў на падворак, каб пакарміць з рукі куры. Агапка ведала, што дзядуля хоча намаляваць мальву, бо кветка гэты была для яго дарагая — яе вельмі любіла яго мама.

Прачула аднойчы Агапка — кот Фокус цішком паведаміў — што Барабанадуля намерыў-

ся новы плот вакол сваёй сядзібы майстраваць і ўжо прывёз першую партыю жалезабетонных слупоў. Агапка адважылася, наблізілася да Піліпавай сядзібы. Пірат гучна забрахаў на ўсю ваколіцу, пагрозліва выставіў іклы, тузаў ланцуг, скакаў ля плота. Агапка змеціла, што жалезабетонны слуп амаль прыціснуў мальву, якая добра расла, выкінула ўжо зялёныя лісцікі.

Тады і вырашыла Агапка ўратаваць мальву: выкапаць яе таемна і пасадзіць ля свайго дома. «Гэта будзе падарунак да дня нараджэння дзядулі», — падумала яна. Агапка разумела, што адна яна гэтага не зробіць і ўгаварыла ката Фокуса дапамагчы.

Дачакаліся яны, калі Барабанадуля зноў паехаў па слупы і хуценька накіраваліся да сядзібы панурага суседа. Скокнуў Фокус на падворак з боку сада і пачаў надакучліва мяўкаць. Пірат, як ракета, адразу ж кінуўся да парушальніка мяжы. Гэтага і чакала Агапка. Яна хуценька пачала выкопваць мальву. Карані кветкі былі глыбока пад зямлёй, і дзяўчынка з цяжкасцю выцягвала іх.

А тым часам, шалеючы ад злосці, Пірат лавіў Фокуса. Трэба сказаць, што Фокус ужо добра-такі стаміўся і не на жарт спалохаўся, бо Пірата падчас сваёй адсутнасці гаспадар здымаў з ланцуга, і сабака бегаў, дзе хацеў. Фокус трымаўся з апошніх сіл. Плот быў невысокі, Пірат падскокваў і жахлівыя сківіцы сабакі ляскалі ля самага Фокусавага вуха.

Прывёз Барабанадуля слупы для плота і выгрузіў іх акурат на тое месца, дзе расла мальва. Не жыць бы ёй, калі б не Агапка. Фокус схаваўся ў гумне, залізваючы рану. Агапка адшукала яго, падзякавала за смеласць.

Вярнуўся кот на вёску і яшчэ доўга расказваў сваёй гаспадыні пра падарожжа ў сталіцу, пра новыя прыгожыя будынкі, пра выставу. У сярэдзіне лета расквітнелі вялікія цёмна-малінавыя кветкі мальвы, на прыгажосць якой дзівіліся і бабуля з дзядулем, і Агапка з бацькамі, і Фокус са сваёй гаспадыняй, якая прыйшла як заўсёды з лупай, каб лепей бачыць прыгажосць мальвы. І ўсім было добра і хораша ад прыгажосці свету.

## Яблычак

*Мікола Янчанка*

Ідзе па вуліцы хлопчык.

А я следам іду.

Хлопчык падскакам, падбегам.

Я таксама хутчэй пайшоў.

Хлопчык спявае сваю на хаду складзеную песеньку:

На галіне грушкі
Заспявалі птушкі —
Нам спяваюць,
Нас вітаюць
Птушкі-весялушкі.

І першым маім жаданнем было падхапіць гэтую песеньку, якая так адпавядала майму

ранішняму настрою. Аднак перадумаў. Людзі скажуць: «Вось дзівак. А яшчэ дарослы чалавек».

А хлопчык спявае. Падскоквае. І не толькі спявае ды падскоквае...

Жанчына кошыкі на рынак на калёсіках вязе. Дапамагу, думаю.

А хлопчык ужо ўплёўся ў ручкі і так піхае калёсікі, што гаспадыня адстае.

Вось і паварот на рынак.

— Дзякую, дзетка! — гаворыць жанчына. — З горачкі калёсікі самі скоцяцца. А за работу вось табе, — яна адхінула на кошыку хусцінку і падала хлопчыку залацісты яблычак.

Хлопчык хацеў пакаштаваць яго, ды, відаць, парашыў болей пацешыцца. І прыпусціў далей, падкідваючы і ловячы на хаду залацісты яблычак.

Але раптам спыніўся: малы плача на ўсю вуліцу. У сад не хоча ісці. Маці не ведае, што з ім рабіць.

А хлопчык да малога:

— Паглядзі-ка, што ў мяне. Не бачыш?

Малы перастаў плакаць, выцер вочы.

— Цяпер бачыш? Яблычак! Ды які яблычак! Залацісты! На! Бяжы хутчэй у сад ды сябрам пакажы.

І куды слёзы дзеліся! Малы ўперадзе маці ў сад пабег.

І зноў подскакам, подбегам, са сваёй песенькай ідзе па вуліцы хлопчык.

## Пухнацік

*Аляксей Дудараў*

Ён нарадзіўся свежым ранкам у глыбокай горнай цясніне. Там, сярод цяжкіх валуноў, бруілася імклівая і неспакойная рачулка. Яе халодная вада так білася аб каменне, што драбнюткія пыркі высока ляцелі ўгору, кружыліся ў паветры і павольна асядалі… З гэтых пырскаў ён і нарадзіўся. Бялюткі, кучаравы, з тоўстымі шчочкамі… Толькі з'явіўся на свет і адразу ж адчуў, што ўмее лятаць.

І ён паляцеў хутчэй прэч са змрочнай цясніны ўгору, да блакітнага неба і яснага сонца. Ляцеў, ляцеў, аж раптам бачыць, што над цяснінай вісіць нехта вялізны і сівы. Вісіць нерухома, быццам дрэмле… Падплыў, прывітаўся:

— Добрай раніцы, дзядзечка волат!

Той расплюшчыў старэчыя вочы і адказвае:

— Добрай раніцы… Толькі я не волат. Я — стары дзед Туман.

— А я яшчэ не ведаю, хто я і як мяне завуць… Толькі-толькі нарадзіўся… Ля рэчкі…

— Ты маленькае воблачка, — сказаў дзядуля Туман. — А завуць — Пухнацік.

— Я лятаць ужо ўмею, — пахваліўся Пухнацік. — Як нарадзіўся, так і паляцеў адразу… Вось як!

— Усе воблачкі лятаюць, — паблажліва ўсміхнуўся дзядуля Туман. — Яны ўвесь час падарожнічаюць па небе.

— Па небе?! — усклікнуў Пухнацік. — І я таксама буду?

— І ты пабываеш у розных мясцінах, шмат чаго ўбачыш... Толькі памятай, — з перасцярогай загаварыў дзядуля Туман, — ты ніколі не павінен плакаць... Ніколі! Ні ад крыўды, ні ад жалю... Як толькі заплачаш — усё.

— Што, памру? — напужаўся Пухнацік.

— Не, не памрэш, проста знікнеш. Растанеш у небе, і цябе больш не будзе... Зразумеў?

— Ага... Ані слязінкі ніколі ў мяне не капне.

— Ну, бывай, Пухнацік... Шчаслівай табе дарогі!

Падзякаваў Пухнацік дзядулю Туману за добрую параду і паляцеў далей. Гарэза Ветрык адразу ж падхапіў яго і панёс высока над зямлёй да засмужанага далягляду. Унізе горы, стэпы праплываюць, зверху сонейка яркае свеціць, навокал блакіт неабсяжны... Хораша Пухнаціку і весела.

Ляцеў ён, ляцеў, ды раптам пытаецца ў Ветрыка:

— Слухай, Ветрык, а што гэта за цёмная пляміна па зямлі бяжыць за намі? Куды мы — туды і яна.

— А гэта ты, — адказвае Ветрык.

— Ну? — засмяяўся Пухнацік. — І тут я, і там я... Нават смешна. Як жа такое можа быць?..

Ветрык растлумачыў:

— Тут — гэта ты, а там — твой цень. Зразумеў?

— Зірні, зірні, Ветрык, — раптам закрычаў Пухнацік. — Там на мяне нехта ўзлез!..

— Гэта чалавек у твой цень схаваўся... Сонейка апоўдні гарачае і сярдзітае, ад яго ўсе хаваюцца. Вось і чалавек, бачыш, змарыўся, прылёг адпачыць... У цяні прахалода... Ну, хопіць размаўляць, паляцелі далей.

Але толькі яны адляцелі, як чалавек падняўся і пайшоў даганяць цень. Дагнаў, зноў прылёг. Пухнацік спыніўся і кажа:

— Слухай, Ветрык, а давай мы цень мой пакінем тут, а самі далей паляцім. Хай чалавек адпачывае...

— Нічога не атрымаецца, — адказаў Ветрык. — Калі ты хочаш, каб цень твой тут быў, — павінен і сам тут застацца.

— Ну добра, — уздыхнуў Пухнацік. — Ты ляці без мяне, а я пачакаю, пакуль ён адпачне... Шкада ж чалавека... Я цябе потым даганю, калі сонейка будзе не такое сярдзітае.

— Бывай, Пухнацік! — развітаўся Ветрык і знік.

Да самага вечара вісеў нерухома Пухнацік, а ўнізе, на зямлі, у яго цяні спаў чалавек. Калі сонейка схілілася на захад, пачырванела і зноў стала спакойным і ласкавым, чалавек падняўся, зірнуў у неба і гукнуў:

— Дзякуй табе, воблачка! — і пайшоў сваёй дарогай. А Пухнацік паплыў далей. Схавалася сонейка, рассыпаліся па небе зорачкі, выглянуў

рагаты месяц. Пухнаціку захацелася спаць. Ён прымасціўся на схіле гары і задрамаў.

Раніцай зноў рушыў у дарогу. Доўга-доўга плаваў над гарамі, над стэпамі, над пустынямі, шмат чаго пабачыў, шмат пра што даведаўся, а потым сам не заўважыў, як зажурыўся. Сумна аднаму ў падарожжы.

Азірнуўся Пухнацік па баках. Неба чыстае, ані воблачка...

— Дзе ж мае брацікі? — уздыхнуў ён.

Раптам угледзеў далёка белую кропку. Паплыў Пухнацік туды. Думаў, што гэта таксама воблачка. Падплывае бліжэй, бачыць, гойдаецца ў паветры нехта белы, з намаляваным ротам і з хвастом.

— Добры дзень,— прывітаўся Пухнацік.

— Хы-хы-хы! — адказаў хвастаты.

— Ці не мой ты брацік?

— Ну, ну! — абурана закрычаў той, што з хвастом. — Я — змей!

— Змеі не лятаюць, яны поўзаюць.

— А я паветраны! Хы-хы-хы! Папяровы! Я ад сваіх гаспадароў уцёк.

— Хочаш быць маім брацікам? — прапанаваў Пухнацік.— Будзем разам лётаць. І табе і мне весялей будзе.

— Яшчэ што! — адказаў папяровы Змей. — Ты ж толькі воблачка, а я — Змей! Не трэба мне ніякіх брацікаў!

— Дрэнны ты Змей, — сумна сказаў Пухнацік і падаўся прэч.

Паплыў ён, паплыў — бачыць: ляціць нехта ўверсе. Таксама белы, таксама з хвастом, а на галаве — нібы піка чырвоная. Пухнацік за ім.

— Ты Змей? — пытаецца.

— Не, не Змей, — адказаў той, што ляцеў.

— Ты воблачка?

— Не, не воблачка.

— Дык хто ж ты?

— Проста бусел...

— Дык, можа, ты мой брацік?

— Я ж сказаў, што бусел я. А ты — воблачка.

— І ты не хочаш быць маім брацікам? — зрумзаў Пухнацік, але ўспомніў, што яму плакаць няможна.

— Чаму не хачу? Давай будзем братамі, — сказаў добры бусел. — Паляціш да мяне на радзіму?

— Далёка? — зацікавіўся Пухнацік.

— Вельмі далёка... Там цяпер вясна... Цёплы дождж зямлю палівае...

— А што такое дождж? — спытаўся Пухнацік.

— Дождж гэта... калі воблачкі плачуць, — адказаў бусел.

— Тады бывай, — сумна ўздыхнуў Пухнацік. — Плакаць я баюся...

— Бывай, — памахаў на развітанне крыламі бусел. — І не сумуй. Знойдзеш ты сабе брацика...

Бусел паляцеў. Пухнацік зноў застаўся адзін. А ў небе, як на тую бяду, ні хмурынкі. Спякота...

Шукаў, шукаў Пухнацік сваіх брацікаў, аж раптам бачыць — скала ўнізе, а на схіле той скалы ляжыць маленькае белае воблачка.

— Ды гэта ж і ёсць мой брацік! — узрадаваўся Пухнацік, хуценька апусціўся, падплыў бліжэй і бачыць, што брацікаў тут вельмі многа. Усе малюсенькія, з жоўтымі тварыкамі, з белымі пялёсткамі. У кожнага зялёненькая тонкая ножка. Стаяць яны адзін ля аднаго, галоўкі журботна апусцілі.

— Добры дзень, брацікі, — прывітаўся Пухнацік. — Хто ж вас пакрыўдзіў? Чаго вы такія сумныя?

— Мы — рамонкі, — адказала адна кветка. — Ветрык нас прынёс сюды ў гэтую пустыню, калі мы яшчэ насеннем былі. Мы прараслі, а цяпер во — даводзіцца паміраць.

— Чаму?

— Дожджыку няма, зямля сухая, а мы піць хочам...

— Піць. Піць... — танюсенькімі галасочкамі падхапілі астатнія рамонкі.

— Не трэба плакаць, бо вы растаць можаце...

— Піць, піць...

— Ну, брацікі мае, ну, не плачце, калі ласка, бо і я заплачу, а мне нельга, — пачаў суцяшаць Пухнацік. — Скажыце, дзе той дожджык, — я яго знайду.

— Дожджык бывае, калі воблачкі плачуць, — адказалі рамонкі і зноў журботна і жаласліва схіліліся над парэпанай ад спякоты зямлёй

сваімі белымі пялёсткамі. І Пухнацік заплакаў. Так шкада яму стала белых рамонкаў, што ён забыўся пра папярэджанне дзядулі Тумана. Паліліся з яго кропелькі чыстай вадзіцы, кропелькі дажджу… Напіліся рамонкі ўдосталь, павесялелі, расправілі свае пялёсткі.

А Пухнацік? Не, ён не знік. Ён ператварыўся ў лёгкую белую смугу над рамонкамі і ў кропелькі празрыстай расы, што нават у самую спёку блішчаць на пялёстках кветак…

Той, хто робіць добрае — ніколі не знікае.

## Зорачка

*Алена Масла*

Далёка-далёка ў касмічнай прасторы жыла Зорачка. Была яна такой маленькай, што нават зямляне не маглі разгледзець яе ў свае магутныя тэлескопы. І таму, напэўна, Зорачка сумавала.

— Ах, — думала яна, — шчаслівыя мае сястрыцы. Іх бачаць з далёкіх планет — і яны бачаць далёкія планеты. А я... Што з таго, што я кожны дзень расчэсваю свае залатыя валасы і абнаўляю зіхоткую сукенку? Нікому не патрэбна мая прыгажосць. Сястрыцы кажуць, што я шчаслівая — мне Фея падаравала самае доўгае жыццё. Але навошта яно мне? Каму я патрэбна?.. А яшчэ сястрыцы кажуць, што людзі, якія жывуць на планеце Зямля, захапляюцца хараством зорнага неба. А я нават нікога не парадавала… — ціха ўздыхала Зорачка.

І вось аднойчы, калі яна так разважала, нехта гукнуў яе. Зорачка азірнулася на голас і ажно заскакала ад радасці, убачыўшы сваю старэйшую сястру.

Прывітаўшыся з госцяй і распытаўшы, як жывуць іх сваячкі, Зорачка папрасіла:

— Сястрыца! Ты так многа ўсяго бачыла, раскажы мне што-небудзь.

— О, я нават не ведаю, з чаго пачаць сваё апавяданне. Памятаеш, я і раней расказвала табе пра Зямлю. Яна мне падабаецца найбольш. Там жывуць вельмі цікавыя істоты — людзі, якія кажуць: «Падае зорка — чакай шчасця...» Ой, — спахапілася раптам яна, — я ж галоўнае забылася! Глядзі не згары ад радасці. Старэйшая Зорка даручыла мне перадаць, што тваё месцазнаходжанне змяняецца: з гэтай пары ты будзеш жыць разам з намі!

— Вось дык сюрпрыз! — і Зорачка стрымгалоў кінулася ўслед за сястрой, хутчэй заспяшалася на новае месца.

Спыніўшыся, усклікнула ад здзіўлення:

— Якая тут прыгажосць! Куды ні глянь, зоркі карагоды водзяць! А вось гэты блакітны шар і ёсць Зямля? Ой, здаецца, я ўжо бачу людзей!..

Захопленая, зачараваная, Зорачка гатова была закрычаць на ўсё неба: «Я шчаслівая, шчаслівая! Я буду доўга жыць!..»

Праходзілі дні за днямі. Не шкадуючы свайго святла, Зорачка разгаралася ўсё ярчэй і ярчэй. Найпрыгажэйшым яе ззянне станавілася

тады, калі з дому на планеце Зямля выходзіла дзяўчынка. Задумлівая, з блакітнымі стужкамі ў косах, яна гадзінамі глядзела на зорнае неба. І Зорачка цягнула да яе свае цудоўныя рукі-промні. Нібы адчуўшы іх дотык, дзяўчынка радасна ўсміхалася.

Але аднойчы вечарам дзяўчынка не выйшла. Не было яе на другі і на трэці дзень. Зорачка кідала заклапочаныя позіркі на Зямлю. І, зазірнуўшы праз акно ў пакой дома, дзе жыла яе маленькая сяброўка, убачыла яе. Толькі што гэта з ёй? Гэта была яна — і не яна...

Задумлівы позірк хаваўся пад цяжкімі павекамі, змучаны тварык пасталеў і асунуўся — дзяўчынка цяжка захварэла.

У адно імгненне Зорачка зразумела ўсё. Век людзей жахліва кароткі. І дзяўчынка можа раней адмеранага — і так кароткага — чалавечага веку пайсці з Зямлі. А яна па-ранейшаму будзе гарэць на небе?

«Ты з нас самая шчаслівая: табе Фея падаравала самае доўгае жыццё...» — прамільгнула ў свядомасці. — Людзі кажуць: падае зорка — чакай шчасця...»

— Дзяўчынка, я табе падарую сваё жыццё, табе... — І Зорачка залатой слязінкай скацілася з неба.

А потым доўга-доўга на планеце Зямля выходзіла з дому дзяўчынка і махала рукой Зорачцы, якая для яе так і засталася жывой.

## Аленчыны канькі

*Ядвіга Бяганская*

На школьным двары залілі вялікі каток, і цяпер з самага ранку тут стаіць вясёлы гоман і смех.

Аленка з зайздрасцю назірае, як спрытна коўзаюцца аднакласнікі, якія фігуры выкручваюць на лёдзе. «Былі б у мяне канькі, я таксама не горш коўзалася б»,— думае яна. Але канькоў у Аленкі няма. Ды і спадзявацца пакуль што не прыходзіцца: трэба справіць паліто старэйшай сястры, падрамантаваць кватэру…

— Чаму ты прыйшла на каток без канькоў? — цікавіцца Юрка.

Дзяўчынка не адказвае. Навошта?

— Хадзем, Аленка, я дам свае, — кажа, спыняючыся каля іх, Ганя.

— А я цябе навучу коўзацца, — дадае Янка.

Аленка з удзячнасцю глядзіць на сяброў, і на яе твары ўспыхвае ўсмешка.

Яны падыходзяць да лаўкі. Ганя скідвае свае чаравікі з канькамі і, усунуўшы ногі ў Аленчыны боцікі, дапамагае ёй абуцца.

— Я ж коўзацца зусім не ўмею, — збянтэжана кажа Аленка, трымаючыся за Янкаву руку.

— Навучышся, гэта проста, — падбадзёрвае Янка і, сціснуўшы мацней Аленчыну руку, падае каманду:

— Правай-левай! Правай-левай!

Зрабіўшы некалькі кругоў, Янка раптам выпускае яе руку:

— Ну а цяпер сама. Ды ты не бойся, не бойся!

— Ой! — палохаецца Аленка. Правая яе нага ўцякае ўперад, а левая чамусьці адстае, і дзяўчынка, узмахнуўшы рукамі, падае.

— Не бойся, яшчэ крыху павучымся, — смяецца Янка, і яны зноў коўзаюцца разам.

— Ну як, падабаецца? — пытае Ганя, калі Аленка з Янкам спыняюцца.

— Вельмі, — усміхаецца Аленка і пачынае расшнуроўваць чаравікі.

— Папрасі, каб і табе маці купіла канькі, — кажа сяброўцы Ганя. — Будзем разам коўзацца.

— Хіба пазней, — уздыхае Аленка і расказвае Гані пра свае хатнія клопаты.

— Ну, то прыходзь заўтра. Будзем на маіх па чарзе коўзацца.

Цяпер Аленка штовечар прыходзіць на каток. Ганя, угледзеўшы яе здалёк, спяшаецца насустрач. А з ёю Марынка, і Зося, і Верачка. Яны нават спаборнічаюць: хто першы ўгледзіць Аленку, той першы і канькі свае ёй аддае.

## Пажар

**(*Урывак з аповесці «Расці, Ганька»*)**

*Алена Васілевіч*

Сёння велікоднае свята. Маня, прыбраная, сядзіць пад клёнам і чакае, пакуль выйдуць з хаты Ганька, Анюта і Грыша. І вось яны выходзяць. Маня падбягае да іх. У яе ёсць план: ісці

ўсім гуртам на Палянку, раскласці там вогнішча і частавацца. Цудоўна! Як гэта ім дагэтуль не прыйшла ў галаву такая бліскучая думка?..

Грышка, як адзіны мужчына тут, клопат пра вогнішча бярэ на сябе, і таму ён бяжыць па запалкі. Ганька, Анютка і Маня наладжваюць частаванне. Збегаць кожнай дадому і схапіць у кішэню па кавалку пірага і яшчэ чаго-небудзь, скажам, каўбасы ці вяндліны, ці якіх смачных салодкіх аладак — на гэта таксама многа часу не патрабуецца. Праз гадзіну на Палянцы ўжо крык, смех. Ганька, Анютка і Маня цягаюць сухое ламачча. Грышка раскладвае вогнішча.

Агонь хітруе. Ён адразу ўступае ў дзіцячую гульню. Спачатку ён нібыта ўпарціцца. Лізне вузенькім гарачым язычком сухую галінку, глытне паветра і раптам зноў нібыта захліпнецца. Дзеці зноў яму сушняку, і ён зноў павесялее.

І толькі калі надакучыць яму гульня ў хованкі, ён раптам як ірване ўгору, як ахопіць усю кучу сушняку! Як затрашчыць, як сыпане з гарачага свайго мяшка іскрамі! Доўгі салапаты язык ледзь не хапаецца зялёных яловых галін. Кругом на вярсту гарачыня. Весела.

А дзеці ўсё падкідаюць то сушняку, то дроў! Каб полымя не толькі да ніжніх галін, але і да самай яловай вяршыні дастала...

А самі тым часам частуюцца, скачуць вакол вогнішча, пераскокваюць цераз маленькія агеньчыкі, што адскочылі ад свайго вялізнага таты. Тым часам гэта вясёлая гульня не такая ўжо

бяскрыўдная. Ганька прапаліла ў дзвюх мясцінах світку. У Грышкі штаны ўжо таксама ў дзірках. У цудоўнай чырвонай Анютчынай хустцы падкурэлі махры. Толькі асцярожная Маня ўберагласся. Яна не скача цераз агонь. Яна толькі ўсё падкідвае ламачча ў вогнішча... А агонь разышоўся ўжо не на жарт. Ён ужо захапіў у свой палон усе ніжнія галіны і па сухой кары, па ствале, як вавёрка, скача ўсё вышэй. Дзеці бачаць, што агонь пакідае жарты. І яны топчуць яго нагамі, прыбіваюць мокрымі лапамі. (Добра, што непадалёку глыбокая лужына.) Але дзе там! Агонь ужо ні на што не зважае. Абхапіў яліну з усіх бакоў і як страсяне, страсяне яе ўсю! І яліна шугае на ветры, як чырвоны сцяг.

— Давайце ваду хутчэй насіць!

— Залівайце агонь!

Але колькі ты наносіш тае вады прыгаршчамі ці няхай сабе і Грышкаваю шапкаю...

— Што нам рабіць?..

— Вось цяпер нам будзе...

— Давайце зваць дарослых...

Але ў вёсцы дарослыя самі ўжо ўбачылі.

— Нехта лес падпаліў! Палянка гарыць!

— Хутчэй трэба пажарную выклікаць!..

І вось нехта памчаўся выклікаць пажарную. Вось ужо з рыдлёўкамі, з вёдрамі, з сякерамі кінуліся па дарозе, цераз мосцік, на Палянку людзі.

А полымя шугае ўжо не з аднае яліны. Агонь заваяваў увесь край лесу, агонь наступае цэлай

сцяной. Яму смешныя гэтыя вёдры вады, што носяць з рэчкі і льюць, льюць на яго людзі.

Палянку ратуе ўся вёска. Агонь шалее. Кідаецца з краю на край, нібыта дражніцца. Але людзі не адступаюць, не здаюцца... Дзесьці праз гадзіну прыязджае пажарная каманда. Дзве вялізныя жалезныя бочкі з доўгімі «кішкамі».

Бойка з лясным пажарам канчаецца на захадзе сонца. Нехта ўспамінае, нарэшце, пра віноўнікаў пажару.

— А дзе ж яны самі, гэтыя вужы печаныя?

Некаму прыходзіць думка пакараць «вужоў» так, каб дзясятаму заказалі... Каб на ўсё жыццё запомнілі, як жартаваць з агнём.

А «вужоў» тых — злачынцаў — і шукаць не трэба. Яны вяртаюцца ў вёску ў гэтым жа самым натоўпе. Ідуць разам з усімі — замурзаныя, задымленыя.

Яны не адступіліся ад свае віны. Не схаваліся ад страху. Яны таксама тушылі пажар...

Але ўцеха малая, асабліва як аглянешся на чорнае пажарышча.

## Усмешка

*Галіна Васілеўская*

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Сустракаючыся, людзі ўсміхаліся адзін аднаму — такое было ў іх прывітанне.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я не ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя,— сказаў сам сабе чараўнік.— Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу, бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць харошыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі, і злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.

Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў цягнуўся лёгкі дымок.

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь з'явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэве, і зялёным лісточкам, што трымцелі ад лёгкага ветрыку.

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.

— Аддай усмешку! — крыкнуў ён страшным голасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека — як яе возьмеш? Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

— Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла...

— Куплю ўсмешку,— вырашыў нарэшце чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі паціскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго зморшчаных шчоках.

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка і пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек?

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ гарчэй.

— Не магу больш так жыць,— усхліпваючы, прагаварыў чараўнік,— ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў... Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

— Усмешку не купіш і не ўкрадзеш,— сказаў жыхар казачнага горада.— Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў ты сёння што добрае. У полі працаваў?

— Не,— адказаў чараўнік.

— Дом будаваў?

— Не.

— Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?

— Не, не, не,— і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

— Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала. Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.

Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешцы. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела, што ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы. Цяпер ён, напэўна, стаў шчаслівым, добрым чараўніком і сам дорыць людзям усмешкі.

# Добрае слова

*Алесь Пальчэўскі*

У трамвай праз пярэднія дзверы ўваходзіў старэнькі дзядок. Хлопчык убачыў, як цяжка падымацца старому чалавеку з нізкай прыступкі. Ён усхапіўся з лаўкі і падаў руку.

Дзядуля падзякаваў.

— Сядайце, калі ласка, на маё месца, — паказаў хлопчык на лаўку.

— Сядзі-сядзі. Мне недалёка ехаць.

Хлопчык быў настойлівы:

— Ну я вас прашу, дзядуля, сядайце.

Прыйшлося паслухацца. Дзядуля сеў, прыхіліў хлопчыка да сябе і спытаў:

— Як жа цябе зваць?

— Юра.

— Харошае імя, — пахваліў дзядуля.

— Я ў той дзень нарадзіўся, як Юрый Гагарын паляцеў у космас.

— Вунь што. Тады яно двойчы харошае... У якім жа ты класе, хлапчына, вучышся? — зірнуў дзядуля на Юраў партфель.

— У трэцім.

— Малайчына. Старайся, старайся. Я ў твае гады і аднаго класа не скончыў. Толькі і ўмею распісацца. Ды і то навучыўся, калі мне было дваццаць гадоў.

— Дык вы і казак гэтых не чыталі? — Юра дастаў кніжку з партфеля.

— Не. Казкі расказвала мне маці.

— Ой, дзядуля, колькі цікавага вы не ведаеце! — пашкадаваў хлопчык. — Каб жылі блізка ад нас, я і вам чытаў бы... Таму і маме я кожны вечар чытаю.

Дзядуля ўздыхнуў: у яго свае такія ўнукі ёсць, могуць пачытаць, ды не вельмі дружаць яны з кнігай. Ён паглядзеў у акно і сказаў:

— Ну, мне пара выходзіць. Ты куды — у школу ці са школы едзеш?

— У школу, на другую змену. Мы пераехалі ў новы раён, а трэці клас я канчаю там, дзе жылі раней.

— Настаўнік ці настаўніца вучыць цябе?

— Настаўніца.

— Сядай на маё месца, — устаў дзядуля, — і перадай настаўніцы дзякуй. Скажы — ад дзядулі Сцяпана Міхайлавіча.

— Вы ведаеце нашу Вольгу Пятроўну?! — здзівіўся Юра і сеў на лаўку.

— Не. Але ты перадай ад мяне дзякуй, прашу цябе! — ужо з прыступкі гукнуў дзядуля.

«А за што перадаць дзякуй незнаёмай настаўніцы? — паціснуў плячамі Юра. — Прывітанне — і тое знаёмым толькі перадаюць, а тут — дзякуй...»

Настаўніца ўвайшла ў клас, і Юра перадаў ёй дзядулеву падзяку. Вольга Пятроўна распытала, дзе і калі гэта было, трошкі захвалявалася і падзякавала вучню за прынесенае добрае слова.

А за што ўсё ж дзякаваў дзядуля настаўніцы? Можа, ты ведаеш?

# Адведалі

*Мікола Янчанка*

Любяць хлопцы дзядзьку Васіля. За тое, што заўсёды вітаецца і размаўляе з імі, як з дарослымі, што справамі іх цікавіцца. І хлопцы рады сустрэчы з дзядзькам. Хоць той спачатку і пакепліваў з іх. Сустрэў аднойчы Янку з Антосем і ну іх дакараць:

— Вы навошта ў майго верабейкі пёрка вырвалі?

— Гэта не мы, — пачаў апраўдвацца Янка.

— Чэснае піянерскае! — пакляўся Антось, хоць хадзіў яшчэ ў дзіцячы садок і, вядома, не насіў піянерскага гальштука.

— Як не вы? — усміхнуўся дзядзька. — Хто бегае хутчэй за ўсіх хлапчукоў нашага двара? Значыць, і майго верабейку вы дагналі і пёрка ў яго вырвалі.

І сапраўды, бегаюць яны хутчэй за ўсіх. Таму ціхі Янка хацеў нават папрасіць прабачэння і паабяцаць дзядзьку Васілю не вырываць пёрак у яго вераб'ёў. Ды Антось выручыў:

— Як жа мы дагонім таго вераб'я? У нас жа крыльцаў няма!

— Няўжо няма? — усумніўся дзядзька.

— Няма! — узрадаваўся Янка. — Во, рукі ў нас!

— Тады не вы, — згадзіўся дзядзька Васіль. — Даруйце! Даруйце, хлопцы.

Вось якія размовы былі!

12 Зак. 1790

Цяпер дзядзька Васіль з іх не смяецца. А сустрэўшы, вітаецца і пытае з усмешкай:

— Ну як жыццё маладое?

— Нішто сабе, — апускае галаву Янка.

— Добрае! — весела адказвае бойкі Антось.

А нядаўна дзядзька Васіль нават папрасіў хлопцаў дапамагчы яму:

— Я без вас, як без рук, хлопцы. Дрэўцы не магу пасадзіць.

— Добра, — кажа Антось, — выручым.

І пайшлі, выручылі. Янка дрэўцы прытрымліваў, пакуль дзядзька Васіль прысыпаў каменьчыкі зямлёю. Антось ваду маленькім вядзерцам насіў ды паліваў саджанцы.

І на забавы таксама запрашае хлопцаў дзядзька. У мінулую суботу сонечны дзянёк выдаўся.

— Гайда на рэчку! — кажа дзядзька. — На сонцы пазагараем. А мо і пакупаемся.

— Гайда! — узрадаваліся хлопцы. І пайшлі побач з дзядзькам.

Ішлі, бы вялікія. Як і ён, рукамі размахвалі. Пад крок яго падладжваліся. Прыйшлі да ракі. На сугрэве зацішнае месца выбралі. Скінулі кашулі і загараць пачалі. Пазагаралі — і да рэчкі. Але дзядзька спыніў іх:

— Відаць, купацца яшчэ ранавата. Я, як старэйшы, паспрабую.

І паспрабаваў. Толькі адразу ж з вады выскачыў:

— Халодная! — сказаў ён. — Але праз тыдзень можна будзе і купацца.

Праз тыдзень яны з самай раніцы стаялі ля чацвёртага пад'езда. Дзядзьку Васіля чакалі. Каб наконт прагулкі дамовіцца. Але хутка даведаліся, што дзядзька Васіль хворы.

— Напэўна, той раз прастудзіўся, — здагадаўся Янка.

— Праз нас цяпер чалавек пакутуе, — падтрымаў яго Антось і нечакана прапанаваў: — Зойдзем!

Зайшлі. Ляжыць дзядзька Васіль. Але, убачыўшы хлопцаў, павесялеў:

— Як жыццё маладое?

— Добра! — усклікнулі хлопцы.

— А я от злёг, — паскардзіўся дзядзька. — У горле дзярэ, і кашаль забівае.

Затым ён з цікавасцю слухаў навіны двара і дзіцячага садзіка, пахваліў свісткі, якія хлопцам куплялі.

— Пасвішчыце, мне не шкада, — прапанаваў Антось.

— Лепей вы, хлопцы. А то я закашляюся, — сказаў дзядзька.

Хлопцы і ну старацца. Так засвісталі, што цётка Аліна з кухні прыбегла:

— Што за гармідар?!

— Ніякага гармідару, — супакоіў яе дзядзька. — Проста сябры адведаць мяне прыйшлі.

— Гэта добра! — сказала цётка Аліна. — Бач, і табе лепей стала.

А дзядзьку Васілю сапраўды лепей стала. Ён ад душы засмяяўся, скінуў коўдру і прысеў на

ложку. Затым пайшоў на кухню і прынёс хлопцам па цукерцы. На развітанне ж паабяцаў у наступную нядзелю пакатаць іх на лодцы.

— Куды гэта вы збеглі? — накінулася на хлопцаў маці Антося.

— Дзядзьку Васіля адведалі! — у адзін голас адказалі хлопцы і як доказ цукеркі паказалі. — Во!

## Ліпка

*Пятро Рунец*

Дзед Даніла разам з унукам Валерыкам гулялі ў садзе. Хоць дзень быў і спякотны, але тут панаваў прыемны халадок. Пахла садавінай і травамі. У густой засені ціха шчабяталі птушкі. Ідучы ўслед за дзедам, Валерык уважліва прыглядаўся да дрэў, на якіх віселі падобныя на зялёныя званочкі грушы. Яблыкі-налiванкі, слівы.

У канцы саду, на ўзмежку, расла маладая купчастая ліпка. Валерык раптам спыніўся і, паказваючы на яе, сказаў:

— Дзед, бачыш, ліпка! Давай ссячом...

Дзед здзіўлена глянуў на ўнука.

— А навошта яе ссякаць? Яна ж, здаецца, нікому не замінае.

— А што з ліпкі за карысць? На ёй жа нічога не расце, — растлумачыў Валерык.— Ні яблыкі, ні грушы, ні слівы...

— Гэта праўда, што на ёй нічога не расце, — згадзіўся дзед. І, крыху падумаўшы, дадаў: — Калі так, то бяжы ў хату і прынясі сякеру.

Валерык памчаўся з саду. Толькі бялявая галава замільгала ў густым зялёным бульбоўніку. Неўзабаве ён вярнуўся.

— На, дзед, секані пад самы корань, — сказаў хлопчык, падаючы вострую сякеру.

— Спачатку, Валерык, давай крыху пасядзім і адпачнём. А то я нахадзіўся, ногі забалелі. А ссячы ліпку мы паспеем. Яна ж без ног нікуды ад нас не ўцячэ. Толькі дзе ж нам сесці? — спытаў дзед, пазіраючы на ўнука.

Валерык паглядзеў навокал і жвава адказаў:

— А вось тут, у цяньку пад ліпкай!

Яны селі пад дрэвам.

— Ну як? — спытаў дзед. — Нябось, каб пасадзіў цябе на сонцы, ты гэтак не сказаў бы... А якое паветра? Чуеш, як пахне?

Валерык пацягнуў носам.

— А што гэта так пахне, дзядуля? — азіраючыся спытаў ён.

— Хіба ты не ведаеш?

Дзед устаў, нагнуў ніжнюю галінку ліпы і, сарваўшы некалькі жаўтавата-белых кветачак, падаў іх унуку.

— На, панюхай.

— Ой, як салодка пахнуць! — усклікнуў здзіўлены Валерык.

— Гэта ты правільна сказаў, — згадзіўся дзед. — У ліпавых кветках ёсць салодкі як цукар сок. З яго пчолы і робяць мёд.

— Той, што бабуля падавала да бліноў?

— Во-во, той самы. Бачыў, які ён светлы і салодкі? А каб ты ведаў, які ён карысны! Гэтым мёдам лечаць хворых.

Валерык недаверліва глянуў на дзеда:

— А хіба мёд — лякарства?

— Яшчэ якое! — адказаў дзед. — Памятаю, я быў малы, вось як ты цяпер, і ў мяне моцна балела горла. Дык мяне толькі мёдам і вылечылі. І наогул, мёд вельмі карысны. Асабліва свежы. Толькі што выняты з вулея.

— А вазьмі ты, — гаварыў дзед, — ліпавы цвет. Гэта ж ад кашлю — першае лякарства. Таму яго збіраюць і сушаць.

Валерык слухаў дзеда так, нібы той расказваў цікавую казку. А калі стары змоўк, тузануў яго за рукаў і пачаў прасіць, каб ён яшчэ што-небудзь расказаў пра ліпку.

Дзед ціха прамовіў:

— Што ж табе яшчэ расказаць? Хіба тое, што калісьці з кары маладых ліп рабілі кошыкі, сявенькі, плялі лапці...

— А што такое лапці? — пацікавіўся Валерык.

— Абутак такі... І яшчэ скажу табе, што ліпу паважаюць не толькі ў вёсцы, але і ў горадзе. Нядаўна я быў у Мінску. Дык там ліпамі абсаджаны цэлыя вуліцы. Вельмі прыгожа!

Дзед крыху памаўчаў, потым падняўся і рашуча прамовіў:

— Ну, адпачылі, цяпер можна і за работу брацца. Давай сякеру, звалім гэтую ліпку.

— Дзедка, не трэба сячы! — усклікнуў Валерык.

— Чаму?

— Шкада, — прашаптаў хлопчык. — Ты столькі добрага расказаў пра яе.

— Вось як! — прыжмурыўся дзед і ўсміхнуўся. — Мне, унучак, таксама шкада. Я ж калісьці сваімі рукамі яе пасадзіў…

У гэты час дыхнуў ветрык. Ліпка весела зашумела, зашапацела лісцем. Валерык паглядзеў на дрэва. Потым на дзеда і сур'ёзна спытаў:

— Дзядуля, а чаго яна шуміць?

— Радуецца, што мы яе не ссеклі, — гэтак жа сур'ёзна адказаў дзед.

— А хіба яна разумее?

— Добрае, унучак, усе разумеюць…

## Рэха

### *Прытча*

Аднойчы бацька і сын ішлі праз горы. Хлопчык спаткнуўся, балюча выцяўся і закрычаў:

— А-а-а-й!

І тут жа пачуў аднекуль:

— А-а-а-й!

Хлопчык з цікаўнасцю прыслухаўся і крыкнуў:

— Хто тут?

І пачуў у адказ:

— Хто тут?

Раззлаваны ён крыкнуў:

— Баязлівец!

І пачуў:

— Баязлівец!

Хлопчык паглядзеў на бацьку і запытаў:

— Тата, што гэта?

Мужчына ўсміхнуўся і адказаў:

— Сынок, будзь уважлівы.

Ён прыклаў руку да шчакі і крыкнуў у горы:

— Я цябе люблю!

І голас адказаў:

— Я цябе люблю!

Мужчына крыкнуў:

— Ты ў мяне самы добры!

І голас адказаў:

— Ты ў мяне самы добры!

Хлопчык здзівіўся і нічога не разумеў. Тады бацька растлумачыў сыну:

— Людзі называюць гэта рэхам. Але ў сапраўднасці гэта як жыццё. Вяртае табе ўсё, што ты гаворыш і робіш.

Наша жыццё — гэта адлюстраванне нашых дзеянняў. Калі хочаш больш дабрыні ад людзей, аддай больш дабрыні людзям. Хочаш шчасця — дай шчасця тым, хто вакол цябе. Хочаш добразычлівай усмешкі — усміхніся тым, каго ведаеш. Жыццё вяртае нам усё, што мы яму далі. Наша жыццё — не супадзенне, а адлюстраванне нас саміх.

# Хлеб – усяму галава

## Прытча пра хлеб

*Максім Танк*

Аднойчы на кірмаш здалёк
Вандроўнік плёўся ў горад
І наракаў на свой мяшок,
Набіты лустай спорай.

Аж Хлеб не вытрымаў і так
Азваўся: — Што бядуеш?
Зусім не ты мяне, дзівак,
Але цябе нясу я.

— Ну што ж, пабачым, хто — каго! —
Той запярэчыў строга
І з цяжкага мяшка свайго
Хлеб вытрас на дарогу.

І сам пашкандыбаў далей.
Нішто не муліць плечы.
Дзень прамінуў. Ужо ў імгле
Стаў набліжацца вечар.

Настаў і час перакусіць.
Успомніў хлеб вандроўнік,
Што недзе, кінуты, ляжыць,
Духмяны і цудоўны!

Прылёг на нейкім дзірване,
Каб адпачыць хоць трошкі.
Але галоднаму і ў сне,
Знаць, сняцца хлеба крошкі.

Цяпер і сам сабе не рад.
Не спіцца, не ляжыцца.
Ці не вярнуцца лепш назад
Ды з другам памірыцца?

Устаў Вандроўнік і брыдзе —
Ідзе пад зорным небам,
На месца памятнае, дзе
Ён пасварыўся з Хлебам.

О, як ён рад быў зноў, калі
Сваю пабачыў страту!
І Хлебу нізкі, да зямлі,
Аддаў паклон, як брату.

## Песня хлебу

*Пятрусь Броўка*

Радуюць сэрца
Збожжа і травы.
Дзень мой праменны,
Дзень мой ласкавы.

Водар хваёвы,
Сіняе неба.
Кожнае ранне
Рады я хлебу.

Рады я ўсходам
Веснімі днямі
І як гамоніць
Ён каласамі.

Рады — увосень
Спорыцца дбайна —
Медным ручайкам,
Што з-пад камбайна…

Тых, хто на полі
З лецейка ў лета…
Дзякуй ім, родным,
Дзякуй за гэта!

З імі не ведаць
Гора-загубы,
Жыць мне цікава,
Жыць мне і люба!

## Прыказкі пра хлеб

* Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
* Хлеб — даражэй за золата.
* Галоднаму не спіцца, калі хлеб сніцца.
* Хлеб ад зямлі, а моц ад хлеба.

## Паданне пра Жыценя

Жыцень — Бог восені. Беларусы здаўна ўяўлялі яго крыху грозным, нібыта вечна некім ці нечым незадаволеным. Жыцень, як гаворыцца

ў павер'і, нізкага росту, худы, даволі сталага веку, з трыма вачыма, з ускудлачанымі валасамі. Ён ходзіць вельмі ціха, сагнуўшыся: расхаджвае па палях і агародах, аглядае ці добра прыбрана. Калі Жыцень знойдзе на жніўніку шмат пакінутых каласоў, збірае іх, звязаўшы ў адзін сноп, пераносіць на іншае поле, дзе ўсё сабрана чыста. Вынікам гэтага здараецца неўраджай у наступным годзе на тым месцы, дзе Жыцень знайшоў шмат пакінутых каласоў: значыць, гаспадар паленаваўся старанна папрацаваць на сваім полі. А вялікі ўраджай будзе на той ніве, дзе пакінуў Жыцень сноп.

Паводле падання, Жыцень прысутнічае таксама ў полі пры восеньскай сяўбе. У час пасеваў ходзіць Бог восені з грозным выглядам па палетках, усё прыглядаецца да чагосьці ўнізе. Гэта ён выглядае зерне і ўтоплівае яго, каб лепш увайшло ў зямлю і напоўнілася зямельнымі сокамі для добрага росту.

## Добры Жыцень

### *Паданне*

Пры суседнім сяле, пад старою вярбою, здавён жыў Жыцень. Дзядок такі. З доўгай барадою. Трошкі на мяне, Лесавічка, падобны.

Як пойдзе сонейка на спачын і ноч апусціцца, Жыцень выходзіў са свае схованкі ды на поле бег. Дзе — каласок падыме, ад пылу атрасе, дзе — каліўца паправіць, каб лепей расло. Не

раз і палівачку з сабою браў, ішоў да крыніцы і палеткі ратаваў ад спёкі.

Радаваліся людзі: зямелька радзіла, жыта ўмалотным было. Ды аднойчы ў сяло прывалокся Злыдзень. Убачыў, што ў людзей на палях усё добра, паклікаў Жыценя і кажа:

— Не тым займаешся! Жыта і само вырасце. Ты лепей песні пра мяне спявай. Інакш згубу на цябе напушчу.

Але Жыцень не спалохаўся. Як хадзіў на палі, так і працягваў хадзіць, збажыну па-ранейшаму даглядаць.

Дачуўся Злыдзень, што яго не паслухалі, ды як узлуецца, ды як раскрычыцца! А потым прыбег пад вярбу і ўсю маёмасць Жыценя знішчыў. Нават палівачку пагнуў.

Вярнуўся Жыцень з поля, убачыў, як нашкодзіў Злыдзень, паківаў са скрухай галавою і пайшоў куды вочы глядзяць.

Не стала Жыценя пры сяле — перастала радзіць і жыта. Занепакоіліся людзі, пачалі думаць-гадаць: што рабіць? Думалі яны, думалі і надумалі: трэба Злыдня прагнаць, а Жыценя адшукаць і папрасіць, каб зноў да іх перасяліўся.

Кінуліся ганцы ва ўсе канцы, шукаюць-шукаюць, а знайсці Жыценя не могуць. Аднойчы заўважылі: поркаецца нехта ў градах пры гарадзе. Падыходзяць, пытаюцца:

— Цябе, часам, не Жыценем клічуць?

— Жыценем,— адказаў дзядок. Ганцы адразу павесялелі:

— У нас просьба вялікая. У сяло вяртайся. Злыдня таго мы прагналі! А табе слова даём: ад усялякай набрыдзі бараніць будзем!..

— Добра,— згадзіўся Жыцень і патупаў услед за ганцамі.

Мінула колькі часу, і за сялом зноў жыта сцяною ўстала, зноў буйным коласам закалыхалася. А пад вярбою, у цяньку, сядзіць Жыцень і радуецца:

— Будзе жыта ўрадлівае — будзе і жыццё ў людзей багатае!..

## Хто галоўны

*Леанід Улашчанка*

Ні для каго не сакрэт, што спрэчкі былі, ёсць і будуць. Але спрэчка спрэчцы розніца. І пачынаюцца яны часцей за ўсё праз драбязу.

Аднаго разу ў нядзельку, акурат перад самым абедам, стравы, што стаялі на святочным стале, заспрачаліся, хто з іх самы галоўны. Трэба сказаць, што гаспадыня, якая гатавала іх, была жанчына працавітая і святочны абед удаўся на славу. Як кажуць: «Паспытаеш — пальчыкі абліжаш». Вядома, пальцы не трэба аблізваць, гэта непрыгожа. Выхаваны чалавек ніколі гэтага не робіць. Але не гэта галоўнае. Справа ў тым, што кожная страва лічыла сябе галоўнай. Грэцкая каша, якая стаяла ў вялікай прыгожай місе, раптам пыхнула парай і сказала:

— Слухай, падліўка, адсунься крыху ўбок. Ад цябе занадта пахне цыбуляй і перцам. Гэта можа пашкодзіць майму смаку. Ты ж бачыш, што ў мяне ўжо ўторкнулі лыжку, каб раскласці па талерках. І наогул, трэба быць больш сціплай у прысутнасці галоўнай стравы.

Што тут пачалося! Нават у казцы цяжка расказаць.

Падліўка ад такой знявагі аж зацягнулася тан̆юткай плеўкаю. Салата, якая стаяла недалёка ад яе, пазелянела ад злосці. Добра, што смятана яе крыху ахаладзіла. Інакш невядома, чым гэта ўсё скончылася б.

Фаршыраваны шчупак наважыўся нешта сказаць. Але тут яму ў пашчу ўторкнулі галінку пятрушкі. Заліўная ялавічына блішчала, нібы лёд, і грозна зыркала маркоўным вокам на ўсіх, хто надта гарачыўся і пыхкаў парай. Яна баялася, каб не растаў студзень, якім яна была залітая.

Цыбуля і часнок ледзь не перамаглі ўсіх. Вядома, удваіх! Нездарма кажуць: часначок — цыбульчын брат. Але грэцкая каша не здавалася. Яна пыхкала парай то ў адзін, то ў другі бок.

— Хіба вы не ведаеце, што я самая паважаная з усіх нас, самая пажыўная, самая смачная. Я нават у дыету ўваходжу.

Гарошак, які быў у мясным салаце, запярэчыў:

— А я?

— Памаўчаў бы лепш! Ты яшчэ зялёны зусім, а туды ж — у галоўныя.

— Без мяне, — сказала бульба, — ніколі ніхто не абыходзіўся. З мяне можна прыгатаваць трыста восемдзесят розных страў, і то я не выхваляюся, як ты, каша... Гэй вы, дранікі, чаму вы маўчыце?

Дранікі былі лянівыя. Адно толькі іх турбавала: хоць бы не страціць свайго цяпла. Бо што ж гэта за дранікі — халодныя?

А грэцкая каша зноў пачала:

— Ты, бульба, памаўчы! Табой і свіней, і жывёлу розную кормяць. А я толькі для людзей. Вось і выходзіць, што я самая галоўная.

— Не вельмі выхваляйся. Ты забылася, што бываеш і размазнёй, — кісла зазначыла капуста.

Тут пачалі да гаспадыні збірацца госці.

— А давайце дамовімся, — прапанавалі раптам агуркі, — каго першага возьмуць людзі ў рукі, той і галоўны.

На тым і пагадзіліся.

Гаспадыня запрасіла гасцей да стала. Рассядаліся нетаропка. Нарэшце госці паселі. На чале стала сядзеў самы старэйшы і паважаны ўсімі дзед. Ён агледзеў стол, запытаўся, ці ў кожнага ўсё ёсць. Яшчэ раз зірнуў на стол і ўсміхнуўся.

— Гаспадынька, я нешта не бачу на стале самага галоўнага...

— Чаго? — падхапілася паружавелая жанчына.

— Паглядзі сама і ўбачыш.

Гаспадыня акінула ўважлівым вокам стол і пляснула далонню аб далонь.

— А мамкі мае, зязюлькі! Гэта ж трэба — хлеб не паставіла. Так закруцілася, што і пра галоўнае забылася!...

Людзі за сталом заўсміхаліся, павесялелі, а жанчына прынесла вялікі бохан свежага духмянага хлеба і падала дзеду.

Той узяў востры нож і пачаў луста за лустай кроіць яго. Рукі ўсіх самі сабой пацягнуліся да хлеба.

Усе стравы прыціхлі.

Хлеб! Ён ніколі не прыядаецца і ніколі не лішні, колькі б яго ні было. Ён і ёсць усяму галава.

# Народная арыфметыка

## Лікі 1 і 2

### Прыказкі і прымаўкі

* Адзін у полі не воін.
* Адным пальцам вузла не завяжаш.
* Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць.
* Адзін дуб у полі — не лес.
* Адным колам плата не падапрэш.
* Адзін дасуж, да не дуж.
* Адно вока бачыць далёка, а два яшчэ далей.
* Адным сэрцам свету не запаліш.
* Аднаму льецца, а другому нават не капае.
* Аднаму капейка і тая рабром.
* Адна бяда не ходзіць, другую за сабою водзіць.
* Адзін з агнём, другі з полымем.
* Адным арэхам падзеляцца.
* Адно зерне пуды прыносіць.
* За аднаго бітага двух нябітых даюць.
* Адным разам дрэва не зваліш.
* Адзін, ды ладны.
* Адзін, ды нелюдзін.
* Адна галава не бяда, а калі і бяда, то адна.
* Адной маткі не адны дзеткі.

* Адною крупінкаю сыты.
* Адною рукою дае, а дзвюма адбірае.
* Адным кірмаш, а другім жыцця нямаш.
* Дзве работы зарáз не зробіш.
* Дзень дню розніца: адзін — матка, а другі — мачыха.
* Надвое бабка варажыла, а ў адно месца палажыла.
* Надвое бабка варажыла: ці памрэ, ці будзе жыва.
* Першы блін сабаку.
* Першы плод за плот.
* Першы шпак вясны не робіць.
* Раз густа, а другі — пуста.
* Рубель без капейкі не бывае.
* Рубель рубля робіць.
* Скупы двойчы плоціць, а дурны двойчы ходзіць.
* Ягадка да ягадкі і — поўны збан.
* Як клёцкі ў малаку, то па дзве валаку, а як у водзе, то раз, два — і годзе.

**Устойлівыя параўнанні**

Адзін, як вока ў лобе.
Адзін, як колік у плоце.
Адзін, як месячык у небе.

**Прыметы**

Два на гаду Юр'і, два дурні: увосень халодны, а ўвясну галодны.

Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ два тыдні.

Калі цёпла да Юр'я, то павінна сена быць і да другога Юр'я і ў дурня.

Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшоў Ілля — апалі два, прыйшоў Барыс — асыпаўся ўвесь ліст.

Прыйшоў Трэці Спас — бяры рукавіцы ў запас.

### Загадкі

Два браты жывуць цераз дарогу, адзін аднаго не бачаць.

*(Вочы)*

Два браты ў ваду глядзяцца, а разам не сходзяцца.

*(Берагі)*

Патыліца слініцца, спераду патрэбная. А ўжываецца толькі адзін раз.

*(Паштовая марка)*

Першы канец у жываце, а другі на верхнім кальцы. Каб першы канец дастаць, трэба ўсе кольцы зняць.

*(Клубок нітак)*

Два разы радзіўся, ні разу не ксціўся, а людзі вераць.

*(Певень)*

Поўны хлявец белых авец, адзін баран — і той бляець.

*(Зубы і язык)*

Стаіць два стаўбца, на стаўбцах — дзежка, а ў дзежцы — гладышка, а на гладышцы — гаршчок, а на гаршку — лес, а ў лесе тавар ходзіць.

*(Чалавек)*

У беленькай бочцы два розныя півы.

*(Яйцо)*

У зямлю кідаем, не жалеем, на другі год — разбагацеем.

*(Пасеў)*

Ходзіць пан па горадзе, носіць бліны на барадзе, кусок мяса на галаве.

*(Певень)*

Што такое перад намі: дзве аглоблі за вушамі, на вачах па калясу і сядзёлка на насу.

*(Акуляры)*

## Лік 3

### Прыказкі і прымаўкі

⁕ Абыякі двойчы робіць, а скупы тройчы плаціць.

⁕ Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, а толькі тры сыны — сын.

⁕ Адна ралля — два сярпы, дзве раллі — тры сярпы.

⁕ Адна бяда — не бяда, дзве бяды — паўбяды, а калі трэцюю напаткаеш, тады бяду спазнаеш.

⁕ Адсунься ты, то сядзе тры!

* Баба качаргу мяняла, тры дні гуляла.

* Баязліўцу адзін пень за тры ваўкі здаўся.

* Дзе двое сварацца, там трэці карыстаецца.

* На рабоце «ой» ды «ох», а за сталом адзін за трох.

* Нашто той вох, калі мы ўтрох.

* Не хвалі каня трэцяга дня, а хвалі трэцяга году.

* Не хвалі нявестку ў тры серады, а пахвалі ў тры гады.

* Не хваліся ў тры дні, а хваліся ў тры гады.

* Першыя пеўні — поўнач, другія пеўні — пара ўставаць, трэція пеўні — пярэдсвет.

* Схавай свае тры грошы.

* Трох не злічыць.

* У вераб'я багатая сям'я: у кожнага верабейкі па тры капейкі.

* У тры секачы сякуць, аднаго рака пякуць.

* Упрасіліся злыдні на тры дні, а за тры гады не выжывеш.

**Загадкі**

Адзін лье, другі п'е, трэці расце.

*(Дождж, зямля, трава)*

Адзін ляжыць, другі бяжыць, трэці паклоніцца і тут стаіць.

*(Вада, зямля, дрэва)*

Адзін кажа: «Пабяжым», другі кажа: «Паляжым», а трэці кажа: «Пахістаемся, ды тут застанемся».

*(Вада, снег, трава)*

Адзін кажа: «Світай, Божа!», другі кажа: «Не дай, Божа!», а трэці кажа: «А мне ўсё роўна, ці дзень, ці ноч».

*(Вакно, дзверы, стол)*

Адно ноччу глядзіць і днём глядзіць, другое ноччу не адпачывае, а трэцяе і днём, і ноччу не адпачывае.

*(Вокны, пожак, зямля)*

Два браты пузатыя на гару бягуць, а трэці гарбаты за чубы трымае.

*(Вёдры на каромысле)*

Іванец, на двух канцах рубец, а два катлы нясе.

*(Каромысел і вёдры)*

Ляцелі тры вароны. Селі на вароты, сталі кукаваць. Перша: «Мне лета летаваць». Другая: «Мне зіму зімаваць». А трэцяя: «Мне ўсё роўна».

*(Калёсы, сані, конь)*

Тры арлы арлююць, чужое яечка балуюць.

*(Кум, кума, поп пры хрышчэнні дзіцяці)*

Тры братца пайшлі на раку купацца, два купаюцца, а трэці на беразе валяецца.

*(Вёдры і каромысел)*

Тры браты на адным кані па белым полі едуць.

*(Пальцы, ручка, папера)*

## Загадкі-задачы

Дзве дачкі, дзве мацеры і бабулька з унучкай. Колькі ўсіх?

*(Трое: бабка, маці, дачка)*

* * *

Ішоў брат з сястрою і муж з жонкаю, знайшлі тры сыры. Як яны падзялілі?

*(Па аднаму сыру)*

* * *

Вёз адзін чалавек ваўка, казу і капусту. Воўк усё хоча казу з'есці, а каза — капусту, ён ім не дае. Прыехаў да рэчкі. Трэба яму перавезці іх на той бераг. А човен маленькі, больш як дваіх не возьме: або яму браць з сабою ваўка, або казу, або капусту. Прыйдзецца некалькі разоў ездзіць. Задумаўся чалавек. «Як жа мне перавезці, каб бяды не выйшла. З ваўком паеду — каза капусту з'есць. З капустай паеду — воўк казу з'есць. Казу павязу, а на другі раз як зрабіць?»

*(Спачатку трэба перавезці казу, потым — ваўка, а казу забраць назад. Пасля перавезці капусту і, нарэшце, вярнуцца забраць казу.)*

## Жарты

### Разумны хлопец

— Чаго плачаш, Янук?

— Капейку згубіў.

— Вось табе дзве, толькі не плач.

Янук узяў дзве капейкі, схаваў ды і зноў плача!

— Ды чаго ж ты плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Як бы не згубіў гэтай капейкі, дык меў бы ўжо тры.

## Лік 5

### Прыказкі і прымаўкі

* За пяць пальцаў не купіш.

### Загадкі

Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць.

*(Язык, вочы, вушы)*

Два стаяць, два ляжаць, а пятая хода ходам ходзіць.

*(Вушакі і дзверы)*

Дзве маткі маюць пяць сыноў, а кожны з іх адно імя.

*(Рукі і пальцы)*

З пяці бэляк хату строяць, а ўсе бэлькі цэлыя застаюцца.

*(Друткі для вязання)*

Зямля белая, насенне чорнае, пяцёра аруць, двое сочаць, адзін кіруе.

*(Кніга і чалавек)*

Пад страхою пяць паненак мокрыя, а па дарозе пяць сухія ідуць.

*(Пальцы жанчыны, калі яна прадзе кудзелю)*

Пяць авечак стажок скубуць, а пяць дарожкай бягуць.

*(Прадзенне)*

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся.

*(Пальцы)*

Пяць уцякае, а пяць даганяе.

*(Пальцы ў час прадзення)*

Пяць хлопчыкаў, пяць гулёнчыкаў, кожны хлопчык у свой гулёнчык.

*(Пальчатка)*

Чатыры чатырнічкі: на кожным чатырнічку па пяць пяцерпічкаў.

*(Рукі, ногі, пальцы)*

## Загадкі-задачы

Пералічыце пяць дзён па парадку, не называючы лікаў і назваў дзён.

*(Пазаўчора, учора, сёння, заўтра, паслязаўтра)*

## Лік 7

### Прыказкі і прымаўкі

⁕ Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю.

⁕ Адным махам сем мух забіяхам.

⁕ Адным стрэлам сем качак забіў.

⁕ Гаспадыня! Сем град — адзін бурак.

⁕ Гора адно не йдзе, а за сабою сем вядзе.

⁕ З сямі печаў хлеб.

⁕ Ліса семярых ваўкоў ашукае.

⁕ На сем двор адзін тапор, адзін рубіць, а шасцёра ў кулак трубяць.

⁕ На сем паганятых адзін араты.

⁕ На сем сукоў садзіцца.

⁕ На год сем прыгод, а на веку — без ліку.

⁕ Не хваліся за сем дзён, а хваліся за сем год.

⁕ Сем капот ды голы жывот.

⁕ Сем паноў, двое штаноў: хто раней устаў, той штаны ўзяў.

⁕ Сем пятніц на тыдні.

⁕ Сем раз адмерай, а адзін раз адрэж.

⁕ Сем разоў глядзі, а назад не вядзі.

⁕ Сем разоў мер і то не вер.

⁕ Сем сёл, адзін вол і той гол.

⁕ Семера аднаго не чакаюць.

⁕ У адзін дзень сем перамен.

### Прыметы

⁕ Каля Уласа сем марозаў: тры да Уласа, адзін на Уласа і тры пасля Уласа.

## Загадкі

Гаршчок разумны, хоць сем дзірак мае.

*(Галава)*

Крыкнуў вол на сем сёл, яго не відаці, а голас чуваці.

*(Царкоўны звон)*

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзя, шосты водзя, сёмы песні пяе.

*(Дзверы)*

Едзе кошка на шасцёх ножках, сама сёмая.

*(Тыдзень)*

Прыйшла Эльжуха ў сямі кажухах.

*(Цыбуля)*

Сем міль масту, а ў канцы цвет, ды на ўвесь свет.

*(Вялікі пост і Вялікдзень)*

Скінуўся ўбок — застаўся хвост на сем вёрст.

*(Клубок ніцак)*

Стаіць мост на сем вёрст, у канцы маста стаіць яблыня, пусціла цвет на ўвесь белы свет.

*(Вялікі пост і Вялікдзень)*

Сядзіць бабуля ў сямёх кажушках, хто яе прыбачыць, той пэўна заплачыць.

*(Цыбуля)*

У адным клубочку ды сем дырачак.

*(Галава)*

У адну пуньку ды сем варот.

*(Галава)*

Чатыры татыркі, дзве тапатыркі, сёмы вярцель.

*(Карова)*

### Загадкі-задачы

Ляцела два статкі гусей. Першы статак гаворыць:

— Дайце нам адну гусь, тады ў нас будзе пароўну.

А другі статак гаворыць:

— Дайце вы нам адну гусь, тады ў нас будзе ў два разы больш.

Колькі было гусей у адным і другім статку?

*(Пяць і сем)*

* * *

Стаяла хатка, а ў ёй было сем акенцаў, і на кожным сядзела сем кошак, а ў кожнай кошкі было па сем кацянят. Увайшоў і я ў хату і маіх было дзве нагі.

Колькі ў іх ва ўсіх было ног?

*(Дзве нагі, а ў катоў — гэта ж лапы)*

## Лік 8

### Прыказкі і прымаўкі

* Восень — на дзень пагод восем.

* Восень — работ восем.

* Прыйшла вясна — ужо часу няма; прыйшло лета — бярыся то за тое, то за гэта; надыйшла восень — яшчэ работ восем.

* Хавай асьмачок на ліхі дзянёк.

## Загадкі

Восем васьмей, пяць па пяцей, дзве во якіх ды дзве во якіх — моцька ды роцька.

*(Сані, вязы, аглоблі, палазы, падсядзёлак, хамут)*

На дрэва лезе на васьмі нагах, а з дрэва на трох.

*(Павук)*

## Загадкі-задачы

Муж з жонкай насілі буракі ў пограб, а маленькі Сымонка забаўляўся каля іх:

— Што ж ты, Сымонка, маме не дапамагаеш? — жартуючы сказаў бацька. — Бачыш, як яна стамілася.

Дзіця схапілася, набрала ў падолак буракоў ды і нясе.

— Ну, колькі ж ты, Сымонка, прынёс? — пытае бацька.

— Дваццаць,— адказаў Сымонка.

Глянуў бацька ў падолак, усміхнуўся і сказаў:

— Не, сынку! Як бы ты ўзяў столькі, ды паўстолькі, ды чвэрць таго, ды я табе даў два буракі, ды мама два, ды ты сам яшчэ выкапаў два, тады было б дваццаць.

Колькі было буракоў у Сымонкі?

*(Восем)*

# Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш

Свет велізарны... Словы, словы...
Іх не злічыць і не спазнаць!
А словы «мама», «тата»
на ўсіх мовах
Амаль аднолькава гучаць.

*Паводле Алеся Бачылы*

## Будзь верным, добрым сынам!

*Эдзі Агняцвет*

Раней за ўсіх яна ўстае,
Пазней за ўсіх кладзецца.
Яна жыве, яна пяе, —
І дзецям лепш пяецца.
Ты рос, як цёплы каласок,
Пры месяцы і зорах
Пачуеш мілае «сынок»,
Хоць будзе і за сорак...
За словам «маці» ў свет пайшлі
Маленства, мара, мова.
І мір, і мужнасць на зямлі —
Жыцця твайго асновы.
Каб не тужыла па начах, —
Ёй падрастай на ўцеху!
Хай будзе ў матчыных вачах
Пабольш іскрынак смеху!

Ты не шкадуй ласкавых слоў
Для роднай, для адзінай.
Адказвай маці на любоў —
Будзь верным, добрым сынам!

## Бабуліна крынічка

*Яніна Жабко*

Кажуць, ёсць крынічка шчасця,
П’юць з крыніцы той ваду,
Ды пра іншую крынічку
Я размову павяду.

А крынічка гэта побач,
Незвычайнай глыбіні,
У сэрцы роднай мне бабулі
Ёсць крынічка дабрыні.

Дабрыня бабулі грэе,
Нібы сонейка цяпло.
Мне з бабуляю ніколі
Кепска, сумна не было.

Побач з ёю так утульна,
З ёй гаворку я вяду.
Кожнай раніцай з бабуляй
У садочак я іду.

І калі мяне пахваляць,
Я скажу вам без хлусні:
Кінула бабуля ў сэрца
Мне зярнятка дабрыні.

# Вернісаж

*Алена Васілевіч*

Цэлы тыдзень мы з сястрой спрачаліся, сварыліся і некалькі разоў нават добра пабіліся. Мы вырашалі, які падарунак лепей зрабіць маме ў дзень Восьмага сакавіка.

Сястра сказала:

— Я вышыю маме сурвэтку. Коцік хлебча з талеркі малако.

Ох! Коцік хлебча малако!.. На сурвэтцы. А потым гэтая сурвэтка будзе ляжаць на хлебніцы. І з хлебніцы трэба будзе браць і есці хлеб!.. Большай недарэчнасці нельга было прыдумаць.

— Ну, ведаеш, я з тваім коцікам есці хлеб з адной хлебніцы не збіраюся! — абурыўся я.

— А хіба я збіраюся табе яго дарыць? — укалола мяне сястра.

— Не мне, дык маме. Усё роўна.

— А вось і не ўсё роўна. Мама любіць усякія мае падарункі. І не твая справа, што захачу, тое і падарую!

Гэтай упартасці не магла прабіць ужо нават сетка (звычайная капронавая сетка, з якой мы ходзім у магазін). Сеткай гэтай я не раз карыстаўся, калі мама пакідала нас з сястрой удваіх і калі на мяне ўскладваўся абавязак выхоўваць сястру... Сёння займацца выхаваннем у мяне не было часу: да свята заставаўся ўсяго адзін толькі дзень, а мы не падрыхтавалі для мамы яшчэ ніякіх падарункаў.

І я пайшоў на хітрасць. Я надаў свайму твару выраз глыбокай развагі, нейкі час маўчаў, нібыта заняты сур'ёзным роздумам, а потым так звярнуўся да сястры:

— Коцік хлебча з талеркі малако, безумоўна, таксама нядрэнна... Але ж у мінулым годзе ты таксама вышывала маме коціка.

— Не, у мінулым годзе я вышывала зайчыка.

— Гм... Вось бачыш. А ў дзіцячым садзе таксама быў зайчык?

— Не, у дзіцячым садзе, калі я была ў старэйшай групе, я вышыла маме вішанькі. А ў малодшай групе я выразала маме прыгожы зялёны кружок. А на яго наклеіла яшчэ маленькія чырвоныя кружочкі... Калі не верыш — магу паказаць. Усе мае падарункі ляжаць у маміным пісьмовым стале. Там усё маё багацце ляжыць, кажа мама. Мама кажа, што яна хавае яго і аддасць мне, калі я вырасту вялікая...

Перагаварыць або спыніць маю сястру гэтаксама немагчыма, як немагчыма ўгаварыць яе не рабіць тое, што нікому не патрэбна і не цікава.

— Добра, добра,— зрабіў я ўсё-такі спробу спыніць яе.

Але дзе там! Адзін момант — і сястра разлажыла перада мной папку з яе багаццем, якое захоўвалася ў маміным стале. Падумаеш багацце! Пісьмо маме, калі мама ляжала ў бальніцы. Літары друкаваныя — і ўсе шыварат-навыварат:

МАМАЧКА Я БЕЗ ЦЯБЕ СУМУЮ

Незразумела толькі, чаму мама не разарвала гэтыя каракулі і не выкінула іх вон...

А то яшчэ ў гэтым «багацці» ляжаць сестрыны малюнкі. Ваза, падобная да вядра. І стол, у якога ўсе чатыры ножкі з аднаго боку... Потым сястра пачала выхваляцца пасмачкай валасоў, якую адстрыглі, калі ёй было дзевяць месяцаў. Пачала выхваляцца сваімі зайчыкамі і вішанькамі...

Я ўвесь гарэў нібы ў агні: і навошта маме спатрэбілася хаваць увесь гэты Натчын хлам? Не хапала яшчэ адной сурвэткі... А маме, безумоўна, няёмка будзе сказаць, што ёй надакучылі гэтыя коцікі і зайчыкі! Бедная мама!

Я, напрыклад... Я таксама рабіў падарункі маме на святы. Праўда, летась я забыўся пра мамін дзень. А ў дзень мамінага нараджэння атрымаў двойку за паводзіны... Падумаеш, па ўроку батанікі пацягнуў за касу Лорку-зубрылку, а настаўніца ўбачыла... Затое ў гэтым годзе я вырашыў зрабіць маме незвычайны падарунак! Такі падарунак, якога ніхто не зробіць.

— Ведаеш што, — завязваючы сваё багацце назад у папку, звярнулася да мяне сястра. — Я ўжо не буду вышываць коціка. Я перадумала.

— А што ж ты будзеш?

— Я падарую маме малюнак. Прыгожы, прыгожы, як у нашым музеі, дзе карціны.

— Малюнак?! — я аж падскочыў ад нечаканасці.

Як гэта я сам не здагадаўся. Мама так любіць, калі мы малюем, або іграем (сястра іграе на скрыпцы, я таксама крыху іграю, але мама кажа, што я лянуюся), або чытаем добрыя кніжкі...

У мінулую нядзелю мы хадзілі з мамай у музей і бачылі там столькі ўсякіх карцін! Ідучы дадому, мама сказала нам:

— Бачыце, дзеці, якую мы з вамі сёння радасць атрымалі.

Дык чаму ж і сапраўды не зрабіць маме гэтую радасць. Я ж таксама магу падараваць ёй малюнак. І, напэўна, не горшы за Натчын...

— Я намалюю маме птушку! — паведаміла сястра з другога пакоя. Яна ўжо раскладвала на стале паперу і рыхтавала ваду для фарбаў. І рабіла гэта так урачыста, што я не вытрымаў, крыкнуў ёй:

— Падумаеш, задавака! І аддай, калі ласка, мае фарбы, я таксама буду маляваць.

— Жадзёба!

— Кажу табе, аддай!

— А вось і не аддам!

Нічога больш не кажучы, я накіраваўся да таго месца, дзе звычайна вісела наша сетка.

— Усё роўна не аддам! Усё роўна! — захныкала Натка.

— Плакса-вакса-гуталін, на насу гарачы блін! — падражніў я сястру.

— А ты... А ты...

Нарэшце нам надакучыла сварыцца і мы ўзяліся за маляванне. Сястра малявала птушку,

а я... Я вырашыў намаляваць карціну зімовага лесу. Такую якраз, як у мастака Шышкіна.

— Ты хутка ўжо скончыш? — праз кожныя пяць хвілін пыталася ў мяне Натка.

Праз адчыненыя дзверы я бачыў, як сястра сядзела, высунуўшы кончык языка, старанна сцірала нешта сціркай, потым малявала кістачкай, а потым зноў сцірала і зноў малявала. Яна расчырванелася і аж спацела — так старалася. У мяне ж... Я таксама стараўся. Але мой зімовы лес атрымліваўся такім зялёным і стракатым, якім не быў ён і летам. Я ўзяў другі аркуш і замест лесу намаляваў адну толькі яліну. Падумаеш... Затое поруч з ялінай я намаляваў прыкіданы снегам пень. Пень мне спадабаўся. Тады я намаляваў яшчэ адзін пень і таксама прыкідаў яго снегам. А поруч з ім яшчэ адзін і яшчэ адзін... Я так захапіўся, што не заўважыў, калі была скончана мая карціна. Праўда, атрымаўся не зімовы, а ссечаны лес...

— Ты ўжо хутка скончыш? — неўзабаве зноў запытала ў мяне сястра, размахваючы сваім малюнкам у паветры. Так яна сушыла яго.

— Хутка, — няпэўна адказаў я, на самай справе не ведаючы, як мне быць.

— А ў мяне ногі не атрымліваюцца, — паскардзілася Натка. — Можа, ты мне намалюеш ногі, Вовачка?

Ага, як намаляваць ёй ногі, дык тады я ўжо Вовачка...

— Давай сюды, — згадзіўся я.

І зрабіў гэта знарок: цікава паглядзець, што там у яе атрымалася? Натка прынесла свой малюнак.

— Вось бачыш, усё добра, толькі ногі ў мяне...

— Ногі ў цябе... А якая гэта птушка?

— Голуб...

— Голуб? Які ж гэта голуб! Гэта ж варона!

— Сам ты варона! — накінулася на мяне Натка, аднак у час зразумела: яшчэ адна абраза, і я адмоўлюся маляваць ногі яе птушцы.

— І зусім не варона! І зусім голуб, як у нашага дзядзі Колі. Шэранькі...

— Шэранькі... А дзюба?

Дзюба ў Натчынага голуба сапраўды была доўгая і панурая.

— А хвост?

Хвост таксама быў, як у вароны.

— Эх, мастачка!.. Давай я табе пакажу, як малююць сапраўдныя мастакі!

Я узяў у Наткі кістачку. Р-раз. Д-два. Р-раз. Д-два... Птушка абаперлася на зграбныя сізыя ножкі, здаецца, вось-вось зробіць некалькі нетаропкіх кароценькіх шажкоў...

— Ой, які прыгожанькі! Які прыгожанькі! — запляскала ў далоні сястра. Яна так захаплялася сваім голубам, што мяне аж злосць разабрала. Намалявала нейкую варону, а форсу колькі! Каб не мае ногі, дык наогул не было б на што глядзець...

— Падумаеш, задавака!.. «Вароне где-то бог послал кусочек сыру...»

Я чакаў, што Натка накінецца на мяне, будзе злаваць, плакаць... А яна раптам як засмяецца, як запляскае яшчэ мацней у далоні.

— Ой, як цудоўна! Ой, як цудоўна! А я не ведала, як назваць свой малюнак!.. Ты мне, Вовачка, толькі дамалюеш яліну. Яліны ў цябе вельмі добра атрымліваюцца! А сыр — сыр я і сама намалюю!

І Натка ўзялася за сыр. За мой сыр. Бо гэта ж я ёй падказаў яго. А сам я сядзеў над сваім лесам і ўсё падмалёўваў і падмалёўваў прыкіданыя снегам пні...

Вось табе і зімовы лес. Вось табе і Шышкін... Безумоўна, лепш за ўсё было б узяць новы аркуш і, як кажа наш пастаўнік малявання, памяняць тэму...

Скончыўшы з сырам, задаволеная сваім малюнкам, сястра звярнула нарэшце ўвагу і на маю работу.

— Што гэта ў цябе — адны пні? — Вочы ў Наткі шырока расплюшчыліся, губы ад здзіўлення выцягнуліся... І раптам яна як пакоціцца ад смеху на канапу:

— Ой, памру! Ой, памру!

— І нічога смешнага няма, — пакрыўдзіўся я, прыкрываючы свае пянькі чыстым аркушам паперы. — Вельмі ўжо твая варона...

— Ведаеш... Ведаеш, як трэба назваць тваю карціну? — ледзь прамовіла скрозь смех Натка.

— Ну, як? — я не чакаў ад яе нічога добрага.

Натка зноў пакацілася на канапу.

— Плакала... Плакала Саша... як лес высякалі...

Дзіўна, але я таксама не пакрыўдзіўся на сястру. Як і яна, я таксама запляскаў у далоні і ў дадатак перакруціўся яшчэ на адной назе.

— Натка — ты геній!..

І тут жа зрабіў подпіс пад сваёй карцінай: «Плакала Саша, як лес высякалі...»

* * *

Назаўтра мы сустрэлі сваю маму з работы яшчэ на парозе. Мы тут жа ўзялі ў яе з рук цяжкую сумку. (Мы стрымаліся! Мы не спыталі яе на гэты раз: «А што ты прынесла нам?..») Мы дапамаглі ёй распрануцца і ўрачыста, пад рукі, павялі яе ў пакой: там, на самым відным месцы, віселі нашы малюнкі — Натчын голуб, або «Вароне дзесьці бог паслаў кавалак сыру», і мой зімовы лес, або «Плакала Саша, як лес высякалі...»

— Ого! — ад прыемнага здзіўлення мама спынілася за некалькі крокаў ад нашых малюнкаў. — Ого! — паўтарыла яна. — Дык я трапіла на вернісаж!

Мы ніколі не чулі гэтага слова: вернісаж. І не ведалі, што яно азначае.

— Віншую цябе са святам, мамачка, — не вельмі ўпэўнена прамовіла Натка.

— І я віншую цябе... — гэтак жа няўпэўнена ўслед за сястрой паўтарыў і я.

— Дзякуй, дзякуй, мае залатыя мастакі! — пацалавала па чарзе Натку і мяне мама. — Ну, і калі ў нас сёння вернісаж!.. Дык на вернісажы звычайна мастакам гавораць прыемныя словы, хваляць іх... Вось і я...

Мама хуценька адвярнулася да свае цяжкое сумкі, дастала адтуль дзве каробкі цукерак і дала іх нам — Натцы і мне.

Вось што, аказваецца, азначала гэта дзіўнае слова — вернісаж. Нам з сястрой яно спадабалася.

## Незвычайны дыктант

*Васіль Ткачоў*

Алесь дрэнна піша дыктанты: памылка на памылцы. Каб хлопчык трохі падцягнуўся, настаўніца параіла пісаць дыктанты дома.

Вечарам Алесь прынёс тату падручнік і сказаў:

— Дыктуй, тата. Буду вучыцца пісаць без памылак.

Тата ахвотна дыктуе. Алесь старанна піша. І так некалькі дзён запар. Потым тата адклаў падручнік убок.

— Садзіся, сынок, пішы, — сказаў ён. — Сёння буду дыктаваць на памяць.

Алесь выводзіць сказ за сказам: «На двары адліга. Радасна свеціць сонейка. На вуліцы лужыны. Я не магу прайсці міма. Абавязкова ўлезу ў ваду...»

Алесь глянуў на тату:

— Ты пра каго так?

— Пішы, сынок, пішы.

Алесь працягвае пісаць: «Прыйдзеш дадому ўвесь брудны, мокры — вось маці і работа. А яна хацела адпачыць...»

— Дрэнны дыктант ты, тата, прыдумаў, — пачырванеў да вушэй Алесь.

— Нічога я не прыдумаў, — сказаў тата.

Вечарам, зрабіўшы ўрокі, Алесь вырашыў, што заўтра ён напіша зусім іншы дыктант.

## Мама

*Лідзія Арабей*

Паўлік жыў у дзіцячым доме. А дзіцячы дом — гэта такі дом, дзе жывуць дзеці, якія не маюць ні мамы, ні таты. Чаму ў Паўліка не было ні мамы, ні таты, ён не ведаў. Яму здавалася, што ён нарадзіўся і жыў у дзіцячым доме ўсё сваё жыццё. Паўліку тут было някепска. Меў шмат сяброў, у сталоўцы смачна кармілі, выдавалі новыя кашулькі, куртачкі, чаравікі. Але нечага яму не хапала. Не хапала, мусіць, таго таемнага, невядомага, што называлася словам «мама». Некаторыя дзеці называлі мамаю выхавацельніцу Людмілу Іванаўну. Калі яна з'яўлялася сярод іх, кожны хацеў дакрануцца да яе рукі. І Паўлік не раз спрабаваў падлашчыцца да Людмілы Іванаўны, але не мог праціснуцца, так шчыльна абступалі яе дзеці. Праўда, ён ведаў, што Людміла Іванаўна несапраўдная мама: не можа быць адна мама на ўсіх дзяцей, у кожнага хлопчыка і дзяўчынкі павінна быць свая мама.

Аднойчы ён падышоў да Каці, у якой нядаўна яшчэ была мама, і спытаў:

— А хто гэта — мама? Якая яна?

Каця схіліла на бок галоўку, задумалася. Пакруціла далонькаю.

— Мама... Ну, гэта самая прыгожая... І самая добрая... Яна ўсіх любіць...

— А дзе мая мама? — спытаў Паўлік.

Каця зноў задумалася.

— Хто ж ведае... Можа, ходзіць дзе па вуліцы...

На тым размова і скончылася. А Паўлік задумаўся: «Калі мая мама недзе ходзіць па вуліцы, то, пэўна, яе можна знайсці?» І аднаго дня, калі ўсе дзеці пайшлі ў двор гуляць, знайшоў шчыліну ў агароджы і пралез на вуліцу.

Па вуліцы ішло шмат людзей — цёці, дзядзі. Паўлік хацеў знайсці сярод цёцяў самую прыгожую, але ўсе яны так хутка прабягалі, што ён не паспяваў разгледзець. Непадалёку быў сквер. На лавачках сядзелі людзі. Там было куды спакайней, чым на вуліцы, і Паўлік збочыў у сквер.

Тут таксама хадзілі, сядзелі на лавачках цёці. У скверы іх лягчэй было разгледзець. На адной лавачцы сядзела цёця і вязала нешта пруткамі. На каленях у яе ляжаў вялікі клубок сініх нітак. Цёця здалася Паўліку прыгожаю. Ён нясмела падышоў да яе і спытаў:

— Цёця, можа, вы мая мама?

Цёця перастала варушыць пруткамі і здзіўлена паглядзела на Паўліка:

— А ты што, згубіў сваю маму?

— Не, я не губляў яе. У мяне зусім няма мамы.

— Сіротка, значыць, — сказала цёця. — Але ты, хлопчык, памыліўся. Я не твая мама, — і зноў пачала варушыць пруткамі.

А Паўлік падумаў, што не такая ўжо гэтая цёця і прыгожая. Ён і праўда памыліўся. І пайшоў далей па алейцы. Мінуў некалькі лавачак, на якіх сядзелі цёці з дзецьмі, але ніводная з іх не здалася яму такою, каб аказацца яго мамаю.

Каля адной лавачкі Паўлік зноў запыніўся. Тут сядзелі цёця з дзядзем. Цёця абдымала дзядзю за шыю. Значыцца, яна яго любіць. А Каця сказала, што мама добрая, што яна ўсіх любіць. І была гэтая цёця прыгожая. Паўлік пастаяў крыху ўбаку, потым адважыўся і нясмела падышоў.

— Цёця, вы мая мама? — спытаў ён.

Цёця спалохана зірнула на яго:

— Гэта ты ў мяне пытаешся, хлопчык?

— У вас, — ветліва адказаў Паўлік.

— Ты што! Якая я табе мама, — цёця, здаецца, нават зазлавала. — Пойдзем, — сказала яна дзядзю.

Калі цёця паднялася, то аказалася такой высокаю, што Паўлік зразумеў — такая не магла быць яго мамаю. Ён засумаваў. Аказваецца, не так проста знайсці маму. Можа, яна ходзіць не там, дзе ён шукае? Хлопчык цяжка ўздыхнуў. Ён ужо не спадзяваўся на ўдачу. Ішоў па алейцы, не вельмі і прыглядаючыся да цёцяў. Але адна

зноў кінулася яму ў вочы. На лавачцы сядзела цёця ў белым капялюшыку і чытала кнігу. Паўлік аглядзеў яе з аднаго боку, з другога некалькі хвілін, падышоў да яе.

— Цёця, — нясмела загаварыў ён, — можа, вы мая мама?

Цёця апусціла кнігу, глянула на Паўліка.

— А як цябе зваць? — спытала яна.

— Паўлік.

— А колькі табе гадоў?

— Пяць...

— А дзе ты жывеш?

— У дзіцячым доме...

Цёця ласкава пагладзіла яго па галаве.

— Трэба падумаць, успомніць, можа, я і праўда твая мама...

Яна ўзяла Паўліка за руку і павяла ў дзіцячы дом. Потым доўга нешта гаварыла з Людмілай Іванаўнай. А праз нейкі час прыйшла ў дзіцячы дом з дзядзем і сказала Паўліку:

— Я — твая мама, а гэта — твой тата. Збірайся, сынок, пойдзем дадому.

Так Паўлік знайшоў сваю маму. Нездарма людзі кажуць: «Хто шукае, той знаходзіць».

## Хацеў маме дапамагчы

*Ганад Чарказян*

**(*Пераклад з курдскай мовы Рыгора Барадуліна*)**

У адной вёсачцы жыў са сваёй мамай маленькі Вослік. Меў ён танюсенькія ножкі, доўгую, худзенькую шыйку, вялікія вушы ды кароценькі

хвосцік. Увесь дзень Вослік бегаў за маці. А яна бесперапынна перавозіла нейкую паклажу. За дзень так стамлялася, што ў яе не заставалася сілы нават прылашчыць Восліка. Думаў Вослік, як дапамагчы маці. Але нічога разумнага не прыходзіла ў галаву.

— Мама, — сказаў ён аднойчы, — хачу дапамагчы табе, ды не ведаю як.

Маці паглядзела на Восліка і адказала:

— Будзь толькі здаровы, і гэта самае лепшае, што ты можаш мне зрабіць.

Але Вослік не супакоіўся. Ён хацеў дапамагчы маці, бо бачыў, як ёй цяжка. І вось ён знайшоў у двары бервяно, якое гаспадар прыхінуў да сцяны. Вослік пачаў бачком штурхаць яго да брычкі. Штурхаў, штурхаў, а бервяно ўпала і балюча стукнула Восліка па спіне. Вослік паваліўся. Убачыла гэта маці, раззлавалася:

— Ну як жа ты так?

— Я хацеў дапамагчы табе, мама, — прызнаўся Вослік.

— Гэта добра. Але ж ты яшчэ маленькі і кволенькі. Расці, сілы набірайся. А пакуль я сяк-так сама спраўлюся.

Колькі дзён Вослік ляжаў хворы, не ўставаў. Маці ўвесь час была занятая: вазіла то нейкія мяхі, то бідон з вадою. Але кожны раз, як толькі выпадзе вольная хвілінка, яна прыбягала да Восліка, каб прылашчыць яго.

Нарэшце Вослік ачуняў і выйшаў у двор. Была вясна, свяціла сонейка, беглі ручаінкі.

«Колькі жыву, — падумаў Вослік, — а вясны не бачыў».

— Чаму ты стаіш і нічога не робіш, Вослік? — кружляючы вакол слабенькага яшчэ Восліка, запытаўся Чмялёк.

— Я думаю, — адказаў Вослік.

— Пра што ты думаеш?

— Як дапамагчы маме.

— Гэта вельмі проста. Трэба пачынаць з маленькай справы.

Чмялёк паляцеў далей. А Вослік здзівіўся: «Гэткі малюсенькі і гэткі кемлівы. Дзіва дый годзе! А можа, ён праўду кажа?»

## Радасць

*Уладзімір Ліпскі*

Рыгорка прагна слухае казку. Ён ловіць кожнае слова. Калі бабуля прыпыняецца, каб паправіць акуляры, Рыгорка цярэбіць яе за рукаў:

— Чытай, бабулька, хутчэй!

— Цікава? — пытае яна і перагортвае старонку.

...Цудоўную кветачку падарылі дзяўчынцы Жэні. Варта толькі адшчыкнуць пялёстак і сказаць два-тры словы, як тут жа збываецца ўсё, чаго пажадаеш.

Вось дзяўчынка на Паўночным полюсе, а праз хвіліну яна зноў дома і па яе просьбе ў хату злятаюцца цацкі з усяго свету. Жэня абрывае апошні блакітны пялёстак цудоўнай кветачкі-сяміцветачкі і загадвае, каб хворы хлопчык Віця стаў

здаровы. У тую ж хвіліну хлопчык саскоквае з лавы і пачынае гуляць з Жэняй у квача. Ён бегае так хутка, што дзяўчынка дагнаць яго не можа…

— А што далей? Чытай, бабулька, — просіць Рыгорка.

— А далей… казачцы канец, — кажа яна і загортвае кніжку.

— У-у, — незадаволена махае рукой Рыгорка. На вочы набягаюць слёзы.Так хочацца быць яму з дзяўчынкай Жэняй і хлопчыкам Віцем!

— А ведаеш што? — кажа бабуля. — Уяві сабе, што і ты атрымаў у падарунак цудоўную кветачку. Што б ты пажадаў? Толькі памятай: у кветачкі сем пялёсткаў — значыць, могуць збыцца толькі сем тваіх жаданняў.

Рыгорка павесялеў. Радасная ўсмешка зноў асвяціла яго твар, і ён сказаў:

— Хачу паглядзець кіно «Кветачка-сяміцветачка».

— Хачу кожны дзень бываць у цырку.

— Куплю дзве шакаладкі і тысячу цукерак.

— Хачу на ракеце паляцець у космас. На Месяц і на Марс..

Жаданні ў Рыгоркі самыя неверагодныя. Ён так імі захапіўся, што, здавалася, не толькі адрываў пялёсткі і выказваў просьбы, а ператвараў казку ў яву. Урэшце бабуля перапыніла яго і сказала:

— Застаўся адзін пялёстак. Ты можаш папрасіць самае-самае… галоўнае.

Рыгорка задумаўся. Уздыхнуў.

— Апошні пялёстак... Самае-самае... Прыдумаў! — закрычаў Рыгорка.

— Хачу, — выразна прагаварыў ён, — каб ты, бабуля, стала маладой.

Бабуля пагладзіла ўнука па галоўцы, твар яе прасвятлеў. Яна нібы і сапраўды стала маладзейшай.

## Малінавы чай

*Расціслаў Бензярук*

Непадалёку ад мядзведжага жытла расла маліна. Сёлета яна ўрадзіла, як, можа, ніколі. Не давалі спакою ягады маленькаму Патапку. Але ён памятаў дзядулеў наказ:

— Патапка, не рві зялёных ягад. Пачакай, пакуль яны даспеюць. Тады яны будуць духмянымі і салодкімі.

Патапка сам не еў і вартаваў, каб ніхто не абарваў іх. А сёння не выцерпеў. Сарваў адну ягадку — і ў рот. Ягада была салодкая і духмяная. Значыць, пара рваць.

Мядзведзік сам наеўся ўдосталь, а потым вырашыў:

— Занясу яшчэ маме. Скажу: «Гэта табе сабраў!» Вось узрадуецца.

Патапка зрабіў кулёчак і напоўніў яго малінамі. Радасны, ён панёс ягады дамоў. Мама якраз цыравала Патапкавы шкарпэткі, а дзядуля Патап Іванавіч чытаў «Лясную газету».

14 Зак. 1790

Мядзведзік працягнуў маме кулёчак і нечакана сказаў:

— Віншую цябе, мама, з днём нараджэння!

Сказаў і засаромеўся, бо ведаў, што мама, як і ён, Патапка, нарадзілася не ў ліпені, а зімою.

Але старэйшыя быццам нічога не заўважылі. Мама падзякавала Патапку за падарунак, а дзядуля адклаў у бок газету, прагаварыў:

— Мы не ведалі, чым сёння чай заварыць. Дык будзем піць малінавы!

Патап Іванавіч пайшоў ставіць самавар. Потым усе сядзелі за сталом, елі бліны з мёдам і запівалі малінавым чаем. Чай быў смачны. Але Патапка сядзеў як на іголках: круціўся за сталом, безупынку дзьмухаў на вар. Урэшце не выцерпеў:

— Прабач, мама, што я цябе сягоння з днём нараджэння павіншаваў. Неяк само сабой выйшла!

— А ў мяне і сапраўды такі ж радасны дзень, як дзень нараджэння, — адказала мама. — Мой сын становіцца дарослым. Ён не абарваў раней часу ягады, а пачакаў, пакуль яны даспеюць. Ён сам пад'еў і пра мяне не забыўся. Ды ў рэшце рэшт ён не баіцца прызнацца, што сказаў няпраўду…

Ад гэтых маміных слоў Патапку стала радасна-радасна.

# У нашай памяці...

## Буслы

*Аляксей Дудараў*

Ідучы з лесу, Андрэйка з мамай адпачывалі ля сціrты саломы. Жмурачыся ад сонца, Андрэйка глядзеў у неба. Яму здавалася, што пад канец лета яно зрабілася незвычайна высокім, усё адно як паднялося і стала шырэйшае і большае.

— Мама! — усклікнуў раптам хлопчык.— Глянь: журавы лётаюць! Вунь, над фермай.

Мама сумна сказала:

— Гэта не журавы, сынок, гэта буслы з суседніх вёсак. Кожны год, збіраючыся ў вырай, яны над нашай Клёнаўкай кружаць. А ў нас не жывуць...

— Чаму? — спытаў хлопчык.— Ім бы добра ў нас жылося.

— Некалі жылі,— сказала мама,— а цяпер не хочуць.

— А чаму?

— Пакрыўдзіліся. Яшчэ тады, калі я была такая, як ты цяпер.

У першы месяц вайны прыкацілі ў нашу вёску фашысты... Памятаю, як кароўку нашу забіралі,

за курамі па двары ганяліся. Пазней гэтыя вылюдкі ўсё спалілі: і хаты, і сады, і дрэвы...

У нашым двары рос вялізны разгалісты дуб. На ім, колькі вёска стаяла, буслы сабе жытло рабілі. Дык вось. Вайна ідзе, а ў буслоў свой клопат: дзяцей гадаваць, каб да восені іхнія крылы дужымі сталі. І не заміналі ж нікому, а адзін фашыст прыцэліўся ды па буслу з аўтамата часануў... І забіў. Ляжыць бедны птах, дзюба ў пыле. Немцы сабраліся ля яго, гергечуць, смяюцца. Бусліха магла б уцячы, але як жа было ёй сваіх дзетак кінуць? Кружылася над гняздом, пакуль той самы ірад і па ёй не бабахнуў...

Забітая бусліха ляціць на зямлю акурат на немцаў з іх машынамі. І — ці паверыш? — спужаліся яны. Сыпанулі з дарогі да агароджы, прыціхлі нават. Ну, а калі яны паехалі, мы, малыя, збегліся, паплакалі і пахавалі буслоў. А дзед твой злазіў на дрэва, дастаў з гнязда асірацелых буслянят. Мы іх да восені жабамі кармілі. Восенню яны паляцелі ад нас. Пэўна, расказалі ўсім буслам, што тут адбылося, і з таго часу не селяцца яны ў нашай вёсцы.

Мама ўздыхнула і паднялася з саломы:

— Ну, пойдзем, сынок.

Ішлі моўчкі. Андрэйка ўсё глядзеў у неба і думаў. Няўцям яму было, як гэта людзі маглі забіць такую прыгожую птушку... А буслы кружыліся, кружыліся...

І раптам усхвалявана і з радаснай надзеяй хлопчык спытаў:

— Мама, а мо, калі восень пройдзе і снег і калі я падрасту і ў садзік не буду хадзіць... мо яны прыляцяць да нас? Я іх таксама карміць буду. Я жаб не баюся...

— Мо і прыляцяць,— уздыхнула мама.

— Няхай бы прыляцелі!

Неба з буслямі здавалася хлопчыку вельмі прыгожым, ласкавым і спакойным.

## Бусел над Хатынню

*Васіль Жуковіч*

Пакружыўся над Хатынню бусел
сонечна-пагодлівай вясною:
каміны стаяць. І людзі ў скрусе.
А нідзе хаціны ні адной.

Заміраюць галасы людскія,
гукі абуджальнае вясны,
і плывуць трывожныя такія,
тонкія жалобныя званы.

Пакружыўся над Хатынню бусел
і паплыў у светлую смугу.
Ён не ведаў болю Беларусі,
пэўна ж, ён адчуў яе тугу.

Пакружыўся бусел над Хатынню
і ў смузе пад воблакамі знік.
Папялішча ўсё яшчэ не стыне,
і ў грудзях не замірае крык.

## Мой горад Мінск у час ваенны

*Эдзі Агняцвет*

Мой горад Мінск у час ваенны
Быў партызанам баявым,
Як воін мужны і сумленны,
Змагаўся з ворагам ліхім.
Ён сёння будаўнік вядомы,
Наўкол — плады яго турбот,
Зара ўстае над кожным домам...
Будуйся, Мінск, на сотні год!

Мой горад Мінск — магутны, смелы,
Славуты з даўняе пары.
Выходзяць з рук яго ўмелых
Гадзіннікі і трактары.
І самазвалы з мінскай маркай
Ён пасылае ў паход,
І дрэвы ён гадуе ў парках.
Будуйся, Мінск, на сотні год!..

# Казачны куфэрак

## Як з'явіўся апостраф

*Алена Масла*

Было гэта даўным-даўно. Можа, толькі сівыя туманы праўду і памятаюць. Спрадвеку ахінаюць яны зямлю сваімі калыханкамі, усе яе таямніцы ім вядомыя. Захацеўшы, столькі расказаць могуць, што нават Бай мех з іх казкамі не тое што панесці — з месца скрануць не зможа.

Мы ж з вамі паслухаем толькі адну гісторыю — пра тое, як з'явіўся апостраф. Я пачну кудзелю з туманоў прасці, а вы ўважліва слухайце, як вераценца спявае, тумановыя гісторыі пераказвае...

На той час, калі ўсё на зямлі ўжо было створана, але яшчэ не было названа, у куфэрку, размаляваным дзівоснымі кветкамі, на востраве, згубленым у моры-акіяне, жылі словы. Многа іх было — не злічыць. Але ж куфэрак быў вялізны, словы шчыльненька туліліся адно да аднаго — вось усе і змяшчаліся пад адным вечкам.

Аднак проста сядзець — і цесна, і сумна!

— Мусіць жа, мы дзеля нечага створаныя? — шапталіся паміж сабой словы і маркоціліся.

Аднаго разу пачуў гамонку слоў Вецер. А ён, як і туманы, старэй за нас з вамі, старэй за

дрэвы і траву. Нават, можа, за зоркі старэй. Дык вось Вецер, які ўсё ведаў, сказаў словам:

— Не ваша гэта доля — нудзіцца тут, далёка ад свету, на востраве, згубленым у моры-акіяне. Ваша доля — па зямлі рассыпацца, усяму на ёй імёны даць.

— А як жа мы даведаемся, куды ісці? — занепакоіліся словы. — Мы ж нічога, акрамя свайго куфэрка, не бачылі.

— Э, не турбуйцеся! — сказаў Вецер. — Спачатку куфэрак адчыню, а пасля падумаем.

Як сказаў Вецер, так і зрабіў. А словам боязна ў невядомы свет ляцець з утульнага куфэрка, прыціхлі, маўчаць. Аж чуюць — раптам пытае нехта:

— Што рабілі? Што робім? Што будзем рабіць?

— О, дружа, цябе мы й чакалі! — радасна загуў Вецер, пазнаўшы Дзеяслова, адвечнага руплíўца. Хто-хто, а ён ведае, чым слоўцы заняць, бо сам дзеянне слоў абазначае, таму Дзеясловам і завецца.

Пакуль яго сваякі ў куфэрку нудзіліся, Дзеяслоў ужо тупаў па зямлі, работы сабе шукаў.

— Што рабілі? У куфэрку бесклапотна марнаваліся... Што зрабілі? Вечка куфэрка адчынілі.. А што будзем рабіць — ад цябе, дружа, залежыць, — адказваў тым часам на запытанне Дзеяслова і за сябе, і за словы Вецер.

— Глянь, колькі дабра ў куфэрку прападае! Прыладкаваць бы яго, па свеце разнесці!..

— Будзе зроблена! — паабяцаў Дзеяслоў.

Разам з Ветрам ён спакаваў словы ў вялікую торбу, сеў у човен, пераплыў мора-акіян і пакрочыў па зямлі. Што на сваім шляху ні сустрэне — слоўцы на тое прымярае, выбірае, каб дакладна падыходзілі жывой істоце, прадмету ці з'яве. Вось так і стала дрэва — дрэвам, рака — ракой, гара — гарой, а вы, мае харошыя — хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Тупаў, тупаў Дзеяслоў, паўзямлі абышоў і трапіў у тыя мясціны, дзе і сёння ёсць наша з вамі зямля — Беларусь.

А тут лясоў багата, кветкамі травы перавітыя, сінь нябесная ў рэчкі і азёры пералітая… Не можа налюбавацца хараством гэтай зямлі Дзеяслоў, самыя пяшчотныя і прыгожыя словы для яе знаходзіць.

А на дварэ — ноч. Неба зоркамі ўсеяна. І бачыць Дзеяслоў, што адна з іх за ражок маладзіка зачапілася і, адлюстраваўшыся ў расінках на траве, памножылася, быццам мільёны зорак заззялі.

Прыгожа! Не часта такое ўбачыш! Стаў Дзеяслоў думаць, куды б гэтае багацце прыладкаваць. І надумаў: давай шчыраваць, кропелькі з адлюстраваннем месяца і зоркі збіраць ды, як завушнічкамі, словы імі аздабляць…

Як сустрэнеце цяпер, сябры, апостраф у словах, ведайце — гэта і ёсць адбіткі зоркі і месяца, сабраныя Дзеясловам і ўплеценыя ў мову.

Сталі завушнічкі ў словах звінець крышталём начной расы, пераліваццa месяцовым ззяннем,

клікаць за сабой у нябесную высь, да зорак. І без таго прыгожыя, сталі словы звонкімі, як салаўіныя песні, на якіх начная раса замешаная.

Упару Дзеяслоў парупіўся! Хутка світаць пачало — летнія ночы, ведама ж, кароткія. Зорка, пацалаваўшы месяц на развітанне, пакацілася па небе. І кажуць, што больш так і не сабралася пакалыхацца ў яго на ражку.

Дзеяслоў жа крышку падрамаў на самым досвітку і, абудзіўшыся, далей па зямлі пакрочыў. Да той пары тупаў, пакуль усе слоўцы не прыладкаваў як след.

А яго падарунак — спеўную беларускую мову, аздобленую апострафамі-завітушкамі, — мы і сёння захоўваем як самы дарагі скарб.

## Лесавічок

**(*Урыўкі*)**

*Яраслаў Пархута*

На палянцы, у старым пяньку-церамку, жыў Лесавічок. Не абы які Лесавічок. Ён умеў казкі складаць!

Уведала пра гэта Сарока і навіну па ўсім лесе разнесла. Збегліся на палянку і старыя, і малыя. Шашок прапанаваў:

— Пакуль Лесавічок адпачывае, выкрадзем у яго казкі і прачытаем!

Выкрасці то выкраў, а разабраць, што на кляновых лістках напісана, не змог.

І Крот акуляры дома пакінуў.

І Сава яшчэ вочы не прадрала.

Выручыў Вожык. Ён прысеў пад елачкай, узяў верхні лісток і пачаў чытаць:

*Казка пятая*

**Шалястунчыкі**

У суседняй пушчы жылі Мядзведзь з Мядзведзіхай. У іх быў сынок-пестунок, якога Мішкам звалі. Здаецца, нічога сабе пестунок, а вечна хадзіў пануры. Сонца свеціць, аблачыны бягуць па небе, ветрык у лістоце гуляе, а ён — крывіцца. Птахі пяюць, матылі пырхаюць, пчолы над кветкамі шчыруюць, а ён — крывіцца. Усё Мішку не так, усё не гэтак.

Але найболей не любіў ён заданні дамашнія рабіць. Два словы, як кажуць, звязаць ленаваўся. Вернецца, бывала, з лясное школы, за стол у сваім берлагу сядзе, а не чытаецца яму, не пішацца.

Аднойчы сядзеў вось гэтак Мішка за сталом, сядзеў і раптам заснуў. І прысніўся яму незвычайны сон. Быццам ва ўсім, што з ім адбываецца, вінаватыя шалястунчыкі — вясёлыя чалавечкі, што пад лісцем на дрэвах жывуць. Быццам яны знарок гушкаюцца на галінках, шалясцяць, думаць яму перашкаджаюць. Не вытрымаў Мішка, выскачыў з берлагу, узабраўся на дуб, што паблізу стаяў, і давай страсаць шалястунчыкаў, давай страсаць. Шалястунчыкі напалохаліся

і на лістках, як на парашуціках, паспускаліся на зямлю ды ў суседнюю дуброву перабеглі.

Вярнуўся Мішка ў бярлог, зноў сеў за дамашняе заданне. Але яшчэ большая лянота апанавала яго. Наўкол была такая цішыня! Прыціхлі птахі, ветрык стаіўся, матылі зніклі, пчолы перасталі шчыраваць — усе нібы чакаюць, што ў Мішкі на гэты раз атрымаецца.

А ў яго і на гэты раз нічога не атрымалася.

Задумаўся Мішка: як жа далей быць? А праз хвіліну ўсё ж здагадаўся, што да чаго: не шалястунчыкі вінаваты, а ён сам! Кінуўся ў дуброву, закрычаў шалястунчыкам:

— Даруйце! Я быў несправядлівы да вас. Назад перасяляйцеся! Крыўдзіць не буду болей.

Шалястунчыкі адказалі:

— Калі ты пакінеш яшчэ і крывіцца, панурыцца ды ленавацца, тады вернемся. А так і не ўпрошвай нават!..

...Мішка ад нечаканасці прачнуўся.

Назаўтра нібы і не ён вяртаўся з лясное школы. Сонца свяціла, аблачынкі беглі па небе, ветрык у лістоце гуляў, а Мішка ўсміхаўся ім. Пчолы над кветкамі шчыравалі, матылі пырхалі, птахі спявалі, і Мішка таксама стараўся песеньку запець. Усё яму даспадобы было, усё сэрцу міла!

І ў той дзень быццам цуд адбыўся: дамашняе заданне ўпершыню выканаў лёгка і хутка.

Мішка ўзрадаваўся, сказаў сам сабе:

— Шалястунчыкі дапамаглі!

*Казка сёмая*

## Пацерка

Сарока знайшла на дарозе пацерку. Прыгожую — як ранішняя расінка. І сонца ў ёй бачылася, і аблокі, і нават кожнае сарочына пёрка.

Ухапіла Сарока пацерку і паляцела да ракі — сяброўкам хваліцца. Сяброўкі ўбачылі знаходку — замітусіліся:

— Ах, якая цудоўная пацерка! — закрычалі яны.— Якая зіхатлівая! Давай падзелім. Каб кожнай было хоць па драбочку.

І пачалі валтузіцца, адна ў адной адбіраць пацерку, каб адшчыкнуць сабе паболей. Валтузіліся, валтузіліся, пакуль не ўкацілі пацерку ў раку. А тады паселі на вярбе, пазіраюць у вірок, на дне якога паблісквала пацерка, і бядуюць: як дастаць яе?

А тут якраз па рачным дне Рак сунецца. Сарокі да яго:

— Зрабі добрую справу, дастань нашу пацерку. Вунь яна, сярод каменьчыкаў зіхаціць!

Вырачыў Рак вочы, пакруціў вусамі, заўважыў пацерку, а ўзяць не можа. Работа ж тонкая, ювелірная! А ў яго кляшчоткі, як лапаты.

— Сваіх клопатаў хапае! — узлаваўся Рак і пасунуўся далей. А тут якраз Бабёр бервяно тралюе. Сарокі да яго:

— Выручай! Пацерка ў раку ўпала. Рак даставаў — не дастаў. Мо ты, Бабёр, дастанеш?

Бабёр прыткнуў бервяно да берага, набраў поўныя грудзі паветра і даў нырца. Доўга не

было Бабра. А выплыў — высыпаў на бераг прыгаршчы рачнога пяску:

— Шукайце. Тут яна павінна быць. І пагнаў далей сваё бервяно.

Перабралі сарокі пясок, а пацеркі не знайшлі. А тут якраз Чапля з броду ляціць. Сарокі да яе:

— Пацерку з вірка не можам вылавіць. Рак даставаў — не дастаў. Бабёр даставаў — не дастаў. Мо ты, чапля, дастанеш?

Чапля пастаяла, падумала, увайшла ў ваду і стала дзюбаю шарыць па дне. Шарыла, шарыла, пускала бурбалкі, пускала, а потым выбралася на бераг і кажа:

— Нічога не выйдзе. Шыя закароткая. — І паляцела ў свой лес.

Сядзяць на суках сарокі ды адна адну папракаюць за прапажу. А тут якраз Аляпка бяжыць — шэранькая, у белым нагруднічку птушачка. Сарокі да яе:

— Мелі мы пацерку. Прыгожую, як ранішняя расіна. У ёй свет увесь бачыўся. Ды ў раку наша пацерка ўкацілася. Рак даставаў — не дастаў. Бабёр даставаў — не дастаў. Чапля даставала — не дастала. Мо ты, Аляпка, дастанеш?

Аляпка як бегла плёсам, так і пабегла, толькі цяпер пад ваду. Крутнулася там, на рачным дне, і гэтак жа хуценька выскачыла назад. У дзюбцы яна трымала пацерку, у якой увесь свет бачыўся. Паклала Аляпка на пясок тую пацерку і кінулася далей.

А сарокі ўбачылі, што згуба знайшлася, шухнулі на бераг і зноў сталі адна ў адной адбіраць

пацерку. Валтузяцца, крычаць. Над ракою такі гармідар паднялі — хоць вушы затыкай.

Яны і да гэтай пары тую пацерку ніяк падзяліць не могуць.

*Казка адзінаццатая*

**Сараканожка**

Паклікала Страказа ў госці Сараканожку. Тая новую сукню надзела, прычоску модную навяла, самыя прыгожыя завушніцы пачапіла. Выскачыла за весніцы, а суседка Муха пасміхаецца:

— Хіба мода новая
Паяўляецца?
Басанож баляваць
Адпраўляецца!..

Азірнулася Сараканожка і бачыць: сапраўды, босая! У спешцы абуцца забылася! Крутнулася туды, крутнулася сюды — а чобатаў ні пад лаваю, ні ў запечы, ні пад печчу. Дзеці, гуляючы, расцягнулі! Села на парог, бядуе. А Муха кажа:

— Вунь на ўзлессі два яноты
Шыюць ялавыя боты.
Ты ім нізка пакланіся —
Мо і чобаты шыць узяліся б.

Пабегла Сараканожка на ўзлессе:

— Яноты-браткі,
Пашыйце чабаткі!..
— Што ты? Што ты? —
адказалі яноты. —
Мы рады прыняць заказ,

Ды столькі хрому
Не знойдзецца ў нас.
Прасі камароў,
Хай заколюць сорак валоў,
Шкуры здзяруць,
Гарбара наймуць.
І калі гарбар
Вырабіць добры тавар,
То, так і быць,
Згодзімся шыць.

Сараканожка да камароў:

— А мае вы камарыкі,
Гвоздзікамі тварыкі!
Бядзе-гору пасабіце!
З папасу валоў ганіце.
Клічце да двара
Лепшага гарбара,
Тэрмінова хай вырабіць хрому —
Босай жа не выйдзеш з дому!..

Камары паспагадалі. У сцельку ледзь не разбіліся, а зрабілі ўсё, што прасіла суседка. І яна зноў пабегла на ўзлессе:

— Ах, яноты-браткі,
Шыйце хутчэй чабаткі!
У госці даўно пазнюся —
Заўтра за ўсё разлічуся!

Яноты прынялі заказ. І хоць на адзін капыл шылі, чобаты атрымаліся як улітыя.

Узрадавалася Сараканожка, пакруцілася ў абнове перад люстэркам ды бегма да Страказы на паляну.

А там госці даўно разышліся.

*Казка трынаццатая*

## Ластаўчыны дзеткі

Над акном музычнай школы жылі ластаўкі. Калі іхнія дзеткі былі яшчэ малыя, усё ішло добра. А падраслі — бацькам трывожна стала: малеча пачала рвацца з гнязда і прыслухоўвацца, як вучні спевы ды музыку пасцігаюць. Іншае ластавяня так высунецца з гнязда, што, здаецца, яшчэ хвіліна — і на зямлі апынецца.

Надакучыла бацькам пільнаваць ластавянят і вырашылі яны на ўсякі выпадак конскім воласам за ножкі папрывязваць іх. Маўляў, цяпер ніводнае не страціцца.

Пакуль у школе развучвалі сальфеджыа, яшчэ туды-сюды было. А калі вучні добра спяваць сталі, — ластавянят аніякае валоссе ўтрымаць не магло. Так і рваліся з гнязда, так і рваліся!

Бацькі нарэшце сказалі:

— Ляціце! Толькі не асаромце нас.

Шухнулі ластавяняты на волю — і адразу сталі насіцца над сялом ды ўмельства сваё паказваць. Шчабечуць на ўсе лады! А здаволяцца — на правады пасядуць. Здалёк глядзеліся, нібы ноты ў спеўніку. Бацькі радаваліся: на карысць навука пайшла!

А Верабей з Вераб'іхаю ўсумніліся:

— А ці могуць яны дорэміфасолю зрабіць?!

Ластавяняты пераляцелі з провада на провад і паказалі, на што здатныя.

— Нічога не скажаш! — пахвалілі вераб'і ды кінуліся збіраць сваю сям'ю. Каб даказаць, што

і вераб'яняты не лыкам шытыя. Але як ні стараліся тыя, як ні пералятаді з провада на провад, у іх так нічога і не атрымалася — ні дорэміфасолі, ні сольфамірэдо. Яшчэ горай спявалі яны:

— Чык-чырык! — усё, што маглі вераб'яняты.

— Бо далекавата ад школы музычнай выхоўваліся, — сказалі Верабей з Вераб'іхаю і вырашылі не адставаць ад ластавак.

Наступнай вясной, калі ластаўкі яшчэ не вярнуліся з выраю, Верабей з Вераб'іхаю занялі ластаўчына гняздзечка, што над школьным акном пуставала, займелі дзетак і пачалі, не апераных нават, прымушаць слухаць і сальфеджыа, і спевы, і музыку. Але ніводнае з вераб'янят не магло засвоіць тую навуку. Не атрымлівалася нічога, акрамя таго ж: «Чык-чырык!..»

Прыляцелі ластаўкі, убачылі, што робіцца ў іхняй хатачцы, ды сварыцца на вераб'ёў не сталі, толькі сказалі:

— Акром жадання, трэба яшчэ хоць трошачкі здольнасці мець!..

І пачалі будаваць сабе новае гняздзечка.

...Мінулі гады, а вераб'і па сённяшні дзень усё, што могуць,— гэта чырыкаць.

## Прыгоды мышкі Пік-Пік

**(*Урыўкі*)**

*Людміла Рублеўская*

### Мышка Пік прыбірае норку

Летам у кватэры, дзе жыла мышка, адбыўся Вялікі Рамонт. Пік-Пік ледзь перажыла гэтую

страшэнную навалу — цэлы тыдзень у доме пахла фарбамі, тупалі незнаёмыя людзі, мэблю перасоўвалі з месца на месца. Асабліва цяжка было прабірацца на кухню. Але ўрэшце ўсё скончылася, і кватэра зрабілася вельмі прыгожай: падлога блішчыць, столь — бялюсенькая, на сценах — новыя шпалеры.

Пахадзіла мышка па абноўленых пакоях, пазайздросціла гаспадарам. Вярнулася ў сваю норку і ледзь не заплакала: якое, аказваецца, бруднае і неўладкаванае яе жытло! Усё шэрае, пыльнае, на падлозе тоўсты слой смецця — абгрызкі, шалупінне семачак, цукерачныя абгорткі, шматкі газет. З усяе мэблі толькі ложак — цукерачная каробка.

Нічога не зробіш, давядзецца прыбіраць!

Ніколі раней на гэты сумны занятак мышка часу не марнавала. «Здаецца, галоўнае — вымыць падлогу. Але насіць у норку ваду цераз усю кватэру... Калі мышка не ідзе па ваду, вада сама павінна прыйсці да мышкі», — мудра падумала Пік-Пік.

Усе ў доме спалі. Мышка збегала на кухню і ў лазенку, адвярнула краны і, паназіраўшы, як вада запаўняе ванну і мыйку, пайшла спаць.

Прачнулася Пік-Пік ад холаду. Расплюшчыла вочы і ўбачыла над сабой столь, якая чамусьці хісталася. Цукерачная каробка-ложак пагойдвалася пасярод пакоя на хвалях!

— Гвалт! — прашаптала мышка, бо голас у яе знік з перапуду.

На шчасце, прачнуўся Тата і захацеў надзець пантофлі, якія даўно сплылі ў другі кут пакоя. Яго ногі апусціліся ў халодную ваду... Ад Татавага ўскрыку прачнуліся ўсе — і Мама, і Веранічка, і кошка Пепіта. Веранічка засмяялася і пачала бегаць па вадзе і ганяць з кута ў кут пантофлі, як маленькія караблі. Мама пабегла перакрываць краны, а Тата стаяў босымі нагамі ў вадзе і шаптаў:

— Гэта канец свету! Вялікі патоп!

Між тым Мама перакрыла краны і сабрала анучай з падлогі ваду. Пантофлі і мышчын ложак перасталі пагойдвацца на хвалях, але кватэра не была больш такой чыстай і прыгожай: з мышчынай норкі вымылася столькі смецця, што яно забрудзіла ўсю кватэру.

Мама пачала высвятляць, хто адкрыў краны, і мышка схавалася ў норку. Там было мокра, але незвычайна чыста.

## Як Тата стаў супермэнам

Аднойчы, калі ўсе ў кватэры паснулі, пабегла мышка Пік-Пік на кухню чым-небудзь падсілкавацца. Ну гаспадары, ну галота! Ні цукерачак, ні торцікаў, ні печыва не пакінулі на стале для беднай мышкі! Толькі... два пернічкі, палова шакаладкі, жменька разынак, чатыры арэшкі, адзін яблычак... Хіба гэта можа выратаваць ад галоднай смерці? Ды яшчэ ёсць вялікі гаршчок на пліце... Пахне з-пад накрыўкі, праўда, смачна. Здаецца, грэчневай кашай з малаком. Ну, не з

голаду ж паміраць... І мышка ўскараскалася на пліту, адкінула накрыўку і скокнула ўніз. Каша сапраўды аказалася смачная. І мышка выела ўсё да донца. А вылезці — як? Гэта спецыяльна, мусіць, робяць такія вялікія гаршкі — каб сумленных мышак лавіць. Вакол — чыгунныя гладкія сценкі... Цёмна... Страшна зрабілася Пік-Пік, і яна закрычала:

— Ратуйце!

Мышчын голас гучаў з пустога гаршка так гучна і страшна, што ўсе прачнуліся — Мама, Тата, Веранічка, Пепіта.

— Што гэта? Хто крычыць? — пыталіся яны адно ў аднаго, а мышка ўсё благала:

— Лю-у-дзі! Сю-у-ды!

Людзі і котка згрувасціліся перад дзвярыма на кухню.

— Там іншапланецяне, — упэўнена прашаптаў Тата. — Я даўно заўважыў, што яны нам знакі пакідаюць — на вазонах кветкі ламаюць.

— Не, там Баба Юга! — сказала Веранічка. Нікога страшнейшага яна пакуль не ведала.

— А мне здаецца, гэта рабаўнік. Ён лез да нас праз фортку і зашчаміўся. Па тэлевізары нядаўна пра такое распавядалі, — запярэчыла Мама.

— Глупства! Я здагадваюся, хто гэта, — прамуркатала Пепіта і слізганула на кухню.

Пепіта адразу зразумела, адкуль страшны голас. Яна скочыла на пліту, зірнула ў гаршчок.

— Так я і думала! Прывітанне, шкодніца! Ну добра, зараз дапамагу...

Пепіта паспрабавала дастаць Пік-Пік, але, на жаль, толькі папхнула гаршчок і той са страшэнным грукатам упаў на падлогу, пакаціўся...

Па той бок дзвярэй кухні пачуліся крыкі.

— Як ты мог адпусціць туды бедную Пепіту? — дакарала Тату угневаная Мама. — Ты ж мужчына! Ратуй нас!

Тата сціснуў сківіцы, пабег у калідор, узяў малаток і — на кухню... У цемры спатыкнуўся аб гаршчок і з усяе сілы стукнуў па ім малатком. Бедная аглушаная Пік-Пік выскачыла са сваёй чыгуннай турмы і слізганула ў норку. Стала ціха. Мама асцярожна зайшла на кухню і запаліла святло.

— Што... што тут рабілася?

— Ды так, — сціпла сказаў Тата. — Былі рабаўнікі, толькі нейкія слабыя. Стукнуў аднаго малатком, дык і збеглі.

Мама застагнала, паклала таблетку пад язык і пакіравалася ў ложак. А на кухню насмелілася зайсці Веранічка.

— Тата, прызнайся, што тут было насамрэч?

— Ды так, — сціпла сказаў Тата. — Баба Юга швэндалася. Стукнуў яе малатком па касцяной назе, яна і ўцякла.

Веранічка з захапленнем паглядзела на Тату і пайшла спаць. А Пепіта, якая сядзела ўвесь гэты час напліце, фыркнула і шматзначна прамовіла:

— Ну, я дык ведаю, што было на самай справе...

— Так, табе я магу сказаць праўду, — прашаптаў Тата. — Гэта былі іншапланецяне. Каб не стукнуў я малатком па іх лётаючай талерцы, невядома, чым бы гэта скончылася...

Пепіта аж мову страціла ад здзіўлення. Тата паклаў малаток на месца і таксама пайшоў спаць.

А Пік-Пік мармытала абурана ў сваёй норцы:

— Гэта неадменна штукарствы амерыканскага гангстэра Мікі Маўса... Вось помслівы які... Не хоча змірыцца, што я яго разлюбіла.

## Мышка Пік-Пік робіць сабе макіяж

Аднойчы днём прыснілася мышцы Пік-Пік каўбаса. І так захацелася мышцы яе з'есці, што і сон прапаў. Пік-Пік думала: «Котцы Пепіце далі цэлую палку каўбасы за прыгажосць. А я — самая прыгожая мышка ў свеце! Чаму ж ніхто не прапануе каўбасу мне? Што ж зрабіць, каб на мяне звярнулі ўвагу?»

І ўспомніла мышка, як Веранiччына Мама робіць макіяж — фарбуе павекі рознакаляровымі парашкамі, якія называюцца «цені», зачарняе вейкі тушшу, пудрыцца, намазвае вусны памадай, а пасля Тата ёй кажа: «Якая ж ты ў мяне прыгожая!»

«Трэба зрабіць макіяж!» — вырашыла мышка.

Залезла мышка на пісьмовы стол, зняла з паліцы скрынку з Мамінай касметыкай і села перад люстэркам.

Больш за ўсё мышцы спадабалася памада ў прыгожым залатым футаральчыку. Пафарбавала

мышка памадай нос. Ах, як прыгожа! Нафарбавала яшчэ вушы і хвосцік. Пасля Пік-Пік зачарпнула лапкай туш і нафарбавала вусы. «Гэтага мала», — падумала мышка і абвяла вочкі чорнымі кругамі.

Што б яшчэ памазаць? Адкрыла мышка Пік-Пік каробку з Мамінымі ценямі. Там было многа-многа рознакаляровых квадрацікаў.

«Ну, не буду ж я па адной фарбеваждацца!» — вырашыла мышка, лягла проста на цені і некалькі разоў па іх пакачалася.

Скурка ў Пік-Пік зрабілася стракатая, рознакаляровая, як вясёлка. Знайшла мышка яшчэ футаральчык з блішчынкамі, адкрыла яго і ўсе блішчынкі на сябе высыпала!

У давяршэнне Пік-Пік зачарпнула пудры і напудрыла шчокі і лоб.

«Вось цяпер ва ўсім свеце няма нікога прыгажэйшага за мяне!» — падумала мышка і важна пайшла, задзёршы носік, паказацца ўсім.

У зале сядзеў Тата і чытаў газету. Раптам нехта перад ім сказаў: «Пі-пі!» Тата падняў вочы і ўбачыў, што на яго ідзе стракатая, бліскучая істота з чырвонымі вушкамі, чорнымі вусамі, белымі плямамі на шчоках і доўгім чырвоным хвастом!

«Гэта іншапланецянін! — падумаў Тата. — Зраблю выгляд, што мяне няма, а то ён забярэ мяне ў лётаючую талерку!»

І Тата падціснуў ногі і схаваўся пад газету.

«Што гэта з Вераніччыным Татам?» — здзівілася мышка Пік-Пік і пашыбавала на кухню. А там

сядзелі Мама, Веранічка і Пепіта і пілі цёплае малако.

І вось зайшло на кухню стракатае, бліскучае страшыдла з чырвонымі вушамі і чорнымі вусамі. Мама вырашыла ратаваць сям'ю і лінула на страшыдла сваё малако. А з другога боку на страшыдла абрынулася малако з кубачкаў Веранічкі і Пепіты. На падлозе ўтварылася вялікая белая лужына з рознакаляровымі разводамі. А ў лужыне сядзела разгубленая шэрая мышка.

Засмяяліся Мама, Веранічка і Пепіта. А мышка Пік-Пік заплакала. Яна так старалася, а тут усю прыгажосць змылі!..

Усе перасталі смяяцца, і Мама дала мышцы кавалак каўбасы, каб тая не плакала. Схапіла мышка Пік-Пік каўбасу і пабегла ў норку.

А Мама, Веранічка і Пепіта пайшлі ў залу і там убачылі пад газетай Тату.

— Што ты робіш? — здзівілася Мама.

— Тс-с-с! — сказаў Тата. — За мной прылятаў іншапланецянін. Можа, ён яшчэ шукае мяне!..

Паглядзелі Мама, Веранічка і Пепіта вакол і не знайшлі ніякага іншапланецяніна. Тады Тата згадзіўся злезці з крэсла і схаваўся пад коўдру на ложку.

А мышка Пік-Пік з'ела каўбасу і заснула, думаючы: «Я ўсё-ткі самая прыгожая мышка ў свеце!»

І спала яна так моцна, што яе не разбудзіў нават роспачны крык Мамы, якая знайшла на сваім стале тое, што засталося ад яе касметыкі!

## І заяц стаў зайцам...

*Яраслаў Пархута*

Заяц даўней быў не такі, як цяпер. Ні вачэй тых, ні ног, ні вушэй. Адна назва! Пацурбалак нейкі. І ўсякі, хто хацеў, кпіў з яго:

— Торба з мясам, а не звер!

Надакучыла Зайцу цярпець, набраўся смеласці і сказаў аднойчы:

— Пушчуся па свеце і набуду ногі хуткія, вушы чуткія, вочы відушчыя.

І пусціўся. Коціцца Заяц, коціцца, аж бачыць: Філін на суку сядзіць, вочы вылупіў, дзівуецца: што гэта за стварэнне з'явілася ў ягоным лесе? А Заяц:

— Філін-Філін, мо ёсць у цябе вочы запасныя? Прадай!

— Прадаць не прадам, а так дам,— адказаў Філін.— Бяры, калі хочаш!

Узяў Заяц у Філіна запасныя вочы і адразу павесялеў: свет перад ім адкрыўся!.. Падзякаваў і пакаціўся далей.

Коціцца, коціцца, аж бачыць: на балоцейку Кабылка пасецца, а вакол яе дзіцятка-жарабятка падбрыквае. Ногі лёгкія, імклівыя. Узрадаваўся Заяц, кажа:

— Кабылка, мо ёсць у вас ногі запасныя? Прадайце!

— Прадаць не прадам,— адказала Кабылка,— а так дам. Выбірай, якія даспадобы.

Падабраў сабе Заяц ногі па густу і не пакаціўся далей, а пабег. Бяжыць, бяжыць, аж бачыць:

стаіць пасярод дарогі Асёл, вушамі трасе. «Вось бы мне такія!» — падумаў Заяц і папрасіў:

— Паважаны Асёл! У цябе лішніх вушэй няма? Прадай, калі ласка!

— А хоць і за так бяры! — адказаў Асёл.— У мяне іх цэлая вязанка.

Выбраў Заяц вушы, бяжыць дарогаю і нарадавацца не можа: «Усё, здаецца, прыдбаў — вочы відушчыя, ногі хуткія, вушы чуткія. Ніякі драпежнік цяпер не страшны! Калі б яшчэ хвост набыць талковы — прыгажэйшага звера не знойдзеш!»

Думае гэтак Заяц, думае, бяжыць сабе паманеньку, бяжыць, аж бачыць: да хвойкі шыльда прыбіта, а на ёй напісана: «Продаж хвастоў». Заяц ледзь не падскочыў ад радасці. Маўляў, пашчасціла! Ды ніжэй на шыльдзе дробнымі літарамі было накрэмзана: «Хвасты прададзены. Пайшоў спаць. Барсук».

Засмуціўся Заяц, хацеў далей бегчы самы фасоністы хвост шукаць, але ноч на зямлю апусцілася, і ён падаўся дадому. Выбраўся на дарогу, дзе стаяў Асёл, перабег балоцейка, дзе пасвілася Кабылка, мінуў бор, дзе сядзеў Філін, і толькі апынуўся на сваёй дзялянцы,— з-за вываратня як выскачыць Воўк ды як схопіць яго ўпоперак тулава!

— Ай-я-яй! — закрычаў Заяц і стаў вырывацца.

Вырываўся, вырываўся і вырваўся. Кінуўся прэч, цераз дзесяць кустоў сігае, і адна толькі

думка ў галаве круціцца: добра, што з кароткім хвастом па лесе бег, а то б не вылузнуўся...

А ўслед яму чулася:

— Другім разам мацней трымаць буду!..

Але Заяц не такі дурны, каб яшчэ раз трапляць у лапы воўчыя. Па сённяшні дзень па лесе бегае. Праўда, пра доўгі ды фасоністы хвост і думаць перастаў.

## Казка пра Ласку

*Еўдакія Лось*

Ціха, дзеці,
Паслухайце казку
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку!
Дзе жыве яна,
Як выглядае,
З кім сябруе,
Каму памагае.

Неяк Ласку ўгледзеў
Сяргейка,
Хоць і слёзы блішчалі
На вейках.
Захварэў неўспадзеўкі
Хлапчына.
Сінява залягла
Пад вачыма.
Парашкі ён глытаў
І пілюлі,

Смеху хлопчыка
Доўга не чулі.
І тады да ягонага
Ложка
Падышла, нібы цень,
Басаножка.
Падышла неўзаметку
Малая,
За плячыма —
Каса залатая.
— Ты Сяргейка? —
Пытае ласкава
І плыве каля ложка,
Як пава.
— Ты хварэеш?
Замучылі лекі?
Пацярпі,
Не хвалюйся, маленькі!
Хочаш — коўдру тваю
Я папраўлю!
Хочаш — кветак у шклянку
Пастаўлю!
Каля хворага
Без адпачынку
Завіхаецца
Тая дзяўчынка.
Лоб малога пагладзіла,
Бровы, —
І Сяргейка заснуў,
Як здаровы.
І ў сне ўжо,

Што быў нібы казка,
Ён пытае:
— Скажы, калі ласка,
Хто ты?
— Ласка.
— Якая?
Такая,
Што маленькім
Заснуць памагае.

Дык застанься са мной,
Мая Ласка!
Я спяшаю ў калгас,
Да Тараскі!
І, махнуўшы хусцінкаю
Белай,
Неўпрыкметку пайшла,
Паляцела.
Ціхі хлопчык
Ажно засмяяўся:
Ён з хваробай сваёй
Развітаўся!

Пасварылася з Надзяй
Ларыска.
І за што?
З-за малочнай ірыскі!
Да дзяўчынак прыходзіла цёця.
Надарыла цукерак блазноце.
І дражэ, і «падушак», і «мішак».
Немалое багацце ў малышак!

Адно цешся з салодкіх
І еш
Ды сябровак частуй ты...
Дык не ж!
Стала крыўдна старэйшай —
Ларысцы,
Што ў Надзеі —
Яшчэ і ірыскі!

Вось старэйшая,
Каб не журыцца,
Адабрала ірыскі
У сястрыцы.
Хто паможа
Надзейцы ціхмянай?
Хто ёй верне
Прысмак адабраны?
Можа, цёця?
Яна на рабоце.
Можа, мама?
На працы таксама.
Памагла ёй
Дзяўчына-краса,
За плячмі —
Залатая каса.
І адкуль яна толькі
Узялася,
Як пазнала,
Што спрэчка ўзнялася?
На маленькіх нагах
Неабутых

Падышла да дзяўчынак
Надзьмутых.

Белай хусткаю
Твар абмахнула,
На сястрычак
Лагодна зірнула.
— Я завуся, — гаворыць ім, —
Ласкай.
Вы паслухайце
Простую казку!

Я прыйшла
Ад Сяргейкі-
Хварэйкі,
Я прыйшла
Ад Тараскі-
Падпаска.
Сумаваў той без ласкі
Са статкам,
Калі ў поле падаўся
За таткам.

А пасля пабыла я
За морам,
За бязмежным
Блакітным прасторам.
Там чакаў мяне
Бедны, пануры
Хлопчык з чорнаю-
Чорнаю скурай.

У краіне,
Дзе сонца багата,
Гэты хлопчык
Застаўся без таты.
Тату ворагі злыя
Забілі,
Бо змагаўся ён
Супраць насілля.
Супраць гора змагаўся
Адважна,
Клікаў волю
У свой край неабсяжны...

Пацямнелі,
Як быццам ад ночы,
Васільковыя
Ласчыны вочы.
Залатую касу
Запляла,
Пацішэлых сястрыц
Абняла.

І тады запытала Ларыса:
— А як хлопчыка клічуць?
— Патрысам.
І ўжо шэпчуцца ціха
Дзяўчынкі...
Ім цяпер
Не да прыкрых учынкаў!
Трэба другу
Пісьмо напісаць,

15 Зак. 1790

Падарунак яму,
Пераслаць.
І пачула тут госця:
«Патрысік!
Шлём табе мы салодкіх
Ірысак.
І дражэ,
І «падушак»-малышак,
Толькі з'елі мы
Некалькі «мішак».
З падарункам прымі,
Калі ласка,
Нашу светлую
Шчырую Ласку!
Не гаруй,
Мы цябе не забудзем
І пра татку
Раскажам мы людзям.
Будзем дружныя мы
Між сабою
І навек
Пасябруем з табою!..»

Вось вам, дзеці,
І ўся мая казка
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку.
Ласка ўсіх вас
Пабачыць жадала,
Але часу ў яе
Дужа мала.

А таму покуль стрэнецца
З вамі,
Будзьце, дзеці,
Ласкавыя самі!

## Прыгоды Нуліка

**(*Урыўкі*)**

*Уладзімір Ліпскі*

### Хто такі Нулік

Жыў-быў Нулік.

Сумна жыў, абы-як. Спытаеце чаму? Ды таму, што быў адзінокі. Ні з кім не сябраваў, ні да каго не хадзіў у госці. Ды як ён мог пайсці, калі ў яго не было нават ног. І рук не было. І вачэй. І носа. І рота.

Нулік быў ніхто, нічый, ніякі. Ён уяўляў сабой роўны абадок, які нібыта саскочыў з курынага яйка. Было яно абвязана дроцікам ад «носіка» да «пяткі» — і раптам вылузнулася з палону. А тая абвязка і стала Нулікам.

На што быў падобны Нулік?

Ды багата на што. На дзірку ад абаранка. На пялёсткі рамонка. На гадзіннік, пярсцёнак, абруч, кола. На савіныя вочы. На пятачок парасяці. На кольцы ў нажніцах.

Дзе жыў Нулік? Ды абы-дзе. Мог жыць у мыльных бурбалках-пухірах. У клубах дыму. На пяску. На слівавых дрэвах. Нават на воблаках.

А што рабіў Нулік?

Ды нічога. Ён умеў толькі палежваць: то на правым баку, то на левым. Мог стаяць, калі нехта яго падтрымліваў, каб не кульнуўся. Той нехта мог быць ці гурбай снегу, ці сасновымі іголкамі, ці выпадковым ветрыкам.

Аднойчы ветрык-падарожнік і нашаптаў Нуліку пра казачнага Калабка. Помніце, ляжаў-палежваў Калабок, ды раптам і пакаціўся.

З акна на лаву, з лавы на падлогу, а далей — праз дзверы ў двор. І памінай баба з дзедам як звалі Калабка.

Задумаў і Нулік паспрабаваць шчасця. Захацеў і ён пабачыць свету. З дапамогай ветрыку пакаціўся Нулік па зялёнай траўцы, пасля — па сцяжынцы. Выскачыў на шырокую роўную вуліцу. Каціўся, каціўся, пакуль не стукнуўся аб сцяну высокага цаглянага дома. Упаў Нулік на асфальт. Думаў, тут яму і канец надышоў. Ды раптам яго нехта падняў...

## Міколка-ратавальнік

Жыве ў высокім доме, на сёмым паверсе, хлопчык Міколка. Вельмі ж ён пацешны. Выйдзе на вуліцу, сядзе на лаўку і сядзіць, думае. А дзеці гушкаюцца, лётаюць паміж дрэў, у пясочніцы корпаюцца. У яго пытаюцца:

— Што робіш, Міколка?

— Варон пералічваю...

А то скажа, што балконы лічыць у сваім доме, галіны на клёне, кветкі на газоне.

Як толькі ні клікалі Міколку: і грамацеем, і матэматыкам, і, не паверыце нават, дзядзькам Колем. Ленка з пятага паверха склала пра яго дражнілку:

Дзядзька Коля — велікан,
Уваліўся ў мамін жбан.
А ў жбане малако,
Дзядзя Коля — ко-ко-ко...

З верасня Міколку пачалі называць Нулікам, бо пайшоў вучыцца ў нулявы клас. Ён, канечне, не вельмі падобны на нуль. Хутчэй на лугавога коніка. Танклявы, падцягнуты, толькі скакаць не любіць. Ходзіць павольна, задуменна.

От аднойчы ішоў ён, пра нешта думаў. А можа, пліты лічыў, па якіх ступаў? Ды раптам аж войкнуў ад знаходкі. Каля самай сцяны ляжаў сапраўдны Нулік. Міколка быццам пачуў яго голас:

— Ратуйце мяне!..

Хлопчык Нулік ухапіў у рукі лічбу Нулік і панёс у сваю кватэру. Бег па лесвіцы і ўвесь час адчуваў у руках не проста абадок з дроціка, а нешта як быццам жывое.

Міколка ўскочыў ў свой пакой. Паклаў знаходку на белы аркуш паперы, які ляжаў на яго пісьмовым стале. Ухапіў каляровыя алоўкі і пачаў маляваць Нуліку вочы, нос, рот, вушы.

І здарыўся цуд. Вочы ажылі, і сінія «кропачкі» пачалі азіраць Міколку. Нос Нулікаў чмыхнуў. А рот заварушыўся, і ў пакоі пачуўся пісклявы голас незвычайнага госця:

— Дзе я?.. Што са мной?..

Міколка расказаў усё, як было.

Нулік войкнуў:

— Вой, як моцна я ўдарыўся аб сцяну.

— Цяпер у цябе ёсць вочы, будзеш бачыць, куды каціцца,— супакоіў Міколка.

— Хачу не каціцца, а ісці, як ты,— папрасіў Нулік.

Міколка хуценька дамаляваў Нуліку рукі, ногі. На галаве зрабіў прычоску — накруціў маленькіх нулікаў. І перад ім паўстаў жывы Нулік, якога Міколка не бачыў ні ў сваім падручніку, ні ў мульціках.

### Першыя крокі

Як толькі Нулік стаў на ногі, яму захацелася агледзець Міколкаву кватэру. Ён скокнуў са стала на крэсла, з крэсла — на дыван, які ляжаў на паркетнай падлозе. Тут Нулік адчуў раздолле і пачаў перакульвацца з ног на рукі, з рук на ногі.

— О-пля! — Госць стаў на ногі-нулікі і падбухторыў Міколку: — А ты так умееш?

— Не спрабаваў...

Міколка і Нулік пачалі куляцца на дыване. Ім было весела і смешна.

Раптам Нулік прыпыніўся і спытаў:

— Слухай, Міколка, а ты можаш высока падскочыць?

— Магу! Глядзі!..

Міколка ўскінуў рукі ўгору, як быццам хацеў узляцець. Ды толькі адарваўся ад падлогі. Тут жа і прысеў.

— Э, трэба во як! — Нулік узмахнуў рукамі і, нібыта надзьмуты шар, узляцеў аж да столі. Прысеў на люстру. Пераскочыў на шафу. Сядзіць там і дражніць Міколку: — Падскоквай да мяне. Адсюль усё бачна.

Міколка падставіў табурэтку, хацеў лезці на шафу, але ў пакой якраз зазірнула бабуля і асіплым голасам сказала:

— Чаго вэрхал падняў?.. Куды лезеш?..

— Я гуляю з... — Міколка хацеў прызнацца, з кім ён пасябраваў, але з-пад столі, з самага верху шафы Нулік тоненька чмыхнуў.

Вось так: «Ап-цхні!»

А Міколку пачулася: «Сціхні!». Ён і змоўк.

Затое бабуля ўсхвалявалася:

— Чхаеш? Зноў прастудзіўся. О божа, што скажа мама?! Марш на кухню чай піць. Пасля ўрокі будзем рабіць.

Нулік усё чуў, ды мала што разумеў. Калі бабуля з Міколкам выйшлі з пакоя, ён саскочыў з шафы, сеў у крэсла і задумаўся. Чаму бабуля зазлавала на Міколку? Чаму не дазваляе яму дурэць? Навошта людзі п'юць чай? Навошта дзяцей прымушаюць рабіць нейкія ўрокі?..

Ад гэтага роздуму Нулік аж засумаваў. Захацелася, як і раней, бесклапотна катацца па вуліцах. Але ж трэба выручаць сябра Міколку. А як?..

## Дзіўны кот

*Васіль Шырко*

Усе вы, канешне, ведаеце, што я, мажліва, адзіны фермер у Беларусі, які зёлкі ад немачы і скрухі вырошчвае, а не толькі збожжа і бульбу. Цуд-зелле — жэньшэнь, рамонкі, васількі, галаўню... Можа, тысячам людзей вярнулі здароўе мае травы. Адзін святаяннік ад тысячы хвароб памагае. У народзе кажуць: «Як без мукі нельга хлеб спячы, так без яго хваробу вылечыць...»

Нават звяры і хатнія жывёлы травамі лечацца. Відаць, і вы бачылі, як сабака шчаўе есць, а кот нейкія карэньчыкі жуе. Значыць, патрабуе арганізм. Я сам ніколі не лячыўся таблеткамі і ўколамі, усё настоі з траў піў, можа, і жыву таму так доўга. Яшчэ і сёння на печы не сяджу...

Не так даўно мяне на злёт выклікалі, каб распавёў, як мы травы вырошчваем.

Трэба дык трэба. Адзеўся я, гэта, чыста. Ордэны і медалі пачапіў... Іду па райцэнтры, вітрыны разглядаю... Не спяшаю: ёсць вольны час. Дай, думаю, у кніжны заскочу: можа, новае што з'явілася.

Іду, бачу, нейкі кот за мной увязаўся: сам чорны, шыя белая. Куды я — туды ён. Я прыбавіў ходу — не адстае, прысеў на лаўку ў скверыку — побач прыпыніўся. Ці не памроілася, думаю. Сто гадоў жыву, а ніколі не чуў, каб каты за чалавекам бегалі. Заплюшчыў вочы, расплюшчыў: сядзіць, аблізваецца. Трэба ратавацца, рашыў. Ці не смерць за табой, Манюкін, ходзіць. Падняўся я

з лаўкі і — бягом. Людзі аглядваюцца, пальцам каля скроні круцяць: маўляў, звіхнуўся стары з розуму. А я тым часам сігануў за нейкі вугал, адтуль у вулачку забег, а там да кніжнага паджгаў. Агледзеўся: быццам адстаў мой кот. Выцер гэта я ўзмакрэлы лоб хусцінкай і ў магазін зайшоў. Купіў мемуары партызана, пагутарыў з прадаўцамі і назад пайшоў.

Толькі высунуўся за парог — кот мой тут як тут. Пазірае ў вочы і хвастом махае. Дакарае, відаць, за ўцёкі.

— І чаго ты хочаш? — пытаю. — Булкі ў мяне няма, скварку з сабой не браў — у сталовай паабедаю. Ідзі сваёй дарогай, а я сваёй.

Глянуў на гадзіннік — пара.

— Ну, будзь здароў, — кажу.

На злёце мне грамату ўручылі, каштоўны падарунак.

— Жадаем, — кажуць, — яшчэ сто гадоў жыць і маладзець.

— Рад бы, — гавару, — спадарочкі. Ды ці не смерць па пятах за мной ходзіць?

Ну, і расказаў пра таго ката. Усе ў рогат:

— Жартаўнік, дзед.

— Ага, — кажу, — жартаўнік. А вы ў акно паглядзіце. Можа, кот той і зараз сядзіць, чакае.

Усе да акна тут.

— І праўда, — кажуць, — сядзіць...

Бачу, прыціхлі, не да смеху. Тут мне аграном шклянку вады паднёс... Здзіўлена так на мяне глянуў:

— Ты не піў, дзядуля, валяр'янкі?

Я, вядома, пакрыўдзіўся:

— Сэрца ў мяне, малады чалавек, як гадзіннік...

— А на ток не заходзіў, дзе корань сушыцца?

— Быў, вядома. Недагледзь — мігам корань перасушаць ці сырым упакуюць.

Усе абступілі нас, слухаюць: цікава, куды гэта аграном хіліць.

— Пакажыце, дзеду, боты, — просіць.

Чаму не паказаць. Глянуў ён ды як зарагоча.

— Пылок валяр'янавы прыстаў, — кажа, — добра, што за вамі адзін кот увязаўся, а не дзесяць.

Тут і палеглі ўсе ад смеху... Кот валяр'янку ўчуў, таму і хадзіў па пятах. Надта ўжо любяць яе каты. І як гэта я, стары дурань, сам не здагадаўся? Вось як, убрыкні вас качкі, бывае.

## Жаласлівая прынцэса

*Пятро Васючэнка*

У Краіне-Дзе-Ніколі-Не-Плачуць жыла-была прынцэса Людвіка Жаласлівая. У гэтай краіне працавалі і зараблялі грошы сур'ёзныя людзі, якія не мелі часу не толькі на тое, каб плакаць, але і смяяцца. Прынцэса ж была несур'ёзная, бо шкадавала ўсіх бедных.

Аднойчы прынцэса гуляла па садзе са сваёй фрэйлінай.

— Навошта вы мяне ў лужыну штурхаеце? — сярдзіта казала фрэйліна.

— Прабачце, але вы маглі наступіць вунь на тую зялёненькую жабку.

— Які жах! — сказала фрэйліна і страціла прытомнасць.

Фрэйліна часта губляла прытомнасць, усе да гэтага прывыклі. Таму прынцэса не спалохалася і нават паспела вызваліць з павуціння мушку-зелянушку.

Мушка ўмела гаварыць.

— Дзякуй табе, прынцэса, што вратавала мяне з лапаў гэтага кашлатага павука. За гэта я скажу табе, дзе тваё шчасце. Яго прынясе табе чалавек, у якога на пальцы будзе зялёны пярсцёнак.

— Дзякуй! — сказала прынцэса. — Я і так шчаслівая. У нашай краіне ўсе шчаслівыя. Такі ў нас закон.

— З кім гэта вы размаўляеце, ваша высокасць? — запыталася фрэйліна, якая да гэтага часу ўжо апрытомнела. — З павуком?

— Не, з мушкай, — адказала Прынцэса, якая не ўмела хлусіць.

— Які жах! — прамовіла фрэйліна і зноў страціла прытомнасць. А пасля таго, як ачуняла, пайшла дакладваць каралю Генрыху XI Сур'ёзнаму пра паводзіны дачкі.

«Як гэта несур'ёзна, — падумаў кароль, выслухаўшы аповед фрэйліны. — Жабкі гэтыя, жучкі, чарвячкі... Нашаму бізнесу такая жаласлівасць толькі на шкоду. Трэба дачку хутчэй замуж аддаць, каб стала сур'ёзнай».

Назаўтра перад каралеўскім палацам стаяў натоўп жаніхоў — каралёў ды прынцаў, шыкоўна прыбраных.

Прынцэса мусіла размаўляць з імі пра кошты на рынку і курс валюты. Але яна не марнавала часу і паспела перавязаць лапку параненаму вераб'ю. Гэта заўважылі жаніхі і пачалі паміж сабою перашэптвацца:

— Жаласлівая! На паляванне з ёю не паедзеш. Ваяваць забароніць. Не патрэбная нам такая жонка!

І жаніхі памалу пачалі разыходзіцца. Толькі адзін застаўся, зусім не падобны да іншых. Усяго хараства ў яго было — добрыя і крыху сумныя вочы і маленькія вусікі. За тое жаніхі зласліва празвалі яго каралём Вусенем.

— Выходзь за мяне замуж, прынцэса, — сказаў ён. — Мне цябе шкада.

— Вось як? — здзівілася прынцэса. — Гэта ж я вас павінна шкадаваць, бо я — жаласлівая.

— Пойдзем у маю краіну, Людвіка, — сказаў кароль Вусень, — і я навучу цябе смяяцца і плакаць.

З гэтымі словамі кароль Вусень працягнуў прынцэсе руку, і яна пабачыла на ягоным пальцы зялёненькі пярсцёнак.

«А мне ён і без пярсцёнка спадабаўся, — падумала прынцэса. — У яго добрыя вочы».

— Ну і выбрала! — здзівіўся кароль Генрых XI Сур'ёзны. — Па-мойму, гэта несур'ёзна. Але гэта твой выбар.

І Жаласлівая Прынцэса пайшла следам за каралём Вусенем у ягоную далёкую краіну.

— Чаму вы такі сумны, ваша вялікасць? — спытала яна.

— Млосна мне без слёз і смеху. Але ты не палохайся, што б ні здарылася, — адказваў кароль Вусень.

Падвечар каралю зрабілася зусім блага, і яны мусілі спыніцца ў прыдарожнай карчме.

Уначы ў хворага караля пачаліся сутаргі. Ногі і рукі здранцвелі і сталі нерухомыя. Цела пакрылася шорсткім панцырам. Але на застылым, бы маска, твары ззялі добрыя, крыху сумныя вочы.

Нікога ў жыцці Жаласлівая Прынцэса не шкадавала так моцна. Слёзы закапалі з яе вачэй. Дзве пякучыя слязіны ўпалі на панцыр, і той раскалоўся, бы шкарлупіна яйка. Кароль падняўся з ложка, памаладзелы, бадзёры, прыгожы. Цяпер яго можна было называць не кароль Вусень, а кароль Матыль, бо за плячыма ў яго пералівалася перламутрам пара яркіх крылаў.

«А мне ён і раней падабаўся не менш», — падумала Жаласлівая Прынцэса.

— У маёй краіне ўсе лятаюць. І кузуркі, і чарвячкі, і людзі, — сказаў кароль Матыль. — Ты таксама станеш там крылатай.

— А мой тата? Мы запросім яго да сябе? — спытала Жаласлівая Прынцэса.

— Абавязкова! — паабяцаў кароль. — Толькі спачатку навучым яго таму, што ўмеем самі.

…Я чуў, што днямі кароль Генрых XI атрымаў ліст ад дачкі з Краіны-Дзе-Смяюцца-І-Плачуць. Казалі, што, прачытаўшы той ліст, кароль павёў сябе зусім несур'ёзна: рагатаў і плакаў, як дзіця.

## Стойкі алавяны салдацік

**(*Пераклад Валянціна Лукшы*)**

*Ханс Хрысціян Андэрсэн*

Жылі-былі дваццаць пяць алавяных салдацікаў. Усе яны былі сынамі адной маці — старой алавянай лыжкі, — і, значыць, даводзіліся адзін аднаму роднымі братамі. Былі яны прыгажуны пісаныя: стрэльба на плячы, галава прама, чырвоны з сінім мундзір — ну прыгажосць што за салдаты!

«Алавяныя салдацікі!» — вось першае, што пачулі браты, калі адчынілася каробка, у якой яны ляжалі. Гэта крыкнуў маленькі хлопчык і запляскаў у далоні. Салдацікаў яму падарылі ў дзень яго нараджэння. Ён адразу ж пачаў расстаўляць іх на стале. Алавяныя салдацікі былі падобныя адзін на аднаго як дзве кроплі вады, і толькі адзін адрозніваўся ад сваіх братоў: у яго была адна нага. Яго адлівалі апошнім, і волава на яго не хапіла. Хаця ён і на адной назе стаяў гэтак жа цвёрда, як іншыя на дзвюх. І ён якраз і вызначыўся.

Хлопчык расставіў сваіх салдацікаў на стале. Там было шмат цацак, але прыгажэй за ўсіх быў

цудоўны замак з кардону: скрозь яго маленькія акенцы можна было зазірнуць усярэдзіну і ўбачыць пакоі. Перад замкам ляжала люстэрка, яно было зусім як сапраўднае возера, а вакол стаялі маленькія дрэвы. Па возеры плавалі лебедзі з воску і дзівіліся на сваё адлюстраванне. Усё гэта радавала вока. Самай чароўнай з усяго была дзяўчына, якая стаяла на парозе шырока расчыненых дзвярэй замка. Яна таксама была выразана з кардону. Спаднічка яе была з тонкага батысту. Блакітная стужка, якая спускалася ад пляча да пояса, была прымацавана ззяючай брошкай, вельмі вялікай, — яна магла б закрыць увесь твар дзяўчыны. Прыгажуня гэта была танцоўшчыца. Яна стаяла на адной назе, працягнуўшы рукі наперад, а другую нагу падняла так высока, што алавяны салдацік не адразу яе ўгледзеў і спачатку падумаў, што красуня аднаногая, як і ён сам.

«Вось бы мне такую жонку! — падумаў алавяны салдацік. — Ды толькі яна, пэўна, знатнага роду. Вунь у якім цудоўным палацы жыве. А мой дом — проста каробка, ды яшчэ набілася нас у гэтую каробку цэлых дваццаць пяць салдат. Не, ёй там не месца! Але пазнаёміцца з ёй усё ж не пашкодзіць».

І салдацік стаіўся за табакеркай, якая стаяла тут жа на стале. Адсюль ён выдатна бачыў цудоўную танцоўшчыцу.

Позна ўвечары ўсіх алавяных салдацікаў, акрамя аднаногага — яго так і не маглі знайсці, —

паклалі ў каробку, усе людзі ў доме ляглі спаць. І вось, калі ўсталявалася цішыня, цацкі самі пачалі гуляць у госці, у вайну, а потым наладзілі баль. Алавяныя салдацікі грукалі ў сценкі каробкі — яны таксама хацелі выйсці і пагуляць, ды ніяк не маглі падняць крышку. Нават шчаўкунчык пачаў куляцца, а грыфель пайшоў у скокі на грыфельнай дошцы. Падняўся такі шум і тлум, што ў клетцы прачнулася канарэйка і таксама загаварыла, ды прытым яшчэ вершамі.

Толькі салдацік і танцоўшчыца не рухаліся з месца. Яна па-ранейшаму стаяла на адной ножцы, выцягнуўшы рукі наперад, а ён застыў са стрэльбай у руках, як вартавы, і не адводзіў вачэй ад прыгажуні.

Прабіла дванаццаць. І раптам — шчоўк! — раскрылася табакерка.

У гэтай табакерцы тытунь ніколі не трымалі, а сядзела ў ёй маленькае чарцяня. Яно выскачыла з табакеркі і азірнулася навокал.

— Гэй, алавяны салдацік! — крыкнула чарцяня. — Што ты заглядзеўся на скакуху! Яна надта добранькая для цябе.

Але алавяны салдацік зрабіў выгляд, што нічога не чуе.

— Вось ты як! — сказала чарцяня. — Ну, пачакай жа да раніцы!

Раніцай, калі дзеці прачнуліся, яны знайшлі аднаногага салдаціка за табакеркай і паставілі на акно.

Раптам акно расчынілася — ці мо чарцяня гэта нашкодзіла ці проста пацягнула скразняком, хто ведае? Ды толькі аднаногі наш салдацік паляцеў з трэцяга паверха ўніз галавой — ды так, што ў вушах засвістала. Хвіліна — і ён ужо стаяў на вуліцы дагары нагой, а яго стрэльба і галава ў касцы заселі паміж каменнямі брукаванкі. Хлопчык і прыслуга адразу ж выбеглі на вуліцу шукаць салдаціка, але, як ні імкнуліся, знайсці яго не маглі.

Неяк раз яны нават ледзь не наступілі на салдаціка і ўсё-ткі не заўважылі яго. Калі б салдацік крыкнуў: «Я тут!», яны, натуральна, адразу ж знайшлі б яго. Але ён лічыў непрыстойным крычаць на вуліцы — бо ён жа быў салдат і насіў мундзір.

Тут пайшоў дождж, сапраўдны лівень. Па вуліцы пацяклі ручаі.

А калі нарэшце дождж скончыўся, да таго месца, дзе паміж брукам тырчэў алавяны салдацік, прыбеглі двое хлапчукоў.

— Эге! — сказаў адзін з іх. — Глядзі! — алавяны салдацік! Давай адправім яго ў плаванне.

І яны зрабілі са старой газеты лодачку, пасадзілі ў яе алавянага салдаціка і пусцілі ў канаўку. Лодачка паплыла, а хлапчукі пабеглі побач і запляскалі ў далоні.

Лодачку падхапіла хуткім цячэннем і панесла. Вада ў канаве так і бурліла. Яшчэ б ёй не бурліць — пасля такога ліўня!

Алавяны салдацік у лодачцы ўвесь дрыжэў, але трымаўся стойка, як і належыць сапраўднаму салдату: стрэльба на плячы, галава прама, грудзі наперад!

І вось лодачку занесла пад шырокі-шырокі мост; стала так цёмна, быццам салдацік зноў трапіў у сваю каробку.

«Куды мяне нясе? — думаў ён. — Гэта ўсё хітрыкі брыдкага чарцяня з табакеркі. Ах, калі б са мной у лодцы сядзела прыгажуня танцоўшчыца, я нічога б не баяўся, нават калі б стала яшчэ цямней!»

У гэтую хвіліну з-пад маста выскачыў вялікі вадзяны пацук.

— Гэта хто такі? — закрычаў ён. — А пашпарт у цябе ёсць? Давай зараз жа пашпарт!

Але алавяны салдацік маўчаў і моцна сціскаў стрэльбу. Лодку яго несла ўсё далей і далей, а пацук плыў за ім наўздагон. Ён злосна шчоўкаў зубамі і крычаў, плывучы, насустрач трэскам і саломінкам:

— Трымайце, трымайце яго! У яго няма пашпарта!

Тут лодачку панесла яшчэ хутчэй, і алавяны салдацік нарэшце ўбачыў наперадзе святло. Мост скончыўся. Але ў гэтую хвіліну пачуўся такі страшны грукат, ад якога задрыжэў бы любы храбрэц. Падумаць толькі! За мастом канаўка ўпадала прама ў вялікі бурны канал. Па такіх хвалях салдаціку ў маленькім папяровым караблiку плысці было гэтак жа небяспечна, як

нам у сапраўднай лодцы ляцець да вялізнага вадападу. Спыніцца было ўжо немагчыма. Лодку з алавяным салдацікам вынесла ў вялікі канал. Але салдацік па-ранейшаму трымаўся малайцом і нават вокам не міргнуў.

Лодачка закруцілася на месцы, два-тры разы чарпанула вады і хутка напоўнілася вадой да краёў. Вось салдацік па пояс у вадзе, вось ужо па горла. І нарэшце, вада накрыла яго з галавой.

З сумам падумаў салдацік пра сваю прыгажуню. Не бачыць яму больш мілай танцоўшчыцы! Але ў апошнюю хвіліну ўспомніў ён салдацкую песню:

Наперад кроч на бой крывавы,
Бо за труной чакае слава!

І ён падрыхтаваўся з гонарам загінуць у страшным віры.

Але яго падцікоўвала другая бяда.

З вады вынырнула вялізная рыба і ўмомант праглынула салдаціка.

О, як цёмна і цесна было ў жываце рыбы! Цямней, чым пад мастом, больш цесна, чым у каробцы. Але алавяны салдацік і тут трымаўся стойка. Ён выцягнуўся на ўвесь свой рост і яшчэ мацней сціснуў сваю стрэльбу. Так ён праляжаў даволі доўга.

Раптам рыба замітусілася ва ўсе бакі, пачала ныраць, звівацца, скакаць і нарэшце замерла.

Зноў прайшло нямала часу. Салдацік насумаваўся і задрамаў.

Прачнуўся ён ад таго, што над ім, як маланка, бліснуў востры нож. Стала зусім светла, і хтосьці закрычаў:

— Вось дык штука! Алавяны салдацік!

А справа была так: рыбу злавілі, адвезлі на рынак, а потым яна трапіла на кухню. Кухарка распарола ёй жывот вялізным нажом і раптам убачыла алавянага салдаціка. Яна ўзяла салдаціка двума пальцамі ўпоперак жывата і панесла ў пакой.

Увесь дом збегся паглядзець на цудоўнага падарожніка. Салдаціка паставілі на стол, і раптам — якіх толькі дзівосаў не бывае на свеце! — ён убачыў той жа пакой, таго ж хлопчыка, тое ж самае акно, з якога не так даўно вываліўся. Вакол былі тыя ж цацкі, а сярод іх горда ўзвышаўся цудоўны кардонны палац і на парозе стаяла прыгажуня-танцоўшчыца. Яна стаяла, як і раней, на адной ножцы, высока падняўшы другую. Вось гэта стойкасць!

Алавяны салдацік так расчуліўся, што з яго вачэй ледзь не паказаліся алавяныя слёзы, але ён своечасова ўспомніў, што салдатам плакаць не дазваляецца. Не міргаючы глядзеў ён на танцоўшчыцу, яна глядзела на яго і абодва маўчалі.

Раптам адзін з хлопчыкаў схапіў алавянага салдаціка і ні з таго ні з сяго кінуў яго прама ў печку. Пэўна, яго падвучыла злое чарцяня з табакеркі. У печы ярка палалі дровы і алавянаму салдаціку стала страшэнна горача — ад агню або ад кахання, ён і сам не ведаў. Фарбы з яго

зусім злезлі, ён увесь паліняў — магчыма, ад крыўды, а магчыма таму, што пабываў у вадзе і ў жываце рыбы. Але і тут ён трымаўся прама, сціскаў сваю стрэльбу і не зводзіў вачэй з цудоўнай танцоўшчыцы, а танцоўшчыца глядзела на яго. І раптам салдацік адчуў, што ён растапляецца ў агні.

У гэты момант дзверы ў пакоі расчыніліся, скразняк падхапіў цудоўную танцоўшчыцу, і яна, як матылёк, уляцела ў печку прама да салдаціка. Полымя ахапіла яе, яна ўспыхнула — і канец. Тут ужо і алавяны салдацік зусім расплавіўся.

На другі дзень служанка пачала выграбаць з печкі попел і знайшла маленькі камяк волава, падобны на сэрца, ды абгарэлую, чорную, як вугаль, брошку. Гэта было ўсё, што засталося ад стойкага алавянага салдаціка і яго цудоўнай танцоўшчыцы.

## Зямля родная

*Анатоль Караленка*

У неабсяжным космасе свеціцца мноства зорак.

Ззяючы серабрыстым бляскам, узышла на небасхіле Венера. За ёю — ружовая планета Марс. Яны, як заўсёды, трымаюцца паблізу адна ад адной. За імі ўзышлі Сатурн, Юпітэр, Меркурый…

Закружыліся яны разам у карагодзе, напяваючы песеньку:

Мы планеты самыя прыгожыя,
Мы планеты самыя шчаслівыя.
Кожнае імгненне ў зорны час
Дзіўнае святло ідзе да нас.

Але тут выглянула з-за гарызонту Сонца.

— Ну і хвалькі, — усміхнулася яно, — гэта ж маё святло. Без мяне вы сталі б чорнымі планетамі, і вас ніхто не ўбачыў бы. А ў Сусвеце, між іншым, ёсць яшчэ такія Сонцы, як і я. І нават большыя за мяне.

У гэты час на небе з'явілася яшчэ адна планета. Прыгожая, на зайдрасць усім! Ярка-блакітная, у лёгкай пуховай коўдры з воблакаў.

— Гэта мая любімая планета, — сказала Сонца, — Зямля.

Абкружылі Зямлю з усіх бакоў Венера, Марс, Сатурн, Меркурый, Юпітэр. Глядзяць на яе, здзіўляюцца:

— Чаму Зямля самая любімая ў Сонца? Яна лепшая за ўсіх нас?

— А таму, — адказала Сонца, — што планета Зямля самая жывая. Ці будзе на якой з вас падобнае жыццё, ніхто не ведае.

— Што гэта за сінія плямы на Зямлі? — пацікавілася Венера.

— Гэта моры і акіяны.

— Так, Зямля і сапраўды прыгожая, — згадзіўся Марс.

Пачуўшы гэта, Венера насупілася. Яна лічыла, што ёй няма роўні сярод планет. Але ніхто не

звярнуў увагі на яе крыўду. Усе наперабой сталі задаваць пытанні Сонцу.

— А што гэта за казюлькі на Зямлі мітусяцца?

— А вусені?

— А мухі?

— Гэта людзі, — з ахвотаю патлумачыла Сонца, — паязды, самалёты. Маленькімі яны здаюцца таму, што вельмі далёка ад нас.

І стала Сонца расказваць планетам пра Зямлю.

— Яшчэ таму я люблю гэтую планету, — сказала яно, — што ўсё на ёй ёсць. Унутры яе, у самым ядры, — вечны агонь. Гэта — сэрца Зямлі. А па жылах яе цячэ нафта. Гэта — кроў планеты. Людзі здабываюць нафту, падымаюць на паверхню і гатуюць з яе страву для машын, самалётаў, паяздоў, караблёў. А лясы, сады і палі, лугі, ручаі і рэкі, даліны і горы... Да хіба ж пералічыш усё, што робіць Зямлю прыгожай!

— Што ж, — падабрэла Венера, — Зямля і напраўду прыгожая.

— Яна для нас усіх родная сястра, — дружна заявілі Марс, Юпітэр і ўсе астанія планеты.

— А для людзей, — светла ўсміхнулася Сонца, — Зямля — дом родны.

# АДГАДКІ

## Да старонак 19—21

Гром. Дождж. Ноч. Неба. Сонца. Снег. Мароз. Лёд. Лядзяш. Год, месяцы, тыдні, дні. Гадзіннік. Абрус. Дарога. Збожжа. Шкарпэтка. Зубр. Алень. Бабёр. Мядзведзь. Ліса. Вавёрка. Вожык.

## Да старонак 21—22

Сонца. Вада. Вецер. Воран. Хмара. Мароз. Сон. Думка. Язык. Новы год. Без імені. Казёл. Літара «м». Мокры. На шыю. За сталом.

## Да старонкі 320

Гультай. Вучаніца.

# Змест

**Вытокі народнай мудрасці** . . . . . . . . 3
Заклічкі і прыгаворы . . . . . . . . 3
Народныя забаўлянкі і лічылкі . . . . . . . . 4
Ехалі з горкі скарагаворкі . . . . . . . . 6
Прыказкі і прымаўкі . . . . . . . . 8
Прымаўкі пра месяцы года . . . . . . . . 9
Народныя прыкметы і павер'і . . . . . . . . 10
Беларускія народныя песні . . . . . . . . 13
Кукарэку, петушок... . . . . . . . . 13
Іграў я на дудцы... . . . . . . . . 13
Зімовыя песні . . . . . . . . 14
Калядныя песні . . . . . . . . 14
Масленічная песня . . . . . . . . 15
Вясновыя песні . . . . . . . . 15
Летнія песні . . . . . . . . 16
Купальская песня . . . . . . . . 16
Жніўная песня . . . . . . . . 17
Восеньскія песні . . . . . . . . 17
Прыпеўкі . . . . . . . . 18
Гэтыя цікавыя загадкі . . . . . . . . 19
Загадкі-жарты . . . . . . . . 21
Легенды і паданні . . . . . . . . 22
Адкуль пайшлі беларусы . . . . . . . . 22
Возера Нарач . . . . . . . . 24
Месяц . . . . . . . . 26
Адкуль зязюля ўзялася . . . . . . . . 28
Адкуль узяўся мядзведзь . . . . . . . . 31
Паданне пра заснаванне Менска . . . . . . . . 32
Адкуль Нясвіж . . . . . . . . 33
Як нарадзіліся Нёман і Лоша . . . . . . . . 33
Пра возера Свіцязь . . . . . . . . 34

Адкуль сяляне і паны . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Адкуль пайшлі буслы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Дуб і сасна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Чаму воўк з сабакам ды з кошкай
і мышкай варагуюць . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Чаму заяц, ліса ды воўк разам не сыходзяцца . . 39
Беларускія народныя казкі . . . . . . . . . . . . . . . 41
Каток — залаты лабок . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Ад крадзенага не пасыцееш . . . . . . . . . . . . . . 43
Стары бацька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Піліпка-сынок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Залаты птах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Сабака і воўк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Лісіца і Гусак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Курачка-рабка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Жаба ў каляіне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Хітры вол . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Пчала і муха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Вол і асёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Як курачка пеўніка ратавала . . . . . . . . . . . . . 73
Мена . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Муха-пяюха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Былінка і верабей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Сабачая грамата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Пшанічны каласок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Каза-манюка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
Казёл і баран . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Ганарыстая варона . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Лісіца-хітрыца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Верабей і мыш . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Жаронцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Сынок з кулачок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Сабака-паляўнічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116

Лісіца і дрозд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Казка пра быка і яго сяброў . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Селянін, мядзведзь і лісіца . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Як лісіца ваўка судзіла . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Коцік, пеўнік і лісіца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Лёгкі хлеб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Як кот звяроў напалохаў . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
Сава і дзяцел . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Вучоны рак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць . . . . . . . . . . 152
Чалавек і козы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156
Стары конь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160
Дзяцел, лісіца і варона . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Кот Максім . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

**Прыгажэйшая на свеце — беларуская зямля** . . . 178
Зямля з блакітнымі вачамі. *Эдзі Агняцвет* . . . . . 178
Маленькі чалавек у вялікім свеце. *Алесь Бадак* . . 179
***О Беларусь, мая калыска... *Пятро Глебка* . . . 180
Белая Русь. *Данута Бічэль-Загнетава* . . . . . . . 181
Беларуска. *Уладзімір Мазго* . . . . . . . . . . . . . . 182
Родныя вобразы. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . 182
Родныя словы. *Пятрусь Броўка* . . . . . . . . . . . . 183
Прамяніся ярчэй і ярчэй. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . 184
Сын і маці. *Янка Купала* . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Рыбнае царства. *Алесь Карлюкевіч* . . . . . . . . . . 189
Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга. *Анатоль Клышка* . . . . . . . . . . . . . . . . 192
 Зала сарака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
 У слаўным горадзе Полацку . . . . . . . . . . . . . 193
Першы астраном. *Янка Сіпакоў* . . . . . . . . . . . . 195

**Жывая кніга прыроды** . . . . . . . . . . . . . . . . . 198
Калінавая рукавічка. *Алена Васілевіч* . . . . . . . . 198
Гаспадарка. *Змітрок Бядуля* . . . . . . . . . . . . . . 205

Грыбнік. *Рыгор Ігнаценка* . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
Джэк і Рыжык. *Зіновій Прыгодзіч* . . . . . . . . . . . . . 207
Азбука птушак. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . . . . 211
Скарб. *Змітрок Бядуля* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218
Арцёмка і яго сябры. *Зіновій Прыгодзіч* . . . . . . . . 224
Як кот грыбы збіраў. *Галіна Васілеўская* . . . . . . . 227
Маленькія памочнікі. *Васіль Гурскі* . . . . . . . . . . . . 229
Слімак. *Леанід Улашчанка* . . . . . . . . . . . . . . . . . 232
Лёс Дункана. *Віталь Вольскі* . . . . . . . . . . . . . . . 235
Хто такі Дункан? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Сіротка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Гульні на двары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
Сутычка з грозным веліканам . . . . . . . . . . . . . . . 239
Чомга. *Віталь Вольскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
У лясніцтве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
На лясным возеры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
Дзіўная птушка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 245
Багіра. *Янка Маўр* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247
Чырвоная кніга. *Уладзімір Ліпскі* . . . . . . . . . . . . . 256

**У любую пару года слухай родную прыроду** . . . 259
Зімняя старонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 259
Зіма. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 259
Зіма. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 259
Першы снег. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . 260
Цудоўныя святы. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . . . . . . 262
Карнавал. *Валянцін Лукша* . . . . . . . . . . . . . . . . . 263
Калі прыходзіць Дзед Мароз? *Васіль Жуковіч* . . . 267
Ёлка. *Мікола Чарняўскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
Ёлка-вясёлка. *Уладзімір Мацвеенка* . . . . . . . . . . 268
Дзед-госць. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270
Верабейчык. *Алесь Пальчэўскі* . . . . . . . . . . . . . . 271
Вясенняя старонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 273
Вясна. *Янка Купала* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 273
Краска. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 274

Сыход зімы. *Алесь Клышка* . . . . . . . . . . . . . . . . 276
Пралескі. *Мікола Хведаровіч* . . . . . . . . . . . . . . . 277
Перад паводкай. *Максім Багдановіч* . . . . . . . . 277
Ірынка. *Максім Танк* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 278
Садзіце лясы! *Максім Танк* . . . . . . . . . . . . . . 279
Летняя старонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 280
Васілёк. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . 280
Галінка і вярбінка. *Максім Танк* . . . . . . . . . . . 281
Восеньская старонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 283
Залатая, асенняя раніца! *Уладзімір Дубоўка* . . . . 283
Восень. *Ірына Багдановіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . 283
Чаму птушкі адлятаюць. *Цётка* . . . . . . . . . . . 284
Лістапад. *Янка Купала* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285
**Чароўны свет маленства** . . . . . . . . . . . . . . . . 286
Сябры. *Мар'ян Дукса* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 286
Сланечнікі. *Ядвіга Бяганская* . . . . . . . . . . . . . . 287
Новы сшытак. *Лідзія Арабей* . . . . . . . . . . . . . . 290
Васьмёрка не ў радасць. *Ганна Скаржынская-Савіцкая* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 293
Далонькі з пушынкамі. *Тамара Бунта* . . . . . . . . 295
Мікіткаў сон. *Лідзія Арабей* . . . . . . . . . . . . . . 297
Каштанчык. *Галіна Пшонік* . . . . . . . . . . . . . . . 299
Дабрадзей для ўсіх дзяцей. Юні-Юні клапоціцца пра здароўе. *Уладзімір Ліпскі* . . . . . . . . . . . . 302
Шчасце. *Янка Маўр* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 306
Пра хлопчыка «Ай». *Уладзімір Ліпскі* . . . . . . . . 308
Саўка за сталом. *Эдзі Агняцвет* . . . . . . . . . . . 311
Грамацеі. *Эдзі Агняцвет* . . . . . . . . . . . . . . . . . 312
Савось-распуснік. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . 313
Загадкі. *Іван Стадольнік* . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Пра Ігнатку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Пра Натку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Дарога. *Васіль Ткачоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320

**Дабру вучыся змалку** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 324
Добрае сэрца. *Георгій Марчук* . . . . . . . . . . . 324
Выратаванне ластаўкі. *Зіновій Прыгодзіч* . . . . . . 326
Як Агапка мальвы ўратавала. *Георгій Марчук* . . . 329
Яблычак. *Мікола Янчанка* . . . . . . . . . . . . . . 332
Пухнацік. *Аляксей Дудараў* . . . . . . . . . . . . . 334
Зорачка. *Алена Масла* . . . . . . . . . . . . . . . 340
Аленчыны канькі. *Ядвіга Бяганская* . . . . . . . . 343
Пажар. *Алена Васілевіч* . . . . . . . . . . . . . . 344
Усмешка. *Галіна Васілеўская* . . . . . . . . . . . 347
Добрае слова. *Алесь Пальчэўскі* . . . . . . . . . 351
Адведалі. *Мікола Янчанка* . . . . . . . . . . . . . 353
Ліпка. *Пятро Рунец* . . . . . . . . . . . . . . . . 356
Рэха. *Прытча* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 359

**Хлеб — усяму галава** . . . . . . . . . . . . . . . . . 361
Прытча пра хлеб. *Максім Танк* . . . . . . . . . . . 361
Песня хлебу. *Пятрусь Броўка* . . . . . . . . . . . 362
Прыказкі пра хлеб . . . . . . . . . . . . . . . . . . 363
Паданне пра Жыценя . . . . . . . . . . . . . . . . . 363
Добры Жыцень. *Паданне* . . . . . . . . . . . . . . 364
Хто галоўны. *Леанід Улашчанка* . . . . . . . . . . 366

**Народная арыфметыка** . . . . . . . . . . . . . . . . . 370
Лікі 1 і 2 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 370
Лік 3 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 373
Лік 5 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 377
Лік 7 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 379
Лік 8 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 381

**Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш** . . . 383
Будзь верным, добрым сынам! *Эдзі Агняцвет* . . 383
Бабуліна крынічка. *Яніна Жабко* . . . . . . . . . . 384
Вернісаж. *Алена Васілевіч* . . . . . . . . . . . . 385

Незвычайны дыктант. *Васіль Ткачоў* . . . . . . . . . . . . 393
Мама. *Лідзія Арабей* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 394
Хацеў маме дапамагчы. *Ганад Чарказян* . . . . . . . 397
Радасць. *Уладзімір Ліпскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 399
Малінавы чай. *Расціслаў Бензярук* . . . . . . . . . . . . 401

**У нашай памяці...** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 403
Буслы. *Аляксей Дудараў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 403
Бусел над Хатынню. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . . . . 405
Мой горад Мінск у час ваенны. *Эдзі Агняцвет* . . 406

**Казачны куфэрак** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 407
Як з'явіўся апостраф. *Алена Масла* . . . . . . . . . . . 407
Лесавічок. *Яраслаў Пархута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 410
*Казка пятая*. Шалястунчыкі . . . . . . . . . . . . . . . . 411
*Казка сёмая*. Пацерка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 413
*Казка адзінаццатая.* Сараканожка . . . . . . . . . . . 415
*Казка трынаццатая.* Ластаўчыны дзеткі . . . . . 417
Прыгоды мышкі Пік-Пік. *Людміла Рублеўская* . . . 418
Мышка Пік прыбірае норку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 418
Як Тата стаў супермэнам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 420
Мышка Пік-Пік робіць сабе макіяж . . . . . . . . . . 423
І заяц стаў зайцам... *Яраслаў Пархута* . . . . . . . 426
Казка пра Ласку. *Еўдакія Лось* . . . . . . . . . . . . . . . 428
Прыгоды Нуліка. *Уладзімір Ліпскі* . . . . . . . . . . . 435
Хто такі Нулік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 435
Міколка-ратавальнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 436
Першыя крокі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 438
Дзіўны кот. *Васіль Шырко* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 440
Жаласлівая прынцэса. *Пятро Васючэнка* . . . . . 442
Стойкі алавяны салдацік. *Ханс Хрысціян Андэрсэн* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 446
Зямля родная. *Анатоль Караленка* . . . . . . . . . . . 453
Адгадкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 456

Літаратурна-мастацкае выданне

Кніжная паліца школьніка

# Чарадзейнае слова

*Хрэстаматыя*
*для пазакласнага чытання ў 3 класе*

На першай старонцы вокладкі выкарыстаны малюнак
Ганны Каліноўскай

Складальнік **Багуцкі** Вадзім Генадзьевіч

Адказны за выпуск *В. Г. Багуцкі*
Мастацкі рэдактар *Т. В. Шабунька*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Карэктары *Т. Б. Міхайлава,*
*С. М. Несцярэнка, В. І. Смірнова*

6+

Падпісана да друку 18.11.2022. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 29,0. Ул.-выд. арк. 16,73. Тыраж 2000 экз. Заказ 1790.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79/1, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Aa

Kk

Шч

дж

’

Dz

ў

Aa

Выдавецтва «Беларусь»

ISBN 978-985-01-1608-6

9 789850 116086

EAC

+6

# Чарадзейнае слова